Несмотря на объективные трудности, обусловленные трансформацией белорусского общества, этот период был продуктивным для научно-исследовательской деятельности историков Беларуси. Академическая и университетская историческая науки внесли весомый вклад в разработку основных направлений исторических знаний о прошлом страны. Исторические факультеты вузов Минска и регионов, Институт истории НАН Беларуси нашли свои определенные ниши в едином научном поле республики. Особенно заметным явлением начала XX века явилось наращивание научного потенциала историков белорусских регионов, которые при координирующей роли Института истории Национальной академии наук Беларуси и исторического факультета БГУ *сформировали единую систему программного комплексного изучения белорусского прошлого.*

С начала 1990-х годов наступил новый этап в изучении Православной церкви в Беларуси, обусловленный коренным изменением характера взаимоотношений органов государственной власти Республики Беларусь с религией в целом и Церковью в частности. Это прежде всего сказалось на изменении законодательной базы государственно-конфессиональных отношений. Религия и Церковь стали одним из приоритетных направлений исследований социологов, политологов, культурологов, историков Беларуси. Одной из первых попыток уйти от идеологического догматизма и по-новому рассмотреть широкий круг проблем конфессиональной истории Беларуси стала коллективная монография В. Григорьевой, В. Завальнюка, В. Новицкого, Е. Филатовой, где с цивилизационных позиций были освещены не только

государственно-конфессиональные отношения, но и важнейшие тенденции в истории и деятельности основных религиозных конфессий в Беларуси. Роль конфессионального фактора в целом в межнациональных отношениях и в идеологии белорусского государства исследовались в работах А. Верещагиной, А. Гурко, В. Завальнюка, Л. Землякова, В. Конона, Л. Новиковой, А. Тиханского и др. [37].

Поскольку в соответствии с новым белорусским законодательством, религиозные организации получили право издательской деятельности, это дало им возможность публиковать работы не только теологического, но и церковно-исторического характера в широких масштабах. Однозначно можно сделать *вывод, что в этот период происходит возрождение православной церковной историографии Беларуси.* Ведущую роль в этом возрождении сыграли такие православные учебные научные заведения Беларуси, как Минская Духовная Семинария, Минская Духовная Академия, Институт теологии им. Св. Кирилла и Мефодия. По инициативе Экзарха Беларуси, Митрополита Филарета, была основана традиция Кирилло-Мефодиевских чтений. Общее количество публикаций, вышедших из-под пера церковных историков православной церкви в эти годы, по данным библиографической регистрации превышает 2 тыс. позиций.

Основной круг проблем, связанных с историей Православной церкви в Беларуси и поднятых светскими историками республики, концентрировался на следующих темах:

1) православное христианство и возникновение государственности на белорусских землях Древней Руси;

2) язычество и Православная церковь в истории культуры Беларуси XI – начала XX века;

3) проблема взаимоотношений Православной церкви и Католического костела и иных конфессий в периоды ВКЛ, Речи Посполитой, Российской Империи;

4) проблема взаимоотношений советского государства и Православной церкви в СССР, которая рассматривалась в ряде специальных работ на белорусском материале;

5) Православная церковь на территории Западной Беларуси и этноконфессиональная политика II Речи Посполитой;

6) Православная церковь Беларуси в годы Великой Отечественной войны;

7) Православная церковь и белорусское государство в постсоветский период (1990 – 2010 гг.).

Широкая тематическая амплитуда и масштабы развернувшихся в Республике Беларусь историко-конфессиональных исследований *были связаны и с коренным изменением методологических парадигм, происходивших в белорусской историографии этого периода.* Одним из проявлений этой «смены вех» стал уход социально-экономической проблематики на второй план. На передний план выдвинулись проблемы этнополитической и этноконфессиональной истории белорусского народа. В этот период происходит сложное концептуальное и методологическое перевооружение белорусских историков. Работы Г. Голенченко, Г. Васюка, Т. Короткой, Д. Карева, Е. Филатовой, Е. Денисовой, А. Вабищевича, А. Цымбала, А. Елисеева, В. Старостенко, И. Марзалюка, А. Загидулина, В. Ладысева, В. Швайко и др. позволили переосмыслить роль православной церкви в истории и культуре Беларуси на протяжении XI – XX веков как фактора, несомненно, позитивного и сыгравшего немаловажную роль в формировании «историко-генетического кода» белорусского этноса и его культуры. Существенное обогащение историографической традиции в конфессиональной проблематике белорусских историков потребовало создания специального историко-культурологического проекта «Православная церковь и белорусское общество X – нач. XXI в.: государственность, экономика, культура (историографические и источниковедческие аспекты проблемы)». Реализацией его в 2006 – 2010 годах занималась группа историков Гродненского государственного университета им. Я. Купалы. В рамках проекта появилось более 100 статей и 4 монографии, посвященные как общим этапам, так и традициям белорусской историографии в освещении роли Православной церкви в жизни белорусского общества (Д. Карев, А. Змитрукевич, А. Карева, Л. Корнилова, Д. Норель, С. Силова, А. Чернякевич) [37].

Историографический анализ показывает, что прямо или косвенно историографическая составляющая изучаемой проблемы постоянно присутствует в исследованиях российских и белорусских историков. Но как самостоятельная научная проблема российская и белорусская историография взаимоотношений Советского государства и Русской православной церкви в 1922 – 1990 годах не была предметом специального исследования.

*Работы историков белорусского зарубежья* в странах Западной Европы и Северной Америки прежде всего интересны тем, что они содержат оригинальные документальные материалы личного происхождения того поколения белорусской зарубежной диаспоры, которая была участником и свидетелем драматических событий 30-х годов XX века и второй мировой войны. Среди этих работ преобладают научно-популярные статьи, публицистика, воспоминания. Недоступность архивных и опубликованных источников с территории БССР и Республики Беларусь нередко мешала им отойти от однозначно идеологизированных и субъективно-эмоциональных оценок. В работах зарубежных исследователей Западной Европы и Северной Америки (Д. Поспеловский, Э. Каррер д'Анкосс, Р. Пайпс, А. Труайя, Дж. Хоскинг,

Л. Энгельштейн) основное внимание обращено на отношение государственной власти в России и Советском Союзе к отдельным конфессиям (чаще всего православия либо сектанство). Но вероисповедная политика правительственных кругов I и II Речи Посполитой, Российской империи и Советского Союза не стало предметом специального комплексного исследования аналитического характера.

Сравнение восточнославянских, польской и западной историографических версий «образа» православной церкви Беларуси убеждает в том, что современной белорусской историографии принадлежит наиболее значительное число *специальных работ* историко-культурологического характера, посвященных истории православия на белорусских землях. Однако по интенсивности *историографической рефлексии* (работы историографического и источниковедческого жанра) белорусская историография существенно уступает не только российской, но и польской, и украинской современным историографиям. Существенной проблемой для белорусской историографии конца XX – начала XXI века является и отставание от ближайших соседей в практике археографической деятельности – публикации сборников документов и изданий серий «Памятники историко-церковной мысли». Слабо включены в современную белорусскую историографическую традицию историографические потоки зарубежной исторической конфессиологии (в частности, по истории православной церкви).

Результаты нашего исследования по данному этапу подтвердили исходную гипотезу о том, что создание масштабного историко-культурологического мегапроекта синтезного характера «Православная церковь и белорусское общество X – начала XXI в.: государственность, экономика, культура» (историографические и источниковедческие аспекты проблемы) является чрезвычайно актуальным как в исследовательском плане (в силу отсутствия специальных работ подобного рода в отечественной и зарубежной историографии), так и для сегодняшней социально-культурной жизни белорусского общества. Историографический анализ позволил выявить «земное ядро» в различных направлениях общественно-исторической мысли народов Беларуси, России, Польши, Украины, зарубежной историографии западного сообщества по важнейшим направлениям роли православной церкви в жизни белорусского общества. Он позволил более рельефно, доказательно и конкретно осмыслить ту огромную роль, которую православная церковь играла в судьбе восточнославянских народов в целом и белорусского в частности. Полученные результаты могут иметь серьезное значение для улучшения качества содержания учебного процесса в вузах Республики Беларусь (для подготовки курсов религиоведения и спецкурсов по истории христианских конфессий в Беларуси). Разрабатываемая проблема, на наш взгляд, представляет интерес для разработки конкретной политики в сфере государственной идеологии Республики Беларусь, в частности в области межконфессиональных отношений (Аппарат Уполномоченного по делам религий и национальностей Республики Беларусь, Министерство образования и Министерство культуры Республики Беларусь).

Новизна данного исследовательского проекта определяется тем, что впервые в отечественной и зарубежной исторической культурологии и историографии предлагается результат комплексного системного анализа проблемы формирования «образа» православной церкви в Беларуси в общественной исторической мысли, историографических традициях народов Беларуси, России, Польши, зарубежной историографии западного сообщества 90-х годов XX – начала XXI века [38].

В 90-е годы XX века историческая «литванистика» восточнославянских народов вступила в очередной этап своего развития, определяемого новым социально-политическим и социокультурным контекстом развития белорусской, украинской и великорусской нации. Этот период был ознаменован большим числом значительных изменений (как положительного, так и негативного характера), отразившихся на характере развития исторической науки восточнославянских народов в целом и исторической «литванистики» как одного из ее магистральных направлений в исследовании истории феодализма в частности.

Новым моментом явились:

1) переход исторической «литванистики» на «рельсы» новой, методологической парадигмы;

2) выход на первые «роли» в исследовании истории ВКЛ белорусской историографии, для которой история ВКЛ стала в 90-е годы своеобразным историческим « полигоном» для выработки своей национальной концепции исторического процесса на белорусских землях;

3) украинскую и российскую историографию этих лет история ВКЛ привлекала прежде всего своими внешнеполитическими аспектами (история политических взаимоотношений ВКЛ и Российского государства, ВКЛ и украинского казачества), история межкультурных связей восточнославянских народов остается на периферии исследовательских интересов историков Украины и России;

4) ведущим, наиболее продуктивным направлением в плане качества представленных результатов в рамках исторической «литванистики» этого периода являлось историографо-источниковедческое направление.

Последний момент позволяет говорить и о том, что будущее развитие и профессиональное совершенствование восточнославянской историографии ВКЛ представляется малопродуктивным без активного, аналитического использования историографического наследия восточнославянских историографий Великого княжества Литовского XVIII – начала XX века. Учитывая то, что значительная часть этого на-

следства сохранилась в архивохранилищах Восточной Европы, целесообразно осуществление ряда исследовательских проектов историографического и источниковедческого характера:

1) «Историческая память народов ВКЛ в XIV – XVIII вв.»;

2) создание каталога-путеводителя «Историки ВКЛ и их наследие в архивах Восточной Европы»;

3) реализовать проект серийной публикации «Белоруссика. Памятники исторической мысли XVI – XX вв.»;

4) создание научного центра по изучению исторического сознания и исторической науки Беларуси.

Реализация представленных проектов должна преследовать не только академические цели (приобретение фундаментального нового знания), но и мировоззренческую, общегражданскую – повышение научного и социального статуса белорусской историографии, формирование культуры национального исторического мышления, влияние белорусской историографии на укрепление исторической памяти нации. Достижению этих целей будут способствовать разработки, внедрение и популяризация в учебном процессе исторических факультетов вузов Беларуси нового научного направления – «Источниковедение историографии».

## ЛИТЕРАТУРА


1. Карев, Д.В. Развитие исторических исследований в Республике Беларусь: общие тенденции / Д.В. Карев, А.Н. Нечухрин // Веснік ГрДУ імя Я. Купалы. Серыя 1. – 2000. – № 1 (3). – С. 14 – 25.
2. Караў, Д.У. Акадэмік М.К. Любаўскі: лес і спадчына / Д.У. Караў // Наш Радавод. – Гродна, 1994. – Кн. 6, ч. III. – С. 450 – 602.
3. Караў, Д.У. Беларуская гістарыяграфія ў канцы XVIII – пач. XX ст. / Д.У. Караў // Наш Радавод. – Гродна, 1993. – Кн. 5, ч. I. – С. 234 – 394.
4. Караў, Д.У. Беларуская гістарыяграфія канца XVIII – XX ст. і гістарычная самасвядомасць беларусаў / Д.У. Караў // Беларусіка=Albaruthenica. – Мінск, 1992. – Кн. 2. – С. 123 – 130.
5. Караў, Д.У. Беларуская і польская гістарыяграфія ў XVI – XX стст. (Этапы ўзаемадзеяння) // Беларусіка=Albaruthenica. – Мінск, 1994. – Кн. 3. – С. 242 – 251.
6. Караў, Д.У. Прадмова / Д.У. Караў // М.В. Даўнар-Запольскі. Гісторыя Беларусі. – Мінск, 1994. – С. 5 – 15.
7. Караў, Д.У. Праект "Гістарычная памяць беларусаў XIII – XX стст." (Праблемы, перспектывы і крыніцы даследавання) / Д.У. Караў // Наш Радавод. – Гродна, 1992. – Кн. 4, ч. 1. – С. 209 – 230.
8. Карев, Д. Белорусская историография XX века и формирование исторического менталитета белорусов / Д.В. Карев // Беларуская нацыянальная ідэя. – Мінск, 2000. – С. 91 – 93. (Книга издана в 2001 г.)
9. Karev, D. Białoruska historiografia i ewoluja swiadomosci historycznej Białorusinow //Tematy polsko-białoruskie – Olsztyn: WKB, 2003. – S. 69 – 94.
10. Карев, Д.В. Белорусская историография на рубеже XX – XXI веков (старые проблемы и поиски новых решений) / Д.В. Карев // XXI век: Актуальные проблемы исторической науки. – Минск: Издат. центр БГУ, 2004. – С. 154 – 157.
11. Карев, Д.В. Великое княжество Литовское в белорусской историографии XX века (20 – 90-е годы) Восточная Европа в древности и средневековье: проблемы источниковедения / Д.В. Карев – М.: ИВИ РАН – РГГУ, 2005. – С. 203 – 206.
12. Карев, Д.В. Генезис и формирование историко-экономического направления в историографии и экономической мысли Беларуси конца XVIII – XX в. Подготовка педагогических и научных кадров историков и развитие исторической науки в Беларуси. – Гродно: ГрГУ, 2005.
13. Нечухрин, А.Н. Смена парадигм в Российской историографии всеобшей истории (80-е годы XIX в. – 1917 годы): автореф. дис. … д-ра ист. наук / А.Н. Нечухрин. – Минск, 1993.
14. Нечухрин, А.Н. Проблемы кризиса исторической науки / А.Н. Нечухрин, С.П. Рамазанов // Веснік ГрДУ імя Я. Купалы. Серыя 1. – 1999. – № 2. – С. 14 – 22.
15. Иоффе, Э.Г. Советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVIII – первой половины XIX века: автореф. дис. … д-ра ист. наук / Э.Г. Иоффе. – Минск, 1993.
16. Буховец, О.Г. Социальные конфликты и крестьянская ментальность в Российской империи начала XX века: новые материалы, методы, результаты: автореф. дис. ... д-ра ист. наук / О.Г. Буховец. – Минск, 1993.
17. Ігнаценка, І. Усевалад Ігнатоўскі і яго час / І. Ігнаценка, А. Кароль. – Минск, 1991.
18. Гісторыя Беларусі. – Мінск, 1996.
19. История Беларуси: учеб. пособие для вузов, колледжей, лицеев, гимназий и школ. – Минск, 1997.
20. Сільчанка, М.У. Асноўныя этапы беларускай дзяржаўнасці / М.У. Сільчанка [і др.]. – Гродна, 1996.
21. 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. – Мінск, 1993.
22. Гісторыя Беларусі: у 2-х ч.: вуч. дап. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск, 1998. – Ч. 1.
23. Марзалюк, І. Міфы "адраджэнскай" гістарыяграфіі Беларусі / І. Марзалюк. – Магілеў, 2009.

24. Липешка, Б.М. Философия истории: белорусский контекст. Реминисценции. – Брест, 2009.
25. Наш Радавод. – Кн. 1 – 8. – Гродна, 1990 – 2000.
26. Беларусіка =Albaruthenica. – Т. 1 – 10. – Мінск, 1993, 2001 і др.
27. Карев, Д.В. Белорусская и украинская историография конца XIII – начала 20-х годов XX века: в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д.В. Карев. – Вильнюс, 2007. – С. 4 – 5.
28. Карев, Д.В. Белорусская историография на рубеже XX – XXI веков (старые проблемы и поиски новых решений) / Д.В. Карев // В кн.: XXI век: Актуальные проблемы исторической науки. – Минск: Издат. центр БГУ, 2004. – С. 154 – 157.
29. Белазаровіч, В.А. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: дапаможнік / В.А. Белазаровіч. – Гродна, 2006. – С. 305 – 327.
30. Каваленя, А.А. Метадалагічныя падыходы асвятлення навейшай гісторыі Рэспублікі Беларусь / А.А. Каваленя // Новейшая история (1991 – 2006): государство, общество, личность: материалы науч.-теоретич. конф., Минск, 29 сент. 2006 г. – Минск, 2006. – С. 78 – 84.
31. Кастюк, М.П. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі на мяжы стагоддзяў / М.П. Кастюк // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця: матэрыялы навук. канф., прысвеч. 70-годдзю Ін-та гісторыі НАН Беларусі, Мінск, 6 – 7 кастрычніка 1999 г. – Мінск, 2000. – С. 8 – 14.
32. Петриков, П.Т. Историческая наука // Наука Беларуси в XX ст. – Минск, 2001. – С. 69 – 91.
33. Корзенко, Г.В. Историки Беларуси в начале XXI ст.: Биобиблиографический справочник / Г.В. Корзенко. – Минск, 2007.
34. Шыбека, З. Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет: курс лекцый / З. Шыбека. – Вільня, 2009.
35. Белазаровіч, В.А. Арганізацыя гістарычнай навукі Беларусі (90-я гг. XX – пачатак XXI ст.) / В.А. Белазаровіч // Новейшая история (1991 – 2006): государство, общество, личность: материалы науч.-теоретич. конф., Минск, 29 сент. 2006 г. – Минск, 2006. – С. 529 – 534.
36. Минич, А.П. Научные исследования исторических факультетов вузов Республики Беларусь 90-е годы XX века / А.П. Минич // Веснік ГрДУ імя Я. Купалы. Серыя 1. – 2010. – № 1(91). – С. 22 – 29.
37. Карев, Д.В. Православная церковь и белорусское общество в белорусской историографической традиции новейшего времени (1918 – нач. XXI в.) / Д.В. Карев, А.А. Змитрукевич, А.Д. Карева // Веснік ГрДУ імя Я. Купалы. Серыя 1. – 2008. – № 3(72). – С. 61 – 69.
38. Карев, Д.В. Зарубежное белорусоведение в странах Западной Европы и Северной Америки (историографические и методологические аспекты проблемы) / Д.В. Карев, А.А. Змитрукевич, А.Д. Карева // Развитие методологических исследований и подготовка кадров историков в Республике Беларусь, Российской федерации и Республике Польша: сб. науч. ст.; под науч. ред. проф. А.Н. Нечухрина. – Гродно, ГрГУ, 2011. – С. 75 – 86.

*Поступила 07.05.2012*

## THE HISTORY OF BELARUS RESEARCH IN BELORUSSIAN HISTORIOGRAPHY FROM 1990TH TILL THE BEGINNING OF XX CENTURY

### (MAIN PROBLEMS AND TENDENCIES OF THE FEUDAL BELARUS HISTORY RESEARCH, BELORUSSIAN HISTORIOGRAPHY AND SOURCE STUDY)

***D. KAREV***

*The main stages and tendencies of development of the historical-culturological school of modern Belorussian historiography are detected. The questions of Belorussian feudalism, of the role of the Orthodox Church in the life of Belorussian society in XI – XX centuries are studied. The critical analysis of the problems of the modern historiography of the Great Lithuanian Principality and Belarus in the end of XX – beginning of XXI centuries is presented. Sociopolitical and ideological reasons, defining the specific character of the evolution of Belorusian historiographic views of the end of XX century, concerning the Orthodox Church history in history and culture of the Belorussian nation of the second millenium are defined.The main questions for the further study of historiography of the beginning of XXI century are indicated.*

**УДК 902/904**

# ЮВЕЛІРНЫЯ ЎПРЫГАЖЭННІ СТАРАЖЫТНАГА ПОЛАЦКА (X – XVII СТАГОДДЗІ)

***І.У. МАГАЛІНСКІ***
***(Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік)***

*Прадстаўлены вынікі даследавання ювелірных упрыгажэнняў X – XVII стагоддзяў з тэрыторыі Полацка. Аўтар адносіць прадметы да дзвюх храналагічных груп: канец X – XIII/XIV стагоддзі; XIV – XVII стагоддзі, у межах якіх вылучае ўпрыгажэнні, што былі зроблены пад уплывам іншаэтнічных тэхналагічных традыцый, імпартныя рэчы, а таксама прадметы мясцовай вытворчасці.*

Ювелірнае ўпрыгажэнне – гэта выраб з каштоўных і некаторых іншых каляровых металаў, часта ў спалучэнні з каштоўнымі камянямі, шклом, бурштынам і інш., які мацуецца да адзення ці апранаецца непасрэдна на цела чалавека і служыць галоўным чынам для задавальнення яго эстэтычных патрэб. Акрамя эстэтычнай функцыі пэўныя віды ювелірных упрыгажэнняў неслі сімвалічную і апатрапейную нагрузку, а таксама адыгрывалі функцыянальную ролю [1]. У дадзенай рабоце выкарыстоўваецца традыцыйны для гістарыяграфіі падзел ювелірных упрыгажэнняў на некалькі груп: 1) галаўныя ўпрыгажэнні; 2) нагрудныя ўпрыгажэнні; 3) упрыгажэнні рук; 4) розныя дэталі адзення.

**Асноўная частка**

Да групы **галаўных упрыгажэнняў** адносяцца скроневыя колцы, завушніцы і дэталь расны.

***Скроневыя колца*** – гэта ўпрыгажэнні жаночага галаўнога ўбору, якія мацаваліся каля скроняў. Яны падвешваліся на стужках ці рамянях, у некаторых выпадках прасоўваліся праз стужкі і рамяні, часта ўмацоўваліся непасрэдна ў валасах, а зрэдку выкарыстоўваліся як завушніцы [2 – 4]. Дадзены від ювелірных упрыгажэнняў з’яўляецца важнай этнавызначальнай прыкметай, на што звярталі ўвагу многія археолагі (А.А. Спіцын, А.У. Арцыхоўскі, В.П. Левашова і інш.) [5; 6, с. 44 – 45; 7, с. 7]. На тэрыторыі Полацка скроневыя колцы – дастаткова рэдкія знаходкі [8, с. 34]. Паводле марфалагічных адметнасцей яны падзяляюцца на некалькі тыпаў і падтыпаў (мал. 1). Найбольшай колькасцю ў калекцыі прадстаўлены дротавыя скроневыя колцы (10 экз.), якія падзяляюцца на пярсцёнкападобныя (9 экз.) і бранзалетападобныя (1 экз.) (гл. мал. 1: 4 – 8). Вырабы датаваныя канцом X – першай паловай XIII стагоддзя. Пры гэтым да найбольш старажытных артэфактаў адносяцца завязанаканечныя скроневыя колцы, якія датуюцца канцом X – пачаткам XI стагоддзя ( гл. мал. 1: 4 – 6). Акрамя дротавых вырабаў, на тэрыторыі Полацка сустрэты трохпацеркавае, шматпацеркавае, ілжэпацеркавае і сямілопаснае скроневыя колцы. Цікавасць выклікае залатое трохпацеркавае скроневае колца XII стагоддзя (мал. 1: 12). Падобныя вырабы ў літаратуры часта называюцца колцамі (ці “завушніцамі”) “кіеўскага” тыпу, што абумоўлена высокай частатой іх выяўлення ў кіеўскіх скарбах [6, с. 45]. Аднак апошнія даследаванні паказалі, што падобныя высокамастацкія ўпрыгажэнні не з’яўляюцца этнавызначальнай прыкметай палян, а адлюстроўваюць агульны ўзровень гарадскога рамяства [9, с. 65]. Трохпацеркавыя колцы атрымалі шырокае распаўсюджванне на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы з канца X – пачатку XI стагоддзя [10, с. 233]. Шматпацеркавыя скроневыя колцы з’яўляюцца этнавызначальнымі ўпрыгажэннямі племені водзь [11, с. 35; 12] (гл. мал. 1: 9). У Ноўгарадзе такія вырабы сустракаюцца ў слаях канца XIII – XIV стагоддзі [13, с. 14]. Найбольшая колькасць шматпацеркавых скроневых колцаў зафіксавана на Іжорскім плато – 108 экзэмпляраў. Пік іх папулярнасці прыпадае на XIII стагоддзе, аднак з’явіліся яны ўжо ў XII стагоддзі, а бытаваць працягвалі і ў XIV стагоддзі [14]. Два фрагменты сямілопасцевых скроневых колцаў былі выяўле-




Мал. 1

ны ў матэрыялах археалагічных даследаванняў на Верхнім замку ў слоі 30-х гадоў XX стагоддзя [15, с. 66] (гл. мал. 1: 11). Такія скроневыя колцы характэрны для матэрыяльнай культуры племені вяцічаў. Аналагічныя прадметы датуюцца XII – XIII стагоддзямі [16].

***Завушніцы.*** Пачынаючы з XIII стагоддзя на змену скроневым колцам прыйшлі завушніцы ў выглядзе пытальніка, а таксама кольцападобныя завушніцы [17, с. 18]. Полацкія ўпрыгажэнні прадстаўлены двума тыпамі (гл. мал. 1: 1 – 3). Завушніцы ў выглядзе пытальніка (3 экз.) уяўляюць сабою выгнуты металічны стрыжаь (дыяметр 0,1 см), на канцы якога замацавана пацерка (гл. мал. 1: 3). Падобныя вырабы знаходзяць у культурным слоі гарадоў Паўночна-Заходняй Русі пачынаючы з XIV стагоддзя [18]. У Ноўгарадзе завушніцы ў выглядзе пытальніка сустракаюцца ў напластаваннях XIV – XV стагоддзяў [13, с. 16]. У Пскове падобныя вырабы былі распаўсюджаны з XIV па XVIII стагоддзе [18]. У Літве яны датуюцца XIV – XVI стагоддзямі [19, с. 62 – 63]. Полацкія завушніцы датаваныя XVII – XVIII стагоддзямі. Аснову кольцападобных завушніц (3 экз.) складае невялікае металічнае незамкнутае колца (дыяметр 0,1 – 0,2 см), да якога падвешана некалькі прывесак (гл. мал. 1: 1 – 2). На тэрыторыі Літвы і Украіны такія прадметы сустракаюцца ў пахаваннях XIV – XVII стагодзяў [19, с. 58 – 60]. На Беларусі кольцападобныя завушніцы знойдзены ў Гродна, на могільніку каля в. Бірулі і інш. [20; 21]. Полацкія знаходкі датуюцца ў межах XV – XVII стагоддзяў.

***Расна.*** На тэрыторыі Верхняга замка ў слоі 30-х гадоў XIII стагоддзя была выяўлена невялікая крутарогая лунніца, упрыгожаная выемкавай эмаллю сіняга колеру [15, с. 71]. На думку Н.І. Наркевіч, дадзены артэфакт можна атаясамліваць з часткай расны [2]. Падобныя ўпрыгажэнні вядомыя ў старажытнасцях Ноўгарада і датуюцца XII – XIII стагоддзямі [13, с. 17].

Да **нагрудных упрыгажэнняў** адносяцца падвескі, шпількі, ланцугатрымальнікі і фібулы.

***Падвескі*** з’яўляліся неад’емнай часткай жаночага металічнага ўбору. Большая частка падвесак не проста служыла ў якасці ўпрыгажэння, але адыгрывала важную сімвалічную ролю [22, с. 153]. Круглыя манетападобныя падвескі з’яўляюцца найбольш распаўсюджаным тыпам нагрудных упрыгажэнняў. На тэрыторыі Полацка выяўлена восем такіх падвесак (мал. 2: 5 – 7). Паводле класіфікацыі Л.У. Пакроўскай, усе полацкія знаходкі адносяцца да некалькіх падтыпаў: 1) з розным арнаментам (5 экз.); 2) з выявай працвіўшага крыжа (1 экз.); 3) з выявай птушкі (1 экз.); 4) з выявай галавы быка (1 экз.) [23]. Усе прадметы датуюцца ў межах XII – XIII стагоддзяў. Вылучаюцца вырабы, упрыгожаныя раслінна-геаметрычным псеўдазярнёным арнаментам з салярнай сімволікай (40 – 50-я гады XIII ст.) [15, с. 69]. Цікавасць выклікае фрагмент падвескі з выявай роўнаканцовага крыжа з пашыранымі перакладзінамі [15, мал. 33: 5] (гл. мал. 2: 6). Аналагічны выраб быў знойдзены ў ювелірнай майстэрні ў Старой Разані, якая датуецца канцом XII – пачаткам XIII стагоддзя [24, с. 185]. Акрамя Полацка, на тэрыторыі Беларусі падвеска з роўнаканцовым крыжам выяўлена ў Друцку [25, мал. 37: 17]. У слоі 40 – 50-х гадоў XIII стагоддзя знойдзена падвеска з выявай працвіўшага крыжа [15, мал. 34: 15]. Гэты арнаментальны матыў атрымаў папулярнасць у XII – XIII стагоддзях [9, с. 67]. На думку даследчыкаў, выкарыстанне дадзенага арнаменту з’яўляецца вынікам капіравання майстрамі дэкору медальёнаў дарагіх княжацкіх брам [26, табл. VII: 7]. Пінчук Н.С. лічыць, што ўзор на дадзеных падвесках мае раслінны арнамент, не звязаны з хрысціянскай сімволікай [27]. Тыпалагічна блізкая падвеска паходзіць з Віцебска і датуецца XII стагоддзем [28, с. 76 – 77]. Упрыгажэнне з выявай птушкі прадстаўлена бракам адліўкі, які быў знойдзены ў слоі 40 – 50-х гадоў XIII стагоддзя [15, с. 69]. Аналагічны выраб выяўлены ў Віцебску ў слоі першай паловы XII стагоддзя [28, с. 76]. Дадзеная іканаграфічная схема, як адзначае К.А. Лавыш, уласціва для візантыйскага мастацтва [29]. У слоі XII стагоддзя выяўлена падвеска з выявай галавы быка [15, с. 69, мал. 34: 21]. Такія вырабы канцэнтруюцца ў арэале радзімічаў, але сустракаюцца таксама ў Цэнтральнай Беларусі, у нізоўях Заходняй Дзвіны, на Смаленшчыне, у Пскоўскай і Наўгародскай землях. Падвескі датаваныя XI – XII стагоддзямі і маюць фіна-ўгорскае ці балцкае паходжанне [30; 31]. Існуе некалькі інтэрпрытацый семантыкі выяў на такіх падвесках. На думку Э.М. Зайкоўскага, гэтыя вырабы з’яўляліся




Мал. 2

атрыбутам язычніцкіх жрацоў і звязаныя з уяўленнямі пра замагільнае жыццё, а таксама адлюстроўваюць іерархічную будову гадавога календара [32]. Іншыя даследчыкі выказваюць асцярожную думку аб сувязі дадзеных падвесак са старажытнымі татэмнымі культамі [22, с. 156 – 157].

Вялікае значэнне мае даследаванне язычніцкіх амулетаў у выглядзе стылізаваных выяў жывёл ці мініяцюрных прадметаў быту і зброі (18 экз.) (гл. мал. 2: 8 – 9). Выкарыстанне гэтай групы прадметаў варта разглядаць у якасці сведчанняў моцных язычніцкіх традыцый у асяроддзі мясцовага насельніцтва. Характэрнай асаблівасцю матэрыяльнай культуры лясной паласы Усходняй Еўропы з'яўляецца наяўнасць выяў розных жывёл і птушак, выкананых з металу [33, с. 88]. На тэрыторыі Полацка знойдзены плоскія праразныя падвескі-конікі (2 экз.), якія можна датаваць у межах XI – XIII стагоддзяў, а таксама падвеска-качка X – XII стагоддзяў. Амулеты ў выглядзе мініяцюрных прадметаў быту і зброі (15 экз.) адлюстроўвалі вельмі архаічны пласт народных уяўленняў, выконвалі апатрапейную і сімвалічную функцыі, з'ўляліся важным элементам ювелірнага ўбору [34]. Сярод прадметаў дадзенай катэгорыі ў полацкім матэрыяле сустрэты падвескі ў выглядзе лыжачак, грэбня і сякерак, якія датуюцца ў межах XI – XII стагоддзяў.




Мал. 3

Асобным тыпам падвесак з'яўляюцца бразготкі – пустацелыя металічныя шарыкі з кавалачкам металу ўсярэдзіне. Бразготкі адрозніваюцца поліфункцыянальнасцю і маглі насіцца ў складзе караляў, паясных ці нагрудных падвесак, выкарыстоўвацца ў якасці гузікаў, аздобы адзення, музычных інструментаў і інш. [35]. Бразготкі ў полацкай калекцыі прадстаўлены некалькімі падтыпамі (мал. 3: 1 – 8). Грушападобныя крыжапраразныя званочкі шырока прадстаўлены ў полацкай калекцыі (17 экз.). Памеры цэлых экзэмпляраў (з вушкам) вагаюцца ад 1,1 × 2,1 см да 1,8 × 2,8 см. Ніжняя частка большасці званочкаў упрыгожана касымі насечкамі, абмежаванымі двума паралельнымі ўразнымі лініямі (гл. мал. 3: 1, 2, 4). Прадметы датаваныя XI – XII стагоддзямі. Званочкі дадзенага падтыпу найбольш актыўна выкарыстоўваліся ў XI стагоддзі, аднак ужываліся на працягу X – XII стагоддзяў [35; 36, с. 136]. На тэрыторыі Беларусі падобныя ўпрыгажэнні знойдзены на гарадзішчы Маскавічы, у Ваўкавыску, Віцебску. Прадметы датаваныя XI – XIV стагоддзямі [37; 38, с. 48; 28, с. 75]. Шарападобныя аднапраразныя бразготкі ў полацкай калекцыі прадстаўлены 17 экзэмплярамі, большая частка якіх захавалася фрагментарна (гл. мал. 3: 7, 8). Артэфакты датуюцца XII – XII стагоддзямі.

***Шпількі*** традыцыйна лічацца элементам касцюма заходнебалцкіх плямён, аднак актыўна выкарыстоўваліся і заходнефінскімі плямёнамі (эсты, водзь) [39; 40]. На тэрыторыі Полацка знойдзены два фрагменты шпілек. Найбольшую цікавасць мае фрагмент крыжападобнай шпількі з так званымі "карамыслападобнымі лопасцямі" (гл. мал. 2: 4); яе галоўка плоская, упрыгожаная рэльефнымі акружнасцямі і выпуклай паўсферай у цэнтры [8, мал. 56: 6]. У Латвіі і Літве падобныя вырабы сустракаюцца пачынаючы з VII – VIII стагоддзяў [41]. У Ноўгарадзе тры такія шпількі знойдзены ў слоі XI стагоддзя, у Віцебску – у слоі XII стагоддзя [13, с. 73; 28, с. 78]. Полацкая знаходка датаваная XI стагоддзем [8, с. 34]. Дадзены артэфакт А.А. Башкоў лічыць крыжом-цельнікам і датуе яго XIII стагоддзем [42, с. 24]. Сапраўды, у археалагічным матэрыяле вядомы знаходкі крыжападобных шпілек, якія былі прыстасаваныя для выкарыстання ў якасці хрысціянскіх сімвалаў [43, с. 183]. Між тым полацкі артэфакт не мае слядоў прыстаса-

вання шпількі для іншых мэт. Яшчэ адзін фрагмент крыжападобнай шпількі з'яўляецца выпадковай знаходкай. Прадмет моцна фрагментаваны і ўяўляе сабой галоўку ажурнай крыжападобнай шпількі. Падобныя ўпрыгажэнні сустракаюцца ў матэрыяльнай культуры эстаў [44]. Аналагічныя шпількі знойдзены ў Ноўгарадзе, Наваградку і інш. Прадметы датаваныя XII стагоддзем [13, с. 73; 45, с. 11 – 12]. Гэтым часам трэба датаваць і полацкую знаходку. Акрамя крыжападобных шпілек на тэрыторыі Полацка знойдзена шпілька з кольцападобнай рухомай галоўкай (гл. мал. 2: 3). Прадмет паходзіць з матэрыялаў раскопак на Вялікім пасадзе ў 1987 – 1988 гадах. Падобныя шпількі на тэрыторыі Ноўгарада датуюцца XII – сярэдзінай XIII стагоддзя [13, с. 75, 77]. Аналагічныя знаходкі вядомы ў Лукомлі і Віцебску, яны датаваныя XII – XIII стагоддзямі [46, с. 74; 28, с. 78 – 79]. Полацкая знаходка паходзіць са слою XII стагоддзя [8, с. 34]. Даследчыкі ювелірных упрыгажэнняў старажытнага Ноўгарада не выключаюць, што дадзены тып шпілек мог з'яўляцца прадукцыяй наўгародскіх ювеліраў [41; 13, с. 77].

***Ланцугатрымальнікі*** – гэта ўпрыгажэнні, якія ў асноўным ужываліся ў касцюме балтаў і прыбалтыйскіх фінаў для мацавання ланцужкоў і падвесак. У Паўночна-Заходніх раёнах Наўгародскай зямлі дадзеныя вырабы маглі выкарыстоўвацца ў якасці самастойных упрыгажэнняў [40]. Падчас археалагічных раскопак на тэрыторыі Полацка знойдзены два арачных ланцугатрымальнікі. Адзін з іх паходзіць з матэрыялаў археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Вялікага пасада ў 2009 годзе і датуецца XI – XIII стагоддзямі (гл. мал. 2: 2). Прадмет упрыгожаны цыркульным арнаментам [47]. Падобныя ланцугатрымальнікі атрымалі распаўсюджванне ў балтаў і прыбалтыйскіх фінаў. Вядомыя такія вырабы і на тэрыторыі Наўгародскай зямлі [40; 48, табл. VII: 5]. Цікавасць выклікае фрагмент арачнага ажурнага ланцугатрымальніка, які знойдзены падчас археалагічных раскопак на Верхнім замку (гл. мал. 2: 1). Прадмет выяўлены ў перадмацерыковым слоі і датуецца XI – XII стагоддзямі [49, с. 9]. Дадзеная форма ланцугатрымальнікаў, як адзначае Я.А. Рабінін, была выпрацавана ў славянскім асяроддзі і выкарыстоўвалася ў якасці асновы для кампаноўкі амулетаў старажытнымі майстрамі [50].

***Фібулы*** – гэта ўпрыгажэнні, якія ўжываліся для зашпільвання адзення. Дадзеныя прыстасаванні выкарыстоўваліся як у мужчынскім, так і ў жаночым касцюме [51, с. 149]. Падковападобныя і кольцападобныя засцежкі-фібулы з'яўляліся ўпрыгажэннямі балтаў і фіна-ўграў. У славянскіх помніках яны сустракаюцца там, дзе славянскае насельніцтва кантактавала з гэтымі народамі (паўночны захад і паўночны ўсход Русі) [51, с. 150; 52]. У полацкай калекцыі колькасна пераважаюць падковападобныя фібулы (26 экз.). Падковападобныя спіралеканечныя засцежкі прадстаўлены ўпрыгажэннямі з круглым (8 экз.), паўкруглым (2 экз.), трохвугольным (7 экз.) і фігурным (2 экз.) сячэннем дужкі [8, мал. 57: 4 – 8; 15, 18]. Асноўная колькасць такіх засцежак датаваная ў межах X – XIII стагоддзяў. Акрамя спіралеканечных фібул у полацкай калекцыі захоўваюцца засцежкі са шматграннымі галоўкам, датаваныя X – XI стагоддзямі; з зааморфнымі галоўкамі X – XIII стагоддзямі; з галоўкамі ў выглядзе макавых каробачак – XI – XII стагоддзямі; фрагмент фібулы з дугой, патоўшчанай у сярэдняй частцы, які адносіцца да XI – XIII стагоддзяў.

Менш распаўсюджаным тыпам засцежак у параўнанні з падковападобнымі з'яўляюцца кольцападобныя фібулы. Яны рэдка сустракаюцца ў матэрыялах X – XI стагоддзяў, найбольшую папулярнасць атрымалі ў XII – XIV стагоддзях [51, с. 168]. На тэрыторыі Полацка знойдзены дзве фібулы гэтага тыпу. Адзін прадмет з'яўляецца выпадковай знаходкай. На тэрыторыі Прыбалтыкі такія фібулы датуюцца ў межах XIII – XIV стагоддзяў [53; 13, с. 91]. Найбольшую цікавасць выклікае кольцападобная фібула, якая была выяўлена падчас археалагічных даследаванняў у 1961 годзе на Верхнім замку. Прадмет датуецца 50 – 60 гадамі XIII стагоддзя. Частка засцежкі ўпрыгожана геаметрычным арнаментам, што складаецца з трохвугольнікаў, кропак і касых штрыхоў [15, с. 71, мал. 33: 12]. Аналагічныя знаходкі вядомыя ў Ноўгарадзе, Карэліі, Прыбалтыцы (датаваныя часам каля 1300 г.) [13, с. 89]. Характар апрацоўкі полацкай фібулы дазваляе казаць, што перад намі не гатовы выраб, а яго нарыхтоўка. Гэта пацвярджаецца яшчэ і тым фактам, што прадмет быў знойдзены падчас даследавання рэшткаў вытворчага ювелірнага комплексу (сядзіба 7М (№ 14 паводле палявой дакументацыі)) [54].

Група **ўпрыгажэнняў рук**, у склад якой уваходзяць пярсцёнкі і бранзалеты, з'яўляецца самай шматлікай сярод іншых полацкіх упрыгажэнняў.

***Пярсцёнкі*** – упрыгажэнне, якое надзяваюць на пальцы рук. У старажытнасці пярсцёнкі насілі часцей жанчыны, іншы раз мужчыны і дзеці [55]. У аснову сістэматызацыі полацкіх пярсцёнкаў пакладзена тыпалагічная схема, распрацаваная Т.Г. Сарачавай і дапоўненая Л.П. Міхайлік на аснове знаходак з Кіева і дняпроўскага левабярэжжа [56; 57]. Пярсцёнкі, якія складаюцца з дужкі, прадстаўлены 55 экзэмплярамі. Сярод вырабаў дадзенага тыпу можна вылучыць пласцінчатыя шырокасярэдзінныя пярсцёнкі (7 экз.). Іх адметнасцю з'яўляецца пашыраная сярэдняя частка і звужаныя канцы. Асобныя пярсцёнкі ўпрыгожаны геаметрычным арнаментам у выглядзе трохвугольнікаў і кропак, астатнія прадметы – гладкія (мал. 4: 11 – 13). Мясцовая вытворчасць гэтых вырабаў пацвярджаецца знаходкай нарыхтоўкі пярсцёнка ў раскопе на Верхнім замку [15, мал. 34: 24]. Вырабы датаваныя ў межах XI – XIII стагоддзяў. Вузкапласцінчатыя пярсцёнкі (14 экз.) маюць аднолькавую шырыню на працягу ўсёй пласціны, якая не выходзіць за межы

0,3 – 0,7 см. Асноўная маса полацкіх артэфактаў дадзенага падтыпу датуецца XI – XIII стагоддзямі. Адно ўпрыгажэнне знойдзена ў слоі XVII стагоддзя [47]. Простых дротавых пярсцёнкаў на тэрыторыі Полацка выяўлена 17 экзэмпляраў (гл. мал. 4: 1 – 4). Гэтыя ўпрыгажэнні атрымалі шырокае распаўсюджванне ў X – XII стагоддзях, аднак сустракаюцца таксама ў матэрыялах XIII стагоддзя [58, с. 264]. Падчас археалагічных даследаванняў простыя дротавыя пярсцёнкі знойдзены на Верхнім замку (6 экз.), Вялікім пасадзе (5 экз.), Запалоцкім пасадзе (1 экз.). Упрыгажэнні датуюцца ў межах XI – XIII стагоддзяў [15, с. 66; 8, с. 34]. Пярсцёнкі прадстаўлены замкнутымі і незамкнутымі вырабамі. На Беларусі простыя дротавыя пярсцёнкі знойдзены падчас раскопак у Віцебску, Ваўкавыску, Брэсце і інш., дзе датуюцца XI – XIII стагоддзямі [28, с. 80; 38, с. 48; 59, с. 264]. З Полацка паходзяць пяць вітых пярсцёнкаў, з іх 3 выпадковыя знаходкі (гл. мал. 4: 5 – 7, 18). Паводле колькасці дротаў вылучаюцца два варыянты ўпрыгажэнняў. Двухдротавыя пярсцёнкі (3 экз.), датаваныя ў межах XI – XIII стагоддзяў [60, с. 58]. Вялікую цікавасць выклікае знаходка залатога двухдротавага пярсцёнка з завязанымі канцамі, упрыгожанага сканнай перавіццю (гл. мал. 4: 18). Прадмет знойдзены В.А. Булкіным падчас даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка (раскоп № 3 у паўднёва-ўсходнім вуглу Сафійскага сабора) ў 1978 годзе. Падобныя прадметы бытавалі з другой паловы XI стагоддзя да XIII стагоддзя, пры гэтым найбольш часта сустракаюцца ў Прыбалтыцы, Фінляндыі і Скандынавіі, аднак вядомыя ў старажытнасцях палян, драўлян, северан і інш. [58, с. 263; 13, с. 125]. Полацкі пярсцёнак паходзіць з перадмацерыковага слою і датуецца другой паловай XI стагоддзя [61, с. 7]. Трохдротавыя пярсцёнкі (4 экз.) датуюцца XII – XIII стагоддзямі (гл. мал. 4: 5, 6). Ілжэвітыя ўпрыгажэнні знойдзены ў Полацку ў колькасці пяці экзэмпляраў, якія датаваныя XII – XV стагоддзямі. З тэрыторыі горада паходзяць пяць плеценых пярсцёнкаў, якія адносяцца да двух варыянтаў. Упрыгажэнні з плеценай сярэдняй часткай (3 экз.) бытавалі ў XII – XIV стагоддзях [13, с. 127] (гл. мал. 4: 8; 17). Суцэльнаплеценыя пярсцёнкі (2 экз.) датуюцца ў межах XI – XIII стагоддзяў. Адзіны ілжэплецены пярсцёнак знойдзены падчас раскопак на Верхнім замку ў слоі 60-х гадоў XIII стагоддзя [15, с. 67]. Трэба адзначыць, што ў Полацку ў межах вытворчага ювелірнага комплексу XIII стагоддзя была выяўлена створка адмысловай глінянай ліцейнай формы для адліўкі пярсцёнкаў з імітацыяй пляцення ў сярэдняй частцы [62].




Мал. 4

У асобны тып вылучаюцца пярсцёнкі са шчытком (24 экз.). Галоўны канструктыўны элемент пярсцёнкаў гэтага тыпу – шчыток (гл. мал. 4: 14, 15, 16, 20). Паводле яго формы і характару арнаментацыі вылучаюцца асобныя падтыпы і варыянты ўпрыгажэнняў. Дужка пярсцёнкаў з плоскім пласцінчатым ці плоскім аб'ёмным шчытком, які знаходзіцца ў адной плоскасці з дужкай (20 экз.), пласцінчатая (разамкнутая ці замкнутая). Форма шчыткоў у прадольным сячэнні розная: авальная, круглая, шматгранная. Частка шчыткоў неарнаментаваная, на астатніх арнаментацыя складаецца з геаметрычных і зааморфных выяў. На большай частцы полацкіх пярсцёнкаў гэтага падтыпу арнамент зацёрты і не чытаецца. Пярсцёнкі з авальным шчытком (13 экз.) датуюцца дастаткова шырока – у межах XII – XVIII стагоддзяў. Упрыгажэнні з круглым шчытком (4 экз.) паводле аналогій датуюцца ў межах другой паловы XII – пачатку XV стагоддзя [13, с. 132]. Пярсцёнкі са шматграннымі шчыткамі (шасці- і васьмігранныя) (4 экз.) можна датаваць XII – XIV стагоддзямі [13, с. 136; 63, мал. 65: 5, 6, 13; 64, табл. 7: 2, 3; 57]. Пярсцёнкі з

пукатым аб'ёмным шчытком (4 экз.) адносяцца да асобнага падтыпу (гл. мал. 4: 16, 20). Тры прадметы датаваныя XIII стагоддзем. Яшчэ адзін фрагмент з'яўляецца выпадковай знаходкай і ўтрымлівае на шчытку трохрадковы надпіс (гл. мал. 4: 20). Выраб мае блізкія аналогіі ў Суздалі, дзе падобныя прадметы датуюцца XV стагоддзем [65]. Пярсцёнкі са ўстаўкамі (7 экз.) складаюцца з дужкі і аправы [57]. Форма аправы полацкіх пярсцёнкаў гэтага тыпу розная: квадратная, круглая, фігурная. Падчас археалагічных даследаванняў выяўлена тры пярсцёнкі, якія маюць круглую аправу і шкляныя ўстаўкі.

Два прадметы з раскопак Г.В. Штыхава на Верхнім замку датаваныя мяжой XII – XIII стагоддзяў [15, с. 67]. Залаты пярсцёнак (гл. мал. 4: 19), які быў знойдзены падчас археалагічных даследаванняў Г.М. Сагановіча на тэрыторыі Вялікага пасада, датаваны XII стагоддзем [66, с. 7]. Аналагічныя вырабы сустрэты ў Ноўгарадзе, Кіеве, на гарадзішчы Маскавічы. Прадметы датуюцца ў межах XII – XIV стагоддзяў [13, с. 139 – 141; 57; 60, с. 59].

***Бранзалеты*** – упрыгажэнні для рук, пераважна кольцападобнай альбо блізкай да яе формы. Насілі іх на запясці, а часам вышэй локця [67]. У гістарыяграфіі традыцыйна прынятая тыпалогія бранзалетаў, распрацаваная А.У. Арцыхоўскім і дапоўненая В.П. Левашовай і М.В. Сядовай [6, с. 8 – 9; 68, с. 207 – 247; 13, с. 93].




Мал. 5

Да асобнага тыпу належаць дротавыя бранзалеты (10 экз.). У дадзены тып залічваюцца ўпрыгажэнні, зробленыя з адрэзка тоўстага дроту (мал. 5: 2). Паводле сячэння дротавыя бранзалеты падзяляюцца на тры падтыпы: кругладротавыя (6 экз.), з трохвугольным сячэннем (3 экз.), чатырохгранныя (1 экз.). Прадметы датаваныя ў межах X – XIV стагоддзяў. Вітыя бранзалеты (6 экз.) зробленыя з нарыхтоўкі, якая была звіта з 2 – 3 дротаў (мал. 5: 1). Датуюцца полацкія вырабы XI – XIV стагоддзямі [68, с. 216 – 224; 13, с. 94, 96 – 97]; трохдротавыя петлеканечыя (2 экз.) бранзалеты – XIII стагоддзем [15, с. 67].

Адзін прадмет паходзіць з матэрыялаў раскопак пад кіраўніцтвам Г.В. Штыхава на Верхнім замку, а другі бранзалет быў знойдзены падчас археалагічнага нагляду А.А. Салаўёва за землянымі работамі на тэрыторыі паўночнай частткі Запалоцкага пасаду (раён вул. Ф. Міронавай) [69]. Яшчэ адзін фрагмент падобнага ўпрыгажэння паходзіць з прыватнай калекцыі і з'яўляецца выпадковай знаходкай.

Сярод вітых бранзалетаў дадзены падтып упрыгажэнняў найбольш распаўсюджаны. У матэрыялах Ноўгарада найбольш раннія вырабы, датаваныя XI стагоддзем, а самыя позні вядомы ў складзе Белеўскага скарбу і слаях Ноўгарада XIV стагоддзя [13, с. 94, 96; 68, с. 222]. Акрамя таго, падобныя бранзалеты вядомыя на тэрыторыі Беларусі (гарадзішча Маскавічы) і Латвіі (Асоцкае гарадзішча) [60, с. 56; 70, с. 32]. Лічыцца, што дадзеныя ўпрыгажэнні найбольш характэрныя для тэрыторыі вяцічаў [6, с. 14 – 17].

Двухдротавыя абрубленаканечныя бранзалеты прадстаўлены адным прадметам, які паходзіць з полацкага скарбу залатых рэчаў другой паловы X стагоддзя. Вітыя абрубленаканечныя бранзалеты з'яўляюцца этнавызначальнай прыкметай наўгародскіх славен [68, с. 220].

У Ноўгарадзе вітыя двухдротавыя бранзалеты сустракаюцца ў матэрыялах XI – XIII стагоддзяў. Вядомы знаходкі падобных упрыгажэнняў разам з матэрыяламі X стагоддзя [13, с. 97]. На тэрыторыі Беларусі двухдротавыя абрубленаканечныя бранзалеты сустрэты ў курганных магільніках каля вёсак Чарневічы і Укля X – XII стагоддзяў [60, с. 16, 56]. Двухдротавы сплюшчанаканечны бранзалет прадстаўлены знаходкай з раскопак М.В. Клімава на Запалоцкім пасадзе. Прадмет датаваны XI – XIII стагоддзямі [47]. Падобныя вырабы рэдка сустракаюцца на тэрыторыі Паўночна-Заходняй і Паўночна-Усходняй

Русі, дзе датуюцца XI – пачаткам XIII стагоддзя [68, с. 222]. Да тыпу ілжэвітых адносяцца бранзалеты, якія імітуюць віццё, хаця зроблены з выкарыстаннем іншай тэхнікі (гл. мал. 5: 4, 5). У Полацку знойдзены тры такія ўпрыгажэнні, якія захаваліся фрагментарна. Мяркуючы па наяўным фрагментам, два прадметы адносіліся да найбольш распаўсюджанага варыянта ілжэвітых бранзалетаў са звужанымі канцамі. Падобныя вырабы атрымалі найбольшае распаўсюджванне ў XI – XIV стагоддзях [13, с. 98]. На Беларусі такія ўпрыгажэнні знойдзены ў Брэсце ў слаях XII – XIV стагоддзяў, а таксама ў Віцебску і Ваўкавыску ў слоі XII стагоддзя [59, с. 263; 38, с. 47; 71]. Адзін полацкі бранзалет паходзіць са слою XI – XII стагоддзяў (прадмет знойдзены падчас раскопак на Запалоцкім пасадзе), другі выраб з'яўляецца выпадковай знаходкай [72]. Плеценыя бранзалеты рабіліся рознымі спосабамі з некалькіх дротаў (мал. 5: 3). На тэрыторыі Полацка знойдзены два ўпрыгажэнні гэтага тыпу. Тыпалагічна блізкія прадметы, але сплеценыя з сямі дротаў, сустракаюцца ў слаях XI – XV стагоддзяў у Ноўгарадзе. У Брэсце плецены бранзалет знойдзены ў напластаваннях XIII стагоддзя [13, с. 100; 59, с. 263]. Плецены з чатырох дротаў бранзалет паходзіць з полацкага скарбу залатых рэчаў і датуецца другой паловай X стагоддзя. Характар вырабу дазваляе меркаваць, што прадмет быў зроблены з вітой шыйнай грыўні. Падобныя знаходкі вядомыя ў Бранскай вобласці (Расія), датуюцца XI стагоддзем [68, с. 228].

Створкавыя бранзалеты (наручы) (4 экз.) складаюцца з дзвюх шырокіх створак, якія злучаюцца паміж сабой пры дапамозе шарніра. Гэтыя вырабы з'явіліся ў XII стагоддзі ў якасці выключна гарадскога ўпрыгажэння і праіснавалі да XIV стагоддзя [13, с. 116]. На тэрыторыі Полацка знойдзена тры фрагменты створкавых бранзалетаў і адна нарыхтоўка. Падчас раскопак М.К. Каргера на Верхнім замку выяўлены два фрагменты шырокіх бранзалетаў-наручаў. Адзін прадмет упрыгожаны ціснёным арнаментам, другі адліты ў імітацыйнай ліцейнай форме, на што ўказвае раслінны арнамент, выкананы несапраўднай зернню. Датуюцца прадметы XIII стагоддзем [15, с. 67, 69]. Яшчэ адзін фрагмент створкавага бранзалета з'яўляецца выпадковай знаходкай, датаваць прадмет трэба, паводле вядомых аналогій, XII – XIV стагоддзямі. Падчас раскопак 1987 года на Вялікім пасадзе была адкрыта ювелірная майстэрня XII – XIII стагоддзяў [73]. Сярод матэрыялаў, атрыманых падчас яе вывучэння, была выяўлена нарыхтоўка ці брак вытворчасці створкавага бранзалета, што з'яўляецца пацвярджэннем мясцовага вырабу ўпрыгажэнняў дадзенага тыпу [8, мал. 54]. На тэрыторыі Беларусі створкавыя бранзалеты былі знойдзены ў Пінску, Гродне, Слоніме, Друцку, на гарадзішчы Вішчын у слаях XI – XIII стагоддзяў [74, с. 393, 395; 75, мал. 33].

Пласцінчатыя бранзалеты (13 экз.) маюць у сячэнні форму моцна выцягнутага прамавугольніка. Паводле спосабу афармлення канцоў пласцінчатыя бранзалеты падзяляюцца на некалькі падтыпаў: тупаканечныя (7 экз.), загнутаканечныя (3 экз.), вузкапласцінчатыя з разамкнутымі канцамі (1 экз.), пуката-ўвагнутыя бранзалеты (1 экз.), з пуката-ўвагнутым валікам усярэдзіне (1 экз.) (гл. мал. 5: 6). Вырабы магчыма датаваць у межах X – XIII стагоддзяў. У асобны тып залічваюцца вузкамасіўныя бранзалеты (3 экз.), якія маюць у сячэнні форму сегмента, авала ці трохвугольніка. Усе полацкія бранзалеты гэтага тыпу літыя, некаторыя ўпрыгожаны адмысловым чаканным арнаментам. Два прадметы знойдзены ў слаях сярэдзіны XIII стагоддзя, яшчэ адзін прадмет датаваны канцом X – першай паловай XI стагоддзя [15, с. 67]. Аналагічныя артэфакты датуюцца ў межах XI – XIII стагоддзяў [13, с. 112].

У асобны тып неабходна вылучыць бранзалеты, канцы якіх маюць завяршэнне ў выглядзе стылізаваных выяў жывёл (6 экз.) (гл. мал. 5: 7 – 8). Паводле сячэння такія бранзалеты падзяляюцца на пласцінчатыя і плоскавыпуклыя. Пласцінчатыя звярынагаловыя бранзалеты з Полацка прадстаўлены адным гатовым вырабам, адным прадметам, незавершаным апрацоўкай, і трыма нарыхтоўкамі. Акрамя пласцінчатых звярынагаловых бранзалетаў у полацкай калекцыі захоўваецца яшчэ чатыры ўпрыгажэнні, якія маюць у сячэнні форму сегмента (плоскавыпуклыя). Канцы бранзалетаў упрыгожаны стылізаванымі выявамі жывёл, а паверхня прадметаў пакрытая чаканным арнаментам у выглядзе крыжыкаў, квадратаў і кружкоў. Звярынагаловыя бранзалеты сустракаюцца ў матэрыялах X – XIII стагоддзяў. Дадзеныя ўпрыгажэнні найбольш характэрныя для балтаў. У X стагоддзі яны распаўсюдзіліся з Прыбалтыкі на тэрыторыі, заселеныя славянамі і фінамі [76]. На Беларусі звярынагаловыя бранзалеты сустрэты ў Ваўкавыску ў слоі XIII стагоддзя, Віцебску – у слоі XII – XIII стагоддзяў, на курганным могільніку Дзмітраўшчына XI – XII стагоддзяў і інш. [38, с. 46; 28, с. 80; 77].

Да групы **розных дэталяў адзення** адносім вырабы, якія не ўвайшлі ў папярэднія групы, але з'яўляюцца важнымі элементамі адзення старажытнага насельніцтва Полацка.

***Шпількі "пус епі".*** У калекцыі археалагічных матэрыялаў, выяўленых на тэрыторыі Полацка, значную частку складаюць шпількі "пус епі" (гл. мал. 3: 21 – 26). На сённяшні дзень у фондах НПГКМЗ захоўваецца 136 шпілек гэтага тыпу. Асновай класіфікацыі шпілек з'яўляецца форма галоўкі [78]. Паводле гэтай прыкметы вылучаюцца некалькі тыпаў шпілек: з галоўкай, утворанай накручваннем дроту (109 экз.); з суцэльнаметалічнымі галоўкамі (22 экз.); з галоўкай у выглядзе пытальніка (3 экз.); цвікападобныя (2 экз.). Асноўная колькасць шпілек "пус епі" канцэнтруецца ў раскопе 2005 года, дзе былі знойдзены рэшткі

вытворчага ювелірнага комплексу першай паловы XVII стагоддзя. Паходжанне дадзенай катэгорыі знаходак варта звязваць з Заходняй Еўропай, дзе яны з'явіліся ўжо ў XIII стагоддзі.

***Гузікі.*** Усе гузікі падзяляюцца на некалькі тыпаў: 1) стрыжнёвыя (кастыльковыя) (2 экз.); 2) шарападобныя (18 экз.); 3) біканічныя (3 экз.); 4) канічныя (8 экз.) [79] (гл. мал. 3: 10 – 14). Кастыльковыя гузікі часцей за ўсе рабіліся з косці ці дрэва. Полацкія літыя металічныя засцежкі гэтага тыпу прадстаўлены дзвюма выпадковымі знаходкамі. Памеры прадметаў – 3,0 × 0,5 × 0,5 і 3,3 × 0,5 × 0,5 см адпаведна. Аналагічныя артэфакты выяўлены ў Белавозеры, а таксама ў Балгары, прадметы датаваныя XI – XIII стагоддзямі [80, с. 192]. Больш частымі знаходкамі з'яўляюцца шарападобныя гузікі. Усе полацкія артэфакты, за выключэннем трох знаходак, цэльналітыя, адлітыя ў двухбаковай раздымнай форме (на большасці экзэмпляраў захаваліся ліцейныя швы). Яшчэ тры прадметы спаяны з двух ціснёных частак, дротавае вушка прыпаянае асобна. Даўжыня шарападобных гузікаў 1,3 – 1,5 см, дыяметр вагаецца ад 0,6 да 0,9 см. Выяўленыя падчас археалагічных даследаванняў гузікі датаваныя XI – XIII стагоддзямі [15, с. 71; 74]. Аналагічныя знаходкі вядомы ў Ноўгарадзе, Ваўкавыску, на гарадзішчы Маскавічы. Прадметы датаваныя XI – XV стагоддзямі [13, с. 155; 38, мал. 13: 21; 60, мал. 31: 5]. Канічныя і біканічныя гузікі знаходзяць прамыя аналогіі ў матэрыялах Ноўгарада, Белавозера, Мінскага археалагічнага комплексу, дзе датуюцца ў межах XI – XIII стагоддзяў [13, с. 155; 80, с. 192].

***Грузікі.*** Значную частку (105 экз.) археалагічнай калекцыі вырабаў з каляровых металаў складаюць свінцовыя грузікі (гл. мал. 3: 15 – 20). Функцыянальнае прызначэнне падобных прадметаў да гэтага часу выклікае спрэчкі. Даследчыкі схіляюцца да вызначэння іх у якасці зашпілек верхняй футравай вопраткі ці праселак [13, с. 158]. Некаторыя навукоўцы называюць гэтыя вырабы "грузікамі-пломбамі", якія маглі ўжывацца падчас безманетнага перыяду ў таварна-грашовым абарачэнні [81, с. 32]. Тыпалогія грузікаў распрацаваная М.В. Сядовай і дапоўненая Ю.М. Лесманам [13, с. 158; 82, с. 61 – 64]. Паводле формы вылучаюцца некалькі датуючых тыпаў такіх вырабаў: 1) канічныя (102 экз.); 2) дыскапаобныя (2 экз.). Сярод вырабаў першага тыпу можна вылучыць: неарнаментаваныя грузікі (46 экз.); з арнаментам у выглядзе рэльефных зерняў (1 экз. ); з рэльефнымі валікамі (50 экз.); з арнаментам, блізкім да шматпялёсткавай разеткі (5 экз.).

Асноўная частка полацкіх грузікаў з'яўляецца пад'ёмным матэрыялам. Толькі 11 артэфактаў паходзяць з матэрыялаў археалагічных даследаванняў: 1) Верхні замак (даследаванні М.К. Каргера і Г.В. Штыхава) – 4 экз. (датаваныя XIII ст.); 2) Вялікі пасад (даследаванні Д.У. Дука) – 11 экз. (прадметы можна датаваць XI – XIII стст.); 3) Запалоцкі пасад (даследаванні Д.У. Дука) – 7 экз. (датаваныя XI – XIII стст.) [15, мал. 18: 6; 83, с. 10; 84, с. 11]. У сістэме датуючых тыпаў наўгародскіх упрыгажэнняў Ю.М. Лесмана неарнаментаваныя канічныя грузікі датаваныя часам пасля 1006 года; вырабы з рэльефнымі валікамі – 989 – 1197 гадамі; з арнаментам у выглядзе рэльефных зерняў – 1006 – 1281 гадамі; з арнаментам, блізкім да шматпялёсткавай разеткі, – пасля 1281 года; дыскападобныя грузікі датуюцца часам пасля 1340 года [82, с. 62 – 64].

***Ланцужкі.*** Металічныя ланцужкі ў полацкай калекцыі прадстаўлены невялікімі фрагментамі (ад 1 да 29 звёнаў), а таксама асобнымі звёнамі (гл. мал. 3: 9). Паводле формы і спосабу злучэння ўсе ланцужкі адносяцца да некалькіх тыпаў: 1) плеценыя (2 экз.); 2) колцавыя (21 экз.); 3) кастыльковыя (1 экз.). Плеценыя ланцужкі зроблены з цэльналітых звёнаў, якія сагнутыя надвое. Два такія вырабы паходзяць з матэрыялаў даследаванняў на Верхнім замку (раскопкі Г.В. Штыхава) і датуюцца мяжой XII – XIII стагоддзяў [15, с. 71]. Колцавыя ланцужкі састаўлены з невялікіх металічных колцаў акруглага ці пласцінчатага сячэння дыяметрам ад 0,5 да 1,6 см. У полацкай калекцыі найбольш поўна прадстаўлены ланцужкі з парнымі колцавымі незамкнутымі звёнамі; прадметы датаваныя XI – XIII стагоддзямі [15, с. 71; 71]. Ланцужкі, зробленыя з двайных колчатых звёнаў, атрымалі шырокае распаўсюджванне ва ўсіх народаў Балтыйскага рэгіёна [85, с. 71]. Кастыльковыя ланцужкі прадстаўлены толькі фрагментам аднаго звяна 8-падобнай формы з петлямі, якія ляжаць у перпендыкулярных плоскасцях. Прадмет паходзіць з прыватнай калекцыі і з'яўляецца выпадковай знаходкай. Аналагічныя артэфакты выкарыстоўваліся для мацавання прывесак да шумячых падвесак. Датаваць выраб трэба XI – XIII стагоддзямі [80, с. 178].

У выніку праведзенага тыпалагічна-храналагічнага аналізу ювелірных упрыгажэнняў з Полацка можна зрабіць наступныя **высновы:**

Усе ювелірныя вырабы можна аднесці да дзвюх вялікіх храналагічных груп:

1) канец X – XIII/XIV стагоддзяў;
2) XIV – XVII стагоддзі.

Для металічнага ўбору першай храналагічнай групы характэрным з'яўляецца выкарыстанне значнай колькасці дэкаратыўных элементаў. Ювелірны ўбор XIV – XVII стагоддзяў больш сціплы. Шматлікія дэкаратыўныя элементы папярэдняга перыяду змяняюцца простымі функцыянальнымі рэчамі. Галоўная дэкаратыўная нагрузка пераходзіць з металічных дэкаратыўных элементаў на само адзенне.

Пэўныя віды і тыпы ювелірных упрыгажэнняў з’яўляюцца адлюстраваннем гандлёва-эканамічных і культурны-этнічных сувязяў горада. Паводле культурнай і этнічнай прыналежнасці іх можна аднесці да чатырох груп:

1) усходнеславянскія рэчы;
2) балцкія і фіна-ўгорскія рэчы;
3) рэчы ўсходняга паходжання;
4) рэчы, для якіх немагчыма вызначыць этнічную прыналежнасць.

Да першай групы трэба адносіць артэфакты, якія традыцыйна лічацца ўсходнеславянскімі (прадметы хрысціянскага культу; лопасцевыя, трохпацеркавыя скроневыя колцы; трайныя вітыя з петлепадобнымі канцамі, абрубленаканечныя, тупаканечныя, вузкапласцінчатыя і загнутаканечныя бранзалеты; асобныя тыпы манетападобных падвесак, пярсцёнкаў і інш.).

Сярод старажытнасцей балцкага і фіна-ўгорскага паходжання можна назваць падкovападобны фібулы (спіралеканечныя, з галоўкай у выглядзе макавых каробачак, з зааморфнымі галоўкамі, са шматграннымі галоўкамі і інш.), шпількі (з крыжападобнай галоўкай), падвескі (падвеска-вутачка), колцападобныя завушніцы, асобныя тыпы звярынагаловых бранзалетаў і інш.

Да рэчаў усходняга паходжання трэба адносіць паясную гарнітуру, некаторыя фрагменты металічнага посуду (наверша рукаяці металічнага збана ў выглядзе птушачкі), завушніцы ў выглядзе пытальніка і інш. Асобную групу рэчаў складаюць артэфакты, якія не могуць быць надзейна суаднесены з пэўным этнасам, што тлумачыцца іх распаўсюджваннем на вялікіх тэрыторыях (пярсцёнкападобныя скроневыя колцы, дротавыя бранзалеты і пярсцёнкі, пярсцёнкі са ўстаўкамі, асобныя тыпы падвесак-амулетаў і іншыя рэчы). Важную частку вырабаў складаюць артэфакты, якія былі зроблены мясцовымі рамеснікамі пад уплывам іншаэтнічных традыцый. Для першай храналагічнай групы характэрным з’яўляецца вытворчасць пласцінчатых звярынагаловых бранзалетаў, рэшткі якіх зафіксаваны падчас даследавання вытворчага ювелірнага комплексу XII – XIII стагоддзяў на тэрыторыі Вялікага пасада. Звярынагаловыя бранзалеты часцей за ўсё звязваюць з балцкім этнічным масівам. Да мясцовай вытворчасці трэба таксама аднесці трохвугольную ажурную накладку на драўляны посуд з выявай грыфона. Дадзены прадмет быў выкананы па візантыйскіх узорах полацкім майстрам. Сярод прадметаў другой храналагічнай групы выразным прыкладам падобнай вытворчасці з’яўляюцца шпількі “пус епі”. Трэба адзначыць, што сярод гэтых прадметаў пэўныя віды і тыпы артэфактаў адносяцца да мясцовай вытворчасці. Гэта датычыцца манетападобных падвесак, некаторых крыжоў-цельнікаў, бранзалетаў, пярсцёнкаў і іншых артэфактаў сляды вытворчасці якіх зафіксаваны на тэрыторыі Полацка (ліцейныя формы, нарыхтоўкі).

## ЛІТАРАТУРА


1. Магалінскі, І.У. Ювелірнае ўпрыгажэнне / І.У. Магалінскі // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 2: Л – Я; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – С. 442.
2. Наркевіч, Н.І. Скроневыя ўпрыгажэнні жанчын Беларусі X – XIV стст. / Н.І. Наркевіч // БГЧ. – 2010. – № 12. – С. 26 – 33.
3. Агапова, А.С. О способах ношения височных колец / А.С. Агапова, Т.Г. Сарачева // Российская археология. – 1997. – № 1. – С. 99 – 108.
4. Сабурова, М.А. Женский головной убор у славян (по материалам Вологодской экспедиции) / М.А. Сабурова // Советская археология. – 1974. – № 2. – С. 85 – 97.
5. Спицын, А.А. Расселение древнерусских племен по археологическим данным / А.А. Спицын // Журнал М-во народ. просвещения. – СПб.: Тип. “В.С. Балашев и Ко”, 1899. – С. 301 – 340.
6. Арциховский, А.В. Курганы вятичей / А.В. Арциховский. – М.: Изд-во РАНИОН, 1930. – 202 с.
7. Левашева, В.П. Височные кольца / В.П. Левашева // Труды ГИМ. – М.: Советская Россия, 1967. – Вып. 43: Очерки по истории русской деревни (X – XIII вв.). – С. 207 – 247.
8. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 183 с.
9. Седова, М.В. Украшения из меди и сплавов / М.В. Седова // Древняя Русь. Быт и культура. – М.: Наука, 1997. – С. 63 – 78.
10. Рябцева, С.С. Древнерусский ювелирный убор (основные тенденции формирования) / С.С. Рябцева. – СПб: Нестор-История, 2005. – 384 с.
11. Седов, В.В. Водь / В.В. Седов // Финно-угры и балты в эпоху средневековья. – М.: Наука, 1987. – С. 34 – 42.
12. Седов, В.В. Этнический состав населения северо-западных земель Великого Новгорода (IX – XIV вв.) / В.В. Седов // Советская археология. – 1953. – Т. XVIII. – С. 120 – 229.
13. Седова, М.В. Ювелирные изделия Древнего Новгорода (X – XV вв.) / М.В. Седова. – М.: Наука, 1981. – 194 с.

14. Кольчатов, В.А. Височные кольца Водской земли / А.В. Кольчатов // Новое в археологии СССР и Финляндии. – Л.: Наука, 1984. – С. 167 – 176.
15. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк IX – XIII вв. / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.
16. Равдина, Т.В. Типология и хронология лопастных височных колец / Т.В. Равдина // Славяне и Русь. – М.: Наука, 1968. – С. 136 – 142.
17. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X – XIII стст. (паводле археалагічных звестак) / Л.У. Дучыц. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 80 с.
18. Козлова, А.В. Металлические украшения и предметы быта восточной традиции X – XV веков из раскопок в Пскове / А.В. Козлова // Археология и история Пскова и Псковской земли. – Псков: Ин-т археологии РАН, 2007. – С. 125 – 143.
19. Svetikas, E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės christianizacija XIV a. pab. – XV a.: archeologiniai radiniai su krikščioniškais simboliais. T. 1 / E. Svetikas. – Vilnius: Diemedžio leidykla, 2009. – 659 p.
20. Дучыц, Л.У. Завушніцы / Л.У. Дучыц // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 2 т. Т. 1. А – К; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – С. 347 – 348.
21. Чараўко, В.У. Праблема датавання познесярэднявечных грунтовых пахаванняў на курганна-жальнічным могільніку каля в. Бірулі Докшыцкага раёна (па матэрыялах даследаванняў 2011 г.) / В.У. Чараўко // Полацкі музейны штогоднік: зб. навук. арт. за 2011 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева, І.П. Воднева, С.В. Нікалаева. – Полацк: НПГКМЗ, 2012. – С. 356 – 362.
22. Голубева, Л.А. Амулеты / Л.А. Голубева // Древняя Русь. Быт и культура. – М.: Наука, 1997. – С. 153 – 166.
23. Покровская, Л.В. Ювелирные украшения Людина конца: систематизация и топография / Л.В. Покровская // Новгородские археологические чтения-3. – Великий Новгород: Новгор. гос. объед. музей-заповедник, 2011. – С. 255 – 269.
24. Даркевич, В.П. Древняя столица Рязанской земли: XI – XIII вв. / В.П. Даркевич, Г.В. Борисевич. – М.: Кругъ, 1995. – 448 с.
25. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля (очерк истории Северной Белоруссии) в IX – XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 296 с.
26. Корзухина, Г.Ф. Русские клады IX – XIII вв. / Г.Ф. Корзухина. – М.-Л.: Акад. наук СССР, 1954. – 157 с.
27. Пінчук, Н.С. Раслінны, зааморфны і антрапаморфны матывы ў дэкоры металічных упрыгажэнняў X – XIII стст. на беларускіх землях / Н.С. Пінчук // БГЧ. – 2010. – № 9. – С. 31 – 37.
28. Бубенько, Т.С. Средневековый Витебск: Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.) / Т.С. Бубенько. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2004. – 276 с.
29. Лавыш, К.А. Художественные связи средневекового Полоцка со странами восточно-византийского мира / К.А. Лавыш // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V міжнар. навук. канф., Полацк, 24 – 25 кастр. 2007 г. – Полацк: НПГКМЗ, 2009. – С. 103 – 111.
30. Хвощинская, Н.В. Об этнической атрибуции подвесок с изображением головок быка / Н.В. Хвощинская // Славяне, финно-угры, скандинавы, волжские булгары. – СПб.: ИПК “Вести”, 2000. – С. 246 – 253.
31. Дучыц, Л.У. Падвескі / Л.У. Дучыц, Э.М. Зайкоўскі // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 2 т. Т. 2: Л – Я; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – С. 153 – 154.
32. Зайкоўскі, Э.М. Яшчэ раз да пытання пра падвескі з выявай галавы буйной рагатай жывёлы / Э.М. Зайкоўскі // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2008. – Вып. 23. – С. 168 – 178.
33. Успенская, А.В. Нагрудные и поясные привески / А.В. Успенская // Труды ГИМ. – М.: Советская Россия, 1967. – Вып. 43: Очерки по истории русской деревни (X – XIII вв.). – С. 88 – 132.
34. Томашевич, И.В. Языческие привески в виде миниатюрных хозяйственно-бытовых предметов с территории Беларуси / И.В. Томашевич // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – Вып. 15. – С. 287 – 289.
35. Поветкин, В.И. Бубенчики-звонцы в древнем Новгороде (применение, способы производства, типология и хронология) / В.И. Поветкин // Российская археология. – 2009. – № 2. – С. 79 – 92.
36. Мальм, В.А. Привески-бубенчики / В.А. Мальм, М.В. Фехнер // Труды ГИМ. – М.: Советская Россия, 1967. – Вып. 43: Очерки по истории русской деревни (X – XIII вв.). – С. 133 – 148.
37. Дучыц, Л.У. Маскавічы / Л.У. Дучыц // Полоцкий летописец. – 1993. – № 1(20). – С. 13 – 18.
38. Зверуго, Я.Г. Древний Волковыск (X – XIV вв.) / Я.Г. Зверуго. – Мінск: Наука и техника, 1975. – 144 с.
39. Покровская, Л.В. Финно-угорские украшения в Новгороде XIII века / Л.В. Покровская // Русь в XIII веке: Древности тёмного времени; отв. ред. Н.А. Макаров, А.В. Чернецов. – М.: Наука, 2003. – С. 304 – 314.
40. Покровская, Л.В. Украшения с Людина конца (Находки Троицкого раскопа) / Л.В. Покровская // Родина. – 2009. – № 9. – С. 75 – 78.
41. Покровская, Л.В. Новгородские одежные булавки (X – XIII вв.) / Л.В. Покровская // Историческая археология. Традиции и перспективы (к 80-летию со дня рождения Д.А. Авдусина). – М.: Памятники исторической мысли, 1998. – С. 175 – 181.

42. Башков, А.А. Христианские древности Беларуси конца X – XIV вв. (предметы христианского культа индивидуального использования) / А.А. Башков. – Минск: И.П. Логвинов, 2011. – 194 с.
43. Мусин, А.Е. Христианизация Новгородской земли в IX – XIV вв. Погребальный обряд и христианские древности / А.Е. Мусин. – СПб.: Центр "Петербургское Востоковедение", 2002. – 272 с.
44. Седов, В.В. Эсты / В.В. Седов // Финно-угры и балты в эпоху средневековья. – М.: Наука, 1987. – С. 13 – 23.
45. Гуревич, Ф.Д. Древний Новогрудок (посад – окольный город) / Ф.Д. Гуревич. – Л.: Наука, 1981. – 160 с.
46. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 168 с.
47. Клімаў, М.В. Асобныя аспекты развіцця паўночнай часткі Вялікага пасада г. Полацка (па выніках археалагічных даследаванняў 2009 г. на вул. Ф. Скарыны) / М.В. Клімаў // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: у 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – С. 55 – 64.
48. Люцинский могильник // Материалы по археологии России. – СПб.: Тип. Главного Управления Уделов, 1893. – № 14: Древности Северо-Западного края. Т. 1. Вып. 2. – 124 с.
49. Тарасаў, С.В. Справаздача аб археалагічных доследах у Полацку і полацкай акрузе ў 1993 г. / С.В. Тарасаў // ААНД ДНУ "Інстытут гісторыі" НАН Беларусі. – № 1496.
50. Рябинин, Е.А. Языческие привески-амулеты Древней Руси / Е.А. Рябинин // Древности славян и Руси. – М.: Наука, 1988. – С. 55 – 58.
51. Мальм, В.А. Подковообразные и кольцевидные застёжки-фибулы / В.А. Мальм // Труды ГИМ. – М.: Советская Россия, 1967. – Вып. 43: Очерки по истории русской деревни (X – XIII вв.). – С. 149 – 190.
52. Авдусина, С.А. Подковообразные фибулы Гнёздова / С.А. Авдусина, Н.В. Ениосова // Труды ГИМ. – М.: ГИМ, 2001. – Вып. 124: Гнёздово. 125 лет исследования памятника. – С. 93 – 101.
53. Гора, З.Я. Типология кольцевидных фибул средневековой Латвии в археологическом материале / З.Я. Гора // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 1995. – Вып. 6. – С. 183 – 188.
54. Магалінскі, І.У. Вытворчыя ювелірныя комплексы старажытнага Полацка (X – XVII стст.) / І.У. Магалінскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – Вып. 21: Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка). – С. 115 – 121.
55. Дучыц, Л.У. Пярсцёнак / Л.У. Дучыц, В.М. Ляўко // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 2: Л – Я; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – С. 237.
56. Сарачева, Т.Г. Металлические перстни Днепровского Левобережья (конец IX – первая половина XIII в.) / Т.Г. Сарачева // История и эволюция древних вещей: сб. ст. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1994. – С. 85 – 99.
57. Михайлик, Л.П. Металлические перстни X – первой половины XIII века из Киева (хронология, типология) / Л.П. Михайлик // Российская археология. – 2006. – № 3. – С. 52 – 62.
58. Недошивина, В.Г. Перстни / В.Г. Недошивина // Труды ГИМ. – М.: Советская Россия, 1967. – Вып. 43: Очерки по истории русской деревни (X – XIII вв.). – С. 65 – 87.
59. Лысенко, П.Ф. Берестье / П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 399 с.
60. Дучыц, Л.У. Браслаўскае Паазер'е IX – XIV стст. / Л.У. Дучыц. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 120 с.
61. Булкин, В.А. Отчёт об археологических исследования Софийского собора и прилегающей к нему территории в 1978 г. / В.А. Булкин // ААНД ДНУ "Інстытут гісторыі" НАН Беларусі. – № 594.
62. Магалінскі, І.У. Ліцейныя формы і тыглі для плаўкі каляровых металаў з тэрыторыі Полацка X – XVII стст. / І.У. Магалінскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Вып. 21: Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка). – Мінск: Беларус. навука, 2011. – С. 184 – 193.
63. Седова, М.В. Суздаль в X – XV веках / М.В. Седова. – М.: Информ.-издат. агентство «Русский мир», 1997. – 320 с.
64. Седова, М.В. Ярополч Залесский / М.В. Седова. – М.: Наука, 1978. – 157 с.
65. Седова, М.В. Перстни-печати XV – XVII стст. из Суздаля / М.В. Седова, Н.М. Курганова // Историческая археология. Традиции и перспективы (к 80-летию со дня рождения Д.А. Авдусина). – М.: Памятники исторической мысли, 1998. – С. 231 – 236.
66. Сагановіч, Г.М. Справаздача аб правядзенні археалагічных даследаванняў у г. Полацку ў жніўні 1986 г. / Г.М. Сагановіч // ААНД ДНУ "Інстытут гісторыі" НАН Беларусі. – № 975.
67. Заяц, Ю.А. Бранзалет / Ю.А. Заяц, С.Я. Рассадзін, Т.С. Скрыпчанка // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 2 т. Т. 1: А – К; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – С. 115.
68. Левашева, В.П. Браслеты / В.П. Левашёва // Труды ГИМ. – М.: Советская Россия, 1967. – Вып. 43: Очерки по истории русской деревни (X – XIII вв.). – С. 7 – 39.

69. Салаўёў, А.А. Да вынікаў археалагічных даследванняў на вуліцы і завулках Ф. Міронавай у 2005 – 2006 гг. / А.А. Салаўёў // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: у 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – С. 114 – 124.
70. Шноре, Э.Д. Асотское городище / Э.Д. Шноре // Материалы и исследования по археологии Латвийской ССР. Т. II. – Рига: Акад. наук Латвийской ССР, 1961. – С. 5 – 167.
71. Бубенька, Т.С. Ювелірныя ўпрыгожванні Віцебска X – XIV стст. (па матэрыялах даследаванняў Ніжняга замка) / Т.С. Бубенька // З глыбі вякоў. Наш край: Гісторыка-культаралагічны зб. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 110 – 131.
72. Дук, Д.У. Рэчавы комплекс з раскопак на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка ў 2004 і 2006 гадах / Д.У. Дук // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. V (Вып. 5); уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2009. – С. 19 – 45.
73. Тарасаў, С.В. Полацкая ювелірная вытворчасць / С.В. Тарасаў // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 2 т. Т. 2: Л – Я; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – С. 205 – 206.
74. Рэчавы інвентар / Я.Г. Звяруга // Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII стст.) / Я.Г. Звяруга [і інш.]; навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – С. 370 – 423.
75. Загорульский, Э.М. Вищинский замок XII – XIII вв. / Э.М. Загорульский. – Минск: БГУ, 2004. – 159 с.
76. Сергеева, З.М. К изучению культурно-экономических связей западнорусских земель с Прибалтикой (по находкам звериноголовых браслетов) / З.М. Сергеева // КСИА. – М.: Наука, 1982. – Вып. 164: славяно-русская археология. – С. 30 – 35.
77. Тарасаў, С.В. Курганны могільнік каля в. Дзмітраўшчына Полацкага раёна / С.В. Тарасаў, Л.У. Дучыц, Г.М. Семянчук // Гістарычна-археалагічны зб. – Мінск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 1995. – Вып. 6. – С. 230 – 241.
78. Магалінскі, І.У. Шпількі “пус епі” з тэрыторыі Полацка: класіфікацыя, храналогія і праблема паходжання / І.У. Магалінскі // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: у 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – С. 78 – 83.
79. Бекцінееў, Ш.І. Некаторыя элементы адзення насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў X – XIV стст. / Ш.І. Бекцінееў // Весці АН БССР. Серыя грамад. навук. – 1990. – № 4. – С. 93 – 99.
80. Захаров, С.Д. Древнерусский город Белоозеро / С.Д. Захаров. – М.: Индрик, 2004. – 592 с.
81. Белорыбкин, Г.Н. Золотаревское поселение / Г.Н. Белорыбкин. – СПб. – Пенза: Изд-во ПГПУ, 2001. – 200 с.
82. Лесман, Ю.М. Хронология ювелирных изделий Новгорода (X – XIV стст.) / Ю.М. Лесман // Материалы по археологии Новгорода. – М.: Новгород. археолог. экспедиция, 1988. – Ч. 1. – С. 29 – 98.
83. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на аб’екце “Узвядзенне помніка героям вайны 1812 г.” у г. Полацку ў 2009 г. / Д.У. Дук // ААНД ДНУ “Інстытут гісторыі” НАН Беларусі. – № 2647.
84. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Запалоцкага пасада г. Полацка ў 2010 г. / Д.У. Дук // ААНД ДНУ “Інстытут гісторыі” НАН Беларусі (на зацвярджэнні ў палявым камітэце).
85. Хвощинская, Н.В. Финны на западе Новгородской земли (по материалам могильника Залахтовье) / Н.В. Хвощинская. – СПб.: Дмитрий Буланин, 2004. – 290 с.

*Паступіў 15.06.2012*

**THE JEWELRY FROM THE TERRITORY OF ANCIENT POLOTSK**
**(X – XVII CENTURIES)**

***I. MAHALINSKI***

*In this article the author shows main conclusions about the study of the jewelry that were found on the territory of Polotsk during X – XVII centuries. The author refers these products to 2 chronological groups – the end of X – XIII/XIV centuries and XIV – XVII centuries. Among these jewelry there are products that were made under the influence of other ethnic technological traditions, imported products, and the jewelry of local production.*

**УДК 902/904**

# ПЛОСКІЯ МЕТАЛІЧНЫЯ ПАДВЕСКІ-«КОНІКІ»: РАСПАЎСЮДЖАННЕ І СЕМАНТЫКА

***Э.М. ЗАЙКОЎСКІ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Разглядаюцца пытанні распаўсюджання і семантыкі адной з разнавіднасцяў плоскіх зааморфных падвесак-амулетаў, якая ў археалагічнай літаратуры атрымала назву «конікаў» і якая досыць шырока трапляецца ў раннесярэднявечных курганных пахаваннях і на паселішчах Падзвіння. Такія падвескі сустракаюцца ў жаночых пахаваннях XI – першай паловы XII стагоддзя, у асноўным у арэале крывічоў, а таксама на тэрыторыі Латвіі. Знаходкі амулетаў-«конікаў» у асноўным характэрныя для тых курганных могільнікаў, дзе сустракаюцца пахаванні з усходняй арыентыроўкай, найбольш уласцівай для славянізаваных балтаў. Згаданы тып падвесак шэраг даследчыкаў лічаць не толькі «конікамі», але і выявамі рысяў, гепардаў, сабачак, грыфонаў. Аўтар абгрунтоўвае, што на самой справе гэта былі схематычныя выявы куніц, з улікам таго, што ў фальклоры і павер'ях славян куніца надзяляецца жаночай шлюбнай, эратычнай і ткацкай сімволікай.*

**Уводзіны.** Светапогляд раннесярэднявечнага насельніцтва Усходняй Еўропы, і тэрыторыі сучаснай Беларусі ў прыватнасці, вывучаецца не толькі па звестках досыць нешматлікіх пісьмовых крыніц, але і па археалагічных матэрыялах, сярод якіх асаблівае месца займаюць разнастайныя падвескі-амулеты. Характэрнай асаблівасцю значнай часткі такіх падвесак-амулетаў з'яўляецца тое, што яны маюць дастаткова акрэсленыя арэалы распаўсюджання, якія ў значнай меры супадаюць з тэрыторыямі рассялення племянных супольнасцяў. Істотна таксама, што металічныя падвескі-амулеты пераважна, ці прынамсі часткова сустракаюцца ў закрытых комплексах, асабліва ў курганных пахаваннях, што дазваляе прасачыць кантэкст іх выкарыстання, храналогію, прывязку да пэўных полавых, узроставых, сацыяльных катэгорый насельніцтва. Пакладзеныя ў пахаванні, падвескі-амулеты выконвалі не толькі эстэтычную функцыю ўпрыгожанняў. Пры міфалагічным ладзе мышлення, уласцівым архаічнаму грамадству, у шэрагу выпадкаў на першы план выступала не ўтылітарнае прызначэнне прадмета ў паўсядзённым жыцці, а тое значэнне, якое ён займаў у духоўнай культуры, яго семіятычны статус. Практычна ўсе прадметы, акрамя свайго функцыянальнага прызначэння, мелі і знакавы статус з адпаведным інфармацыйным патэнцыялам [1, с. 8 – 9].

**Асноўная частка.** У раннесярэднявечных курганных пахаваннях і на паселішчах Падзвіння і суседніх тэрыторый сярод іншых знаходак досыць шырока трапляецца адна з разнавіднасцяў плоскіх зааморфных падвесак-амулетаў, якая ў археалагічнай літаратуры атрымала назву «конікаў». Адліваліся гэтыя пласцінчатыя падвескі з бронзы, зрэдку са срэбра. Форма падвесак дастаткова стандартная: досыць тонкае тулава, злёгку сагнутыя ногі, доўгі хвост, які амаль дастае да шыі і на канцы раздвойваецца, утвараючы колца. На галаве добра прыкметныя стаячыя тарчком вушы, якія часам выглядаюць досыць завостранымі, але такая асаблівасць не заўсёды для іх характэрная. Паверхня такіх падвесак амаль заўсёды ўпрыгожвалася цыркульным арнаментам, але часам замест яго маюцца насечкі або дробныя клетачкі (мал. 1). Цыркульны арнамент наносіўся чаканам з плоскай ці трохі выпуклай рабочай паверхняй.

Паводле назіранняў А.В. Успенскай, усе вядомыя падвескі-«конікі» знойдзены выключна ў жаночых пахаваннях, і толькі ў тых магілах, якія былі зроблены па абраду інгумацыі. У пераважнай большасці пахаванняў маецца па адным экзэмпляры такіх падвесак, вельмі рэдка – па два, і толькі ў курганным могільніку Харлапава (каля Дарагабужа на Смаленшчыне) у двух пахаваннях было па тры «конікі». У значнай колькасці выпадкаў падвескі размяшчаліся ў вобласці левага пляча, а часам трапляюцца паблізу таза (гэта значыць, яны былі прымацаваныя да пояса) [2, с. 91]. Зыходзячы з таго, што значная колькасць падвесак трапляецца ў вясковых курганных могільніках на тэрыторыі Смаленскага княства і ў той жа час яны адсутнічаюць у самім Смаленску, даследчыца выказала меркаванне, што гэтыя вырабы з'яўляліся прадукцыяй мясцовых сельскіх рамеснікаў.

Заморфным упрыгожанням X – XI стагоддзяў Я.А. Рабінін прысвяціў асобную манаграфію. Навуковец на падставе аналізу матэрыялаў акрэсліў час з'яўлення падвесак тыпу XIV стагоддзя (да якога ён аднёс паводле сваёй класіфікацыі пласцінчатых літых «конікаў») у курганных пахаваннях усходніх славян пачатка XI стагоддзя. Пахавальны інвентар, які ўключае такія падвескі, прадстаўлены пераважна рэчамі XI – пачатку (ці першай паловы) XII стагоддзя. Час найбольшага распаўсюджання пласцінчатых «конікаў» на помніках Кіеўскай Русі вызначаецца Я.А. Рабініным і шэрагам іншых даследчыкаў у рамках XI – перш. паловы XII стагоддзя [3 – 5]. Ва ўсходняй Латвіі аналагічныя знаходкі датуюцца XI – перш. паловай XII стагоддзя [6; 7]. На тэрыторыі Літвы, недалёка ад г. Укмерге (на правабярэжжы р. Швянтойі), у возеры Обляяй знойдзена больш за 3 тыс. прадметаў XIII – XIV стагоддзяў, сярод якіх і літая падвеска-«конік». Побач на беразе раскапаны могільнік гэтага ж часу з трупаспаленнямі [8, p. 61 – 63, pav. 71, 3].




Мал. 1. Плоскія металічныя падвескі-«конікі»*

У археалагічнай літаратуры большасць даследчыкаў традыцыйна адносіць плоскія зааморфныя падвескі разглядаемага тыпу да выяў конікаў. У свой час Б.А. Рыбакоў, адзначаючы яўна «няконскую» форму вушэй і пярэдніх ног жывёлы, выказаў думку, што гэта былі выявы рысі [9, с. 21, 23]. Аднак ён пры гэтым праігнараваў такую важную асаблівасць рысі, як вельмі кароткі хвост, у той час як на падвесках доўгі хвост, закінуты на спіну.

Сапуноў Б.В. прапанаваў лічыць такія падвескі выявамі гепарда (пардуса) [10, с. 111 – 116]. Сапраўды, гепард паводле вонкавага аблічча мае значнае падабенства з істотамі, якіх адлюстроўваюць падвескі. Аднак Б.В. Сапуноў не ўлічвае таго, што ў сярэднявеччы гепарды ў лясной паласе Усходняй Еўропы сустракаліся толькі як імпарт з Сярэдняга Усходу і ў невялікай колькасці выкарыстоўваліся вышэйшай арыстакратыяй на паляванні для пагоні за зверам, паколькі вызначаюцца хуткасцю, спрытам і сілай і спалучаюць рысы кашэчых і сабачых. Няма падставаў лічыць, што сярод шырокіх мас насельніцтва, асабліва ўдалечыні ад цэнтраў буйных княстваў, гэтыя экзатычныя жывёліны паспелі набыць папулярнасці, тым больш, сталі аб’ектам пакланення. Яшчэ раней А.А. Спіцын называў такія падвескі сабачкамі. Аднак ва ўсходнеславянскіх курганах, хоць і досыць рэдка, трапляюцца падвескі ў выглядзе даволі рэалістычных выяў – сабачак з хвастом «абаранкам». Нарэшце, у апошнія пару дзясяцігоддзяў у публіка-

* Артэфакт 2 знойдзены ў г. Мсціславе Магілёўскай вобласці; месцы знаходак артэфактаў 1, 3 – 8 не былі ўказаныя ([Электронны рэсурс]).

цыях шэрагу даследчыкаў (напрыклад, М.А. Макараў [11], Г. М. Семянчук [12, с. 303]) прасочваецца тэндэнцыя называць такія падвескі грыфончыкамі, з чым катэгарычна немагчыма пагадзіцца. Як вядома, грыфонамі называюць фантастычныя крылатыя істоты з тулавам ільва і галавой арла. На падвесках жа ні крылляў, ні галавы арла не прасочваецца, ды і тулава не дужа падобнае на ільвінае. Акрамя таго, калі кранацца атаясамлення падвесак з выявамі каня, рысі, гепарда або сабакі, то прыхільнікі адпаведных гіпотэз, прызнаючы гэтыя вырабы амулетамі, якімі карысталіся выключна жанчыны, не ўлічваюць таго, што ўсе пералічаныя жывёліны ў міфалогіі зусім не з'ўляліся жаночымі сімваламі.

Што да ідэнтыфікацыі падвесак з выявамі нейкага канкрэтнага віду жывёл, то адназначна адказаць на гэта пытанне не могуць нават заолагі. Акрамя каня, гепарда і сабакі, падвескі ў профіль нагадваюць выявы шмат якіх жывёл лясной паласы Усходняй Еўропы, за выключэннем зайца, мядзведзя, дзіка, тура і зубра. Іх нават можна атаясаміць з жывёламі сямейства аленевых (алень высакародны, лось, казуля, лань), асабліва з улікам таго, што самкі аленевых не маюць рагоў, але перашкодай з'ўляецца тое, што ва ўсіх аленевых вельмі кароткія хвасты.



Мал. 2. Куніца лясная

Відавочна, што для ідэнтыфікацыі плоскіх зааморфных падвесак з выявамі жывёлы пэўнага віду патрэбны комплексны падыход: як падабенства профілю, так і жаночая семантыка пэўнага віду жывёлы. На нашу думку, гэтым абодвум умовам цалкам адпавядае з жывёл лясной паласы толькі куніца лясная (Martes martes). Трэба ўлічыць, што ў значнай частцы падвесак ніжняя частка пярэдніх ног істоты падагнута наперад, а не пад сябе, што зусім нехарактэрна для каня, сабакі, гепарда, але затое з'ўляецца асаблівасцю куніцы (мал. 2). У фальклоры і народных павер'ях славян, асабліва ўсходніх, куніца надзяляецца жаночай шлюбнай, эратычнай і ткацкай сімволікай.

**Хтанічная сімволіка** куніцы праяўляецца, акрамя іншага, у колеравай характарыстыцы: у фальклорных тэкстах для куніцы, гэтак сама як і для іншых кунічных – собаля, гарнастая, характэрны эпітэт «чорны» (напрыклад, чорнай куне ўпадабляецца нявеста). У летапісах («Аповесць мінулых гадоў» і інш.) ужывалася словазлучэнне «чорныя куны» і «бель серебро». Беларускаму і ўкраінскаму матыву чорных гарнастаеў, баброў або собаляў каля каранёў райскага («шчаслівага») дрэва, які падкрэслівае хтанічную прыроду сямейства кунічных, у паўночнарускіх песнях адпавядае вобраз стаячага на гары «дрэўца кіпарыснага», якое «кунами обросло, соболями расцвело».

Хтанічная прырода кунічных праяўляецца і ў тым, што ім прыпісваецца датычнасць да падземных скарбаў, асабліва ў ласкі і гарнастая [13, с. 201 – 202; 14, с. 46].

Праявай **ткацкай сімволікі** ва ўкраінскай вясельнай песні можна лічыць згадку пра тое, як куніца скача па «просести» (на кроснах паміж палатняным навоем і бёрдам), калі нявеста тчэ дары на вяселле: «По ейи просисти / Кунонька скакала, / С соболями грала». У аналагічнай вясельнай песні згадваецца куніца, якая скача па «понажах» – дошчачках у кроснах, на якія націскаюць нагамі, каб прывесці ў дзеянне ніты: «Па яе [нявесты] панажачках куначка скача, / Па ёй, маладзенькай, мамачка плача» [14, с. 46 – 47].

**Жаночая шлюбная сімволіка** куніцы ва ўсходніх славян адпавядае аналагічнай сімволіцы ласкі ў паўднёвых славян. У беларускім фальклоры, асабліва звязаным са сватаннем да дзяўчыны і з вяселлем, нявеста называецца куніцай (куна, кунанька, кунка, куначка, конухна, конка). Сваты прадстаўляюцца бацькам маладой як паляўнічыя, якія на іхнім падвор'і выявілі праследуемую імі куніцу. Паводле слоў адной з вясельных песень: «Ды па бары, па бары куна хадзіла, залатым падгарлем весь бор асвяціла, сямі бор сакалоў да яна згардзілася, да цябе, сакол, сама захацелася. Па новых сенях дзеванька хадзіла, залатым пярсцёнкам сені асвяціла» [15, с. 57].

У фальклорных тэкстах куніца прыпадабняецца нявесце, напрыклад, у беларускіх і ўкраінскіх жартоўных песнях пра жаніцьбу зайца на маладой куне. Часцей за ўсё ва ўсходнеславянскім песенным фальклоры, асабліва вясельных песнях, хлопец і дзяўчына або жаніх і нявеста падаюцца як собаль і куніца, гарнастай і куніца, радзей, – як бабёр і куніца [14, с. 46]. Кунай называюць дзяўчыну у традыцыйным звароце пры сватанні – «Хадзілі мы, брадзілі па вашаму лесу, напалі на след пушнога звера, гналісь, гналісь за куніцай, у сяло ўвагналі і след пацяралі». Гэта можна параўнаць з тым, што ў сярэднявеччы дзяўчаты-сялянкі, якія выходзілі замуж у чужы маёнтак ці чужую воласць, давалі свайму ранейшаму пану адмысловую плату – «куніцу».

Тэрмінам «kuna» яшчэ ў XVIII стагоддзі ў Рэчы Паспалітай называлі спецыяльнае металічнае прыстасаванне пры драўляным слупе або касцельных дзвярах, якое служыла для прымыкання дзяўчат або

хлопцаў, вінаватых у сексуальнай распусце, якія выстаўляліся для грамадскага ганьбавання. Вінаваты ці вінаватая прымацоўваліся за шыю ці за руку на час набажэнства для кары сорамам, бо ніякім фізічным болем гэта не суправаджалася. Глогер З. у сваёй «Энцыклапедыі старапольскай» прыводзіў малюнак дзвярэй сярэднявечнага касцёла ў Чэрвіньску (усходняя Мазовія), да якіх была прыбіта куна – металічная выява галавы звера з колцам у пашчы, праз якое прапускаўся ланцуг для прымыкання вінаватых [16, s. 118 – 119).

Характэрна, што этымалагічна звязаным з тэрмінамі «куніца», «куна» з'яўляецца лацінскае *cunnus* «вульва» і *cunae* «калыска», «радзіма». Згодна з рэканструкцыяй настратычнай мовы, **küni* абазначае жанчыну, а **kanΛ* – «нараджацца» [17, с. 306, 335]. Фізіялагічнае падабенства куніцы з жанчынай праяўляецца ў тым, што ў куніцы працягласць цяжарнасці таксама набліжана да 9 месяцаў (дакладней, у дыяпазоне 236 – 275 дзён ), а злучка адбываецца летам, што ў свядомасці язычнікаў магло выклікаць асацыяцыі са святкаваннем дня летняга сонцастаяння, калі дапускалася значная свабода сексуальных паводзін.

Тэрмін для абазначэння куніцы агульнаславянскі (украінск. **куниця, *куна*, руск. **куница, *куна*; старажытнаўсходнеславянск. **куна*; балгарск. **куна*; македонск. **куна*, серб. **куна*; харвацк. **kuna*; славенск. **kúna*; польск. *kuna*; чэшск. **kuna*; славацк. **kuna*; верхнелужыцк. **kuna*; ніжнелужыцк. **kuna*. З гэтага рэканструюецца праславянскае **kuna*, якое мае генетычна тоесныя адпаведнікі: прускае **caune,* літоўскае **kiáunė*, латышск. **caúna* [18, с. 159].

Акрамя ўжывання назваў *куна, *куніца для абазначэння не толькі жывёліны і яго футра, а таксама грошай (kuna – грашовая адзінка сучаснай Харватыі ), вядомыя таксама значэнні слоў **куна, *кунка, *куночка* ў сэнсе *vulva*. Вядомыя таксама ўжыванні кашубскага ** kuna* ў значэнні 'сука' (часам – 'старая карова') і **kunovac 'objawiać chęć zaspokojenia popędu płciowego'* (г. зн. 'праяўляць жаданне задавальнення сексуальнай цягі'), славінскае **kŭnă, *kúnica* 'сука', латышск. **kuņa* 'сука'. Тапароў У. М. лічыў этымалагічна звязанымі з абазначэннем куніцы пскоўскае дыялектнае **чунеть* 'прыходзіць у непрытомны стан', як і звязанае з ім украінскае **вúчуняти* 'выздаравець, прыйсці ў сябе' і рускае **кунеть, *выкунеть* 'папраўляцца пасля хваробы, прыходзіць у сілу, як бы адліняўшы звер [19, с. 279 – 280].

Яшчэ паводле рашэння Ягайлы на з'ездзе ў Гародлі ў 1413 годзе была ўстаноўлена свабода шлюбаў паміж сялянскімі дзяўчатамі і хлопцамі розных феадалаў, і гэта рашэнне пацверджана ў 1511 годзе. Але за гэта ўладальніку нявесты, а часам яшчэ і ваяводзе павінны былі ўнесці адмысловую плату – «куніцу». У канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя. Нарушэвіч і Чацкі дапускалі нават, што плата «куніцы» ва ўсходніх славян узнікла як замена права першай ночы [16, s. 119].

Зааморфныя падвескі-амулеты, у свой час заўважыў В.В. Сядоў, не з'яўляюцца спецыфічнай прыналежнасцю ўсходнеславянскага жаночага касцюма [20, с. 151], а характэрныя найперш для фіна-уграў, а таксама ў значнай ступені – для балтаў. Знаходкі падвесак-«конікаў», па назіраннях В.В. Сядова, трапляюцца ў асноўным у тых курганных могільніках, дзе сустракаюцца пахаванні з усходняй арыентыроўкай, якая характэрная для славянізаваных балтаў. Нагрудныя ланцужкі, якія нярэдка трапляюцца ў пахаваннях з амулетамі-«конікамі», з'яўляюцца спецыфічна прыбалтыйскім упрыгожаннем. Сярод курганоў з такімі падвескамі нямала насыпаў, якія ўтрымліваюць пахаванні на спецыяльнай падсыпцы (Жылыя Горы, Харлапава, Каліхноўшчына, Шчукаўшчына). Такія курганы вядомыя ў асноўным на тэрыторыях, дзе адбылося змешванне славян з балцкім субстратам [20, с. 156]. Акрамя таго, падвескі згаданага тыпу былі не толькі шырока распаўсюджаныя на тэрыторыі Латвіі, але там была вядомая і мясцовая іх вытворчасць (знаходка на гарадзішчы Даўгмале паўфабрыката пласцінчатага «коніка»). Меркаванню пра паходжанне такіх амулетаў ад балцкага субстрату, на першы погляд, супярэчыць тое, што у помніках балтаў Верхняга Падняпроўя і Падзвіння, якія датуюцца I тыс. н. э., невядомыя іхнія прататыпы. Але тут можна правесці аналогію з круглымі падвескамі, на якіх маюцца выявы галавы буйной рагатай жывёлы [21, с. 167 – 174]. Апошнія, хоць і былі больш рэдкай знаходкай, мелі ў значнай меры блізкі арэал распаўсюджання і таксама сустракаюцца на помніках, якія характарызуюцца змяшанымі славяна-балцкімі рысамі.

Аналізуючы ступень распаўсюджанасці пласцінчатых літых выяў куніц на розных тэрыторыях (мал. 3) [1; 6; 7; 10; 11; 14; 15; 18 – 20; 22; 26], адразу трэба адзначыць, што найбольшая канцэнтрацыя іх знаходак назіраецца ў басейне верхняга Дняпра з яго прытокамі, а таксама ў верхнім і сярэднім цячэнні Дзвіны, г. зн. у арэале крывічоў. Дастаткова шмат іх таксама ў ніжнім Падзвінні і прылеглых раёнах на тэрыторыі Латвіі, дзе існавала нават мясцовая вытворчасць такіх падвесак. Прыблізна аднолькавая храналогія гэтых амулетаў у крывічоў і ў насельніцтва ніжняга Падзвіння не дае магчымасці вызначыць, з якога першапачатковага цэнтру распаўсюдзілася традыцыя выкарыстання такой сімволікі. Літыя выявы куніц сустракаюцца таксама ў арэале радзімічаў, хоць іх там менш, чым на крывіцкай тэрыторыі. З іншых рэгіёнаў, дзе досыць распаўсюджаныя падвескі ў выглядзе літых выяў куніц, трэба адзначыць вярхоўі Акі і Волгі, а таксама тэрыторыю паміж азёрамі Ільмень і Чудскім на поўдні, Фінскім залівам і Ладажскім возерам на поўначы. Паасобныя падвескі трапляюцца ў вярхоўях Паўночнай Дзвіны і нават недалёка ад памежжа Фінляндыі і Швецыі, паўночней Батнічнага заліва.




Мал. 3. Карта распаўсюджвання плоскіх заамарфных падвесак-«конікаў»:
1 – Свенцк-Струмяны; 2 – Гальшаны; 3 – Вільня; 4 – Обяляй; 5 – Талсы; 6 – Тэрветэ; 7 – Даўгмале; 8 – Лаукскола; 9 – Ікшкіле; 10 – Плявіню Радзес; 11 – Чыекуры; 12 – Лудза (Люцын); 13 – Раушы; 14 – Рауна; 15 – Тракатас Лубумуйжа; 16 – Лыхаверэ; 17 – Тарту; 18 – Кіўты; 19 – Лелпудзерэ; 20 – Ізборск; 21 – Астанец; 22 – Паліцы; 23 – Каліхноўшчына; 24 – Гусева Гара; 25 – Савіноўшчына; 26 – Дуброўна; 27 – Каменка; 28 – Ноўгарад; 29 – Дзеравяніцы; 30 – Хрэпле; 31 – Малы Арэдзеж; 32 – Арэдзеж; 33 – Вонша; 34 – Старая Ладага; 35 – Ганькава; 36 – Кручкова; 37 – Рысачова; 38 – Ільіно; 39 – Міціна-Зварыкіна; 40 – Чалмужы; 41 – Гротрэск; 42 – Унна Сайва; 43 – Сайво; 44 – Кузамень; 45 – Веркола; 46 – Кічылькоські; 47 – Корбала; 48 – Аксёнаўская; 49 – Каратыгінская; 50 – Няфедзьева; 51 – Нікольскае III; 52 – Шульгіно; 53 – Турыгіна; 54 – Сёмухіна; 55 – Старая Разань; 56 – Ваздзвіжанне; 57 – Крэстцы; 58 – Сарагожа; 59 – Федава; 60 – Ісакава; 61 – Крывушкіна; 62 – Ратніна; 63 – Глінкікі; 64 – Цвер; 65 – Андрэеўскае; 66 – Васільеўскае; 67 – Бяседы; 68 – Падмоклава (Падноклава); 69 – Серэнск; 70 – Бачарова; 71 – Панова; 72 – Мерзлева; 73 – Жылыя Горы; 74 – Шэйка; 75 – Удрай; 76 – Угрумава; 77 – Акулін Бор; 78 – Коханы; 79 – Трашкавічы; 80 – Колчына; 81 – Радовішчы; 82 – Глухаў; 83 – Гочава; 84 – Сукромля; 85 – Улазавічы; 86 – Смялічы; 87 – Ходасавічы; 88 – Мадора; 89 – Ціманава; 90 – Віркаў; 91 – Эсьмоны; 92 – Усціж; 93 – Селішча; 94 – Карпілаўка; 95 – Лагойск; 96 – Мінск; 97 – Гарадзішча на Менцы; 98 – Зябкі-Доўгае; 99 – Дрысвяты; 100 – Браслаў; 101 – Маскавічы; 102 – Пуцілкавічы; 103 – Лучна; 104 – Лукомль; 105 – Віцебск; 106 – Гразівец; 107 – Юр'евы Горы; 108 – Бенцы-Барузда; 109 – Сяльцо; 110 – Слабада; 111 – Сакі; 112 – Заазер'е; 113 – Мізінава; 114 – Навасёлкі; 115 – Труханаў; 116 – Харлапава; 117 – Барадзіно; 118 – Мутышына; 119 – Мсціслаў; 120 – Войлава

І зноў-такі назіраюцца пэўныя аналогіі з распаўсюджаннем ужо згаданых падвесак з выявамі галавы буйной рагатай жывёлы, якія часам разам з выявамі куніц трапляюцца ў адных і тых жа могільніках (Федава ў вярхоўі р. Мсты, Нікольскае ІІІ каля Белага возера, Няфедзьева).

Удалечыні ад асноўнага арэалу распаўсюджання, адзінкавыя знаходкі падвесак вядомыя на захадзе – у Пабужжы (Свенцк-Струмяны), а на паўднёвым усходзе – у вярхоўях р. Сейм (Гочава), дзе пражывала змяшанае насельніцтва (выхадцы з розных рэгіёнаў Кіеўскай Русі). Зрэшты, заканамернасці распаўсюджання апісваемых намі падвесак-амулетаў і роля ў гэтым працэсе балтаў або іх славянізаваных нашчадкаў патрабуюць далейшага вывучэння, з дэталёвым аналізам матэрыялаў кожнага могільніка, дзе такія рэчы знойдзены.

Голубева Л.А., зыходзячы з канстатацыі таго факта, што заамарфныя падвескі ў пахаваннях трапляюцца традыцыйна ў вобласці грудзей (радзей – пляча) або ніжэй пояса, прыйшла да высновы, што такое іх размяшчэнне звязана з функцыянальным прызначэннем падвесак-абярэгаў: ахоўваць грудзі і ўлонне жанчыны і перадаваць ёй урадлівасць [26, с. 157]. Мяркуем, што такая думка гэтай даследчыцы з’яўляецца цалкам справядлівай у дачыненні да пласцінчатых літых выяў куніц .

У заключэнне можна зрабіць наступныя **высновы:**

- плоскія металічныя заамарфныя падвескі, якія найчасцей называюцца ў археалагічнай літаратуры “конікамі”, няма падстаў атаясамліваць з выявамі коней, рысяў, гепардаў, сабачак і тым больш грыфонаў. Як падабенства профілю падвесак, так і іх сувязь з пахаваннямі жанчын дазваляе атаясамліваць гэтыя вырабы з выявамі куніц, паколькі гэта істота ў фальклоры і народных павер’ях славян надзяляецца менавіта жаночай сімволікай;
- жаночая сімволіка куніцы ўключае ў сябе хтанічны, ткацкі, эратычны і шлюбны аспекты;
- заамарфныя падвескі-амулеты не з’яўляліся спецыфічнай прыналежнасцю ўсходнеславянскага жаночага касцюма, а іх з’яўленне на тэрыторыі Беларусі абумоўлена балцкім уплывам.

ЛІТАРАТУРА


1. Валодзіна, Т. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. Валодзіна. – Мінск: Тэхналогія, 1999. – 167 с.
2. Успенская, А.В. Нагрудные и поясные привески / А.В. Успенская // Очерки по истории русской деревни X – XIII вв.: тр. Гос. ист. музея; под ред. акад. Б.А. Рыбакова. – М.: Изд-во “Советская Россия”, 1967. – Вып. 43. – С. 88 – 133.
3. Рябинин, Е.А. Зооморфные украшения Древней Руси X – XIV вв. / Е.А. Рябинин. – Л.: Наука, Ленингр. отд-ние, 1981. – САИ, Е1-60. – 123 с.
4. Рябинин, Е.А. Языческие привески-амулеты древней Руси / Е.А. Рябинин // Древности славян и Руси; отв. ред. д-р ист. наук Б.А. Тимощук. – М.: Наука, 1988. – С. 55 – 63.
5. Рябинин, Е.А. Финно-угорские племена в составе Древней Руси. К истории славяно-финских этнокультурных связей. Историко-археологические очерки / Е.А. Рябинин. – СПб., Изд-во С.-Петерб. ун-та, 1997. – 260 с.
6. Latvijas PSR arheologija. – Rīga: Zinātne,1974. – 374 lpp, 80 tab.
7. Lībieši senatnē. The Livs in Antiquity. –Rīga,2001. – 53 lpp. – Teksta autori: J. Ciglis, S. Zirne, I. Žeiere.
8. Urbanavičius, V. Archeologiniai tyrimai / V. Urbanavičius, S. Urbanavičienė // Lietuvos archeologija. 6. Obelių kapinynas. Monografija. – Vilnius: Mokslas, 1988. – P. 9 – 63.
9. Рыбаков, Б.А. Русское прикладное искусство X – XIII вв. / Б.А. Рыбаков. – М.: Аврора, 1971. – 128 с.
10. Сапунов, Б.В. Семантика зооморфной подвески XI в. из кургана у д. Калихновщина / Б. В. Сапунов // Археологический сборник Государственного Эрмитажа. 24. – Л., 1983. – С. 111 – 116.
11. Макаров, Н.А. Колонизация северных окраин Древней Руси в XI – XIII вв. По материалам археологических памятников на волоках Белозерья и Поонежья / Н.А. Макаров. – М.: Научно-исслед. центр «Скрипторий», 1997. – 386 с.
12. Семянчук, Г. Исследования археологического комплекса Дрысвяты в 2001 году / Г. Семянчук // Badania archeologiczne w Polsce północno-wschodniej i na zachodniej Białorusi w latach 2000 – 2001. Materiały z konferencji, Białystok 6 – 7 grudnia 2001 roku; redakcja tomu: M. Karczewska, M. Karczewski. – Białystok, 2002. – С. 303 – 310.
13. Гура, А.В. Символика животных в славянской народной традиции / А.В. Гура. – М.: Изд-во “Индрик”, 1997. – 912 с.
14. Гура, А. В. Куница / А. В. Гура // Славянские древности. Этнолингвистический словарь; под ред. Н.И. Толстого. Т. 3. К (Круг) – П. (Перепелка). – М.: Междунар. отношения, 2004. – С. 46 – 47.
15. Фацеева, С. Сімволіка вясельнай паэзіі. Жывёльны свет / С. Фацеева // Роднае слова. – 1999. – № 9 (141). – С. 50 – 57.

16. Gloger, Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. Ze wstępem Juliana Krzyżanowskiego. III / Z. Gloger. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 1978. – 350 s.
17. Иллич-Свитыч, В.М. Опыт сравнения ностратических языков. Введение. Сравнительный словарь. В-К. – Изд. второе, испр. / В.М. Иллич-Свитыч. – М.: УРСС, 2003. – 408 с.
18. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 5. К-Л / уклад. В.У. Мартынаў, І.І. Лучыц-Федарэц; рэд. В.У. Мартынаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 320 с.
19. Топоров, В.Н. Прусский язык. Словарь. I-К / В.Н. Топоров; ответств. ред. В. В. Иванов. – М.: Наука, 1980. – 384 с.
20. Седов, В.В. Амулеты-коньки из древнерусских курганов / В.В. Седов // Славяне и Русь; ред. кол.: Е.И. Крупнов (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1968. – С. 151 – 157.
21. Зайкоўскі, Э.М. Яшчэ раз да пытання пра падвескі з выявай галавы буйной рагатай жывёлы / Э.М. Зайкоўскі // ГАЗ. Вып. 23. – Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэд. кал.: А.А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2007. – С. 167 – 177.
22. Дучыц, Л.У. Браслаўскае Паазер'е ў IX – XIV стст. Гістарычна-археалагічны нарыс / Л.У. Дучыц; пад рэд. Г.В. Штыхава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 120 с.
23. Седов, В.В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья / В.В. Седов // МИА. – М., 1970. – № 163. – 196 с.
24. Jaskanis, D. O kilku przedmiotach obcej proweniencji na wschodnim Mazowszu wczesnego średniowiecza / D. Jaskanis // Swiatowit. Rocznik Instytutu archeologii Uniwersytetu Warszawskiego. Nowa seria. T. I (XLII). Fascykul B. Archeologia pradziejowa i średniowieczna. Archeologia Polski. – Warszawa, 1999. – S. 81 – 88.
25. Jonaitis R. Tyrinėjimai Rotušės aikštėje ir jos prieigose / R. Jonaitis // Archeologiniai tyrinėjimai Lietuvoje 2006 metais. – Redakcinė koegija: G. Zabiela (vyr. redaktorius) ir kit. – Vilnius: Lietuvos archeologijos draugija, 2007. – P. 365 – 368.
26. Голубева, Л.А. Амулеты / Л. А. Голубева // Древняя Русь. Быт и культура. – Археология; отв. ред. тома Б.А. Колчин, Т.И. Макарова. – М.: Наука, 1997. – С. 153 – 165.

*Паступіў 24.06.2012*

**FLAT METAL HORSE PENDANTS: DISTRIBUTION AND SEMANTICS**

***E. ZAIKOUSKI***

*The article deals with issues relating to the distribution and semantics of one of the varieties of flat zoomorphic pendants which became to be called "horses" in archeology studies and can still be found in Early Middle Ages burial mounds and settlements across the basin of the Western Dvina River. Such pendants can be discovered in female burials of the 11th – early 12th century, primarily in the area populated by the Krivichi, as well as in Latvia. Discoveries of horse amulets are mainly typical for the mounds with burials of Eastern type, which is most characteristic of the Slavonized Balts. Several researchers view the above-mentioned type of pendants as not only "horses" but as the images of lynxes, cheetahs, dogs and gryphons. The author provides arguments in favour of the concept that those were in fact sketchy images of the marten, referring to the fact that Slavonic folklore and legends view the animal as possessing female, wedding, erotic and weaving symbols.*

УДК 392.1(476) «19/20»

# ВОСЕНЬСКІЯ ДЗЯДЫ Ў БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ: РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ І ЛАКАЛЬНЫЯ ВАРЫЯНТЫ[1]

*У.Я. АЎСЕЙЧЫК*
*(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)*

*Разглядаюцца восеньскія Дзяды ў беларусаў Падзвіння, вылучаюцца іх рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты. Аналізуецца варыятыўнасць у назве, структуры, часе правядзення, а таксама ў асобных элементах абраду. Прыходзім да высновы, што восеньскія Дзяды з'яўляюцца абрадам, які дэманструе асаблівасці традыцыйнай народнай культуры беларускага насельніцтва Падзвіння. Разам з тым у межах рэгіёна восеньскія Дзяды маюць лакальную варыятыўнасць, якая датычыцца асобных абрадавых дзеянняў, уяўленняў і прадпісанняў, матэрыяльнай абрадавай атрыбутыкі, а таксама праяўляецца ў наяўнасці ці адсутнасці ў канкрэтным рэгіёне пэўных структурных частак абраду.*

**Уводзіны.** Традыцыйная духоўная культура этнасу не з'яўляецца нечым адзіным, гамагенным і цэльным. Па вызначэнні даследчыкаў, яна існуе і функцыянуе выключна ў дыялектнай форме, у форме мясцовых, вузкалакальных варыянтаў, і ўяўляецца як «сістэма лакальных традыцый» [1, с. 47; 2, с. 145]. Дадзеная асаблівасць характэрна як для традыцыйнай духоўнай культуры ў цэлым, так і для яе асобных частак. Яна датычыцца і пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў. У залежнасці ад канкрэтнай тэрыторыі пахавальна-памінальная абраднасць мае пэўную спецыфіку. На гэта неаднаразова звярталі ўвагу даследчыкі. Па словах У.А. Васілевіча, «пахавальны абрад беларусаў у асноўных сваіх момантах праводзіўся і праводзіцца аднолькава ва ўсіх рэгіёнах. Аднак кожны этап стабільных абрадавых дзеянняў у залежнасці ад геаграфічнага бытавання характарызуецца шматлікімі дадатковымі праявамі, афарбоўваецца мясцовымі традыцыямі» [3, с. 16]. Да падобнага меркавання прыходзіць і Т.Б. Варфаламеева. Лакальныя асаблівасці пахавальнага рытуалу, як адзначае даследчыца,назіраецца «як з боку яго абрадавага складу, так і з боку паэтыка-музычных характарыстык галашэнняў (адлюстраваных у тэрміналогіі)» [4, с. 23]. У поўнай ступені дадзеныя асаблівасці можна аднесці і да памінальнай абраднасці беларусаў.

Вывучэнне пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў немагчыма без разгляду канкрэтных яе праяў у межах асобных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. Аналіз арэальнага распаўсюджвання пахавальна-памінальнай абраднасці з'яўляецца важным інструментам яе цэльнага даследавання. Вывучэннем тэрытарыяльнай спецыфікі пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў займаліся розныя даследчыкі. З боку этнамузыколагаў удзялялася значная ўвага вывучэнню лакальных асаблівасцей пахавальных галашэнняў (даследаванні Т.Б. Варфаламеевай [5, с. 84 – 94; 6, с. 67 – 71], З.Я. Мажэйкі [7, с. 23], В.І. Харытонавай [8]). Лінгвісты таксама зрабілі нямала ў гэтым накірунку, сведчаннем чаго сталі матэрыялы 3-га тома «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» [9, с. 102 – 104, карты 285 – 293]. Іншыя часткі пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў менш даследаваны. Разам з тым не аднолькавай ступенню даследавання адрозніваюцца і гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі. Маецца значны вопыт па даследаванні лакальных асаблівасцей палескага пахавальнага абраду [10 – 12]. У адносінах іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, а ў нашым выпадку Падзвіння, такая праца амаль не праводзілася. Праўда, нельга не адзначыць, што падрыхтоўка і выданне тамоў «Традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў» (выйшла 5 тамоў) [13 – 17], кожны з якіх быў прысвечаны асобнаму рэгіёну, з'яўляецца значным укладам у выпраўленне сітуацыі, якая склалася. Аднак у выданнях не ставіўся за мэту поўны і сістэмны аналіз рэгіянальных асаблівасцей і лакальных варыянтаў пахавальна-памінальнай абраднасці кожнага з рэгіёнаў, а таму гэтая праблематыка не атрымала ў іх належнага асвятлення.

Такім чынам, з пазіцыі арэальнага падыходу пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння вывучана слаба. Гэта датычыцца як яе ў цэлым, так і асобных частак. У дадзеным артыкуле прадпрынята спроба вылучыць яе рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты на прыкладзе восеньскіх Дзядоў.

**Асноўная частка.** Перш чым прыступіць да аналізу дадзенай праблематыкі, неабходна зрабіць шэраг папярэдніх заўваг, якія датычацца прынцыпаў і метадалогіі даследавання пазначанага сегмента традыцыйнай духоўнай культуры.

1. У рабоце важным у метадалагічным плане з'яўляецца вызначэнне і суаднясенне паняццяў *«рэгіянальнае»* і *«лакальнае»*. У этналагічнай навуцы дадзеная праблема застаецца яшчэ нявырашанай у дастатковай ступені, а адносна яе вырашэння існуюць розныя, часам нават супрацьлеглыя меркаванні. Як адзначае В.М. Шарая, гэтыя паняцці застаюцца недастаткова распрацаванымі і ў фалькларыстыцы [18, с. 310]. У дадзенай працы мы будзем прытрымлівацца падыходу, які прапанаваў Э.С. Маркаран. Разглядаючы гэ-

[1] Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па тэме «Антрапацэнтрызм і анімізм як аснова мадэлявання свету ў традыцыйнай культуры беларусаў» (грант БРФФД «Наука (НАНБ – вузы)-2011»; дамова № Г 11ОБ-023).

тую праблематыку, даследчык звяртае ўвагу на адноснасць паміж паняццямі «агульныя» і «лакальныя» культурныя традыцыі. Іх суаднясенне, па меркаванні навукоўца, залежыць ад зададзенага поля даследавання. Калі ў якасці такога поля даследавання бярэцца глабальная сацыякультурная сістэма ці сусветная гісторыя, паняцце «агульнай культурнай традыцыі» будзе выражаць узровень вопыту, універсальны для ўсяго чалавецтва ці канкрэтных эпох і ступеней развіцця. Пад паняццем жа «лакальнай культурнай традыцыі» будзе разумецца спецыфіка любога рэгіянальнага вопыту людзей. Калі ў якасці поля даследавання бярэцца канкрэтны рэгіён, паняцце «агульнай культурнай традыцыі» будзе датычыцца ўжо ўзроўню гістарычнага вопыту людзей, агульнага для выдзеленага рэгіёна. Паняцце ж «лакальнай культурнай традыцыі» будзе прымяняцца для характарыстыкі спецыфічнага вопыту, характэрнага для больш вузкіх рэгіянальных адзінак [19, с. 86]. У нашай рабоце, дзе полем даследавання выступае рэгіён Падзвінне, пад «лакальнымі варыянтамі пахавальна-памінальнай абраднасці» будзем разглядаць спецыфічныя яе праявы, характэрныя для канкрэтнай тэрыторыі ў межах рэгіёна. У той жа час пад «рэгіянальнымі асаблівасцямі» будуць разумецца традыцыі, характэрныя для ўсяго рэгіёна, якія выдзяляюцца пасродкам абагульнення тэрытарыяльных варыянтаў дадзенай часткі народнай культуры беларускага насельніцтва і якія будуць выяўляць пэўную адметнасць пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння.

У межах асобнай лакальнай традыцыі даследчыкі часам выдзяляюць і больш дробныя, *мікралакальныя* традыцыі. Пад мікралакальнымі традыцыямі мы будзем разумець азначэнне, прапанаванае балгарскім даследчыкам Т.І. Жыўкавым (такія высновы аўтар робіць у адносінах да прасторы функцыянавання фальклору). За межы асобнай лакальнай традыцыі ён прымае вясковую супольнасць. У яе межах даследчык выдзяляе яшчэ традыцыі родавых калектываў і асобных сем’яў, якія і адносіць да *мікралакальных* традыцый [2, с. 145]. У нашым выпадку мікралакальныя рысы мае родавы характар восеньскіх Дзядоў, што фіксуецца яшчэ і сёння ў некаторых месцах Докшыччыны (гл. ніжэй).

2. Крыніцамі дадзенага даследавання з’яўляюцца этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы, зафіксаваныя на Падзвінні ў XIX – пачатку XXI стагоддзя. Сярод іх значную частку складаюць матэрыялы Архіва гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, сабраныя на працягу 1995 – 2011 гадоў, матэрыялы ўласных палявых даследаванняў аўтара, а таксама матэрыялы асабістага архіва Т.В. Валодзінай[1]. Калі сучасныя палявыя этнаграфічныя матэрыялы ў асноўным ахопліваюць увесь рэгіён Падзвіння, то гэтага нельга сказаць пра этнаграфічныя крыніцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Этнаграфічныя працы гэтага перыяду характарызуюцца неаднароднасцю ў даследаванні розных частак рэгіёна. І калі адны рэгіёны, як, напрыклад, Віцебскі ці Лепельскі паветы, у этнаграфічнай літаратуры гэтага часу прадстаўлены досыць аб’ёмна, то па некаторых, наадварот, матэрыялы поўнасцю адсутнічаюць. Таму вылучыць характэрныя рысы пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння, апіраючыся толькі на адзначаныя матэрыялы, дастаткова праблематычна. У гэтым плане больш інфармацыйнымі з’яўляюцца матэрыялы сучасных палявых даследаванняў. На іх аснове можна таксама рабіць дапушчэнні аб лакальных асаблівасцях пахавальна-памінальнай абраднасці тых рэгіёнаў, па якіх адсутнічаюць больш раннія апісанні. У сваю чаргу тая карціна, якая складваецца на аснове матэрыялаў сучасных палявых даследаванняў, не дае поўнага ўяўлення аб усёй разнастайнасці пахавальна-памінальнай абраднасці асобнага рэгіёна, якая існавала раней. У сучасны перыяд пад уздзеяннем шэрага фактараў многія яе асаблівасці ўжо зніклі ці падвергліся зменам. Разам з тым мы не заўсёды можам сказаць, ці з’яўляецца канкрэтная варыяцыя лакальнай асаблівасцю або гэта больш архаічная (ці, наадварот, сучасная) форма дадзенай часткі народнай культуры. Гэта значна ўскладняе аналіз лакальных асаблівасцей пахавальна-памінальнай абраднасці ў дыяхронным аспекце. Больш плённым уяўляецца спалучэнне сінхроннага і дыяхроннага аналізу пры выяўленні рэгіянальных асаблівасцей і лакальных варыянтаў у пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння.

3. Разглядаючы лакальныя асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння, мы ў першую чаргу будзем мець на ўвазе дадзеную частку народнай культуры беларускага вясковага насельніцтва. Калі лакальныя рысы пахавальна-памінальнай абраднасці ў вясковым асяроддзі нават у сучасны перыяд можна прасачыць, то ва ўмовах горада гэта зрабіць даволі праблематычна. Перш за ўсё такая сітуацыя характэрна для буйных гарадоў Падзвіння (Віцебск, Полацк, Наваполацк). Жыхары, якія пражываюць у дадзеных гарадах, з’яўляюцца выхадцамі з розных рэгіёнаў Беларусі, значная ў іх і колькасць іншаэтнічнага насельніцтва. Такім чынам, сучаснае гарадское насельніцтва, якое прадстаўлена рознымі ў этнічным, канфесійным і тэрытарыяльным плане групамі людзей, не будзе ўваходзіць у рамкі нашага даследавання[2]. У меншай ступені дадзеная асаблівасць датычыцца раённых цэнтраў, якія з пэўнай агаворкай, можна ўключаць у арэальны разгляд пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння.

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку доктару філалагічных навук, загадчыку сектара фалькларыстыкі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі Т.В. Валодзінай за прадстаўленыя палявыя матэрыялы.

[2] Пры гэтым неабходна адзначыць, што жыхары гарадоў, колішнія вяскоўцы, працягваюць захоўваць лакальныя асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці той мясцовасці, з якой пераехалі ў горад. Так, напрыклад, і сёння многія гараджане едуць на могілкі ў тыя дні, якія з’яўляюцца найбольш важнымі памінальнымі ў той мясцовасці, з якой яны паходзяць.

4. Вызначаючы рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці, неабходна ўлічваць рэлігійны фактар. Ва ўмовах традыцыйнага грамадства рэлігія з'яўляецца інтэгральным элементам лакальнай культуры. А прыналежнасць да пэўнага касцёла ці царквы з'яўлялася паказчыкам прыналежнасці да пэўнай лакальнай групы [20, s. 89]. У сувязі з гэтым некаторыя лакальныя асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння якраз і фіксуюцца ў межах аднаго царкоўнага прыхода, або межы прыходу могуць вызначаць тэрыторыю распаўсюджання асобнага элемента, абрадавага дзеяння ці нават усяго абраду. Дадзеную асаблівасць можна прасачыць на прыкладзе Стаўроўскіх Дзядоў. На сучасным этапе бытавання абраду асаблівасці яго тэрытарыяльнага распаўсюджання абумоўліваюцца і дадзеным фактарам. У сувязі з гэтым нават у суседніх вёсках, адлегласць паміж якімі нязначная, але якія адносяцца да розных прыходаў, памінальныя традыцыі могуць адрозніваца. І калі ў адной вёсцы абрад фіксуецца, то ў другой – ён адсутнічае [21, с. 117].

Трэба таксама звярнуць увагу яшчэ на адну асаблівасць, звязаную з рэлігіяй. Гістарычна склалася, што большая частка беларусаў па канфесійнай прыналежнасці падзяляецца на праваслаўных і католікаў. Канфесійныя адрозненні ў значнай ступені ўплываюць на існаванне варыятыўнасці ў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння. Пра адрозненні пахавальна-памінальнай абраднасці беларускага каталіцкага і праваслаўнага насельніцтва адзначаў яшчэ М. Анімеле [22, с. 211 – 212, с. 214]. Існаванне падобных адрозненняў характэрна і для сучаснага перыяду. Улічваючы той факт, што канфесійнае размежаванне беларусаў мае тэрытарыяльны характар (каталіцкае насельніцтва ў асноўным сканцэнтравана ў заходняй частцы рэгіёна), можна было б казаць пра пэўную спецыфіку пахавальна-памінальнай абраднасці заходняй часткі Падзвіння. Асабліва гэта датычыцца каляндарнай памінальнай абраднасці, у тым ліку і Дзядоў. Аднак уласна «лакальнымі» гэтыя асаблівасці лічыцца не могуць, паколькі сустракаюцца таксама ў іншых частках рэгіёна і краіны.

5. Арэальнае вывучэнне пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння накіравана на вызначэнне варыянтаў пэўнага абраду ці яго асобнага элемента ў прасторы. Аднак не кожная варыяцыя вызначаецца толькі тэрытарыяльным фактарам. Лакальная разнастайнасць культуры, як правіла, існуе паралельна з іншымі відамі адрозненняў. Варыятыўнасць вынікае, напрыклад, з сумеснага існавання дзвюх традыцый: народнай і царкоўнай. Паралельнае існаванне двух варыянтаў канкрэтнай з'явы можа сведчыць пра разбурэнне абраду, калі існуюць яшчэ традыцыйныя элементы, але адначасова з'яўляюцца і новыя. Такую сітуацыю можна патлумачыць і разрывамі ў межах некалі аднароднай лакальнай супольнасці, якія ўтвараюцца ў выніку міграцыі насельніцтва. Пры разглядзе нашай праблематыкі неабходна ўлічваць усе гэтыя акалічнасці і аддзяляць такія варыяцыі ад лакальных праяў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння. Але ў выпадку разгляду дадзенай праблематыкі ў сінхронным аспекце розныя варыяцыі, якія маюць тэрытарыяльную абумоўленасць, будуць вызначацца намі як лакальныя варыянты пахавальна-памінальнай абраднасці, незалежна ад умоў і фактараў, што іх выклікалі.

Пры існаванні даволі істотных разыходжанняў тэрытарыяльнага характару ў пахавальным абрадзе і прыватных памінках, якія фіксуюцца на тэрыторыі Падзвіння, іх лакальная варыятыўнасць (за выключэннем Прыкладзінаў) не выходзіць за межы асобных абрадавых дзеянняў, іх семантыкі, абрадавых рэгламентацый і прадпісанняў. Пры гэтым агульная структура, ход і парадак абрадавых дзеянняў застаюцца прыблізна аднолькавымі на тэрыторыі ўсяго рэгіёна. А як можна меркаваць па матэрыялах з іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, яны мала адрозніваюцца ад усяго беларускага этнасу. Больш істотна лакальная варыятыўнасць праяўляецца ў каляндарных памінальных абрадах. Дадзеную рысу можна патлумачыць феноменам, які А.К. Байбурын вызначыў як неаднолькавую ступень рытуалізацыі розных абрадаў у структуры народнага календара жыхароў канкрэтных тэрыторый. Даследчык адзначаў, што калі абрады жыццёвага цыкла больш або менш аднародныя (у плане рытуалізацыі), каляндарныя абрады дастаткова адрозніваюцца па гэтай прыкмеце. Ступень іх рытуалізацыі асабліва істотна адрозніваецца ў лакальных традыцыях, дзе заўсёды выдзяляюцца некалькі галоўных святаў (радзей – адно), а астатнія лічацца (у рознай ступені) другараднымі [23, с. 18].

У цыкле народнага календара беларускага насельніцтва Падзвіння асобае месца займаюць абрады ўшанавання памерлых продкаў – Дзяды. Гэтая памінальная ўрачыстасць з'яўляецца адной з самых архаічных і духоўна адметных традыцый беларускага этнасу. Дзяды распаўсюджаныя толькі ў беларусаў і часткова ўкраінцаў [24, с. 147; 25, с. 470]. Абрад сустракаецца на ўсёй тэрыторыі Падзвіння сярод беларускага праваслаўнага насельніцтва. У беларусаў каталіцкага веравызнання рэгіёна ён фіксуецца не так часта. Пад уплывам касцёла дадзеная памінальная традыцыя была выцеснена «афіцыйнымі» памінкамі, якія прымеркаваны да Дня Задушнага (2.XI). Таму для намінацыі такіх памінак слова «дзяды» беларусамі-католікамі ўжываецца рэдка, а сама ўрачыстасць адбываецца ў адпаведнасці з каталіцкім рытуалам. Пра гэта адзначаюць і самі рэспандэнты каталіцкага веравызнання: *«– А вось Вы казалі, што тут многа Дзядоў, а ў католікаў нешта падобнае ёсць? – Дык Дзядоў няма. У нас другога кастрычніка* [лістапада – *У. А.*] <...> *Гэта Усе Святыя* <...> *Гэта адзін раз у год. А тут Дзяды, Дзядоў многа разоў бываець. Дзяды. Дзяды і Дзяды. Ну вот у праваслаўных Дзяды гэтыя»*[1]. Дадзеная асаблівасць памінальнай абраднасці беларусаў

[1] Зап. Філіпенкам У.С. і Шаўчэнка Я. у 2009 г. ад Марковіч Г.Ф., 1934 г. н., у в. Сценка Докшыцкага р-на.

каталіцкага веравызнання характэрна і для іншых рэгіёнаў краіны [26, s. 447 – 448]. Аднак нягледзячы на гэта ў комплексе памінальных урачыстасцей, прымеркаваных да Дня Задушнага, можна лёгка адшукаць элементы і абрадавыя дзеянні, якія характэрныя для Дзядоў і якія шырока бытуюць ў праваслаўнага насельніцтва рэгіёна. Да іх ліку адносіцца абрадавая трапеза, якая часам ладзіцца дома па вяртанні з могілак. Пра такую трапезу пісаў яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя М. Анімеле [22, с. 214].

Нараўне з назвай «Дзяды» ў рэгіёне фіксуецца і яшчэ адно азначэнне дадзенай памінальнай урачыстасці – «*радзіцельскія суботы*». Такая назва паходзіць з праваслаўнага веравучэння. Праваслаўнай царквой памінанне памерлых адбываецца ў «радзіцельскія суботы» (мясапусная і Троіцкая («усяленскія»), Дзмітраўскія суботы, суботы 2-га, 3-га і 4-га тыдняў Вялікага посту) [27, с. 184 – 186; 28]. Згодна з праваслаўным веравучэннем субота з’яўляецца днём спакою, а таму самым прыдатным для малітваў за памерлых [28]. Пад уплывам царквы як у мінулым (XIX ст.), так і ў сучасны перыяд на Падзвінні дзень спраўлення восеньскіх Дзядоў прыпадае на суботу. Але некаторыя Дзяды, як вынікае з этнаграфічных крыніц, маглі адзначацца ў іншыя дні тыдня. Як згадваў М.А. Дзмітрыеў, часам Дзяды спраўляліся ў чацвер [29, с. 214]. Некаторыя з Дзядоў прымеркаваны да канкрэтнай даты. Так, напрыклад, Стаўроўскія Дзяды на Докшыччыне ў сучасны перыяд прымеркаваны да Узвіжання (14 / 27.IX) [21, с. 118].

Цікавым падаецца і пытанне аб ужыванні тэрміна *«дзяды»* для назвы памерлых продкаў. Яшчэ ў канцы XIX стагоддзя, адзначаў М.Я. Нікіфароўскі, у рэгіёне пад «дзядамі» разумелі ўсіх памерлых, незалежна ад іх полу і ўзросту [30, с. 593]. А як вынікае з матэрыялаў палявых этнаграфічных даследаванняў, дадзены тэрмін і сёння з’яўляецца найбольш распаўсюджаным на тэрыторыі Падзвіння для абазначэння агульнай катэгорыі продкаў. Але, па меркаванні Т.А. Лістова, на беларуска-рускім памежжы сучасная тэрміналогія, якая абазначае сукупнасць памерлых продкаў, значна «абрусела». Калі раней на Захадзе Пскоўскай і Смаленскай абласцей быў прыняты тэрмін «дзяды», то цяпер не толькі на тэрыторыі Расіі, але і ў памежных беларускіх раёнах хутчэй пачуеш тэрмін *«родители»* [31, с. 329]. Праўда, як сведчаць этнаграфічныя крыніцы XIX стагоддзя, на тэрыторыі Падзвіння апошні тэрмін таксама сустракаўся сярод беларускага насельніцтва [22, с. 214; 32, с. 17]. Жыхары сталага ўзросту ў памежных раёнах па абодва бакі мяжы, як адзначае Т.А. Лістова, ў сучасны перыяд яшчэ выкарыстоўваюць абодва тэрміны [31, с. 329].

У рэгіёне Дзяды звычайна спраўляюцца некалькі разоў на год. Іх колькасць мае значную варыятыўнасць у залежнасці ад канкрэтнай тэрыторыі. На Падзвінні беларускае вясковае насельніцтва адзначае Дзяды да шасці разоў на год, але нідзе ў рэгіёне не перавышае гэту лічбу. Сярод беларусаў Докшыччыны нават існуе прыказка адносна такой колькасці Дзядоў: *«Каб сёмы Дзед, дык звёўся б і свет»* [33, р. 130]. Разыходжанні ў колькасці Дзядоў на год характэрныя нават для суседніх вёсак. Так, яшчэ А.Р. Пшчолка адзначаў, што жыхары в. Падмікітаўка Лепельскага павета паміналі сваіх памерлых пяць разоў на год, у той час як суседнія зарачане – шэсць разоў [34, с. 3]. У шэрагу рэгіёнаў Падзвіння распаўсюджана традыцыя спраўляць Дзяды адзін раз на год – восенню. Згодна з матэрыяламі сучасных палявых даследаванняў, дадзеная традыцыя больш характэрная для заходняй часткі Падзвіння. Гэта звязана не толькі з канфесійным фактарам. Як можна меркаваць па матэрыялах з іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, аналагічная сітуацыя характэрна для ўсёй заходняй часткі краіны, у той час ва ўсходняй частцы Беларусі яна мае большую варыятыўнасць [35, с. 82; 36, с. 85, 86; 13, с. 179; 16, с. 95, 142, 221; 15, с. 239 – 240].

Як сведчаць этнаграфічныя крыніцы, найбольш распаўсюджанымі на Падзвінні былі восеньскія (Дзмітраўскія), Масленічныя, Радаўніцкія і Траецкія Дзяды [37, с. 295 – 296; 30, с. 594 – 595; 22, с. 212 – 213].

Асаблівай урачыстасцю сярод беларускага насельніцтва Падзвіння вылучаюцца восеньскія Дзяды. На дадзеную асаблівасць звярталі ўвагу этнографы XIX – першай трэці XX стагоддзя. Гэтыя Дзяды Ю.Ф. Крачкоўскі называў «Багатымі», а В.Ю. Ластоўскі адзначаў, што на Дзісеншчыне яны мелі назву «Вялікія Дзяды» [38, с. 156; 39, с. 67]. Такога ж меркавання прытрымліваюцца і сучасныя вяскоўцы: *«Асяніны гэта дужа даўныя, гэтыя дзядоўскія, прадзеды ўжо гэта спраўлялі, і цяпер спраўляюць гэты Дзяды. Яны дужа бальшыя Дзяды, самые глаўные»*[1]. Для восеньскіх Дзядоў характэрна некаторая варыятыўнасць у назве. У рэгіёне найбольш пашыраныя наступныя назвы абраду: *Асяніны*, *Змітраўка*, *Дзмітраўскія Дзяды*. У некаторых частках рэгіёна лексема *«Дзяды»* якраз і азначае восеньскія Дзяды: *«Дзéды, Дзедаўская гэта называецца, Дзяды, увосень»*[2].

Праваслаўнай царквой устаноўлены дакладны час восеньскага памінання памерлых – Дзмітраўская памінальная субота (апошняя субота перад днём велікамучаніка Дзмітрыя Салунскага, які ўстаноўлены 26.X / 8.XI) [27, с. 182; 28]. Большасць праваслаўнага беларускага насельніцтва рэгіёна адзначае восеньскія Дзяды менавіта ў гэты час (адсюль і існаванне назваў *Змітраўка*, *Дзмітраўскія Дзяды* для намінацыі храноніма). Аднак нягледзячы на афіцыйна ўстаноўлены царквой памінальны дзень, у некаторых частках рэгіёна як у мінулым, так і ў сучасны перыяд восеньскія Дзяды могуць адзначацца ў іншы час. У асноўным гэтая варыятыўнасць у рэгіёне абмяжоўваецца часам ад Пакрова да Дзмітраўскай памінальнай суботы. Дадзеная спецыфіка асабліва заўважная ў тых частках рэгіёна, дзе восеньскія Дзяды но-

[1] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Маскалёнак В.М., 1930 г. н., у в. Таргуны Докшыцкага р-на.

[2] Зап. аўтарам у 2009 г. ад Крыўко Т.М., 1926 г. н., у в. Осцевічы Міёрскага р-на.

сяць родавы (абшчынны) характар. Часцей такія памінкі распаўсюджаны ў межах аднаго населенага пункта, маюць сваю назву (у адпаведнасці з назвай населенага пункта, радзей прозвішча) і могуць адрознівацца часам правядзення: «*А якія яшчэ Дзяды? – Кромаўскія, Мядзельскія, Чысцянскія, эта якая дзярэўня*»[1]; «*У нас Мільчанскія, Кромаўскія і нашы Дзяды. Нашы перва Дзяды, а Кромаўскія тады послі*»[2]. Сучаснымі вяскоўцамі такія разыходжанні ў святкаванні Дзядоў могуць тлумачыцца ўздзеяннем царквы (святара): «*Восенню Дзяды. Ёсь нашы, а тады Змітраўка. Мусіць, бацюшка іх разлажыў. Сакаўскія, Змітраўскія і Юрылаўскія. Памінкі такія*»[3]. Прычыну такога разыходжання Ю.Ф. Крачкоўскі бачыў у імкненні сялян запрашаць для ўдзелу ў сваіх Дзядах сялян з суседніх вёсак. А таму, па меркаванні этнографа, яны святкавалі Дзяды на розных тыднях [38, с. 156]. Для другіх рэгіёнаў Беларусі характэрны і іншыя тэрміны спраўлення восеньскіх Дзядоў: напярэдадні Піліпаўкі, дня Кузьмы і Дзям'яна (1 / 14.XI), Міхайлава дня (8 / 21.XI) [35, с. 82; 24, с. 147; 40, с. 208; 13, с. 181; 17, с. 319; 41, с. 393]. На Падзвінні восеньскія памінанні ў вышэйадзначаныя тэрміны ў этнаграфічнай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзя не фіксуюцца. Не былі яны зафіксаваны і ў ходзе сучасных палявых даследаванняў у рэгіёне (за выключэннем адзінкавага выпадку ўпамінання аб святкаванні Дзядоў напярэдадні Піліпаўкі).

Сама ўрачыстасць восеньскіх Дзядоў заключаецца ў памінальным застоллі, якое ладзіцца дома. Паводле народных уяўленняў, у гэтыя дні душы памерлых продкаў спускаюцца на зямлю, каб паглядзець, як іх ушаноўваюць, і прыходзяць у свае хаты на памінальную трапезу [37, с. 296]. Этнографы XIX стагоддзя звярталі ўвагу на разыходжанні, якія існавалі адносна вызначэння канкрэтнага часу такога памінання. Большасць аўтараў у якасці часу памінання на Дзяды называюць вячэрнюю пару [30, с. 595, 600; 42, с. 58; 43, с. 258]. Таксама і М.Я. Нікіфароўскі згадваў, што галоўная памінальная трапеза ў рэгіёне часцей адбывалася ўвечары. Але ў Віцебскім павеце, па звестках этнографа, яна ладзілася не ўвечары, а раніцай [30, с. 631]. Анімеле ўвогуле адзначаў, што памінальныя застоллі звычайна адбываліся ў паўдзённую пару, не пазней гадзіны ці двух пасля абеду. Аднак пры гэтым абрадавыя трапезы ў розныя памінальныя дні мелі свае адпаведныя назвы. У суботу перад мясапуснай нядзеляй такое застолле мела назву *«палудзінь па радзіцелях»*, на Радаўніцу – *«снеданне па радзіцелях»*, у суботу перад Тройцай – *«абед па радзіцелях»*, у Дзмітраўскую суботу – *«вячэра па радзіцелях»* [22, с. 214]. Як вынікае з матэрыялаў сучасных палявых даследаванняў, у рэгіёне традыцыя памінання памерлых на Дзяды характэрна для вячэрняй пары. У некаторых месцах Падзвіння існавалі і больш дакладныя вызначэнні часу абрадавай трапезы. У в. Лозы Ушацкага раёна было прынята пачынаць вячэру толькі пасля таго, як куры сядуць на курасадню. У адваротным выпадку, як лічылася, гэта можа негатыўна паўплываць на будучы ўраджай: «*А кашу нельзя было начанаць з-за таго, што птушкі тады з'ядуць ніву*»[4].

На Падзвінні памінанне продкаў на Дзяды адбывалася звычайна ў адзін дзень, у адрозненне ад іншых рэгіёнаў, дзе фіксуюцца памінанні ў два ці нават у тры дні [10, с. 252 – 253; 17, с. 320; 13, с. 179; 16, с. 222; 35, с. 82]. Аднак некаторыя крыніцы сведчаць, што ў шэрагу месцаў рэгіёна памінанне памерлых ладзілася таксама ў два дні. Як адзначаў А.Я. Багдановіч, на Лепельшчыне яшчэ ў XIX стагоддзі напярэдадні Дзядоў святкаваліся «Бабы» [44, с. 56]. Абрадавы бок «Баб», як пазначае даследчык, амаль нічым не адрозніваўся ад «Дзядоў». Выключэнне складала толькі колькасць страў, якіх на Дзяды гатавалася больш [44, с. 56]. Існаванне разам у адной лакальнай традыцыі «Баб» і «Дзядоў» можа сведчыць аб тым, што ў мінулым памінанне продкаў адбывалася ў два дні, у залежнасці ад полу памерлых. У сучасны перыяд такой асаблівасці ў рэгіёне ўжо не сустракаецца. Троіцкі А. згадваў, што сяляне в. Гняздзілава (сучасны Докшыцкі раён) напярэдадні Асянін, у чацвер, праводзілі *«прыдзедкі»*. Аўтар паведамляў, што яны ладзіліся з мэтай паесці і папіць уволю, паколькі на Асяніны за гасцямі сем'яніну не заўсёды ўдавалася гэтага зрабіць [43, с. 258].

Абрадавай трапезе і святкаванню Дзядоў папярэднічала стараннае прыгатаванне. Напярэдадні свята абавязкова прыбіралі ў хаце і на панадворку [30, с. 595 – 596; 34, с. 9 – 11]. Абавязковай працэдурай напярэдадні Дзядоў было мыццё ў лазні. На дадзеным этапе прыгатавання да святкавання існавалі свае лакальныя асаблівасці ў залежнасці ад часу яго правядзення. Некаторыя этнаграфічныя крыніцы сведчаць, што на Падзвінні ў лазні мыліся або ў дзень, які папярэднічаў Дзядам (Віцебскі павет) [30, с. 598, с. 631], або на самі Дзяды (Лепельскі, Гарадоцкі, Вілейскі (сучасны Докшыцкі раён) паветы) [30, с. 631; 34, с. 16 – 18; 45, с. 376; 43, с. 258]. Як паказваюць праведзеныя палявыя даследаванні, менавіта апошні варыянт з'яўляецца больш распаўсюджаным у сучасны перыяд у рэгіёне.

Цэнтральнае месца ў памінанні продкаў на восеньскія Дзяды займае абрадавая трапеза, якая таксама мае назву *«дзяды»*. Колькасць і асартымент страў, якія гатавалі да абрадавай трапезы, звычайна залежылі ад дастатку сям'і. Але амаль паўсюдна ў рэгіёне было распаўсюджана патрабаванне гатаваць да

[1] Зап. Валодзінай Т.В. і Гурскай Ю.А. у 2007 г. ад Сакалоўскай М.А., 1924 г. н., у в. Грабяні Докшыцкага р-на.
[2] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Лукашэвіч М.А., 1926 г. н., у в. Грабяні Докшыцкага р-на.
[3] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Аксючыц Н.Н., 1936 г. н., Паплёўка М.М., 1935 г. н., у в. Сакавічы Докшыцкага р-на.
[4] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Ліленка М.Р., 1926 г. н., у в. Лозы Ушацкага р-на.

памінальнага стала на Дзяды няцотную колькасць страў [37, с. 296; 46, s. 378]. Падобныя перакананні бытуюць яшчэ і сёння сярод беларусаў Лепельшчыны: *«Сем ці пяць страў, каб няцотна, на стол ставілі»*[1]. У сучасны перыяд дадзеная колькасць памінальных страў звычайна не лічыцца абавязковай, і яна значна скарачаецца. Для Падзвіння найбольш характэрнымі ў сучасны перыяд з'яўляюцца тры стравы: куцця, поліўка (юшка) і клёцкі: *«Восенню. Тады ўжо на памінкі паміналі Дзядоў. <...> – А што было абізацельна? – Камы, поліўку, кашу»*[2] (Расонскі раён); *«– А як даўней паміналі? Ці адлівалі што Дзядам? – Ну, адлівалі, канешне. Канешне адлівалі. А я не адліваю. Тады, бывала, адліём клёцак, полівачкі зверху. Звару рысу на кашу»*[3] (Чашніцкі раён). На Лепельшчыне таксама абавязковымі лічацца куцця, юшка і клёцкі, якія часам замяняюць блінамі [47, с. 223]. Гэтыя ж тры асноўныя памінальныя стравы на Дзяды характэрныя для Барысаўскага і Лагойскага раёнаў Мінскай вобласці, у той час як для другіх раёнаў Мінскай вобласці характэрныя іншыя наборы рытуальных страў [17, с. 323; 48, л. 322]. У дадзеным элеменце прасочваецца тыпалагічнае падабенства і нават роднасць традыцыйнай культуры Барысаўскага і Лагойскага раёнаў з Падзвінскім рэгіёнам.

У некаторых частках рэгіёна асартымент страў мог некалькі адрозніваццa: *«Бліны пяклі, поліўку, кашу»*[4]; *«Далжна быць крупяная каша, далжны аладдзі быць, клёцкі»*[5]. У беларусаў Докшыччыны на памінальным стале абавязковым быў гарачы суп з капусты ці буракоў: *«Ну, вот нада капуста каб была, каша, каб была абязацельна і бліны, астальное ўсе дабаўка. Там ілі капуста, ілі буракі, ну вот первае блюда»*[6].

Разам з разыходжаннямі ў асартыменце памінальных страў, адрозненні маглі датычыцца нават рэцэптаў і ходу прыгатавання адных і тых жа страў. Так, напрыклад, у заходняй і цэнтральнай частках Падзвіння клёцкі, якія гатавалі да абрадавага стала на Дзяды (як і на іншыя памінкі) рабілі «з душамі». Як сведчаць крыніцы, такая традыцыя характэрна для Дзісеншчыны [39, с. 68]; Лепельшчыны: *«З душамі абізацельна, не бялёныя, душа чалавечая ўхадзіла на эты Дзяды. Дык усё ўрэмя з душамі»*[7]; Полаччыны [49, с. 222]; Ушаччыны: *«Як даўней нашы гатавалі клёцкі... Бульбяныя. Бульбы надзераш, муку сыпеш, тады замесіш. – А туды клалі што-небудзь? – Клалі. Хто посныя дзелаў, а хто клаў сала, кусочкамі парэжаш. – А можа называліся яны як-небудзь спецыяльна? – З душамі, ці з душэй»*[8]; Шумілiншчыны: *«На памінкі куццю раньшэ, поліўку варылі, клёцкі варылі... – А клёцкі якія? – Ну з картошкі патрэш. – Ну з мясам? – З мясам, з душамі»*[9]. У той жа час на Талочыншчыне: *«Што абізацельна на стол? – Поліўку, клёцкі. – І з душамі? – Не, у малацэ»*[10], Чашніччыне клёцкі гатавалі звычайна з мукі ў малацэ, і без «душ» [50, с. 236]; на Браслаўшчыне часам гатавалі рыбныя клёцкі [51, с. 84].

Памінальная вячэра на восеньскія Дзяды пачыналася з малітвы і рытуальнага запрашэння памерлых продкаў на трапезу. Этнаграфічныя крыніцы XIX стагоддзя прадстаўляюць розныя апісанні дадзенага абрадавага дзеяння. Згодна з апісаннем з Полацкага і Дрысенскага паветаў, напачатку вячэры гаспадар запальваў свечку, ставіў яе на кут і пачынаў малітву. Пасля малітвы ўсе садзіліся за стол, а гаспадар запрашаў на вячэру продкаў: *«Святыя дзяды, завем вас, святыя дзяды, ідзіце да нас! Ёсьць тут ўсё, што Бог даў, што я лі вас ахвяраваў, чым толька хата багата. Святыя дзяды, просім вас, хадзіце, ляціце да нас!»* [30, с. 596]. Потым наліваў чарку гарэлкі так, каб праз краі пралівалася некалькі кропель («для дзядоў»), і выпіваў. За ім паўтаралі ўсе прысутныя [30, с. 596]. Падобныя апісанні абраду характэрныя і для Віцебскага (былога Суражскага) павета [45, с. 374]. У іншых частках Падзвіння рытуал запрашэння памерлых продкаў мог быць некалькі іншым. У Талачынскім раёне сустракаецца такі варыянт: *«Як усё было. Блін адкладзеш на вакно і завеш: Хадзіця, тамацька, усе к свайму столу. Перабіраеш усіх па імёнах»*[11]. У в. Кромавічы Докшыцкага раёна для запрашэння памерлых продкаў на Дзяды маглі адмыслова выходзіць на вуліцу [33, p. 109].

На Падзвінні яшчэ і сёння фіксуецца традыцыя, перш чым прыступаць да трапезы, адкладаць ад кожнай стравы дзядам у асобную міску і адліваць ім у чарку гарэлку: *«Кладзём, да-да, малая тарэлачка і каждага блюда, што толька строіш, усё адкладываіш. І дажэ і чарачкі ўліеш туды»*[12]. У п. Обаль Шумілінскага раёна на «дзедаўскую» талерку таксама клалі і грошы [49, с. 223]. Гэта талерка павінна была заставацца на стале і яе не прыбіралі да раніцы. Яе маглі таксама ставіць на акно або падаконнік

[1] Зап. Валодзінай Т.В. у 1999 г. ад Якубоўскай Э.Б., 1937 г. н., у в. Гадзіўля Лепельскага р-на.
[2] Зап. Лобачам У.А. і Валодзінай Т.В. у 2009 г. ад Машарскай Л.С., 1922 г. н., у в. Забор'е Расонскага р-на.
[3] Зап. Лобачам У.А. і Валодзінай Т.В. у 2008 г. ад Паўлоўскай Л.Н. 1938 г. н., у в. Млын Чашніцкага р-на.
[4] Зап. аўтарам, Філіпенкам У.С., Круткіным А. у 2010 г. ад Пілімон Г.І., 1935 г. н., у в. Шо Глыбоцкага р-на.
[5] Зап. Валодзінай Т.В. і Лобачам У.А. у 2008 г. ад Шчэрбік Н.Б., 1925 г. н., у в. Стаўбцы Чашніцкага р-на.
[6] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Васюковіч В.У., 1935 г. н., у в. Чарніца-2 Докшыцкага р-на.
[7] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Буржынскай Н.К., 1918 г. н., у в. Завадзіна Лепельскага р-на.
[8] Зап. у 2006 г. ад Аўтух Д.Ц., 1912 г. н., у в. Вашкова Ушацкага р-на).
[9] Зап. Лобачам У.А. і аўтарам у 2008 г. ад Грузневіч В.І., 1923 г. н., у в. Пабеда Шумілінскага р-на.
[10] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Ступак С.М., 1926 г. н., у в. Лаўрэнаўка Талочынскага р-на.
[11] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Ступак С.М., 1926 г. н., у в. Лаўрэнаўка Талочынскага р-на.
[12] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Дунец Н.А., 1921 г. н., у в. Таргуны Докшыцкага р-на.

за акном [30, с. 596, 600, 601; 45, с. 374, 375 – 376]. Назаўтра гэтую ежу аддавалі жабракам, або хатняй жывёле [30, с. 597, 599; 46, s. 379]. У в. Баяры Барысаўскага раёна талерку з ежай для дзядоў выносілі на двор [49, с. 223]. На другі дзень яе з'ядалі самі, каб не балелі зубы [49, с. 223]. А ў в. Завадзіна Лепельскага раёна зафіксавана традыцыя адносіць гэту ежу на магілкі [52, с. 180]. У некаторых лакальных варыянтах абраду для дзядоў мог накрывацца асобны стол. У с. Домжарыцы[1] (сучасны Лепельскі раён) стол для дзядоў ставілі каля парога. Падаючы на стол вячэру для сям'і, гаспадыня перш за ўсё аддзяляла частку ад кожнай стравы і ставіла на стол каля парога [53, с. 188]. У в. Гняздзілава (сучасны Докшыцкі раён) «стол» для дзядоў рабілі на лаве каля печы ля стаўбца. Туды адлівалі крыху пітва і стравы, пасыпалі солі і клалі кавалак хлеба [43, с. 258].

Пасля «адкладання» дзядам часткі страў і «адлівання» гарэлкі сям'я прыступала да вячэры. Спажыванне страў на Дзяды мела свой парадак. У залежнасці ад рэгіёна ён мог адрозніваццa. Так, на Лепельшчыне, першай рытуальнай стравай, з якой пачыналі святочную вячэру, была куцця, на сярэдзіне вячэры падавалі клёцкі, а завяршалі стол поліўкай [47, с. 222]. У некаторых лакальных варыянтах Докшыччыны памінальную трапезу завяршалі куццёй: *«На стале далжна быць капуста, мяса, а патом ў паследствіі каша <…> Самая паследняя каша: каша ілі рысавая, ілі манавая, ілі грэчневая»*[2]. Розныя варыянты сустракаюцца нават у межах невялікага рэгіёна (в. Лаўрэнаўка і в. Трасцянка Талачынскага раёна): *«– А што перва начанаеш есці? – Гарэлкі вып'еш і закусавай што ёсь. А клёцка – эта сама паследняя»*[3]; *«*[На Дзяды – *У. А.*] *Перва начынаюць кушаць кашу. А поліўку паследнюю»*[4].

У некаторых лакальных варыянтах абраду памінальная вячэра завяршалася провадамі дзядоў. Гэтыя провады маглі нават суправаджацца адпаведнай рытуальнай формулай: *«Святые Дзяды! Елі і пілі, ідзіце да сябе»* [46, s. 379]. У сучасны перыяд гэта могуць быць больш простыя рытуальныя дзеянні ці словы: *«Пасля вячэры паспасібаваеш дзядом: "Спасіба, дзядочкі", – і ідзеш спаць»* [33, p. 12].

Пасля памінальнай трапезы астаткі ежы са стала не прыбіраюць. Лічыцца, што пасля трапезы жывых за стол на вячэру з'явяцца душы памерлых продкаў. Аднак, як адзначаў М.Я. Нікіфароўскі, у Віцебскім павеце астаткі страў спецыяльна прыбіралі са стала, пакідаючы толькі хлеб і соль [45, с. 376].

Абрадавая вячэра на Дзяды патрабавала вельмі строгай рэгламентацыі паводзін і выканання спецыфічных патрабаванняў. Некаторыя з іх былі звязаныя з верай у тое, што на памінальнай трапезе прысутнічаюць таксама і душы памерлых продкаў. Так, на Лепельшчыне (с. Домжарыцы) існаваў парадак, згодна з якім у час памінальнай вячэры, пасля ўсялякага спажывання ежы, лыжкі трэба абавязкова класці на стол. У гэтыя кароткія перапынкі, як лічылася, імі карыстаюцца душы памерлых продкаў, якія вячэраюць разам з усімі з той жа міскі [53, с. 188]. У некаторых месцах Лепельскага раёна сустракаюцца больш дэталёвыя прадпісанні адносна таго, як трэба класці лыжкі: *«І ложкі на Дзяды ні так клалі. Так кладзеш выемкай уверх, а то ўніз на Дзяды нада. І ясі так: зачарпнуў адзін раз, у рот узяў, а тады палажы ўніз выемкай»*[5]. Можна меркаваць, што дадзенае прадпісанне звязанае з верай у тое, што ў адваротным выпадку памерлыя продкі будуць есці з такой лыжкі і гэта можа нашкодзіць чалавеку. Такое ўяўленне з'ўляецца даволі характэрным для ўсходнеславянскіх народаў [54, с. 124]. У Чашніцкім раёне былі распаўсюджаны іншыя ўяўленні, а таму лыжку клалі наадварот: *«Ясі і ложку кладзеш. Тата гавораць: "Ложку кладзі дагары. Той выемкай што ясі. Каб яна ляжала кверху. Каб дзяды маглі з'есці". Такія былі законы»*[6]. На Бешанкоўшчыне існаваў такі ж парадак, але тлумачэнне было іншым: *«Ложкі не кладуць ніц, а дагары, бо пакойнік ляжыць не ніц, а дагары»* [49, с. 222].

На Дзяды, як і ў іншыя святы, існавала строгая забарона на гаспадарчую працу. Як адзначаюць рэспандэнты, забарона датычыла толькі другой паловы дня (тэмпаральныя рамкі свята): *«Дзяды – памінаюць памёршых, ну вот як ужо гаварацьː "С абеда ужо Дзяды, нічога ня робце, да абеда робяць, с абеда кашу вараць"»*[7]. З іншага боку, гэты святочны час быў насычаны дзеяннямі рытуальнага характару рознай скіраванасці (ачышчальныя і засцерагальныя дзеянні, падмацаванне здароўя, прадказання будучага, надвор'я і г.д.) [55, л. 92]. Так, на Лепельшчыне на Дзяды казалі: *«ешця клёцкі з малаком, тады летам камары ня будуць кусаць»*[8]. Разам з тым «менавіта святочныя дні максімальна канцэнтруюць у сабе цэлую сістэму знакаў (інтэрпрэтаваных навукай як прыкметы і павер'і, але аднолькава «слушных» і «правільных» для чалавека традыцыі), які прадказваюць, прагназуюць будучае ў межах гадавога кола» [55, л. 93]. У рэгіёне даволі характэрнымі на Дзяды з'яўляліся прыкметы, якія могуць прадвяшчаць смерць. Як адзначаў М.Я. Нікіфароўскі, калі на памінальнай вячэры з рук гаспадара выпадзе хлеб, лыжка, нож і асабліва калі нож уторкнецца ў падлогу, то лічылася, што ў хаце на працягу года будзе нябожчык [37, с. 296 – 297].

---

[1] Апісанне абраду, зробленае ў с. Домжарыцы, адносіцца да Траецкіх Дзядоў. Аднак падабенства паміж абрадавымі дзеяннямі на розныя Дзяды дае падставу меркаваць аб наяўнасці дадзенай асаблівасці і ў восеньскіх Дзядах.

[2] Зап. экспедыцыяй ПДУ у 2009 г. ад Кавалевіч З.І., 1936 г. н., у в. Дзедзіна Докшыцкага р-на.

[3] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Ступак С.М., 1926 г. н., у в. Лаўрэнаўка Талочынскага р-на.

[4] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Падабед Р.І., 1923 г. н., у в. Трасцянка Талочынскага р-на.

[5] Зап. Валодзінай Т.В. у 1999 г. ад Якубоўскай Э.Б., 1937 г. н., у в. Гадзіўля Лепельскага р-на.

[6] Зап. Валодзінай Т.В. у 2007 г. ад Пясецкай В.П., 1931 г. н., у в. Падрэзы Чашніцкага р-на.

[7] Зап. Мішыным П.І., Мішынай В.І., студэнтамі ПДУ Мілянцеем А. і Шыпілам У. у 2007 г. у в. Губіна Лепельскага р-на.

[8] Запісана Валодзінай Т.В. у 1999 г. ад Якубоўскай Э.Б., 1937 г. н., у в. Гадзіўля Лепельскага р-на.

Па меркаванні беларускага насельніцтва, смерць на працягу года можа здарыцца і калі на Дзяды патухне лучына ці ад яе адпадзе палаючы кавалак і, уторкнуўшыся ў падлогу, будзе нагадваць свечку [37, с. 297].

Дзяды, па меркаванні беларусаў Падзвіння, з'яўляліся даволі прыдатным часам для лячэння некаторых захворванняў. Сітуацыя часава-прасторавага «памежжа» (а фактычна адсутнасць гэтай мяжы, мяжы паміж «тым» і «гэтым» светам), якая характэрная для свята, адзначаецца магчымасцю ўзаемадзеяння са звышнатуральнымі сіламі, у тым ліку і магчымасцю звяртацца да іх за дапамогай пры лячэнні хвароб. У гэтым плане з ліку каляндарных свят асабліва вылучаюцца памінальныя дні, якія былі «спецыяльна» прызначаныя для кантакту з памерлымі продкамі. Дзейснымі сродкамі ад розных хвароб лічыліся прадметы, якія судакраналіся з «тагасветам» ці яго агентамі. Так, на Докшыччыне і Барысаўшчыне эфектыўным сродкам ад зубнога болю лічыліся гарэлка і стравы, якія пакідаліся на ноч для дзядоў [49, с. 223; 33, р. 18 – 19, 53].

**Заключэнне.** Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння выяўляе рэгіянальныя асаблівасці. Яны прасочваюцца як па асобных элементах, іх групах, так і цэлых абрадах. У якасці абраду, які дэманструе асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці беларускага насельніцтва рэгіёна, выступаюць восеньскія Дзяды. Адметнасць дадзенай часткі народнай культуры з'яўляецца састаўной часткай этнакультурнай спецыфікі ўсяго Падзвінскага рэгіёна. Разам з тым у межах гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Беларускае Падзвінне восеньскія Дзяды маюць лакальную варыятыўнасць. Яна датычыць як асобных абрадавых дзеянняў, іх семантыкі, уяўленняў і прадпісанняў, матэрыяльнай абрадавай атрыбутыкі, а таксама праяўляецца ў наяўнасці ці адсутнасці ў канкрэтным рэгіёне пэўных структурных частак абраду. Нягледзячы на мадэрнізацыю і ўніфікацыйныя тэндэнцыі ў культуры беларусаў у XX – пачатку XXI стагоддзя, восеньскія Дзяды ў беларускага насельніцтва Падзвіння яшчэ і сёння працягваюць захоўваць лакальную разнастайнасць. Праўда, у выніку вышэйадзначаных працэсаў многія лакальныя варыянты дадзенай часткі народнай культуры зніклі з абрадавай практыкі, а шэраг з іх захоўваецца толькі ў пасіўнай форме (у памяці інфармантаў).

## ЛІТАРАТУРА


1. Толстой, Н.И. Язык и народная культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике / Н.И. Толстой. – 2-е изд., испр. – М.: Индрик, 1995. – 512 с.
2. Путилов, Б.Н. Фольклор и народная культура / Б.Н. Путилов. – СПб.: Наука, 1994. – 238 с.
3. Васілевіч, У.А. Беларускія жалобныя абрады і галашэнні / У.А. Васілевіч // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні; рэдкал. А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]; уклад. тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча; артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – С. 5 – 59.
4. Варфоломеева, Т.Б. О традиции похоронного причитания междуречья Дитвы и Пелясы / Т.Б. Варфоломеева // Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд: тез. докл. – М.: Наука, 1985. – С. 23.
5. Варфаламеева, Т.Б. Пахавальныя галашэнні ў сучасных запісах. Тыпы напеваў і раёны іх пашырэння / Т.Б. Варфаламеева // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні; рэдкал. А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]; укладанне тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча; Артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – С. 60 – 96.
6. Варфаламеева, Т. Сямейна-абрадавы цыкл / Т. Варфаламеева; // Беларусы / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка; Нац. акад. навук Беларусі; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – Т. 11: Музыка. – С. 41 – 88.
7. Мажэйка, З.Я. Песні беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 494 с.
8. Харитонова, В.И. Полесская традиция причитания на восточнославянском фоне / В.И. Харитонова // Славянский и балканский фольклор / Духовная культура Полесья на общеславянском фоне; отв. ред. Н.И. Толстой. – М.: Наука, 1986. – С. 55 – 62.
9. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: у 5 т. / АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; пад рэд. Ю.Ф. Мацкевіча. – Мінск: Фонд фундам. дасл. Рэсп. Беларусь, М-ва архітэктуры і буд-ва Рэсп. Беларусь, 1996. – Т. 3: Чалавек; уклад. А.П. Груцо [і інш.]; навук. рэд. І.Я. Яшкін. – 115, [293] с.
10. Седакова, О.А. Материалы к описанию полесского погребального обряда / О.А. Седакова // Полесский этнолингвистический сборник. Материалы и исследования. – М.: Наука, 1983. – С. 246 – 262.
11. Свительская, В.Л. Опыт картографирования полесского погребального обряда / В.Л. Свительская // Славянский и балканский фольклор / Этнолингвистическое изучение Полесья. – М.: Индрик, 1995. – С. 188 – 208.
12. Митюкова, Е. Территориальные особенности полесского погребального обряда / Е. Митюкова // Моўнакультурная прастора Берасцейшчыны: зб. навук. арт.; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, каф. гісторыі беларус. мовы і дыялекталогіі; рэдкал.: М.М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст: Альтэрнатива, 2010. – С. 136 – 140.
13. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.

14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 910 с.
15. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В.І. Басько [і інш.]; аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2006. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне: у 2 кн. Кн. 1. – 608 с.
16. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В.І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – Т. 4: Брэсцкае Палессе: у 2 кн. Кн. 1. – 559 с.
17. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В.І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2010. – Т: 5. Цэнтральная Беларусь: у 2 кн. Кн. 1. – 847 с.
18. Шарая, В.М. Лакальнае і рэгіянальнае ў традыцыйнай духоўнай культуры: асаблівасці метадалогіі даследавання / В.М. Шарая // Наука, образование и культура: состояние и перспективы инновационного развития: материалы междунар. науч.-практ. конф., г. Мозырь, 27 – 28 апр. 2008 г.: в 2 ч. – Мозырь: УО МГПУ им. И.П. Шамякина, 2008. – Ч. 2. – С. 310 – 312.
19. Маркарян, Э.С. Узловые проблемы теории культурной традиции / Э.С. Маркарян // Советская этнография. – 1981. – № 2. – С. 78 – 96.
20. Straczuk, J. Cmentarz i stół. Pogranicze prawosławno-katolickie w Polsce i na Białorusi / J. Straczuk. – Wrocław: Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 2006. – 275 s.
21. Аўсейчык, У.Я. Абрад Стаўроўскія Дзяды на Докшыччыне / У.Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21 – 23 красав. 2011 г.: у 2 ч. Ч. 2; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – С. 111 – 123.
22. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. II. – С. 111 – 268.
23. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К. Байбурин. – СПб.: Наука, 1993. – 240 с.
24. Шарая, О.Н. Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н. Шарая. – Мінск: Тэхналогія, 2002. – 249 с.
25. Ліс, А.С. Восеньская каляндарная лірыка, яе тыпалогія і паэтыка / А.С. Ліс // Каляндарна-абрадавая паэзія / А.С. Ліс, А.І. Гурскі, В.М. Шарая, У.М. Савіцкі; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – С. 464 – 510.
26. Charytoniuk, G. Biłoruski obrzęd dziadów w literaturze przedmiotu i w pamięci mieszkańców wsi // Pogranicza Białorusi w perspektywie interdyscyplinarnej / Red. E. Smułkowa, A. Engelking. – Warszawa: DiG, 2007. – S. 439 – 459.
27. Верещагина, А.В. Праздники и таинства в жизни христиан Беларуси / А.В. Верещагина. – Минск: Беларус. навука, 2009. – 232 с.
28. О поминовении усопших по уставу православной церкви [Электронный ресурс] // «Око церковное» – литургическая библиотека. – Режим доступа: http://www.liturgica.ru/bibliot/usopsh/usopsh2.html. – Дата доступа: 07.05.2012.
29. Дмитриев, М.А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края / М.А. Дмитриев. – Вильно: Печатня А.Г. Сыркина, 1869. – 264 с.
30. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1890. – Т. I. Ч. II: Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – XXXIV, 712 [4] с.
31. Листова, Т.А. Региональная специфика обрядовой культуры (на примере семейных обрядов) / Т.А. Листова // Белорусско-русское пограничье. Этнологическое исследование; отв. ред. Р.А. Григорьева, М.Ю. Мартынова. – М.: РУДН, 2005. – С. 235 – 348.
32. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1902. – Т. III. – 596 с.
33. Tautosaka 2006 m. liepos mėnesį prie Neris ištakų surinkta Lietuvos ir Baltarusijos mokslininkų grupės, vadovaujamos Vykinto Vaitkevičiaus // Рукапісны фонд літоўскага фальклору Інстытута літоўскай літаратуры і фальклору. – Спр. 7647.
34. Пщелко, А.Р. Деды. Этнографический очерк из жизни Лепельских белорусов / А.Р. Пщелко. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1898. – 23 с.
35. Толстая, С.М. Деды в полесском народном календаре / С.М. Толстая // Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд: тез. докл. – М.: Наука, 1985. – С. 81 – 83.
36. Агапкина, Т.А. Очерки весенней обрядности Полесья / Т.А. Агапкина // Славянский и балканский фольклор / Этнолингвистическое изучение Полесья. – М.: Индрик, 1995. – С. 21 – 107.
37. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1897. – 307 с.
38. Крачковский, Ю.Ф. Быт западнорусского селянина / Ю.Ф. Крачковский. – М.: Изд. Имп. О-ва истории древностей России при Моск. ун-те, 1874. – 212 с.

39. Пагашчанін. Крывічанскія дзяды / Пагашчанін // Крывіч. – ліпень 1926 – сакавік 1927. – № 12. – С. 66 – 69.
40. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар / А.Ю. Лозка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Полымя, 2002. – 240 с.
41. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных / У.М. Сысоў. – Мінск: Выш. шк., 1997. – 415 с.
42. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская Типография, 1895. – VIII, 548, CLIV с.
43. Троицкий, А. Уклад / А. Троицкий // Литовские епархиальные ведомости. – 27 июля 1875. – № 30. – С. 69 – 70.
44. Богданович, А.Е. Пережитки древняго миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А.Е. Богданович. – Гродно: Губернская типография, 1895. – III, 186 с.
45. Шейн, П.В. Белорусские народные песни / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. П. Майкова, 1874. – 548 с.
46. Tyszkiewicz, E. Opisanie powiatu Borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim. Z dodatkiem wiadomości: o obyczajach, śpiewach, przysłowiach i ubiorach ludu, gusłach, zabobonach i t.d. / E. Tyszkiewicz. − Wilno: Drukarnia Ant. Marcinowskiego, 1847. − 489, IV s.
47. Пшонка, Т.М. Асаблівасці выкарыстоўвання традыцыйнай ежы ў святах народнага календара Лепельшчыны / Т.М. Пшонка // Народная культура Віцебшчыны: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі «Працэсы мадэрнізацыі народнай культуры і вопыт устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны па захаванню традыцый», 26 – 27 мая 2005 г.: [прысвеч. 160-годдзю М. Нікіфароўскага] / рэдкал. Л. Вакар [і інш.]. – Віцебск: УА «ВДУ» імя П.М. Машэрава, 2007. – С. 219 – 224.
48. Дулебо, А.И. Современный общественный и семейный быт белорусских колхозников: дис. ... канд. ист. наук / А.И. Дулебо. – Минск, 1966. – 367 л.
49. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. Ч. 2. – 368 с.
50. Шамбурова, Н. Адметнасці народнай кухні Чашніцкага раёна і яе сувязь з календаром народных святаў / Н. Шамбурова // Народная культура Віцебшчыны: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі «Працэсы мадэрнізацыі народнай культуры і вопыт устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны па захаванню традыцый», 26 – 27 мая 2005 г.: [прысвеч. 160-годдзю М. Нікіфароўскага] / рэдкал. Л. Вакар [і інш.]. – Віцебск: УА «ВДУ» імя П.М. Машэрава, 2007. – С. 233 – 236.
51. Зінкевіч, Э. Адметнасці народнай кухні Браслаўшчыны і яе сувязь з календаром свят / Э. Зінкевіч // Народная культура Віцебшчыны: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі «Працэсы мадэрнізацыі народнай культуры і вопыт устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны па захаванню традыцый», 26 – 27 мая 2005 г.: [прысвеч. 160-годдзю М. Нікіфароўскага]; рэдкал. Л. Вакар [і інш.]. – Віцебск: УА «ВДУ» імя П.М. Машэрава, 2007. – С. 79 – 85.
52. Аўсейчык, У.Я. Абрад Дзяды на Лепельшчыне (па матэрыялах сучасных палявых даследаванняў) / У.Я. Аўсейчык // Лепельскія чытанні: матэрыялы IV навук-практ. канф. (Лепель, 17 – 18 верас. 2010 г.); рэдкал.: Я.А. Грэбень; А.У. Стэльмах. – Мінск: Медысонт, 2011. – С. 176 – 182.
53. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / рэдкал. А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]; укладанне тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча; Артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
54. Толстой, Н.И. Переворачивание предметов в славянском погребальном обряде / Н.И. Толстой // Исследования в области балто-славянской духовной культуры (Погребальный обряд). – М.: Наука, 1990. – С. 119 – 128.
55. Лобач, У.А. Уяўленні аб прасторы і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX – пач. XX ст.): дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.07 / У.А. Лобач. – Мінск, 2003. – 116 л.

*Паступіў 11.06.2012*

## THE AUTUMN DZIADY OF BELARUSIAN DVINA REGION: REGIONAL PECULIARITIES AND LOCAL VARIATIONS

***U. AUSEICHYK***

*The article is devoted to the review of the regional peculiarities and local variations of the rite of the autumn Dziady of Belarusian Dvina region. The variation in the name of the rite, in its structure, in its time of implementation and in some rite elements are analized. We make a conclusion that the autumn Dziady acts as a rite that shows the peculiarities of the ethnic culture of Belarusian Dvina region population. In addition to that the rite in the borders of the region has a local variation that concerns its special rite actions and becomes apparent available/absent in the concrete region of the definite structure parts of the rite.*

**УДК 327/474/476 ВКЛ/ (091)“15”**

# ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА НА МАСКОЎСКІМ НАКІРУНКУ Ў 1592 – 1596 ГАДАХ

***С.А. ЛАШКЕВІЧ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Разглядаецца дыпламатычная дзейнасць Вялікага княства Літоўскага на маскоўскім накірунку ў 1592 – 1596 гадах. Узаемаадносіны ВКЛ і Масквы ў гэтыя гады характарызуюцца рашэннем двухбаковых праблем шляхам мірных перамоў і некаторых кампрамісаў. Аўтар на аснове крыніц і літаратуры прааналізаваў уплыў міжнародных фактараў на знешнепалітычную пазіцыю ВКЛ у разглядаемы гістарычны перыяд, вывучыў прадстаўніцтва Княствам інтарэсаў Шведскага Каралеўства ў Маскоўскай дзяржаве, выявіў спрэчныя памежныя тэрытарыяльныя пытанні паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, абазначыў гандлёва-эканамічную праблематыку адносін Княства і Масквы. Адносіны ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы разглядаюцца праз прызму інтарэсаў ліцвінскай палітычнай эліты і абавязкова ў кантэксце складаных унутрыпалітычных працэсаў адзінай федэрацыі, а таксама ў кантэксце адносін Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы.*

**Уводзіны.** Па ўмовах Люблінскай уніі 1569 года паміж Вялікім княствам Літоўскім (ВКЛ) і Каронай Польскай пытанні знешняй палітыкі і абароны сталі агульнай справай усёй Рэчы Паспалітай. Тым не менш ВКЛ у другой палове XVI стагоддзя захоўвала як частку ўнутрыпалітычных, так і знешнепалітычных паўнамоцтваў у рамках адзінай дзяржавы. Спецыфіка знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай асноўвалася на своеасаблівым падзеле знешнепалітычных паўнамоцтваў і абавязкаў паміж ВКЛ і Каронай Польскай. Да кампетэнцыі ВКЛ адыходзілі дыпламатычныя адносіны з Маскоўскай дзяржавай, Швецыяй і часткова Інфлянтамі, Карона падтрымлівала адносіны з астатнімі еўрапейскімі краінамі. Дадзены падзел не быў падмацаваны ні адным дзяржаўна-прававым дакументам, а зыходзіў з геапалітычнага становішча Княства і знешнепалітычных традыцый, якія фарміраваліся некалькі стагоддзяў.

Храналагічныя рамкі працы ахопліваюць вельмі вузкі перыяд – з 1592 і да канца 1596 года. Выбар першай даты абумоўлены тым, што ў канцы 1591 года было падцверджана перамір’е паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай. Тым самым знешняя палітыка дзяржавы на маскоўскім накірунку набывае новы характар, што было выкарыстана дыпламатычнай службай ВКЛ для вырашэння сваіх знешнепалітычных інтарэсаў. Выбар другой храналагічнай мяжы абумоўлены тым, што ў гэтым годзе Княства актывізавала сваю дыпламатычную дзейнасць, накіраваную на аб’яднанне Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы, і перад ВКЛ паўстаюць зусім новыя знешнепалітычныя задачы.

Пасля заключэння перамір’я 1591 года паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай дыпламатыя першай была накіравана на вырашэнне наступных задач: *па-першае*, трэба было забяспечыць мір на паўднёва-ўсходнім накірунку, нейтралізаваць агрэсіўную палітыку Асманскай Імперыі і Крымскага ханства; *па-другое*, працягваць ваенна-палітычнае супрацоўніцтва са Шведскім Каралеўствам, што давала Рэчы Паспалітай козыр у стрымліванні Масквы; *па-трэцяе*, падтрымліваць дружалюбныя сувязі з аўстрыйскімі Габсбургамі, так як гэта стрымлівала Маскоўскую дзяржаву, Крымскае ханства і Асманскую Імперыю ў агрэсіўных планах супраць Рэчы Паспалітай. Важным фактарам для Рэчы Паспалітай былі набегі на дзяржаву казакоў Налівайкі: так, з гэтай нагоды ўмацоўваліся крэпасці і ваенна-тэхнічныя пабудовы паўднёва-ўсходніх рэгіёнаў дзяржавы, у прыватнасці крэпасць у Кіеве [1, с. 36 – 37]. Вядома, што ў 1596 годзе ВКЛ выдаткавала на барацьбу з атрадамі Налівайкі на Украіне 2000 злотых [2, с. 17].

Так, беларускі даследчык У.А. Падалінскі, прааналізаваўшы вальныя соймы Рэчы Паспалітай у 1592 – 1597 гадах, прыйшоў да высновы, што для Вялікага княства Літоўскага ў гэты перыяд былі важнымі «пытанні захавання рэлігійнага міру і забеспячэння знешняй бяспекі краіны». Сярод знешнепалітычных задач даследчык называе стварэнне антытурэцкай лігі, абарону ад татараў і казакоў [3, с. 13].

Фактычна ў гэты перыяд знікае ў двухбаковых адносінах праблематыка выбрання адзінага кіраўніка і аб’яднання дзяржаў. Зараз на першы план для дыпламатычнай службы ВКЛ у адносінах да Масквы выходзяць іншыя пытанні. Умоўна іх можна падзяліць на тры группы: першая група пытанняў звязана з працягам прадстаўніцтва і фактычна абаронай знешнепалітычных інтарэсаў Шведскага Каралеўства ў Маскоўскай дзяржаве, другая група пытанняў – з вырашэннем спрэчных памежных пытанняў, трэцяя – з гандлёвымі супярэчнасцямі паміж ВКЛ і Масквой. Спынімся падрабязна на кожнай з пазначаных груп пытанняў.

**Шведскі фактар у ліцвінска-маскоўскіх адносінах.** Вялікае княства Літоўскае, зыходзячы са сваіх знешнепалітычных інтарэсаў, надавала вялікую ўвагу Шведскаму Каралеўству. Справядліва выказванне беларускага даследчыка В.І. Пічэты, што знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – першай палове XVII стагоддзя была звязана з Балтыкай: «Польша стремилась иметь в резерве Великое кня-

жество Литовское на случай, если придется вмешаться в военное столкновение за обладание Балтикой» [4, с. 555]. Палітычная эліта Княства ў канцы XVI стагоддзя часам выступала як пасрэднік паміж Масквой і Шведскім Каралеўствам. Гэта яскрава праявілася падчас заключэння перамір'я 1591 года, калі прадстаўнікі Княства, падканцлер і пісар, заключылі ад імя Швецыі з Маскоўскай дзяржавай перамір'е на 1 год. У 1591 годзе Швецыі ўдалося падпісаць мірнае пагадненне з Крымскім ханствам, якое па сваёй сутнасці было накіравана супраць Маскоўскай дзяржавы [5, с. 88 – 89]. Ва Усходняй Еўропе адносіны паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй разглядаліся таксама як дынастычны саюз, што ў сваю чаргу стварала пагрозу Маскве. Тым не менш у гэты перыяд паміж Масквой і Стакгольмам было заключана спачатку перамір'е на 2 гады ў 1593 годзе, а потым, у 1595 годзе, Цяўзінскі мірны дагавор, што было выгадна ВКЛ [6, с. 181].

Дыпламатычная служба Княства прымала актыўны ўдзел у рэалізацыі знешнепалітычных інтарэсаў Швецыі шляхам дыпламатычных перагавораў. Да нашых часоў захавалася дыпламатычная перапіска паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай, якая тычылася Шведскага Каралеўства. Менавіта канцылярыя ВКЛ ажыццяўляла пасрэдніцкія кантакты паміж Шведскім Каралеўствам і Масквой, бо маскоўскі накірунак быў сферай знешнепалітычных паўнамоцтваў Княства, а вялікі князь ВКЛ Жыгімонт III быў сынам шведскага караля Юхана III (Йохана, Іаана).

У сакавіку 1592 года ў Маскоўскую дзяржаву былі накіраваны літвінскія пасланнікі Марцін Сушскі і Паўла Воўк для вырашэння спрэчных тэрытарыяльных пытанняў [7, с. 21; 8, с. 109]. Дыпламатычная місія ВКЛ была па колькасці асоб сярэдняй: «… а людей с ними 35 человек да 60 лошадей» [7, с. 25]. Разам з дыпламатычнай місіяй у Маскоўскую дзяржаву накіроўваліся літвінскія купцы: «А иж с тым послаником и гонцом его королевское милости водлуг давного обычая люди купецкие с товары своими мели были ехать» [7, с. 27]. Тут цяжка пагадзіцца з расійскім даследчыкам Л.А. Юзефовічам, які сцвярджае, што ў практыцы літвінска-маскоўскіх адносін колькасць дыпламатычнай місіі ў рангу пасланнікаў складала 150 – 200 чалавек: як мы бачым, былі і значна меншыя па колькасці місіі [9, с. 31].

На працягу знаходжання пасланнікаў у дарозе адбывалася перапіска паміж Фёдарам Іванавічам і яго служачымі, з якой мы можам шмат чаго падкрэсліць для разумення тагачаснай міжнароднай палітыкі. Так, маскоўскі цар цікавіўся ў сваіх служачых, ці знаходзіцца яшчэ на троне Жыгімонт III: «А что есте писали к нам, что Жигимонта короля не стало, и вы б к нам о том всякшими обычаи проведав отписали подлинно, да и у посланника б естя, и у гонца, и у их людей о том проведати велели накрепко и проведав отписали к нам» [7, с. 24]. Верагодна, гэта даручэнне было звязана з чуткамі, што кароль пакідае трон, каб заняць трон Шведскага Каралеўства, бо яго бацька быў вельмі хворы.

У другім лісце Фёдар Іванавіч просіць праверыць чуткі ў літвінскіх пасланнікаў аб смерці караля Рэчы Паспалітай: «… и ныне у них король есть ли, и будет нет, и кого они на королевство обирают». Тут жа маскоўскі цар дае загад даведацца, ці ёсць супярэчнасці паміж сенатарамі ВКЛ і Кароны, што магло быць выкарыстана ў дыпламатычнай гульне з Рэччу Паспалітай: «И меж панов ряд полских и литовских ныне розни нет ли, и будет есть и за что» [7, с. 31].

Пасля таго як літвінскія пасланнікі прыехалі да Масквы, служачыя пасольскага прыказа працягвалі выведваць у іх інфармацыю: задавалі пытанні пра міжнародную сітуацыю вакол Рэчы Паспалітай, што думаюць сенатары і шляхта пра караля і вялікага князя, ці хочуць яны абраць сабе новага караля, ці ёсць супярэчнасці паміж сенатарамі краіны, як палітычная эліта Кароны Польскай і ВКЛ ставіцца да знешнепалітычных поглядаў канцлера Кароны Я. Замойскага, ці рыхтуецца дзяржава да вайны з Крымскім ханствам і Асманскай Імперыяй, якія адносіны паміж бацькам і сынам (Жыгімонтам III і Іаанам III) [7, с. 38]. Падчас аўдыенцыі літвінскіх пасланнікаў у Фёдара Іванавіча было ўзнята пытанне парушэння перамір'я паміж Масквой і Шведскім Каралеўствам 1591 года з боку Стакгольма, таму што ВКЛ ад імя Швецыі заключала яго [7, с. 32].

Працягам гэтай дыпламатычнай місіі было тое, што ў ліпені 1592 года на імя караля паступіў ліст ад імя Фёдара Іванавіча, у якім маскоўскі цар абвінавачваў шведскага караля Іаана і караля Жыгімонта III у парушэнні перамірных грамат 1591 года, а менавіта – у нападзенні з Інфлянскіх тэрыторый (уладанні ВКЛ, Кароны і Швецыі) на Наўгародскі і Пскоўскі ўезды Маскоўскай дзяржавы [10, арк. 182]: «И нине, мимо договорные записи нашихъ бояр и пословъ и твоихъ Пановъ Рад и пословъ, ис техъ лифлянскихъ городовъ, которые за свеискимъ королем, приходили в нашу землю в Новъгородскои и во Псковскои уездъ воиною, а с ними были немецкие люди лифлянских и курлянских городовъ, которые за тобою, Жикгимонтомъ королемъ» [11, с. 180; 12, с. 195].

Фёдар Іванавіч патрабаваў ад караля Швецыі спыніць набегі на землі Маскоўскай дзяржавы, а вінаватых наказаць: «И из ливонскихъ городовъ, которые ныне за свеискимъ за Яганом королемъ, … в Новгородскую и во Псковскую землю, мимо договорныхъ записеи ходити не велелъ и нашимъ людемъ в рубежохъ по всимъ местомъ обидные дела по нашымъ перемирнымъ грамотамъ исправити велелъ» [11, с. 180; 12, с. 196].

Пасольскі прыказ паведамляў, што Маскоўская дзяржава згодна з пагадненнем паміж прадстаўнікамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы ў Яноўцах 1591 года таксама выводзіла свае войскі з Фінляндскага Княства, якое было часткай Шведскага Каралеўства: «… что будучи с ними в ответе твои Паны Рада говорили

имъ о том, чтобъ намъ, великому господару, для тебе, …. на Свеиское Королевство и на Финскую землю ратеи своихъ посылати не велити … » [11, с. 181; 12, с. 196].

У адказе на дадзены ліст (датаваны ў Літоўскай Метрыцы 22 кастрычнікам 1592 г.) кароль гэты канфлікт называе прыдуманым, а ваеннае супрацьстаянне на мяжы Швецыі і Маскоўскай дзяржавы называе вымушаным, паколькі Іаан, кароль Швецыі, абараняў свае межы ад Маскоўскага войска [12, с. 197 – 199]: «ино то сут речи змышленные и неправъдивые, кгды жъ люди з городовъ нашихъ инфлянтьскихъ и курлянскихъ, которых мы в держанью естесмо, … в землю вашу николи не ходили и мы имъ ходити не велимъ. А короля его милости швецкого, пана отца нашого, в каждои справе отступити его милости намъ не годит ся не можемъ» [11, с. 183].

Верагодна, у канцы кастрычніка 1592 года (Метрыка ВКЛ не ўтрымлівае дакладнай даты) у Маскву быў накіраваны пасланнік Княства з мэтаю дамовіцца аб тэрміне і месцы заключэння міру паміж Шведскім Каралеўствам і Маскоўскай дзяржавай [12, с. 205]: «абы покои межи его королевскою милости и панъствы его королевское милости а межи тобою и панствы твоими был номовенъ и постановенъ …» [11, с. 191]. Разам з сабою пасланнік павёз ліст, з якога можна шмат цікавага падкрэсліць [11, с. 189 – 192; 12, с. 205 – 208]. Прадстаўнікі ВКЛ у дадзеным дакуменце растлумачваюць, чаму ўмовы перамір'я на 1 год паміж Швецыяй і Масквой не выконваліся з боку Стакгольма: паведамленне аб перамір'і дайшло да караля Швецыі Іаана са спазненнем [11, с. 190].

Жыгімонт ІІІ прапаноўваў Фёдару Іванавічу ў бліжэйшы час выслаць вялікіх паслоў на мяжу ў раён паміж Навагародкам (горад у Інфлянтах) і Псковам для заключэння вечнага міру: «… о вечном покою межи Королевством нашимъ дедичнымъ Швецкимъ и межи панствы твоми … намовляти и становити» [11, с. 191; 12, с. 207]. Такім чынам, Маскоўскай дзяржаве прапаноўвалася заключыць вечны мір са Швецыяй сіламі дыпламатычнай службы Вялікага княства Літоўскага.

Верагодна, гэтага не адбылося толькі таму, што ў лістападзе 1592 года шведскі кароль Іаан памёр і на першы план выйшла абранне новага караля. У пачатку 1593 года для каранацыі на трон Швецыі ў гэту дзяржаву павінен быў ехаць сын Іаана, кароль і вялікі князь Жыгімонт ІІІ. З гэтай нагоды 28 ліпеня 1593 года быў напісаны і адпраўлены да Фёдара Іванавіча праз пасланніка ВКЛ Яна Дзевялтоўскага ліст, у якім кароль інфармаваў цара аб ад'ездзе ў Швецыю на каранацыю і прасіў не распачынаць вайну як супраць Шведскага Каралеўства, так і супраць Рэчы Паспалітай [11, с. 192; 12, с. 208].

Трэба адзначыць, што для каранацыі на шведскі трон Жыгімонт ІІІ павінен быў прасіць дазволу сойма Рэчы Паспалітай, бо яго ад'езд у іншую дзяржаву мог справакаваць ваеннае ўмяшанне ў справы Рэчы Паспалітай. Так, паляк С. Карнкоўскі выступаў у канцы 1592 года супраць ад'езду караля ў Швецыю, бо існавала верагоднасць, што ён не вернецца назад і ў краіне зноў пачнецца бескаралеўе [13, с. 53]. Асабліва важна, што паездку ў Шведскае Каралеўства Жыгімонта ІІІ фінансаваў часткова і літвінскі скарб, які працаваў аўтаномна ад польскага. Гістарычныя крыніцы прыводзяць суму ў памеры 100 000 злотых [2, с. 17]. Аўдыенцыя пасланніка ВКЛ Я. Дзевялтоўскага ў маскоўскага цара, падчас якой прадстаўнік Княства быў запэўнены ў тым, што Маскоўская дзяржава будзе прытрымлівацца ўсіх раней падпісаных пагадненняў як з Рэччу Паспалітай, так і з Шведскім Каралеўствам, адбылася ў верасні 1593 года: «и мы велики господарь, … то перемире деръжим до урочных летъ по перемирныхъ грамотамъ крепко…» [11, с. 195; 12, с. 211].

У сакавіку 1594 года, пасля таго як Жыгімонт ІІІ ад'ехаў на каранацыю ў Швецыю, Масква паспрабавала, ведаючы негатыўныя настроі некаторых магнатаў і часткі шляхты Рэчы Паспалітай да Жыгімонта ІІІ, пасварыць яго з апошнімі, а магчыма, і рукамі польска-літвінскай апазіцыі дэтранізаваць. Так, ад імя маскоўскіх баяр прыйшоў на імя паноў-рад Рэчы Паспалітай ліст, у якім баяры ўздымалі пытанне наконт таго, што ў лісце, дасланым у 1594 годзе Жыгімонтам ІІІ са Швецыі на імя Фёдара Іванавіча, тытул «кароль польскі і вялікі князь літоўскі» стаіць пасля тытула «кароль шведскі, готскі і г.д.», што, па словах баяр, прыніжала Рэч Паспалітую ў міжнародных справах: «И мы вам, брати нашои любителнои, о томъ объявляемъ а чаемъ того, что такие непригожие дела Жигимонт корол всчинает без ведома и без совету вас, Пановъ Рад Коруны Полские и Великого Княжства Литовского, а по совету швецкихъ думцовъ, а шведцких немец передо всею вселенною знатна» [11, с. 198; 12, с. 215]. На думку даследчыка, ідэя пасварыць Рэч Паспалітую і Швецыю прыналежыць Б. Гадунову, які, па мяркаванню айчынных і замежных гісторыкаў, імкнуўся вярнуць назад страчаныя падчас Лівонскай вайны землі, а таксама прытрымліваўся больш хітрай палітыкі адносна заходняй суседкі.

Зразумеўшы сапраўдныя матывы адпаведнага дыпламатычнага ходу, каб пасварыць Рэч Паспалітую і Каралеўства Шведскае, сенатары Рэчы Паспалітай адказвалі баярам маскоўскім, што так вядзецца ў міжнароднай практыцы: тытул той зямлі ставіцца на першае месца, дзе знаходзіцца кіраўнік дзяржавы [11, с. 200; 12, с. 216 – 217]. Сенатары раілі не парушаць раней падпісаныя пагадненні і строга іх прытрымлівацца: «… же великому господару вашому городов у Шведского Королевства доступати и над Шведскою землею промышляти, того мы не зычимъ … » [11, с. 200; 12, с. 216]. У лісце рэкамендавалася выкарыстаць падрыхтаванае маскоўскае войска супраць туркаў і татараў [11, с. 200; 12, с. 216]. Дадзены ліст быў падрыхтаваны ў канцылярыі ВКЛ і быў падпісаны ад імя Рэчы Паспалітай віленскім ваяводам К. Радзівілам і канцлерам ВКЛ Л. Сапегай [11, с. 199].

У 1595 годзе паміж Шведскім Каралеўствам і Маскоўскай дзяржавай быў падпісаны Цяўзінскі мірны дагавор. Трэба адзначыць, што па дагавору горад Нарва адыходзіў да Маскоўскай дзяржавы, а мяжа паміж Маскоўскай дзяржавай і Швецыяй у Інфлянтах праходзіла па рацэ Нарва. Дадзеная акалічнасць негатыўна ўплывала на ВКЛ, паколькі па перамір'ю 1591 года Нарва павінна была адыйсці да сумеснага ўладання Кароны Польскай і Вялікага Княства. Тым не менш Цяўзінскі дагавор не быў ратыфікаваны як Жыгімонтам ІІІ, так і Фёдарам Іванавічам; верагодна, з боку Рэчы Паспалітай на дадзенае рашэнне ўплывалі магнаты, якія мелі інтарэс да пазначаных спрэчных тэрыторый [14, с. 82 – 83].

Маскоўская дзяржава неадрыўна сачыла за тым, што адбывалася у 1596 годзе, спрабуючы знайсці слабыя бакі ў Рэчы Паспалітай. З мэтаю даведацца аб магчымай дэтранізацыі Жыгімонта на троне, паколькі грамадзянская вайна ў Швецыі давала вялікую верагоднасць адпаведным падзеям, 10 ліпеня 1596 года да Рэчы Паспалітай быў высланы маскоўскі пасол Афанасій Разанаў. Дабраўшыся да Варшавы маскоўскі пасол даведаўся, што гэта няпраўда, а значыць элекцыя прадстаўніка Масквы на трон Рэчы Паспалітай сама сабою адпадала [15, с. 22].

**Спрэчныя памежныя тэрытарыяльныя пытанні паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай.** Нягледзячы на тое, што перамір'е 1591 года паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай прадугледжвала вырашэнне спрэчных памежных тэрытарыяльных пытанняў, зняць поўнасцю з павесткі дня дадзеную праблему не ўдалося. Гэта было звязана з тым, што ў тагачасных міжнародна-прававых умовах было вельмі складана правесці дакладную мяжу паміж Каронай Польскай і ВКЛ, з аднаго боку, і з Маскоўскай дзяржавай, з другога. Хаця перамір'е 1591 года і канкрэтызавала мяжу паміж дзяржавамі, пералічваючы лінію памежных гарадоў і мястэчак, але маленькія гарады і вёсачкі заставаліся па-за ўвагаю дыпламатаў, і фактычна мяжа не бала дэмаркавана, калі гаварыць сучаснай мовай. Больш таго, мясцовыя ўлады з абодвух бакоў імкнуліся парушыць тэрыторыю свайго суседа, што было падмацавана эканамічнымі матывамі.

Тэарэтычна падпісаныя пагадненні ў пачатку 1590-х гадоў прадугледжвалі вырашэнне дадзеных пытанняў шляхам стварэння сумеснай памежнай камісіі, якая на месцы павінна была правесці дэмаркацыю, на практыцы ж дадзеная норма не выконвалася. Трэба адзначыць, што за перыяд 1592 – 1596 гадоў толькі паводле афіцыйнай дыпламатычнай перапіскі Масквы з ВКЛ можна налічыць некалькі дзесяткаў спрэчных тэрыторый і гарадоў паміж краінамі, якія ў геаграфічным плане размяшчаліся ад Інфлянтаў на поўначы і да Крымскага ханства на поўдні. Часам памежныя непаразуменні правакавалі буйны міжнародны канфлікт, які вырашаўся паміж дзяржавамі толькі на ўзроўні вышэйшай палітычнай эліты абедзвюх дзяржаў. Час ад часу дзяржаўная мяжа парушалася з мэтаю захопу палонных і маёмасці. Пазначанае кола міждзяржаўных праблем і павінна была вырашаць дыпламатычная служба ВКЛ.

Так, 8 лютага 1592 года на імя маскоўскага цара Фёдара Іванавіча быў накіраваны ліст праз ганца ВКЛ Марціна Сушскага з просьбаю адпусціць на волю ротмістра Темрука Сямёнавіча Чэрскага, які быў схоплены годам раней казакамі, і без выкупу яго не аддавалі. У лісце гаварылася: «… и ты бы при том гонцы нашом помененыхъ князеи Черкаскихъ зыскати и при немъ волно до отчизны ихъ пустити велелъ …» [11, с. 173].

У маі 1592 года цар звяртаўся да Жыгімонта ІІІ з крыўдаю на парушэнне як з боку Кароны, так і з боку ВКЛ дзяржаўнай мяжы. У прыватнасці, называліся месцы парушэння мяжы: Веліжская воласць, Пскоўскі ўезд, Луцкі, Невельскі ўезд, Тарапецкі і Чарнігаўскі ўезды [12, с. 191 – 193]: «А вступаютца в наши земли за рубежъ переходя и задоры нашим людям чинят ваши люди во многихъ местехъ перемирные грамоты и порубежнымъ нашымъ людем обиди и насильства многие чынят …» [11, с. 176 – 177].

Маскоўскі цар гарантаваў у сваю чаргу выкананне парубежных палажэнняў перамір'я 1591 года [12, с. 192]: «… и мы рубежи державимъ по прежнему и вступати ся через перемирные грамоты в рубежахъ не велим, и твоим порубежным людем задоровъ и обид никоторыхъ чинити не велимъ» [11, с. 176].

Паводле перамірных грамат забаранялася на дзяржаўнай мяжы будаваць новыя гарады і крэпасці, што магло б парушыць парытэт сіл паміж дзяржавамі: «А новыхъ местъ нигде не поседати и городовъ не ставити …» [11, с. 178; 12, с. 193]. Так, аршанскі староста А. Сапега пасля будаўніцтва Маскоўскай дзяржавай такога горада ў Смаленскім уездзе, звярнуўся да мясцовых улад з патрабаваннем узгадніць дадзенае будаўніцтва з уладамі ВКЛ: «чтобъ мы того города в перемирное время мимо перемирныхъ грамот ставит не велели, покаместа с вами о томъ обошлем ся» [11, с. 178].

У ліпені 1592 года накіраваў цар да Рэчы Паспалітай ліст, падобны папярэдняму. У ім пералічваліся канкрэтныя мястэчкі і гарады, з якіх на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы рабіліся набегі з захопам маёмасці. Вось толькі некалькі вытрымак з Літоўскай Метрыкі [12, с. 194]: «А изъ Юрева Ливонского во Псковском уезде половиною селомъ Выбовки и деревнями завладели. А из Витебска и Усвята, из Велижа, вступаютца в Лутцкои уездъ, в село в Огрызлово з деревнями, … детеи боярскихъ … ограбя выбили вонъ» [11, с. 179].

У дыпламатычнай практыцы таго часу сустракалася наўмысная падмена перамірных грамат і лістоў. У дадзеным лісце Фёдар Іванавіч называе Ругодзіў (Нарва) горадам Шведскага Каралеўства, хаця мы ведаем, што сам канцлер ВКЛ Л. Сапега ў Янаўцах (снежань 1591 г.) настойваў і дабіўся, каб дадзены горад перайшоў пад уладу ВКЛ [11, с. 180].

Трэба сказаць, што падобная дыпламатычная рыторыка захоўвалася і з боку Рэчы Паспалітай. Дыпламаты Княства настойвалі на тым, што спрэчныя тэрыторыі заўжды, яшчэ са стэфанавых часоў, належалі ВКЛ. Так, у лісце на імя цара ад 22 кастрычніка 1592 года паведамлялася, што Веліжская воласць заўжды адміністрацыйна адносілася да горада Таропца, які быў літвінскім горадам: «… Торопец город искониvековъ был великихъ князеи литовских и к Великому Князству Литовскому завжды належалъ …» [11, с. 182; 12, с. 197]. За ваенныя сутычкі на мяжы прадстаўнікі Княства ўскладвалі віну на маскоўскі бок, таму што літвіны толькі баранілі свае вёскі і гарады ад нападзенняў і ад несанкцыянаванага будаўніцтва гарадоў і крэпасцей: «Ино што пишешъ о задорах и зачепках розных вкладаючи на люди наши, то все нашим панъствамъ и людем от ваших людеи делаетца, бо ваши люди з Смоленска, с Торопца, с Чернегова, с Путивля и з ынъшых городов украинныхъ через давные границы в наши земли вступают ся, городы ставити и слободы закладати хотели … » [11, с. 182; 12, с. 198].

У дыпламатычных дакументах з боку ВКЛ апісваюцца канкрэтныя выпадкі нападу з боку Маскоўскай дзяржавы на гарады і мястэчкі Княства. Так, у лісце паноў-рад ад 23 кастрычніка 1592 года на імя маскоўскіх баяр паведамлялася аб такім нападзенні на шляхціча ВКЛ: «… яко жъ недавныхъ часовъ люди господаря вашого собравши ся и в землю его королевское милости, господаря нашого, воиною безвестно впадши в Любецкомъ уездзе шляхтича одного Нолника окрутне забили и замордовали, сына его и зо всею челядю до везенья были взяли …» [11, с. 188; 12, с. 204].

Сенатары патрабавалі ад маскоўскіх баяр выканання папярэдніх дагавароў і пакарання вінаватых: «Вы бы тежъ, братя наша, того стерегли и боронили, абы зъ стороны его милости господара вашого люди его милости своволне через границы въ панъства его королевское милости господара нашого не входили, крывдъ, утисковъ и зачепокъ жадных людемъ его королевское милости не чинили, а о то, што се до сих местъ стало, абы справедливост была учинена» [11, с. 189; 12, с. 205].

**Гандлёвая праблематыка ў дыпламатыі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы.** У канцы XVI стагоддзя Вялікае княства Літоўскае актыўна развівала гандаль амаль з усімі еўрапейскімі дзяржавамі, што было звязана з выгадным геаграфічным палажэннем Княства, спрыяльнай міжнароднай сітуацыяй вакол Рэчы Паспалітай і бурным развіццём самой гаспадаркі ВКЛ. Менавіта пасля заключэння Ям-Запольскага перамір'я купцы абедзвюх дзяржаў узнялі двухбаковы гандаль на новы, больш высокі, узровень.

Бурнаму развіццю гандля паміж краінамі спрыяла таксама магдэбурскае права літвінскіх гарадоў. Як прыклад, у 1588 годзе магдэбурскае права атрымаў Магілёў. Вось урывак з граматы Жыгімонта III: «… дабы соизволили мы, по особливой своей Королевской милости и власти, утвердить какъ Магдебургское право, такъ льготы и все примущества, дарованныя сему городу и жителямъ его предками нашими, а наипаче Королемъ Стефаномъ» [16, с. 46]. У 1588 годзе Кароль Рэчы Паспалітай падцвердзіў Магдэбургскае права за Кіевам [17, с. 446].

Беларускі гісторык В.І. Мялешка ў сваёй манаграфіі, прысвечанай гандлёвым сувязям Магілёва з гарадамі Польшчы і Прыбалтыкі, адзначае, што ў канцы XVI – пачатку XVII стагоддзя гандлёвыя сувязі Магілёва былі з некалькімі дзесяткамі гарадоў Маскоўскай дзяржавы [18, с. 61].

Рускі гісторык М.І. Кастамараў сцвярджае, што ВКЛ у канцы XVI стагоддзя па гандлю займала другое месца ў Вялікім Ноўгарадзе пасля фламандцаў, трэцяе месца ў Пскове і першае месца ў Маскве. Варотамі для гандлю ў Маскоўскую дзяржаву быў Смаленск [19, с. 210 – 211].

Літвінскія купцы гандлявалі ў многіх рэгіёнах Маскоўскай дзяржавы, адпаведным чынам мясцовыя ўлады рэгулявалі гандаль з ВКЛ. Так, ва Устаўной грамаце мытнай пошліны Вялікага Ноўгарада спецыяльна для літвінаў устанаўлівалася мытная пошліна: «А приедет литвин и всякой иноземец с товаром с каким ни буди, и таможником у них имати по старине тамгу со всякого товару с рубля Новгородского по семи денег по новгородскую. Да у них же имати с саней по алтыну» [20, с. 20].

Ва Устаўной грамаце канкрэтна прапісвалася пошліна на канкрэтны тавар: «А литвин и всякой иноземец взвесит мед, или икру, или иное что взвесит, и пудовщиком у них имати по старине, з продовца с рубля по две деньги, а с купца с рубля по две денги же» [20, с. 22].

Па словах беларускага даследчыка Л.С. Абэцэдарскага, літвінскія купцы ў Маскоўскую дзяржаву накіроўваліся па двум маршрутам: першы – Смаленск – Орша – Барысаў – Слонім – Брэст; другі – Смаленск – Орша – Барысаў – Лагойск – Маладзечна – Крэва [21, с. 17].

Развіццё двухбаковых гандлёвых адносін стварала адначасова і шмат праблемных пытанняў, якія трэба было своечасова вырашаць на міждзяржаўным узроўні. Да супярэчнасцей у сферы гандлёвых зносін можна назваць праблему свабоды перамяшчэння купцоў, бяспека і недатыкальнасць купцоў, свабода набыцця маёмасці ў другой дзяржаве, фарміраванне мытных пошлін, пакаранне купцоў у замежнай краіне ў выніку парушэння імі парадку ў гэтай дзяржаве і г.д.

Трэба адзначыць, што паміж дзяржавамі ў другой палове XVI стагоддзя была сфарміравана дагаворна-прававая база для рэгулявання гандлёвых пытанняў. Амаль кожнае пагадненне і кожны дыпламатычны ліст паміж краінамі ўтрымліваў адпаведныя палажэнні, хаця шматлікасць дамоўленасцей не здымала супярэчнасцей з парадку дня. Так, у тэксце перамір'я 1591 года гаварылася: «А купцомъ твоим изо всихъ твоихъ земель во все нашы земли прыехати и зо всякимъ товаром и торговати на всякии товар. А приехати имъ и отехати доброволно без всякихъ зачепокъ» [11, с. 120; 12, с. 185].

Згодна з вышэйсказаным трэба не пагадзіцца з Л.С. Абэцэдарскім, які сцвярджае, што «… конфликтные дела … отражают единичные случаи нарушения русско-белорусской торговли и не могут объективно характеризовать ее, потому что такие случаи были не правилом, а исключением» [21, с. 9].

Цяжка пагадзіцца з беларускім даследчыкам В.І. Бобышавым, які сцвярджае, што ў другой палове XVI стагоддзя дыпламатычныя кантакты паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у сваёй большасці былі накіраваны на падпісанне міру альбо перамір'я, а іншыя пытанні заставаліся па-за ўвагаю канцылярыі ВКЛ [23, с. 46].

Перыяд 1592 – 1596 гадоў багаты на дыпламатычную перапіску паміж ВКЛ і Масквой менавіта па гандлёвай праблематыцы. Афіцыйныя дакументы двухбаковай перапіскі знаходзяцца ў кнігах Літоўскай Метрыкі № 593 і № 594, а таксама ў архіве РДАСА у Маскве (фонд 79, кнігі 22 і 23). Часткова 22 кнігу 79 фонда апублікаваў савецкі даследчык Г.М. Анпілогаў у 1967 годзе. У дадзеным даследаванні нас цікавяць спрэчныя двухбаковыя пытанні, альбо скаргі, якія праходзілі праз канцылярыю ВКЛ і маскоўскі прыказ.

Так, ад 28 студзеня 1592 года на імя Фёдара Іванавіча праз пасланніка ВКЛ П. Воўка быў дасланы ліст, у якім ішла справа аб парушэнні правоў літвінскіх купцоў, якія гандлявалі ў Маскоўскай дзяржаве, а канкрэтна пад рускім горадам Дарагабуж іх пабілі і пасадзілі ў турму, а тавары канфіскавалі [12, с. 186 – 187]: «То какъ в томъ часе дошла насъ ведомость певная, же ты подданыхъ нашихъ, людеи купецкихъ, вильневцовъ, видьблянь, могилевцовъ из ынъших многихъ мест паньства нашого Великого Князства Литовского, которые при послехъ нашихъ великихъ с товарми своими до паньства твоего приехавшы а не спродаши товаровъ для торговли позостали … » [11, с. 171; 12, с. 186]. Размова ішла пра тых купцоў, якія накіраваліся ў Маскоўскую дзяржаву разам з вялікім пасольствам Рэчы Паспалітай падчас заключэння перамір'я 1591 года. Не рэалізаваўшы цалкам свае тавары, яны засталіся ў Маскве, а вялікія паслы пакінулі іх, ад'ехаўшы на радзіму. Вяртаючыся ў ВКЛ, літвінскія купцы па смаленскай дарозе імкнуліся рэалізаваць свой тавар, дзе пад Дарагабужам і здарыўся канфлікт [11, с. 171; 12, с. 186].

У дадзеным дыпламатычным лісце ВКЛ патрабавала ад уладаў Маскоўскай дзяржавы выпусціць зняволеных купцоў, выплаціць за страты і пакараць служачых, якія гэта зрабілі: «… ажъ тыхъ всихъ подданыхъ нашихъ, людеи купецкихъ, зов сими ихъ маетностями и з нагородою ранъ, збитя, зелживости, шкод и утратъ ихъ, до панствъ нашихъ доброволне выпустити велишъ и за прежние шкоды, от отца твоего поделанные, нагороду подданымъ нашимъ учинишъ и тыхъ людеи твоихъ, которые то неслушне и непристоине над подданными нашими поделали и некоторых з нихъ насмерть забили, на горле карати велишъ» [11, с. 172; 12, с. 187].

Гандлёвая тэматыка была непасрэдна ў кампетэнцыі ВКЛ, вышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі Княства напрамую дасылалі лісты да чыноўнікаў свайго рангу ў Маскву. Так, праз літвінскага ганца П. Воўка быў накіраваны ліст ад імя віленскага ваяводы К. Радзівіла і канцлера ВКЛ Л. Сапегі непасрэдна Б. Гадунову (датаваны 15 лютым 1592 г.), у якім было шмат палажэнняў аб свабодным гандлю. Цікава, што пры вырашэнні гандлёвых супярэчнасцей, літвіны ў дадзеным лісце спасылаліся на перамір'е 1587 года, якое было заключана прадстаўнікамі Княства [7, с. 54]. Сутнасць патрабаванняў літвінаў можна ўмоўна выдзеліць у некалькі блокаў пытанняў: памежныя тэрытарыяльныя спрэчкі; гандлёвыя перашкоды; незаконнае ўтрыманне людзей; патрабаванні літоўскіх купцоў вярнуць тавары і грошы, якія былі адабраны пры Іване IV [7, с. 55 – 57]. 26 красавіка 1592 года літвінскі пасланнік прыехаў у Маскву, а ў маі 1592 года П. Воўк быў прыняты царом, дзе і быў зачытаны ліст са скаргамі [7, с. 59].

Адказ цара прадстаўнікам ВКЛ мы можам даведацца праз дыпламатычны ліст, які быў накіраваны праз П. Воўка як у Варшаву, так і ў Вільню [11, с. 173 – 178; 12, с. 188 – 193]. Наконт дарагабужскага канфлікту з купцамі ВКЛ узгадвалася, што літвінскія купцы вінаваты самі, паколькі самавольна пакінулі горад Дарагабуж без дазволу на тое мясцовых улад, за што і былі затрыманы: «… и они своимъ самоволственнымъ обычаемъ нашого указу не послушали, в Дорогобуже постоят не похотели, а поехали силно самоволствомъ … » [11, с. 175; 12, с. 190]. У лісце падкрэслівалася, што для разбору дадзенага канфлікту быў высланы ў Дарагабуж Іван Мясны, які дакладваў у Маскву, што ўсе літвінскія купцы здаровы, а тавар ім вярнулі назад: «… что у нихъ жывотовъ и товаров ничего не пропало, все цело имъ отдано …» [11, с. 176; 12, с. 191]. Больш таго, літвінскім купцам дазволілі свабодна гандляваць у Смаленску, пасля чаго яны ад'ехалі да радзімы: «… и в Смоленске имъ по ихъ челобитю торговат велели по их воле. А как они исторговали ся в Смоленске, и мы их отпустит из Смоленска со всими ихъ товары велели» [11, с. 176; 12, с. 191]. Фёдар Іванавіч прасіў Жыгімонта III прасачыць, каб больш такога самавольства не паўтаралася, а таксама патрабаваў прытрымлівацца заключаных раней пагадненняў [11, с. 176; 12, с. 191]. З дадзенага дыпламатычнага дакумента можна даведацца пра рэгіёны Маскоўскай дзяржавы, якія актыўна гандлявалі з ВКЛ: «… торговымъ людемъ москвичемъ, псковичемъ, новугородцемъ, смолняномъ, беляномъ, торопчаномъ, вязмичемъ и северскихъ городовъ … » [11, с. 176; 12, с. 191].

22 кастрычніка 1592 года ў лісце Рэчы Паспалітай на імя Фёдара Іванавіча пацвярджалася права купцоў з абодвух бакоў весці свабодны гандаль [11, с. 197 – 198]: «… купецкимъ людем мы завжды в панствах наших доброволне куды хотят ездити торговати позволяемъ, мыта и пошлины от них брати не велим … » [11, с. 183]. Разам з тым дыпламатычная служба ВКЛ звяртала ўвагу маскоўскіх улад на сістэматычнае парушэнне з боку Масквы гандлёвых правіл [11, с. 183; 12, с. 198].

У ліпені 1593 года ў Маскву быў накіраваны літвінскі пасланнік Я. Дзевялтоўскі, сярод шматлікіх дыпламатычных паручэнняў якога было заданне паспрабаваць угаварыць Маскву вярнуць адабраную маёмасць літвінскіх купцоў Зянона Зарэцкага, Лукаша Мамоніча і інш. за вялікі перыяд, ад часоў Івана IV і да пачатку 1590-х гадоў [11, с. 193; 12, с. 209]. Трэба адзначыць, што заступіцца за купца праз дыпламатычную службу ВКЛ магла толькі магутная магнацкая альбо шляхецкая групӑўка, купцы меншага рангу заставаліся па-за ўвагаю дыпламатаў.

Чым закончылася дадзеная дыпламатычная акцыя, можна даведацца з ліста ад верасня 1593 года на імя Жыгімонта III [111, с. 194 – 196; 12, с. 210 – 212]. У ім гаворыцца, што пытанне з літвінскімі купцамі даўно ўжо вырашана, аб чым паведамлялася сенатарам ВКЛ: «… о тех купецкихъ товарехъ ответъ учиненъ и писмо давано, да и Паном Радамъ наши послы, будучи в Литве, писмо давывали … » [11, с. 195; 12, с. 211]. Паведамляецца, што за ўзятыя тавары літвінскім купцам была кампенсацыя [11, с. 195; 12, с. 211]. Са свайго боку Маскоўская дзяржава называла парушэнні правоў маскоўскіх купцоў з боку польска-літвінскіх улад: «… которые обиды учинилис в перемирные лета нашимъ людем от ваших людеи в немецкихъ городех, въ Юреве Ливонском и в ыных городех … не исправлены» [11, с. 195; 12, с. 211]. У канцы ліста Фёдар Іванавіч гарантаваў са свайго боку свабоду гандлю купцам Рэчы Паспалітай [11, с. 196; 12, с. 212]. Дыпламатычныя лісты, накіраваныя ў Маскоўскую дзяржаву з канцылярыі ВКЛ у 1596 годзе, таксама ўтрымліваюць шэраг пытанняў гандлёвай праблематыкі [11, с. 201 – 206; 12, с. 217 – 220].

Трэба адзначыць, што існавалі з абодвух бакоў (ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы) цэлыя спіскі спрэчных гандлёвых спраў, якія з пераменным поспехам вырашаліся на працягу дзесяцігоддзяў. Дасканальна можна азнаёміцца з гэтымі справамі, прааналізаваўшы з боку Вялікага Княства Літоўскага 593 і 594 кнігі Літоўскай Метрыкі [11, с. 147 – 161; 12, с. 161 – 176], з боку Масквы – 22 кнігу 79 фонда РДАСА [7, с. 78 – 109; 24, арк. 124 адв. – 169 адв.].

**Заключэнне.** Пасля падпісання перамір’я 1591 года з Маскоўскай дзяржавай дыпламатычная служба ВКЛ накіравала свае намаганні на вырашэнне наступных задач: працяг прадстаўніцтва палітычных інтарэсаў Стакгольма ў Маскве, вырашэнне спрэчных памежных тэрытарыяльных праблем з Маскоўскай дзяржавай і гандлёва-эканамічных праблем двухбаковых узаемаадносін. Прычынай пераарыентацыі дыпламатыі ВКЛ на вырашэнне вышэйпазначаных праблем было заключанае пагадненне з Масквой і міжнародная сітуацыя ва Усходняй Еўропе, а менавіта дынастычны саюз Рэчы Паспалітай і Швецыі, а таксама знешняя пагроза з боку Асманскай Імперыі і Крымскага ханства. Вялікае Княства Літоўскае і Маскоўская дзяржава ў адпаведных міжнародных умовах былі зацікаўлены ў захаванні становішча статус-кво ў двухбаковых адносінах.

Зыходзячы з таго, што існаваў дынастычны саюз паміж Рэччу Паспалітай і Стакгольмам, дыпламатычная служба Княства была пасрэднікам і прадстаўніком знешнепалітычных інтарэсаў Швецыі ў Маскоўскай дзяржаве, міжнароднага дакумента, рэгулюючага механізм прадстаўніцтва, не існавала, як не існавала і дакумента аб падзеле знешнепалітычных паўнамоцтваў і абавязкаў паміж ВКЛ і Каронай Польскай. У 1592 – 1596 гадах да кампетэнцыі дыпламатыі Княства адыходзілі пытанні прыналежнасці спрэчных тэрыторый і гарадоў паміж Швецыяй і Масквой, падрыхтоўка і ўзгадненне пазіцый па мірнаму дагавору Стакгольма і Масквы, нагляд за выкананнем перамір’я 1591 года, інфармаванне Маскоўскай дзяржавы і Шведскага Каралеўства аб усіх знешнепалітычных змяненнях і г.д.

Пры вырашэнні спрэчных тэрытарыяльных памежных праблем дзяржавы зыходзілі з падпісанага перамір’я 1591 года, а таксама іншых двухбаковых дагавароў. На практыцы палажэнне перамір’я 1591 года аб стварэнні памежных тэрытарыяльных камісій для вырашэння спрэчных пытанняў не дзейнічала. З-за таго, што мяжа не была дакладна прапісана ў пагадненні, большасць канфліктаў было на адрэзку ад Оршы да Інфлянтаў.

Дыпламатычная служба ВКЛ прымала актыўны ўдзел у вырашэнні спрэчных пытанняў, звязаных з маёмаснымі правамі і недатыкальнасцю як літвінскіх, так і замежных купцоў у Маскоўскай дзяржаве. Дадзеная з’ява была звязаная з павелічэннем літвінска-маскоўскага тавараабароту, што назіралася пасля заканчэння Інфлянцкай вайны. Пры вырашэнні гэтых супярэчнасцей ВКЛ абапіралася на палажэнні перамір’я 1591 года, дзе было шмат увагі нададзена дадзенай праблематыцы. Сярод шматлікіх двухбаковых парушэнняў у гэтай вобласці можна назваць: затрыманне купцоў, адабранне да казны тавараў, абмежаванне гандлю на спецыяльна адведзеных тэрыторыях, павелічэнне мытных збораў і г.д.

ЛІТАРАТУРА


1. Архив Юго-Западной России, издаваемый временной комиссией для разбора древних актов, высочайше учрежденной при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. Ч. 3. Т. 1: Акты о казаках (1500 – 1648). Киев: В тип. И. и А. Давиденко, 1862 г. – 433 с.
2. Filipczak-Kocur, A. Skarb litewski za pierwszych dwu Wazów. 1587 – 1648 / A. Filipczak-Kocur. – Wrocław: Wyd-wo Uniwersytetu Wrocławskiego, 1994. – 120 s.: il. + Aneks (24 s.).
3. Падалінскі, У.А. Прадстаўніцтва і палітычная пазіцыя Вялікага княства Літоўскага на вальных соймах Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI ст.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / У.А. Падалінскі; Нац. Акад. навук Беларусі. – Мінск, 2004. – 22 с.
4. Пичета, В.И. Белоруссия и Литва XV – XVI вв. / В.И. Пичета. – М.: Акад. Наук СССР, 1961. – 818 с.

5. Скрынников, Р.Г. Россия накануне «смутного времени» / Р.Г. Скрынников. – М.: Мысль, 1985. – 206 с.
6. Платонов, С.Ф. Москва и Запад; Борис Годунов / С.Ф. Платонов. – М.: Богород. печатник, 1999. – 283 с.
7. Анпилогов, Г.Н. Новые документы о России конца XVI – начала XVII в. / Г.Н. Анпилогов. – М.: Изд. Моск. ун-та, 1967. – 541 с.
8. Бантыш-Каменский, Н.Н. Обзор внешних сношений России (по 1800 год) / Н.Н. Бантыш-Каменский. – М.: Тип. Э. Лисснера и Ю. Романа, 1897. – Ч. 3: Курляндия, Лифляндия, Эстляндия, Финляндия, Польша и Португалия. – 319 с.
9. Юзефович, Л.А. «Как в посольских обычаях ведется» [Рус. посол. обычай конца XV – нач. XVII в.] / Л.А. Юзефович. – М.: Междунар. отношения, 1988. – 214, [2] с.
10. Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў. – Фонд 79. (Зносіны Расіі з Польшчай). – Воп. 1. – Спр. 21.
11. Lietuvos metrika / Lietuvos istorijos institutas. Kn. 593: (1585 – 1604) : Diplomatinių reikalų knyga: Book of diplomatic relations: Księga dyplomatycznych spraw / parengė Algirdas Baliulis, 2009. – 293 c.
12. Lietuvos metrika / Lietuvos istorijos institutas. Kn. 594: (1585 – 1600) / parengė Algirdas Baliulis. – Vilnius: Lietuvos istorijos institutas leidykla, 2006. – 297 p.
13. Kozinski, Z. Źródła do dziejów parlamentaryzmu polskiego w XVI – XVIII wieku w zbiorach Biblioteki Jagiellońskiej / Z. Kozinski, Z. Pietrzyk. – Kraków : [Biblioteka Jagiellońska], 2004. – 108 s.
14. Кан, А. Швеция и Россия в прошлом и настоящем / А. Кан. – М., 1999. – 359 с.
15. Malec, J. Szkice z dziejów federalizmu i myśli federalistycznej w czasach nowożytnych / J. Malec. – Kraków: Wyd-wo Uniw. Jagiellońskiego, 1999. – 173 s.
16. Белорусский архив древних грамот / пред. протоиерея И. Григоровича. Ч. 1; худ. Ал. Фролов. – 1824. – 148 с.
17. Муханов, П.А. Сборник Муханова: [документы по русской истории] / П.А. Муханов. – СПб.: в Типографии Эд. Праца, 1866. – 780 с.
18. Мелешко, В.И. Торговые связи Могилева с городами Польши и Прибалтики во второй половине XVI – первой половине XVII в. / В.И. Мелешко // Actobaltico – Slavico / Bialystok, 1965. – Т. II. – 61 – 101 с.
19. Костомаров, Н.И. История Руси Великой: соч. Николая Ивановича Костомарова: в 12 т. / сост. и прим. С.Д. Ошевского. – М.: Мир книги, 2004. – Т. 9: Как жила Россия в старину. – 478, [1] с.
20. Великий Новгород во второй половине XVI в.: сб. док. / Федер. арх. служба России, Рос. гос. арх. древ. актов. – СПб.: Дмитрий Буланин, 2001. – 274, [1] с.
21. Абецедерский, Л.С. Белоруссия и Россия: Очерки рус.-белоруск. связей второй половины XVI – XVII в. / Л.С. Абецедерский; под ред. З.Ю. Копыского. – Минск: Выш. шк., 1978. – 256 с.
22. Абецедерский, Л.С. Белоруссия и Россия: Очерки рус.-белорус. связей второй половины XVI – XVII в. / Л.С. Абецедерский; под ред. З.Ю. Копыского. – Минск: Выш. шк., 1978. – 256 с.
23. Бобышаў, В.І. Некаторыя аспекты арганізацыі дыпламатычных перамоў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у другой палове XVI ст. / В.І. Бобышаў // Беларусь і свет: Альманах. Т. 1. – Мінск, 1999. – С. 46 – 53.
24. Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў. – Фонд 79. (Зносіны Расіі з Польшчай). – Воп. 1. – Спр. 22.

*Паступіў 08.06.2012*

## DIPLOMATIC ACTIVITIES OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA ON THE MOSCOW DIRECTION IN 1592 – 1596 YEARS

***S. LASHKEVICH***

*The article deals with the diplomatic activities of the Grand Duchy of Lithuania on the Moscow direction in 1592 – 1596 years. Relations between VKL and Moscow in these years are characterized by the solution of bilateral problems through peaceful negotiation and some compromises. The author on the basis of sources and literature analysed influence of international factors on foreign policy position of VKL during the considered historical period, studied representation of foreign policy interests of the Kingdom of Sweden in Moscow State , revealed controversial border issues between VKL and the Moscow state, designated trade and economic problems of the relations of the Principality and Moscow. The relations of the Principality and the Moscow state are considered through a prism of interests of litvinsky political elite and necessarily in a context of difficult internal political processes of single federation, and also in a context of the relations of the Rzeczpospolita and the Moscow state.*

УДК [766:655] (=826)

# КСІЛАГРАФІЧНЫЯ АЗДОБЫ Ў КУЦЕІНСКІХ ВЫДАННЯХ

***Ю.М. ЛАЎРЫК***
***(Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Мінск)***

*Даследуецца пытанне аб выкарыстанні ксілаграфічных аздоб пры афармленні выданняў, апублікаваных у Куцейне ў 1630 – 1650-х гадах як Спірыдонам Собалем, так і манастырскай друкарняй. Аналізуюцца прысутныя ў гэтых выданнях асобныя тыпы і віды элементаў кніжнага аздаблення: рамкі тытульных аркушаў, застаўкі, канцоўкі, ініцыялы, гравюры ілюстрацыйнага жанру і інш. На падставе параўнання іх з ксілаграфічнымі аздобамі, выступаючымі ў кнігах іншых айчынных, а таксама замежных друкарняў дадзенага часу, аўтар робіць высновы як пра магчымае паходжанне саміх элементаў ці іх прататыпаў, так і наогул пра месца куцеінскай ксілаграфічнай школы ў айчыннай кніжнай культуры разглядаемага перыяду.*

Разгляду аздаблення выданняў Куцейны дагэтуль не надавалася шмат увагі. Ксілаграфічныя аздобы куцеінскіх кніг Спірыдона Собаля поруч з іншымі аспектамі праблемы разглядаліся А. Зёрнавай у артыкуле, прысвечаным дзейнасці друкара [1], а агульная характарыстыка друкаў Куцейны ў кантэксце мастацтва беларускай старадрукаванай кнігі была дадзена ў публікацыях В. Шматава [2; 3] і В. Малюшынай [4; 5]. Прычым, калі В. Малюшына імкнулася прадставіць прысутныя ў аздабленні айчыннай кнігі разгляданага перыяду мастацкія з'явы і тэндэнцыі ў агульных рысах і без вылучэння спецыфікі паасобных друкарняў, В. Шматаў разглядаў прадукцыю кожнага варштату, а ў прыватнасці як Собалевага, так і манастырскага, больш ізалявана і дэталёва. Разам з тым яго працы напісаны з пункту гледжання мастацтвазнаўства і з выкарыстаннем уласцівага для гэтай навукі інструментарыя, а таму пакідаюць гісторыку шмат прасторы для дзеяння. Паасобныя пытанні, звязаныя з тэмай даследавання, закраналіся таксама ў працах кнігазнаўцаў і гісторыкаў кнігі [6 – 8].

**Выкарыстанне гравіравальных тэхнік у аздабленні Собалевых друкаў і выданняў манастырскай друкарні.** Тытульныя аркушы кіеўскіх выданняў Спірыдона Собаля даюць нам прыклад ужывання 2-х відаў гравюры: на медзі і на дрэве. І хоць пазней друкар выкарыстоўваў выключна ксілаграфію, менавіта пры дапамозе медзярыта была аздаблена першая выдадзеная ім кніга (кіеўскі "Актоіх", 1628 г.). Украінскі гісторык Я. Ісаевіч звярнуў увагу, што ў гэтым выданні Собаль выкарыстаў названую тэхніку ўпершыню ў практыцы кірылічнага кнігадрукавання [8, с. 71]. Ужыты толькі аднойчы, медзярыт тытульнага ліста "Актоіха" 1628 года больш нідзе ў выданнях Собаля не сустракаецца, хоць, як мы бачылі з цытаваных вышэй дакументаў, гравіраваныя пласціны з патрэбнымі для пераводу рысунка металічнымі валікамі заставаліся ў валоданні друкара да самай смерці.

Такім чынам, ужо ў Кіеве, а затым і ў Куцейне Спірыдон Собаль пры падрыхтоўцы гравіраваных аздобаў адназначна аддае перавагу ксілаграфіі. Гэтая тэхніка выкарыстоўваецца ім для падрыхтоўкі аздаблення тытульных аркушаў, выяваў ілюстрацыйнага характару і гербаў мецэнатаў, заставак і канцовак, загаловачных і маргінальных аздобаў, а таксама ініцыялаў. У яго кнігах можна сустрэць як дошкі, вядомыя нам па ранейшых выданнях іншых друкарняў (напрыклад, застаўку Івана Фёдарава, якая выкарыстоўвалася і Вярбіцкім [1, с. 135]), так і больш новыя. Паводле падлікаў А. Зёрнавай, Собаль прывёз з сабой з Кіева, апрача фёдараўскай, яшчэ дванаццаць дошак заставак, каля дзесяці буйных ініцыялаў і некалькіх дзесяткаў дробных, тры ці чатыры дошкі канцовак і дзве рамкі для тытульных лістоў, адна з якіх ужывалася для Апостала, а другая, састаўная, для "Мінеі" і "Актоіха" 1629 года [1, с. 135].

Пры ад'ездзе ў Буйнічы Собаль значную частку друкарскага матэрыялу забраў з сабой, пакінуўшы, тым не менш, пэўную колькасць ксілаграфічных аздоб, якія мы сустракаем і ў пазнейшых куцеінскіх выданнях. Разам з тым пяцігадовае супрацоўніцтва з ім дало куцеінцам знаёмасць з тагачаснай тэхналогіяй кніжнай справы і схіліла іх запрасіць або падрыхтаваць рэзчыкаў па дрэве, якія, у прыватнасці, стварылі тры цыклы ілюстрацыйных гравюр, некалькі серый ініцыялаў і серыю заставак для "Новага Запавета".

Трэба адзначыць, што выраб дрэварытавых элементаў аздаблення быў распачаты ў Куцейне ўжо падчас падрыхтоўкі да выпуску першых выданняў, пра што гавораць складзеныя з адмысловых ініцыялаў ксілаграфічныя загалоўкі ў "Малітвах штодзённых". Мы не ведаем сёння, каму належыць аўтарства гэтых аздобаў – самому Спірыдону Собалю, каторы, быць можа, валодаў і мастацтвам дрэварыту, як валодаў уменнем рэзаць матрыцы для шрыфтоў; заезджаму майстру (прывезенаму друкаром з Кіева?) або камусьці з куцеінскіх манахаў.

**Аздабленне тытульнага аркуша ў куцеінскіх выданнях.** У 1629 годзе Спірыдон Собаль публікуе ў Кіеве "Актоіх" са складзенай з некалькіх элементаў ксілаграфічнай рамкай-"фортай" тытульнага аркуша, якую пазней паўтарае і ў куцеінскім перавыданні кнігі, ажыццёўленым пасля 1632 года. Рамка ўвасабляе традыцыйную для выданняў гэтага часу ідэю кнігі як брамы да ведаў: уключаючы ў якасці бочных элементаў постаці арханёлаў Міхаіла і Гаўрыіла на фоне калон, яна прадстаўляе сабой стылізаваны франтон і, такім чынам, змяшчае алюзію да так званага "архітэктурнага" стылю.

Больш ярка “архітэктурны” стыль праявіцца на тытульных аркушах куцеінскіх кніг канца перыяду (напрыклад, у перапісаным багаяўленскімі манахамі так званым “Баркалабаўскім Ірмалоі” 1651 года) або ў надрукаваным у 1652 годзе “Новым запавеце”. Найчасцей жа тытульныя аркушы ранніх манастырскіх выданняў аздабляліся ў “іканастасным” стылі – своеасаблівай постаці (“іпастасі”) стыля “архітэктурнага”, якая атрымала распаўсюджанне менавіта ў праваслаўнай кнізе.

“Іканастасны” стыль характарызуецца прысутнасцю выяваў прарокаў, святых і айцоў царквы, якія могуць мець прамавугольную форму абразоў або быць укладзенымі ў круглыя медальёны, падобна як на царскай браме алтара. Злучаючыся паміж сабой пры дапамозе рамкі і арнаменту, гэтыя выявы ўтвараюць падабенства іканастаса. Айчынны мастацтвазнаўца В. Шматаў датуе з’яўленне гэтага стылю ў айчынным кірылічным кнігадрукаванні толькі 1654 годам [3, с. 104], беручы за пункт адліку 2-е выданне куцеінскай “Дыёптры”. Аднак насамрэч “іканастасны” стыль выкарыстоўваўся ў прадукцыі манастырскай друкарні ўжо амаль ад самага пачатку яе дзейнасці (у прыватнасці, мы можам яго назіраць у аздабленні тытульнага аркуша “Гісторыі пра Варлаама і Іасафа” 1637 г.). Гэты стыль аздаблення куцеінскіх кніг запазычаны, як здаецца, з украінскіх праваслаўных выданняў, дзе ён актыўна развіваецца пачынаючы з першай чвэрці XVII стагоддзя.

**Гербавыя выявы ў куцеінскіх выданнях.** Паколькі куцеінцы друкавалі кнігі за кошт уласных даходаў, гербы дабрачынцаў не належаць да вельмі распаўсюджаных выяваў у выпушчаных імі выданнях. Тым не менш часам іх можна сустрэць і ў друках Куцейны, у прыватнасці гэта гербы духоўных асобаў Сільвестра Косава і Пятра Магілы, якія прысутнічаюць у розных асобніках “Гісторыі пра Варлаама і Іасафа” 1637 года [6, с. 105]. Першы з названых святароў быў у гэты час епіскапам магілёўскім, аршанскім і мціслаўскім, а другі – мітрапалітам кіеўскім і галіцкім. На тытульным аркушы пазначана, што выданне ажыццёўлена “старанем и коштом Іноков Общежителного Монастыра Кутеінского”. Таму змяшчэнне гербаў іерархаў у кнізе, відаць, указвае не столькі на фінансавую, колькі на маральную падтрымку яе публікавання вышэйшым духавенствам праваслаўнай царквы. Рэч у тым, што “Гісторыя пра Варлаама і Іасафа” (1637 г.) была першай у айчынным праваслаўным друку спробай публікавання белетрыстычнага твора хрысціянскай тэматыкі і таму стаяла асабняком сярод выданняў літургічнага або аскетычнага характару. Прысутнасць жа ў ёй гербаў вышэйшых іерархаў указвала на ўхваленне друку царквой і павінна было гарантаваць “прававернасць” кнігі. Гэтае меркаванне разам з тым не выключае магчымасці аказання названымі асобамі дапамогі друкарні ў тым ці іншым выглядзе (напрыклад, накіраваць з Кіева рэзчыка па дрэве).

У куцеінскіх друках адзіны свецкі герб – герб роду Сцяцкевічаў, ктытараў Багаяўленскага манастыра, які прысутнічае на некаторых асобніках “Новага запавету з псалтыр’ю” 1652 года. Зрэшты, і ён чаргуецца ў іншых асобніках выдання з гербам тагачаснага епіскапа віцебскага, магілёўскага, аршанскага і мціслаўскага Язэпа Гарбацкага [6, с. 119]. “Новы запавет з псалтыр’ю”, як мы пабачым ніжэй, быў прызначаны для продажу ў Маскоўшчыне.

**Кніжная ілюстрацыя ў куцеінскіх выданнях.** Сюжэтныя выявы, традыцыйна называныя ў літаратуры “ілюстрацыямі” або “ілюстрацыйнымі гравюрамі” [3, с. 104], далёка не заўсёды насамрэч ілюструюць тэкст: гэтыя тэрміны ўжываюцца, хутчэй, каб адрозніваць такія выявы ад іншых гравіраваных аздобаў – заставак, канцовак і г.д.

Для айчыннай кнігі гэтага перыяду характэрна ўжыванне такіх “адвольных ілюстрацый”. Напрыклад, з дзвюх выкарыстаных у Куцейне Спірыдонам Собалем гравюраў – “Хрыстос з серафімамі” (“Буквар”, 1631 г.) і “Ян Дамаскін” (“Актоіх”, выд. пасля 1632 г.) – пэўнае дачыненне да зместу выдання мае толькі апошняя, якая прадстаўляе партрэт аўтара кнігі; непасрэдна ж тэкст ніводная з іх не ілюструе. Абедзве выявы выкарыстоўваліся Собалем ужо ў Кіеве; яны займаюць цэлую старонку на франтыспісе кнігі. Новых гравіраваных выяваў у куцеінскіх выданнях Спірыдона Собаля няма, а яго друкі 1631 – 1634 гадоў не вылучаюцца адметнасцю і разнастайнасцю ілюстрацыйнага матэрыялу.

Першая ілюстрацыя ў поўным сэнсе гэтага слова з’яўляецца ў куцеінскіх друках ужо толькі пасля ад’езду Собаля, у “Гісторыі пра Варлаама і Іасафа” (1637 г.). Гэта гравюра прадстаўляе размову “тытульных” герояў аповесці пра “камень веры”. Менавіта з яе распачынаецца размяшчэнне сюжэтных выяваў у выданнях Куцейны непасрэдна на кніжнай старонцы побач з тэкстам. Такая прытэкставая ілюстрацыйная гравюра, зазвычай, мае велічыню ўдвая меншую за памеры тэкставага блоку і размяшчаецца каля правага поля – у верхнім ці ніжнім куце, або нават пасярэдзіне старонкі. І хоць традыцыйнае, “франтыспіснае”, знаходжанне партрэтаў яшчэ доўга захоўвае свае пазіцыі ў літургічных (“Актоіх”) і “боганатхнёных” (“Новы запавет з псалтыр’ю”) кнігах, аднак з выхадам “Гісторыі пра Варлаама і Іасафа” друк на нашых землях узбагаціўся ў новы прыём*, каторы ад таго часу спарадычна сустракаецца як у пазнейшых куцеінскіх (“Трыфалагіён”), так і ў іншых айчынных (напрыклад, магілёўскіх) выданнях. Гэта дае нам падставы гаварыць пра *два віды ілюстрацый у куцеінскіх выданнях*: *франтыспісныя* і *ўнутрытэкставыя*.

* Праўда, ілюстрацыі на кніжных старонках можна сустрэць ужо ў Скарынавых выданнях, дзе яны, найчасцей знаходзячыся напачатку біблійных кніг, выконваюць ролю своеасаблівых заставак. Толькі паасобныя Скарынавы гравюры (напрыклад, выява цара Давіда на с. 1 “Псалтыры”), размешчаныя наўзбоч тэксту, можна разглядаць як праобраз куцеінскіх ілюстрацый. Пасля Скарыны гэты прыём не выкарыстоўваўся ў айчынным кірылічным друку больш за стагоддзе.

Пазасталага ў Куцейне пасля Собалевага ад'езду друкарскага матэрыялу (у тым ліку ксілаграфічнага) было замала для хуткага аднаўлення кнігавыдавецкай справы: калі сам друкар па пераездзе ў Буйнічы выдае "Псалтыр" ужо ў 1635 годзе, падрыхтоўка абсталявання для манастырскай друкарні зацягваецца ажно да 1636 года (толькі ў гэтым годзе выходзіць малафарматнае (in octavo) і малааб'ёмнае (52 старонкі) выданне пад загалоўкам "На "Ойча наш" выклад". І сам "Выклад", і наступная па ім "Дыдаскалія альбо Навука пра сем сакраментаў" Сільвестра Косава, якая ўбачыла свет у студзені 1637 года, аздоблены яшчэ даволі сціпла і не маюць на сваіх старонках ілюстрацыйных выяваў (ксілаграфія ў іх прадстаўлена ў першым выпадку, Собалевымі ініцыяламі ў віленскім стылі, а ў другім – двума дрэварытавымі загалоўкамі, адной застаўкай і канцоўкай ды некалькімі ініцыяламі рознага стылю). Значны зрух у гэтай справе назіраецца ў 1637 годзе, калі ў куцеінскіх друках з'яўляецца першая арыгінальная ілюстрацыйная гравюра, новыя рамкі тытульных аркушаў пачынаюць станавіцца сталай з'явай, а колькасць іншых аздобаў істотным чынам узрастае.

Відаць, ужо напачатку 1637 года (а быць можа, і з канца 1636 г.) у Куцейне працуе кваліфікаваны гравёр па дрэве, які рэжа, у прыватнасці, рамкі-"форты" для тытульнага аркуша і ілюстрацыі. Яго ўдзел можна бясспрэчна сцвердзіць ужо ў трэцім (ліпень 1637 г.) самастойным выданні манастырскай друкарні "Гісторыі пра Варлаама і Іасафа", дзе прысутнічаюць арыгінальная, выкананая ў "іканастасным" стылі, ксілаграфічная рамка тытульнага аркуша і ілюстрацыя з выявай Варлаама ды Іасафа. Упэўненасць ліній і багацце дробных дэталяў пераконваюць, што абедзве гравюры належаць рэзцу (або, як тады казалі, "рыльцу") прафесійнага ксілографа.

Прысутнасць у некаторых асобніках выдання герба мітрапаліта Пятра Магілы дае падставы меркаваць, што рэзчык мог быць запрошаны за згодай мітрапаліта з Кіева. З гэтага часу мы пачынаем сустракаць у куцеінскіх друках усё новыя і новыя ілюстрацыйныя дрэварыты. Ужо ў наступным выданні манастырскай друкарні – "Брашне духоўным" (1639 г.) – таксама прысутнічае адмысловая ксілаграфічная рамка тытульнага аркуша і новая ілюстрацыя з выявай цара Давіда.

Разам з тым некаторыя выкарыстаныя ў той жа "Гісторыі пра Варлаама і Іасафа" ініцыялы (як, напрыклад, "І̊" на арк. 79 адв.), нягледзячы на адносна вялікі памер (28×23 мм), характарызуюцца адсутнасцю дэталяў і схематычна намечаным арнаментам на белым фоне; хутчэй за ўсё, яны створаны пачаткоўцам. Іншым, але таксама не вельмі дасведчаным, мастаком выразаны яшчэ адзін досыць буйны (24×22 мм) ініцыял "К", які некалькі разоў (пачынаючы з арк. 7 адв.) сустракаецца ў гэтым выданні. Ён мае лістападобныя абрысы на фоне, запоўненым рэдкай штрыхоўкай, і аформлены ў адной манеры з застаўкай (арк. 1), якая змяшчае, апрача арнаменту, авальны медальён з контурна паказанай сцэнай Багаяўлення. Наяўнасць у згаданых выданнях поруч з прафесійна выкананымі гравюрамі новых ксілаграфічных элементаў больш нізкага ўзроўню ўказвае на тое, што дасведчаны майстра, які рыхтаваў высокаякасныя творы, разам з тым абучаў манахаў разьбе па дрэве і, такім чынам, заклаў асновы будучай куцеінскай школы дрэварыту.

Пасля выхаду "Брашна духоўнага" далейшая праца па выданні кніг у Куцейне была, відаць, па невядомых для нас прычынах спынена на некалькі гадоў (або, быць можа, яе плён да нашага часу не дайшоў). У кожным разе наступнае вядомае бібліёграфам выданне манастырскай друкарні датуецца 1646 годам – гэта "Актоіх", які з'яўляецца перадрукам Собалевага "Актоіха", выпушчанага пасля 1632 года. А ўжо на наступны год выходзіць у свет "Трыфалагіён", які В. Шматаў назваў "лепшай ілюстраванай кнігай Куцейны" [3, с. 104]. З працытаванай характарыстыкай можна спрачацца, бо дрэварыты "Трыфалагіёна" паводле майстэрства і дбайнасці выканання выразна саступаюць, напрыклад, гравюрам "Новага запавета" (1652 г.) і часам выглядаюць як зробленыя на хуткую руку. Разам з тым нельга не прызнаць, што гэта найбагацей ілюстраванае куцеінскае выданне (паводле падлікаў Г. Галенчанкі, яно змяшчае 19 адбіткаў з 17 гравіраваных дошак) [6, с. 116].

У "Трыфалагіёне" можна вылучыць два цыклы ілюстрацыйных гравюр:

1) Гасподнія і Багародзічныя святы (Дабравешчанне, Божае нараджэнне, Увядзенне ў храм, Багаяўленне, Пераўвасабленне і Успенне Найсвяцейшае Багародзіцы);

2) персанажы Святой гісторыі і выбітныя постаці хрысціянства (арханёл Міхаіл, прарок Ілля, Ян Правазвеснік, апосталы Пётр і Павел, св. Юры, Ян Златавусны, Рыгор Багаслоў і Васіль Вялікі).

Думаецца, што гравюры "Трыфалагіёна" ствараліся некалькімі майстрамі. Найбольш выразна гэта заўважна на прыкладзе дрэварытаў "асобаснага" цыклу. Напрыклад, гравюры "Арханёл Міхаіл" і "Святы Юры", без сумневу, выйшлі з-пад "рыльца" розных гравёраў, што відаць па адрознай трактоўцы асобных элементаў аблічча (вачэй, вушэй, валос, шэі, падвойнага або адзінарнага круга німба), больш ці менш грубай штрыхоўцы і г.д.

Зыходзячы з манеры выканання і арфаграфіі надпісаў усе "асобасныя" выявы "Трыфалагіёна" можна падзяліць на некалькі груп. Да першай з іх аднясём такія гравюры, як: "Прарок Ілля", "Ян Правазвеснік", "Васіль Вялікі" ды апосталы "Пётр і Павел"; да другой будуць належаць "Рыгор Багаслоў" і "Св. Юры"; да трэцяй – "Арханёл Міхаіл" і "Ян Златавусны".

Першыя чатыры гравюры адназначна належаць аднаму майстру, што відаць па аднолькавай трактоўцы элементаў аблічча, падобных прыёмах пры паказе зямлі пад нагамі святых, белым незапоўненым фоне па-за імі, адзінарнай лініі німба і іншых дэталях. Усе гэтыя дрэварыты маюць акуратную падвой-

ную рамку, а скарот ад слова “святы” паўсюль падпісаны (згодна з кіеўскай традыцыяй) праз “Σ”. На мячы прарока Іллі прысутнічае манаграма “ІСЖ”. Літара “І”, падобная да лацінскага “J”, мае такі самы выгляд, як і ў імені “Jωанъ” на выяве Яна Правазвесніка і, верагодна, з’яўляецца скаротам ад слова “іераманах”. У такім разе “С” і “Ж” – гэта ініцыялы майстра, якія, аднак, пакуль не ўдалося атаясаміць з канкрэтнай асобай; назавём яго “Манаграмістам ІСЖ”.

Гравюры другой групы паводле манеры выканання набліжаюцца да апісаных вышэй дрэварытаў і характарызуюцца большасцю са згаданых падабенстваў; разам з тым яны маюць некаторыя адрозненні. Так, на гэтых гравюрах больш актыўна, чым на апісаных вышэй, ужываецца гарызантальная штрыхоўка адзення, а слова “святы” пачынаецца з літары “С”, а не “Σ”. Тым не менш можна дапусціць, што і гэтыя выявы выразаны “Манаграмістам ІСЖ”, але па часе выкання крыху адстаяць ад папярэдніх.

Інакш справа маецца з дрэварытамі трэцяй групы, якія адрозніваюцца не толькі ад іншых, але і між сабой. Зблізае гэтыя гравюры падобная кампазіцыя постаці і палажэнне далоняў, падвойная лінія німбаў, імкненне запоўніць усю прастору выявы і адрознае ад папярэдніх размяшчэнне подпісаў (апошняе, зрэшты, можна растлумачыць адсутнасцю вольнага месца).

Пры некаторым падабенстве да апісаных вышэй выяваў, гравюра “Ян Златавусны” дэманструе шэраг адрозненняў: іншая трактоўка паасобных элементаў аблічча (вочы, вушы, валасы, палажэнне пальцаў пры жэсце праслаўлення), кніжнай аправы (заштрыхаваная, тады як у Васіля Вялікага і ў апостала Паўла – дакладна выпісаная), падлогі (простыя бесперарыўныя лініі штрыхоўкі замест перарывістых). Рамку гэтая гравюра мае адзінарную, а “Арханёл Міхаіл” – падвойную, але вельмі неахайна выкананую.

Між сабой дзве апошнія гравюры адрозніваюцца майстэрствам выканання. Можна выказаць меркаванне, што “Арханёл Міхаіл” ствараўся гравёрам-пачаткоўцам паводле аналагічнага дрэварыту, што сустракаецца ва ўкраінскіх выданнях (вучнёўскі характар гэтага абразка падкрэслівае і нечытальны люстэркавы подпіс, атрыманы пры пераводзе гравюры).

Такім чынам, над гэтым цыклам, трэба думаць, працавала не менш за трох рэзчыкаў.

Пра “святочны” цыкл гравюраў выказацца цяжэй, паколькі даволі складана зрабіць адназначныя высновы на падставе параўнання рознапланавых сцэн. Разам з тым, здаецца, што выявы і гэтага цыклу не заўсёды выкананы адным майстрам (напрыклад, адрозніваецца перадача рысаў твараў дзейных асоб у сцэнах Дабравешчання і Увядзення Багародзіцы ў храм).

Яшчэ адзін цыкл ілюстрацыйных гравюр знаходзіцца ў “Новым Запавеце” і змяшчае выявы евангелістаў Марка, Матфея, Лукі ды Яна. Усе яны заключаны ў аднатыпныя (але не ідэнтычныя) рамкі і вылучаюцца выдатнай прапрацоўкай дэталяў. Святы Ян паказаны ў пячоры на востраве Патмас; ён выразна адрозніваецца памерам і стылістыкай выканання ад іншых евангелістаў, нагадваючы хутчэй мініяцюры даўніх рукапісаў – па-за ўсялякім сумневам, гэтую гравюру рэзаў іншы майстра. Што да трох астатніх выяваў, то ў адносінах іх супольнага аўтарства таксама няма пэўнасці. Адназначна належаць аднаму гравёру партрэты Матфея і Марка, якія супадаюць дробнай штрыхоўкай адзення, аднолькавай трактоўкай рысаў твару і аблічча (дакладна выпісаныя вочы, зморшчынкі, валасы) і інш. Супадаюць у дэталях і кветкі, прысутная ў аблямоўцы рамкі.

Штрыхоўка партрэта Лукі буйнейшая, але разам з тым больш выразная; быць можа, на гэтай гравюры не так дакладна паказаны рысы твару, але значна натуральней выглядаюць і складкі гімантыя, і цагляная сцяна па-за евангелістам. Не мае Лука, у адрозненні ад папярэдне апісаных, і выявы свайго атрыбута-сімвала (цялка). Нягледзячы на тое, што некаторыя элементы гэтай гравюры (напрыклад, форма чарнільніцы на стале або нішы за спіной святога) нагадваюць партрэт Матфея, думаецца, што дрэварыт Лукі ствараў іншы майстра; супадзенні дэталяў можна растлумачыць знаёмствам абодвух рэзчыкаў (ці нават аўтарствам аднаго з іх) з гравюрай Дамаскіна ў куцеінскім “Актоіху” 1646 года, дзе прысутнічаюць падобныя элементы.

Выява святога Лукі не датаваная, у адрозненні ад трох астатніх, на якіх пазначана: “В Кутейне року АХНА” 1651 года; адсутнасць подпісу на ёй тлумачыцца, відаць, спешкай аддання дрэварыта ў друк. Выданне выйшла ў свет 5 жніўня 1652 года і мела вялікі аб’ём (632 арк.) ды наклад (не менш за 600 асобнікаў). Знаходжанне партрэта Лукі прыкладна ў сярэдзіне кнігі (арк. 105 адв. 2-й пагінацыі – гэта значыць, 237 ад пачатку) схіляе думаць, што і гэтая гравюра рэзалася менавіта ў 1651 годзе.

**Застаўкі і ксілаграфічныя загалоўкі.** У ранніх куцеінскіх друках (а асабліва ў першых манастырскіх выданнях) рэзаныя па дрэве застаўкі сустракаюцца не вельмі часта. Так, у кнігах “Малітвы штодзённыя” і “На "Ойча наш" выклад” няма ніводнай такой аздобы, а ў “Дыдаскаліі” 1637 года і “Гісторыі пра Варлаама і Іасафа” – толькі па адной. Гэта можа тлумачыцца не столькі адсутнасцю друкарскага матэрыялу як такога, колькі празнымі іншымі прычынамі. Так, напрыклад, у першым выпадку фармат выдання не дазваляў ужываць наяўных у Собаля вялікіх заставак даўжынёй каля 100 мм. У апошнім жа – увядзенне заставак, з аднаго боку, прыўносіла б непатрэбнае раздзяленне звязанага тэксту, а з другога – пры кароткіх главах і выкарыстаным для друку памеры шрыфта магло б парушыць архітэктоніку старонкі. Магчыма, да гэтага спрычынілася таксама імкненне і Собаля напачатку яго дзейнасці ў Куцейне, і пазней манастырскіх друкароў, выкарыстоўваць у ролі своеасаблівых заставак ксілаграфічныя загалоўкі.

*Ксілаграфічныя загалоўкі* ўяўлялі сабою назвы кніг або найбольш значных раздзелаў, складзеныя з вялікіх літар адметнага рысунку. Ажурная разьба фона візуальна злучала паасобныя літары ў арнаментальную лінію, як мы можам назіраць тое ў "Малітвах штодзённых" або ў "Дыдыскаліі" 1637 года.

Ксілаграфічныя загалоўкі ў куцеінскіх выданях сустракаюцца двух відаў: састаўныя і цэльнарэзаныя. Першыя складаліся з паасобных ініцыялаў (як загалоўкі раздзелаў у "Малітвах штодзённых"), другія гравіраваліся цалкам на адной дошцы (як назва "Часаслоў" у "Брашне духоўным"). Апошнія ў большай ступені імітуюць вязь рукапісных кніг і нярэдка друкаваліся паралельна з застаўкамі, дапаўняючы апошнія (як у "Брашне духоўным" і "Новым Запавеце"). Разам з тым адзначым, што дрэварыты загалоўкаў дэманструюць дастаткова шырокі дыяпазон формаў: ад надпісаў, што складаюцца з "голых" літараў ды лігатур (напрыклад, загаловак Псалтыры ў "Новым Запавеце"), і да аздобленых разнастайным раслінным арнаментам (напрыклад, загалоўкі Евангелляў у тым жа выданні).

*Застаўкі* ў куцеінскіх выданнях можна падзяліць на тры тыпы: І тып – застаўкі расліннага арнаменту шырокія; ІІ тып – застаўкі расліннага арнаменту вузкія; ІІІ тып – застаўкі сюжэтныя (шырокія).

Пад застаўкамі расліннага арнаменту мы разумеем такія, каторыя ў якасці дэкору выкарыстоўваюць выключна раслінны арнамент у розных яго праявах; пад сюжэтнымі – такія, каторыя апрача расліннага арнаменту змяшчаюць медальёны (або, іначай, клеймы) з пэўным евангелічным сюжэтам або з выявай святога.

Паколькі падчас ужывання застаўкі нярэдка страчваліся выступаючыя па-за лінію рамкі ўпрыгожванні, то памеры адной і той жа аздобы маглі ад выдання да выдання змяняцца*. Звяртаючы ўвагу на гэта, пры даследаванні мы прымалі за асноўныя памеры вышыню і шырыню рамкі або (пры адсутнасці апошняй) асновы застаўкі; вымярэнні ж, зробленыя з улікам дадатковых упрыгожанняў, разглядаліся намі як дапаможныя. У сувязі з гэтым мы абазначым застаўкі з вышынёй па рамцы да 15 мм уключна як вузкія, а да шырокіх аднясем тыя, што перасягаюць гэтую велічыню (часцей за ўсё яны маюць вышыню 25 – 35 мм). Шырокія застаўкі традыцыйна выкарыстоўваліся як загалоўныя ў найбольш значных структурных раздзелах таго ці іншага выдання, а вузкія – для вылучэння падпарадкаваных тэкстаў.

У куцеінскіх друках найчасцей сустракаюцца застаўкі з раслінным арнаментам: яны прэвалююць амаль у кожным выданні (за выключэннем хіба што "Новага Запавету"). У асноўным куцеінскія друкары выкарыстоўвалі чатыры шырокія застаўкі даўжынёй каля 100 мм (адна з іх, "І г", мае па рамцы 88 мм, а з бочнымі ўпрыгожваннямі – 108 мм; астатнія – звыш 100 мм па рамцы). Дзве з гэтых заставак змяшчаюць белы раслінны арнамент на белым фоне ("І а", "І б") і дзве – на чорным ("І в", "І г").

У кіеўскіх друках Спірыдона Собаля гэтыя застаўкі не сустракаюцца; не ўдалося іх выявіць і ў іншых украінскіх, маскоўскіх або віленскіх выданнях, што схіляе да думкі пра куцеінскае паходжанне названых аздоб. Разам з тым гэтыя аздобы нярэдка дэманструюць пэўную ступень падабенства да тых ці іншых заставак, сустраканых у больш ранніх друкаваных кнігах. Так, у прыватнасці, застаўка "І а", верагодна, створана пад уплывам аздобы, прысутнай у некаторых друках С. Собаля, такіх, як "Мінея" 1628 года (1 арк. 2-й нумарацыі і інш.) і "Апостал" (1 нн. і інш.), а прататып застаўкі "І б" (раслінны арнамент усярэдзіне рамкі) можна знайсці ў выданнях Кіева-Пячорскай Лаўры, напрыклад, на арк. 1 2-й пагінацыі "Кнігі пра веру адзіную" 1620 г. і на арк. 1 "Номаканона" 1624 г.

Судзячы па манеры выканання, усе чатыры згаданыя застаўкі маглі быць выразаны адным майстрам, але паводле эскізаў розных рысавальнікаў або пад уплывам разнатыпных твораў.

Напрыканцы куцеінскага перыяду дзейнасці манастырскай друкарні ў яе арсенале з'яўляецца яшчэ адна шырокая застаўка, але ўдвая карацейшая за іншыя (памер 23 × 58 мм, упрыгожванняў па-за межамі рамкі няма) – яна выкарыстана двойчы ў "Буквары" 1653 г. (арк. 2, 7) [7, с. 250 – 251]. Манера яе выканання вельмі блізкая да манеры, у якой выразаны сюжэтныя застаўкі з выявамі апосталаў для "Новага Запавету" 1652 г., і несумненна належыць руцэ таго майстра, што рыхтаваў гэтую серыю.

Вузкіх заставак з раслінным арнаментам, якія сустракаюцца ў выданнях манастырскай друкарні напрацягу амаль усяго перыяду яе дзейнасці, таксама чатыры. Усе яны маюць даўжыню каля 100 мм (без бочных упрыгожванняў: ад 96 да 113 мм) і прэзентуюць белы арнамент на чорным фоне. Тры з гэтых аздоб ("ІІ а", "ІІ б", "ІІ г") з'яўляюцца даволі дакладнымі копіямі, з незначнымі адрозненнямі ў дэталях, фёдараўскіх заставак, якія прысутнічаюць у "Апостале" 1574 года, а пазней выкарыстоўваліся ў некаторых львоўскіх друках, напрыклад, у "Актоіху" 1630 г. Чацвёртая застаўка ("ІІ в") па стылістыцы таксама ўзыходзіць да фёдараўскіх; яе прататып (з адрозненнямі галоўным чынам у пазарамачных элеметах) прысутнічае ў друках Мамонічаў, у прыватнасці ў "Апостале", выдадзеным пасля 1595 года.

Калі казаць пра сюжэтныя застаўкі, то яны ў манастырскіх друках сустракаюцца радзей: напрацягу амаль усяго куцеінскага перыяду мы назіраем усяго дзве, і толькі ўжо амаль перад самай маскоўскай вайной з'яўляецца новая іх серыя з шасці штук – у "Новым Запавеце з псалтыр'ю" 1652 года.

Найчасцей у куцеінскіх друках прысутнічае выкананая ў кіеўскім стылі сюжэтная П-падобная застаўка з трыма круглымі медальёнамі ў атачэнні расліннага арнаменту на белым фоне (ІІІ а); у медальёнах

* Часам назіралася і адваротная сітуацыя; так, застаўка "І б" у "Дыдаскаліі" 1637 г. сустракаецца без бочных аздоб, а ў пазнейшых выданнях (напрыклад, у "Брашне духоўным" 1639 г.) яны ўжо прысутнічаюць.

змешчаны выявы Ісуса Хрыста (дыяметр унутранай акружнасці – 25 мм), а таксама Маці Божай і св. Яна Багаслова (дыяметрам па 18 мм). Цікава, што ў дадзеным выпадку мы можам выкарыстоўваць слова "медальёны" не толькі ў мастацтвазнаўчым значэнні, але і ва ўжытковым, паколькі іх круглыя рамкі маюць нарысаваныя вушкі для падвешвання. Памеры гэтай застаўкі: па рамцы – 54 × 118 мм, з верхнім упрыгожваннем – 58 × 118 мм. Яна выглядае ўрачыста, і, відаць, таму выкарыстоўвалася напачатку найбольш значных кніг: напрыклад, "Часаслова" ў "Брашне духоўным" 1639 года або "Евангелляў" у "Новым Запавеце".

Другую сюжэтную застаўку, якая ўжывалася на заранні дзейнасці манастырскай друкарні, мы згадвалі, калі выказваліся пра пачаткі куцеінскай ксілаграфічнай школы – гэта застаўка са сцэнай Багаяўлення ў авальным медальёне і лістападобным арнаментам на заштрыхаваным фоне ("ІІІ б"). Такая застаўка сустракаецца толькі ў "Гісторыі пра Варлаама і Іасафа" (арк. 1) і "Брашне духоўным" 1639 года (арк. 47, 74, 88 адв.). Быць можа, менавіта невысокая якасць аздобы схіліла манастырскіх друкароў адмовіцца ад яе далейшага выкарыстання. Памеры гэтай застаўкі па рамцы 25 × 100 мм, упрыгожванняў па-за лініяй рамкі няма.

Серыя, падрыхтаваная для "Новага запавета з псалтыр'ю" 1652 года, складаецца з шасці аднатыпных заставак без пазарамачных упрыгожванняў памерам 36 × 112 мм ("ІІІ в" – "ІІІ з"). Яны запоўнены белым раслінным арнаментам на чорным фоне і змяшчаюць у цэнтры картушны медальён з выявай таго ці іншага апостала або святога – аўтара кніг Новага Запавету. Стылістыка гэтых заставак нагадвае стылістыку некаторых віленскіх выданняў, напрыклад, "Новага Запавету" 1623 года (які, магчыма, служыў мастаку ўзорам для наследавання); разам з тым і арнамент, і партрэты ў куцеінскіх дрэварытах выкананы больш тонка і дакладна, чым ў віленскіх.

Азначаныя застаўкі прызначаліся для ўпрыгожвання пэўных частак Святога Пісьма, напісаных згаданымі асобамі. Так, перад "Дзеямі апостальскімі" змешчана выява святога евангеліста Лукі, перад "Апакаліпсай" – святога Яна, а перад адпаведнымі апостальскімі лістамі – выявы святых Якава, Пятра, Яна, Юды і Паўла.

Паводле выкарыстання ксілаграфічнага матэрыялу "Новы запавет з псалтыр'ю" 1652 года можна раздзяліць на тры часткі. Першая частка, якая ўключае "Псалтыр", надрукавана выключна з ужываннем старых гравіраваных аздобаў. Дзве другія, наадварот, выдаваліся з выкарыстаннем нававыразаных дрэварытаў. Так, сярэдняя частка (Евангеллі) уключае поруч з раней ужыванымі застаўкамі і канцоўкамі выробленыя ў 1651 годзе гравюры евангелістаў. Апошняя ж частка ("Дзеі і лісты апосталаў", "Апакаліпса" і інш.) таксама апрача некалькіх старых заставак змяшчае і шэраг новых, а менавіта згаданую сюжэтную серыю з медальёнамі апосталаў і св. Лукі. Калі гэтыя застаўкі, падобна да гравюр евангелістаў, рыхтаваліся непасрэдна перад друкаваннем адпаведнай часткі кнігі, то іх прыкладна можна датаваць канцом 1651 – пачаткам 1652 года.

Такім чынам, толькі ў выданнях манастырскай друкарні налічваецца 17 ксілаграфічных заставак. Калі да іх далучыць ужываныя ў Куцейне Собалем, але забраныя ім у Буйнічы, то лічба гравіраваных дошак заставак, якія выкарыстоўваліся напрацягу ўсяго часу куцеінскага кнігадрукавання, узрастае да двух – двух з паловай дзесяткаў дошак.

***Маргінальныя ўпрыгожванні*** для куцеінскіх друкаў не вельмі характэрны, што абумоўлена выпускам друкарняй мала- і сярэднефарматных выданняў пры амаль выключным выкарыстанні рамачнай арганізацыі старонкі, якая дазваляла ўжываць толькі невялікія аздобы і тое пры адсутнасці тэкставых маргіналій. Дастаткова цікавымі з'яўляюцца дзве адрозныя пары маргінальных упрыгожванняў у выглядзе рукі з крыжом (памерам прыкладна 20 × 8 мм і 30 × 8 мм); іх парнасць выклікана патрэбай ужывання як у правым, так і ў левым знешнім полі рамкі. Гэтыя аздобы дастаткова шырока прадстаўлены на старонках "Трыфалагіёна" (напрыклад, арк. 1, 15, 31, 58 адв. і інш.); магчыма, яны выкарыстоўваліся ў якасці аналагу дастаткова распаўсюджанай у кірылічных рукапісах і старадруках аздобы з выявай "указующего перста", якая азначала: "зри". Згаданая ж аздоба ў выглядзе рукі з "указующим перстом" у куцеінскіх выданнях сустракаецца вельмі рэдка. Яна выяўлена толькі ў "Дыёптры" 1651 года на арк. 5 адв. і 8 адв.; малы фармат выдання і, адпаведна, невялікая шырыня знешняга поля рамкі, абумовілі памер гравюры 5 × 7 мм.

***Ініцыялы***, як і застаўкі, паводле характару свайго фона можна падзяліць на сюжэтныя і расліннага арнаменту. З увагі на стылістыку аздаблення яны зазвычай утвараюць серыі, якія ў большай ці меншай меры ахопліваюць алфавіт; у сярэдзіне гэтых серый нярэдка можна вылучыць асобныя камплекты, якія адрозніваюцца паводле памеру.

Спірыдон Собаль, камплектуючы друкарскі матэрыял з розных крыніц, ужываў у сваіх выданнях як разрозненыя ініцыялы, так і серыйныя. Сярод апошніх, у прыватнасці, вылучаюцца выкананыя ў стылі віленскіх выданняў ініцыялы, якія характарызуюцца чорным фонам з белым раслінным арнаментам. Яны прысутнічаюць у некалькіх рознапамерных камплектах і з варыяцыямі паасобных літараў. У друках Собаля гэтыя ініцыялы ўпершыню, як здаецца, з'яўляюцца ў выданні ""Ліманара" з дробнымі ініцыяламі".

""Ліманар" з дробнымі ініцыяламі" горш забяспечаны ксілаграфічным матэрыялам у параўнанні да ""Ліманара" з буйнымі ініцыяламі". Так, у прыватнасці, яго ініцыял "К" напачатку прадмовы да чытача ўтвораны з вялікай літары пры дапамозе наборнага арнаменту, а замест ініцыяла "В" у тэксце некалькі разоў выкарыстана адпаведная ламбарда. Гэта ўсё, да слова, пацвярджае выказанае намі вышэй меркаванне, што ""Ліманар" з дробнымі ініцыяламі" з'яўляўся 1-м, а не 2-м выданнем кнігі, як тое лічыла А. Зёрнава; аднак мы зараз звяртаем увагу на гэтую акалічнасць дзеля таго, каб прасачыць паходжанне ініцыялаў віленскага стылю ў куцеінскіх выданнях.

Ініцыялы віленскага стылю ў згаданым "Ліманары" дэманструюць два дыяметральна розныя станы захаванасці: частка адбіткаў амаль неразборлівая і ўяўляе з сябе амаль суцэльную чорную пляму; іншыя ж праглядаюцца надзвычай выразна – усутыч да найтанчэйшай лініі арнаменту. Гэта сведчыць пра тое, што Собаль набыў пэўную колькасць ужываных (прычым амаль зужытых) ініцыялаў (верагодна, у Вільні або праз віленскіх кнігароў*), а адсутныя дапоўніў, па магчымасці, нававыразанымі ў адным з імі стылі. Для 2-га выдання "Ліманара" быў падрыхтаваны ўжо новы камплект ініцыялаў у віленскім стылі, але большага памеру (каля 14 мм вышынёй); у той час выраблялісі і іншыя аздобы – напрыклад, была выразана серыя вялікіх, вышынёй каля 35 мм, плеценых ініцыялаў для "Апостала" ("Г", "С", "М" і інш.), бо аздоблены ў гэтым жа стылі ініцыял "Б" быў выкарыстаны ў якасці загалоўнага напачатку асноўнага тэксту ""Ліманара" з буйнымі ініцыяламі" (арк. 1).

Частка ініцыялаў Спірыдона Собаля з розных камплектаў, а магчыма, і некамплектных, пасля ад'езду яго ў Буйнічы перайшла ва ўладанне друкарні Багаяўленскага манастыра. З гэтай прычыны ў манастырскіх выданнях можна нярэдка сустрэць аздобы віленскага стылю, якія мы атаясамліваем з Собалевымі: напрыклад, "П" памерам 20 × 14 мм, шэраг ініцыялаў памерам 14 × 11 мм – "А", "Ж", "В", "П" і інш. Больш таго, даследчыкі ўжо даўно заўважылі, што некаторыя з куцеінскіх ініцыялаў у віленскім стылі (напрыклад, ужытыя пры друку зборніка, вядомага пад загалоўкам "На "Ойча наш" выклад" [6, с. 105]) дэманструюць уплывы Скарынавых аздобаў. Сапраўды, даволі рэдка сустраканая форма "П" з вастраканечным выступам пасярэдзіне перакладзіны перш за ўсё выклікае згадку адпаведных ініцыялаў Скарыны (напрыклад, ужытага ў інцыпіце "Апостала" 1625 г.). Можна выказаць меркаванне, што яны паходзяць з камплекту, які Собаль вырабіў на падабенства набытага ім віленскага. Такім чынам, гэтыя ініцыялы, хай і ўскосна, але інфармуюць нас пра лёс Скарынавых аздоб, частка якіх, будучы ўжо амаль цалкам зношанай, трапіла да Собаля і была ўжыта ім для друку 1-га выдання "Ліманара".

Але ініцыялы, што засталіся ад С. Собаля, не ахоплівалі ўвесь алфавіт. Апрача таго, патрэба ў большай колькасці камплектаў ініцыялаў узрастае прапарцыйна змяншэнню фармату кнігі, паколькі прысутныя на суседніх старонках раздзелы могуць пачынацца з адной літары. Таму пры друку ў фарматах *in quarto* і *in octavo*, калі аркуш складаецца на 4 ці 8 частак, а такім чынам, адначасова друкуюцца чатыры ці восем старонак, нават двух камплектаў бывае недастаткова**. Гэтая акалічнасць, як і ўвогуле недахоп элементаў аздаблення, прымусіла куцеінцаў у хуткім часе ўзяцца за падрыхтоўку ўласнага ксілаграфічнага матэрыялу для аздаблення выданняў, галоўным чынам шляхам капіравання (нярэдка з выразным прыўнясеннем уласнай творчасці) аздоб з іншых выданняў.

Магчыма, у Куцейне для манастырскай друкарні было скапіравана некалькі разрозненых сюжэтных ініцыялаў. Прататыпы некаторых з іх сустракаюцца ў беларускіх і ўкраінскіх выданнях. У прыватнасці, гэта сюжэтны ініцыял "В" з выявай двух музыкаў ("Брашно духоўнае" 1639 г.: арк. 8 адв., 47; "Трыфалагіён": арк. 172, і інш.), які мог быць скапіраваны або са страцінскага "Службоўніка", або з віленскіх "Размоў" Макарыя Егіпецкага.

Не ўдалося выявіць прататып даволі цікавага ініцыяла "Б", гарызантальныя элементы якога ўтвораны парасткамі вінаграднай лазы. Ён сустракаецца толькі ў "Гісторыі пра Варлаама і Іасафа" (арк. 37 адв., і інш.) і, быць можа, з'яўляецца створаным у Куцейне арыгіналам, а не копіяй. У іншых куцеінскіх выданнях ні сам гэты ініцыял, ні выкананыя ў гэтым стылі іншыя аздобы не сустракаюцца.

Першы новы ініцыял – рамачны "С" з белым раслінным арнаментам на белым жа фоне – з'яўляецца ўжо ў "Дыдаскаліі", якая ўбачыла свет 17 студзеня 1637 года (ён выразаны на падабенства ініцыялаў, якія можна сустрэць у выданнях Кіева-Пячорскай Лаўры). А ў датаванай жніўнем 1637 года "Гісторыі пра Варлаама і Іасафа" поруч са згаданым "С" (арк. 29 адв.) мы знаходзім цэлы шэраг новых ксілаграфічных аздоб, выкананых у блізкім да яго стылі: "М" (арк. 22 адв.), "З" (арк. 46 адв.), "Ї" (арк. 69, 79 адв.). Гэта рамачныя ініцыялы памерам 28 – 30 × 21 – 22 мм з контурным (месцамі са штрыхоўкай) раслінным арнаментам на белым фоне. Характэрнымі рысамі гэтай серыі можна назваць патаўшчэнне літар на канцах і звужэнне іх бліжэй да цэнтра, сіметрычна размешчанае зубчастае лісце фона з сэрцападобным выгінам сцёблаў.

З несерыйных у гэтым выданні варта назваць рамачны ініцыял "К" з лістападобнымі ножкамі на гарызантальна заштрыхаваным фоне (арк. 7 адв., 18 і інш.), пра які мы ўжо згадвалі, гаворачы пра аздобленую ў тым жа стылі застаўку са сцэнай Багаяўлення.

---

* Ісаевіч Я. паведамляе, што, напрыклад, у 1630 – 1631 гадах у Львове "для спроданя кніг" знаходзіліся віленцы Рыгор і Янікі Ваўчковічы (гл.: Исаевич Я.Д. Преемники первопечатника, с. 93). Пра Кіеў падобных звестак не знойдзена, але мы даволі часта сустракаем там беларусаў – з найбольш вядомых гэта, напрыклад, спярша студэнт, а затым і рэктар брацкай школы Фама Яўлевіч, першы рэктар Кіева-Магілянскай Акадэміі (тады яшчэ калегіума) Ісая Трафімовіч-Казлоўскі, выкладчык калегіума і пазнейшы епіскап магілёўскі Сільвестар Косаў. Цяжка дапусціць, каб і віленскае брацтва (а менавіта ў брацкіх выданнях сустракаюцца ініцыялы Скарыны, адбітыя з арыгінальных дошак першадрукара), распаўсюджваючы сваю кніжную прадукцыю, магло абмінуць гэты найбуйнейшы праваслаўны горад Рэчы Паспалітай.

** Нават у 1639 годзе, калі куцеінскія друкары мелі ў сваім распараджэнні ўжо некалькі новых камплектаў, яны ўсё роўна яшчэ мусілі ў падобных выпадках выкарыстоўваць пры друку "Брашна духоўнага" ў якасці ініцыялаў ламбарды (гл., напрыклад, арк. 1-й нумарацыі: 1 адв., 2 адв. і інш.).

Праз паўтары ці два гады (дакладная дата нам невядомая – толькі год: 1639) выходзіць у свет “Брашно духоўнае”, якое характарызуецца значнай колькасцю ксілаграфічных аздоб, а перадусім ініцыялаў. Тут ужо выступаюць новыя серыі, якія нярэдка складаюцца з некалькіх камплектаў рознай велічыні. Ад гэтага часу ініцыялы ў куцеінскіх выданнях зазвычай прадстаўлены ў некалькіх памерах: 1) вялікія: 28 – 30 × 24 – 25 мм; 2) сярэднія: 19 – 21 × 14 – 16 мм; 3) малыя: 15 – 16 × 10 – 12 мм; 4) дробныя: 12 – 13 × 10 – 11 мм. Поруч з імі працягвае выкарыстоўвацца і (няпоўны?) камплект Собалевых ініцыялаў памерам 14 × 10 мм. Пра паўнату таго ці іншага камплекту немагчыма выказацца дакладна з прычыны беспарадачнасці ўжывання ініцыялаў рознай велічыні і стыля. Трэба думаць, яны былі рассартыраваныя толькі па алфавіту, і калі наборшчык меў патрэбу ў тым ці іншым ініцыяле, ён не падбіраў падобныя паводле памеру або арнаментальнага фона.

***Канцоўкі*** ў куцеінскіх выданнях выкарыстоўваюцца значна радзей ад заставак, хоць, быццам бы, павінны былі ўжывацца з імі ў пары. Гэтая акалічнасць тлумачыцца тым, што застаўкі з’яўляючыся абавязковым элементам аздаблення, прысутнічаюць напачатку кожнага буйнога (а часта, і драбнейшага) раздзела выдання; канцоўкі ж ужываюцца толькі ў тых выпадках, калі ад канца раздзела да края старонкі застаецца дастаткова месца для іх размяшчэння. Больш таго, заканчэнню раздзела лягчэй надаць эстэтычна прывабны выгляд і пры дапамозе іншых сродкаў – такіх, напрыклад, як фігурная форма набору або варыяцыі спалучэнняў розных элементаў літога арнаменту. Адпаведна, меншая запатрабаванасць у застаўках вымагае і меншай іх лічбы: так, у прыватнасці, у выданнях манастырскай друкарні сустракаецца ўсяго восем ксілаграфічных канцовак; некаторыя з іх, без сумневу, паходзяць з Собалевага матэрыялу.

Падобным чынам, як застаўкі, на некалькі груп можна падзяліць і канцоўкі: у прыватнасці, вылучым сярод іх узорчыстыя і сюжэтныя. Да першай групы аднясем такія, што маюць у сваёй аснове дэкаратыўны арнамент і не прэзентуюць акрэсленага сюжэта; да другой – тыя, што прадстаўляюць пэўны сюжэт, асобу, істоту (у нашым выпадку ў трох розных варыянтах выступае выява анёла). У куцеінскіх друках сустракаецца пяць узорчыстых канцовак і тры сюжэтыя.

*Узорчыстыя канцоўкі* маюць рознае паходжанне: чатыры з іх з’яўляюцца копіямі фёдараўскіх або ўкраінскіх, але адна належыць да арыгінальных Собалевых. Пачнём разгляд менавіта з яе.

Плеценая канцоўка з завостраным нізам, паводле нашай класіфікацыі “I а”, сустракаецца, у прыватнасці, у “Ліманары”. Наогул, друкар меў дзве аздобы гэтага рысунка ў адрозных паводле памеру варыянтах – большым (46 × 74 мм) і меншым (44 × 60 мм). Наша, большая, канцоўка пасля ад’езду Собаля засталася ў Куцейне і некалькі разоў выкарыстоўвалася ў розных выданнях манастырскай друкарні (“Брашне духоўным”, “Актоіху”, “Новым Запавеце” і інш.). Другі, меншы, варыянт Собаль забраў з сабой пры ад’ездзе ў Буйнічы і пазней выкарыстоўваў пры дадрукоўцы магілёўскага “выдання” “Апостала”. Гэтая канцоўка паводле рысунка нагадвае заходнееўрапейскія ксілаграфічныя аздобы (у прыватнасці нямецкія, як, напрыклад, прысутную ў выдадзенай у 1628 годзе ў Інгальштадзе кнізе А. Танэра “Universa Theologia”). Магчыма, яна была выразана ў Кіеве або самім Спірыдонам Собалем, або на яго замаўленне, але з выкарыстаннем замежных узораў для наследавання. Айчыннае паходжанне канцоўкі пацвярджае выпадковая асіметрыя паміж правым і левым бакамі аздобы, недапушчальная ў аздобах заходніх выданняў.

Дзве наступныя канцоўкі (“I б” і “I в”) з’яўляюцца амаль дакладнымі копіямі ксілаграфічных аздоб, што прысутнічаюць у выдадзеных Іванам Фёдаравым “Апостале” 1574 года і астрожскай “Бібліі” 1581 года, і якія пазней выкарыстоўваліся ў львоўскіх брацкіх выданнях (напрыклад, абедзве можна пабачыць у “Актоіху” 1630 г.). Варыяцыі на тэму гэтых канцовак можна знайсці і ў віленскіх друках (напрыклад, у мамоніцкай “Трыёдзі поснай” 1609 г.), але яны ў большай ступені адрозніваюцца паасобнымі дэталямі.

Канцоўка “I г” уяўляе сабой павялічаную копію аздобы з астрожскіх выданняў канца 1590-х гадоў, а апошняя, “I д”, скапіравана, хутчэй за ўсё, са страцінскіх выданняў Балабана, або, магчыма, з выданняў Кіева-Пячорскай Лаўры.

Як і ў выпадку з застаўкамі, досыць складана сцвердзіць, ці былі гэтыя копіі зроблены менавіта ў Куцейне або ў іншым месце, а таксама якое дакладна выданне паслужыла ўзорам, і хто выступаў у якасці аўтара або замоўцы.

*Сюжэтыя канцоўкі* прадстаўлены трыма варыянтамі выявы анёла (галоўка з крыламі). Найчасцей у куцеінскіх выданнях выступае найбольшая з іх – “II а” (35 × 63 мм); мы яе сустракаем ужо ў “Дыдаскаліі” 1637 г. (арк. 2 нн адв.). Паходжанне гэтай канцоўкі высвятліць не ўдалося. Ва ўсходнеславянскіх кірылічных выданнях яна (або яе прататып) не сустракаецца, а асіметрыя крылаў анёла ўказвае на мясцовае паходжанне аздобы. Цалкам верагодна, што гэтая канцоўка была выразана ў Куцейне.

Канцоўка “II б” з’яўляеца копіяй з больш часта сустраканай выявы, якую можна бачыць і ў львоўскіх (напрыклад, “Анфалагіён” 1638 г., арк. 585 адв.), і ў віленскіх (“Новы Запавет” 1623 г., арк. 450 адв.) выданнях. Паводле знешняга віду наш “маленькі анёл” больш блізкі да львоўскага варыянта, але храналагічна яго апярэджвае, што ўказвае на выкарыстанне ў якасці ўзору для нашай аздобы менавіта віленскай канцоўкі. “Маленькі анёл” прысутнічае ў большасці куцеінскіх выданняў, пачынаючы, як здаецца, з “Брашна духоўнага”.

Канцоўка “II в” (18 × 21 мм) таксама прадстаўляе маленькую галоўку анёла, але выразаную ў іншым стылі. Яна дэманструе невысокую якасць і, хутчэй за ўсё, з’яўляецца вучнёўскай працай, выкананай у

Куцейне; сустракаецца толькі ў адным выданні – “Брашне духоўным” 1637 года – і толькі аднойчы (с. 344). Магчыма, што і ад яе выкарыстання, як ад згаданай вышэй застаўкі і ініцыяла “К”, куцеінскія друкары вырашылі адмовіцца з прычыны нізкага ўзроўню выканання аздобы.

**Падсумаванне.** У куцеінскіх выданнях выяўлены ўсе асноўныя віды ксілаграфічнага аздаблення кнігі, якія выкарыстоўваліся ў разгляданы перыяд у айчынным кнігадрукаванні: рамкі тытульных аркушаў, гербавыя выявы, ілюстрацыйныя гравюры, застаўкі і загалоўкі, маргінальныя ўпрыгожванні, ініцыялы, канцоўкі. Сустраканыя ў даследаваных друках элементы ксілаграфічнага аздаблення вызначаюцца разнастайнасцю і разам з тым адсутнасцю адзінага стылю, што тлумачыцца іх паходжаннем з розных крыніц або капіраваннем з розных выданняў. Хоць большасць выкарыстаных куцеінскімі друкарамі аздобаў (улічваючы вялікую колькасць ініцыялаў) можна разглядаць як арыгінальныя, аднак пэўная іх частка выкарыстоўвалася ўжо раней у розных друкарнях. Выкарыстаныя раней аздобы маглі трапіць у Куцейну ў складзе матэрыялу, набытага або вырабленага Спірыдонам Собалем у Кіеве.

Да арыгінальных дрэварытаў, выкананых непасрэдна ў Куцейне, можна залічыць рамкі тытульных аркушаў шэрагу выданняў манастырскай друкарні (“Гісторыі пра Варлаама і Іасафа”, “Брашна духоўнага”, “Новага Запавету”, “Дыёптры”), ілюстрацыйныя гравюры (“Ян Златавусны” ў “Актоіху”, “Цар Давід” у “Брашне духоўным” і ў “Новым Запавеце”, некалькі цыклаў рэлігійных выяваў у “Трыфалагіёне”, партрэты евангелістаў у “Новым Запавеце”), серыю заставак з выявамі апосталаў у “Новым Запавеце” і некалькі серый ініцыялаў, якія сустракаюцца штораз у большай колькасці ў розных друках, пачынаючы з “Гісторыі пра Варлаама і Іасафа”.

Станаўленне ў Куцейне сваеасаблівай ксілаграфічнай школы, верагодна, можна звязваць з запрашэннем майстра з Кіева і датаваць пачатак яе дзейнасці 1636 годам. У падрыхтоўцы серый ілюстрацыйных дрэварытаў для выдаваных у Куцейне кніг кожны раз бралі ўдзел не менш за 3 – 4 гравёра. Узяўшы пад увагу 30-гадовае існаванне друкарні, а таксама вялікую колькасць драбнейшых арыгінальных элементаў аздаблення (такіх, як шматлікія цэльнарэзаныя загалоўкі ды ініцыялы), можна выказаць меркаванне, што на працягу куцеінскага перыяду функцыянавання варштату над падрыхтоўкай ксілаграфічнага матэрыялу магло працаваць да дзесяці рэзчыкаў рознай кваліфікацыі.

ЛІТАРАТУРА


1. Зёрнава, А.С. Белорусский печатник Спиридон Соболь // Книга: Исслед. и матер. –М.: Книга, 1965. – Сб. X. – С. 126 – 145.
2. Шматаў, В.Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI – XVIII стст. / В.Ф. Шматаў. – Мін: Навука і тэхніка, 1984. – 182, [2] с.: іл.
3. Шматаў, В.Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI – XVIII стст. / В.Ф. Шматаў. – Мінск: Тэхналогія, 2000. – 130, [2] с.: іл.
4. Малюшына, В.А. Арнаментыка беларускіх старадрукаў эпохі барока // Барока ў беларускай культуры і мастацтве; НАНБ, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; пад рэд. В.Ф. Шматава. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 269 – 281.
5. Малюшына, В.А. Мастацкія асаблівасці старадрукарскага стылю ў беларускіх выданнях кірылічнага друку XVI – XVIII стст. // Здабыткі: Дакум. помнікі на Беларусі; склад. Л.Г. Кірухіна, Т.І. Рошчына; НББ. – Мінск, 2001. – Вып. 4. – С. 49 – 74.
6. Старадрукаваныя кірылічныя выданні XVI – XVIII стст. / склад. Г.Я. Галенчанка // Кніга Беларусі (1517 – 1917): Зв. каталог; ДБЛ БССР; склад. Г.Я. Галенчанка, Т.В. Непарожная, Т.К. Радзевіч. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 9 – 192.
7. Симмонс, Дж.С.Г. О некоторых старопечатных кириллических книгах в Дублине // Книга. Исследования и материалы: сб. – М.: Книга, 1963. – Вып. VIII. – С. 250 – 251.
8. Исаевич, Я.Д. Преемники первопечатника / Я.Д. Исаевич. – М.: Книга, 1981. – 191 с.


*Паступіў 15.06.2012*

## XYLOGRAPH ORNAMENTATION OF BOOKS PRINTED IN KUCIEJNA

***J. LAURYK***

*The article is dedicated to xylograph ornamentation used by Spirydon Sobal as well as printers of the monastery typography in books published in Kuciejna in the middle of XVII c. The author analyzes different elements of book decoration, such as frames of title-pages, headpieces, initials, colophons, illustrations etc, produced with help of this technique. Making a comparison of these ornamental elements with the ones present in books of other home and foreign publishing houses of that time the author tries to trace origins of them or their prototypes. Special attention paid to the question of development of local xylographical art school and its place in native book culture.*

**УДК 2-9(476) (XVII)**

# КАНФЕСІЙНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ ГРАМАДСТВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў СВЯТЛЕ ШТОДЗЁННАСЦІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII СТАГОДДЗЯ

***М.А. ПЕТРАУСКАС***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы)***

*Разглядаюцца магчымасці вывучэння канфесійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага праз прызму штодзённасці жыхароў XVII века. Паказана, што канфесійнае разуменне шмат у чым залежыла ад адносін абываценляў Новага часу да грамадзянскага абавязку, рэлігійнага рытуалу, матэрыяльных каштоўнасцей. У цэнтры ўвагі аўтара знаходзяцца дакументы масавага справаводства першай паловы XVII века, у якіх раскрываецца сувязь паміж набожнасцю людзей і іх штодзённымі практыкамі і перажываннямі. У артыкуле сцвярджаецца, што некаторыя рэчы і прадметы маглі набываць ролю сімвалаў падначалення людзей вышэйшай уладзе і "агульнаму дабру". Такое падпарадкаванне пры дапамозе царкоўных і свецкіх механізмаў адбывалася нараўне з існаваннем прававой традыцыі рэлігійнай вольнасці. У характарыстыках канфесійнай штодзённасці разгледжан працэс фарміравання "грамадства падданых".*

**Уводзіны.** Нягледзячы на вялікую колькасць тэарэтычных прац і практычных эксперыментаў па гісторыі штодзённасці, яе мэты, прадмет і метадалогія кожным даследчыкам фарміруюцца па-свойму. Такая акалічнасць ускладняе вылучэнне парадыгмальнай рэвалюцыі ў вывучэнні канфесійнай гісторыі. У навуцы існуюць як мінімум два разуменні гісторыі штодзённасці: як прыёмы мікрагісторыі ці "гісторыі малых светаў", якія аб'ядноўваюць сферы цікаўнасці гісторыкаў і этнографаў, і як рэканструкцыя ментальных, псіхалагічных кантэкстаў мінулых падзей, якая ўяўляецца часткай макрагісторыі. У адпаведнасці з гэтым дзяленнем па-рознаму бачацца мэты вывучэння канфесійнай штодзённасці.

**Магчымасці метадалогіі гісторыі штодзённасці ў вывучэнні канфесійных працэсаў.** Гісторыя рэлігійных рухаў, канфесій, царкоўнай улады, культавых пабудоў і сакральных сімвалаў утрымлівае не транслiраваную афіцыйна штодзённасць існавання "маленькай асобы", яе побыт і прыватнае жыццё ў віхуры значных падзей. На думку беларускага гісторыка С. Ходзіна, з факталагічнага пункту гледжання вывучэнне быту ў беларускай навуцы не перапынялася ніколі, але дамінавалі ў гэтым этнаграфічныя даследаванні [1, с. 5]. У той жа час культура ўтрымлівае "іншую рэальнасць": ментальныя ўяўленні, стэрэатыпы, звычаі і каштоўнасці, у якіх успрымалася і перадавалася людзьмі сучаснае ім жыццё. Таму вывучэнне побыту ў этнаграфічным сэнсе не тоесна вывучэнню штодзённасці. У апошнім выпадку маецца на ўвазе не проста даследаванне жыцця па-за іерархічнымі рамкамі афіцыйна транслюемай гісторыі, але і захоўванне каштоўнаснага арыенціра разглядаемых з'яў. Па словах расійскага прафесара Н. Пушкаровай, прынцыповае адрозненне штодзённасці ад этнаграфічнага вывучэння быту – у разуменні значнасці гісторыі падзей, гэта значыць гісторыя штодзённасці не разглядае дробязі, а вывучае ў падрабязнасцях [2].

Калі арыентавацца на сам факт штодзённасці, то семантычная сфера яе як супрацьвага афіцыйнаму і іерархічнаму афармляецца значна раней навуковага накірунку даследаванняў [3]. Узнікненне апошняга ў галіне гістарычных ведаў звязваюць з крушэннем "вялікіх тлумачальных схем мінулага". Прыгаданаму крушэнню вельмі часта прыпісваюць характар рэвалюцыйнай з'явы ў даследаванні сацыяльных працэсаў, што само па сабе не з'яўляецца новым у развіцці гістарыяграфічнай традыцыі. На думку выдатнага французскага філосафа і гісторыка Мішэля дэ Серто, гістарыяграфія заўсёды аддзяляе ўласную сучаснасць ад мінулага, пасля чаго ў гэтым мінулым яна выбірае тое, што можна "зразумець" з масы таго, што трэба забыць [4].

Гаворачы пра неаднаразовасць і заканамернасць крызісаў наратыву ў еўрапейскай культурнай традыцыі, С. Ходзін адзначае, што "пасля глабальных канфліктаў XVI – XVII стагоддзяў патрыятычны пафас летапісання і гісторыка-мемуарнага апавядання змяніўся глабальным расчараваннем", таму мемуарыстыка XVIII стагоддзя хутчэй з'яўляецца матэрыялам для мікра- і псіхагісторыі [1, с. 4]. Вывучаць гісторыю "малых светаў", якая ўяўляецца па-за афіцыйна транслюемай іерархіяй каштоўнасцей, прасцей па крыніцах перыяду крызісу ідэалогій і светапогляду, калі вынікі сацыяльных катаклізмаў пэўным чынам ужо паўплывалі на жыццё грамадства і асобы.

Пры вывучэнні штодзённасці ў разнастайных інтэрпрэтацыях эмоцый, ментальнасці, побыту абывацеляў мінулых эпох раней ці пазней даследчык сутыкаецца з крызісам разумення паняцця "новае". Ці павінна рэканструяваная штодзённасць мінулай эпохі ўяўляць сабою новыя веды і новую інфармацыю для навукоўца? Ці не стане гэта "новае" доказам, што ў рэальнасці, напрыклад, у XVII стагоддзі "вада таксама была вадкай"? Пазбегнуць сэнсавага тоеслоўя ў пазнанні мінулага дазваляе ўключэнне мэтаў даследавання штодзённасці ў макракантэкст мінулага. Важным уяўляецца захаванне прынцыпу навуковай аб'ектыўнасці перад пагрозай неаргументаванай мадэрнізацыі гісторыі. Асаблівую ўвагу на гэтым зася-

роджвае С. Ходзін: "Перанясенне вопыту клінічнай псіхалогіі XIX – XX стагоддзяў на эпохі XV – XVI стагоддзяў нічым не адрозніваецца ад таго, як прадстаўнікі марксісцкай школы вызначалі класы ў антычным грамадстве" [5, с. 44].

Вывучэнне штодзённасці прадугледжвае пошук фундаментальных структур у гісторыі, якія задавалі і задаюць парадак чалавечых дзеянняў [6, с. 5 − 7]. Бясконцая фрагментацыя тэматычнай прасторы гісторыка-антрапалагічнага дыскурсу падштурхнула даследчыкаў гісторыі Еўропы Новага часу да вывучэння культуры смеха, вобраза свету жабракоў, традыцыі народнага ганьбавання і пакарання [7, с. 9]. У канфесійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага XVI − XVII стагоддзяў можна вылучыць мноства падобных тэм для вывучэння скрозь прызму штодзённасці: а) у ракурсе ментальнасці і ўяўленняў: роля клятвы перад судом і Богам, страх перад замагільным жыццём, значэнне граху і адкуплення, чарадзейства як уяўляемае ў рэальнасці дзеянне; б) у сферы матэрыяльнай культуры і звычаяў: апісанне "гісторыі" свечкі як сімвала рытуалу і канфесійнага абавязку, пазарытуальны дагляд алтара храма, рэлігійныя святы як арыенцір у шэраговых падзеях штодзённага жыцця, адносіны да "новага" і "старога" календароў і інш.

**Набожнасць і штодзённасць**. У XVII стагоддзі аўтарытэт дзяржавы і свецкага права ўмацоўваўся ў вялікай ступені праз царкоўныя інструменты дысцыплінацыі (сацыяльная дысцыплінацыя − працэс падпарадкавання дзяржавай інтарэсаў людзей і груп "агульнаму дабру" [8, с. 62]). Паступова "святочнае-канфесійнае" праз уключэнне ў юрыдычныя акты і прававы тэкст пачынала ўсведамляцца як "тыповае". Матэрыялы завяшчанняў абывацеляў XVII стагоддзя сведчаць пра гэтыя змены. Якія штодзённыя вобразы захоўваліся ў тэстаментах? З узнікненнем і ўдасканаленнем судовых устаноў ВКЛ, у кампетэнцыі якіх знаходзілася фіксаванне волі нябожчыка, завяшчанні становяцца больш уключанымі ў сістэму афіцыйнага справаводства, што патрабавала ўніфікацыі іх формы і зместу. На думку ўкраінскай даследчыцы Н. Білоус, тэстаменты жыхароў другой паловы XVI – першай паловы XVII стагоддзя можна назваць масавай канцылярскай прадукцыяй [9, с. 23]. У сувязі з гэтым страчваўся "аўтарскі" кампанент такіх дакументаў, без якога вывучэнне штодзённасці амаль немагчымае. Аднак "застылая" знешняя форма не магла заглушыць індывідуальнасць, хоць у большасці выпадкаў пачатковы і канцавы пратакол афармляўся ўраднікамі згодна з існуючымі нормамі [9, с. 24]. "Аўтарскі" кампанент захоўваўся не толькі ў надзённых маёмасных пытаннях, але і ў выражэнні абывацелем пажаданняў наконт традыцыі, месца і ўмоў пахавання.

Шматлікія тэстаменты жыхароў ВКЛ ранненавачаснай эпохі ўтрымліваюць такія шаблоны выражэння волі чалавека пра сваё пахаванне: "ciału swemu grzesznemu w ... (месца пахавання)" ці "ciało grzeszne ziemi ktore ma bydz pochowane (якім спосабам)" [10; 11, с. 28]. Падобнае ўзгадванне "грэшнасці" цела можна знайсці ў завяшчаннях жыхароў Полацка, Гродна, Вільні і многіх іншых мясцовасцей ВКЛ. Гэты выраз вылучаецца сваёй паўторнасцю ў дакументах. Нябожчык мог указаць спосаб, месца свайго пахавання, дадаць вялікую ўступную частку пра непазбежнасць смерці і Божай кары.

Матэрыяльны стан чалавека вызначаўся не толькі пералічэннем таго, што завяшчаецца, але і магчымасцю быць пахаваным пры фарным касцёле ці пры кляштары. Падобнага роду тэстаменты пакідалі людзі з даволі значным сацыяльным статусам: райцы, падкаморыі, лаўнікі. Магчыма, матэрыяльны стан вылучае завяшчанне Івана Бурака, перададзенае без пышных уступаў і яркіх эпітэтаў. Гэты небагаты гродзенскі абывацель у 1642 годзе распарадзіўся толькі пра "pogrzeb … na mogilkach", пасля чаго "maiętnosc swoią ubogą" завяшчаў нашчадкам [10, а. 180].

Нашмат больш насычанае ўяўленне пра пахаванне можна знайсці, напрыклад, гадам пазней у напісаным тэстаменце брэсцкай жыхаркі Ульяны Хамічовай: "Naprzód duszę moię gdy z tego mizernego ciała, za powołaniem Bozskim wynidzie, w ręce miłosierdzia pana Boga wszechmogącego oddaię, a ciało ku pogrzebowi, które pochowane bydż ma..." [12, с. 416]. Шчодрыя дараванні цэрквам, епіскапу і родным сведчылі пра добры маёмасны стан брэсцкай мяшчанкі.

У тэстаментах звычайным было прыгадванне, якую рэч нябожчык завяшчае на пахаванне ("na pogrzeb ciała"). Юльяна Хамічова перадавала вінакурны кацёл, на грошы ад продажу якога брэсцкая капітула павінна была правесці ўсе неабходныя цырымоніі. Такая рэч у XVII стагоддзі мела значны кошт і, верагодна, магла выкарыстоўвацца для атрымання папулярных харчовых прадуктаў. Аднак у тэстаменце гаворыцца толькі пра магчымасць продажу катла. Падобным чынам сваё пахаванне забяспечыла жонка гродзенскага лаўніка Ганна Талочка, ахвяруючы "на пахаванне" срэбны пояс [10, а. 276 аб.]. Пінскі шляхціц Грыгорый Фурса ў 1647 годзе менш спасылаецца на "грэшнасць" і завяшчае, каб цела "iako ziemia ziemi oddana być ma", наказваючы сваёй жонцы выканаць астатнюю сваю волю "nie ważąc wielkiego kosztu"[13, с. 364]. Пан даручае сваю душу ўсемагутнаму Богу ў міласэрныя Яго рукі. Ковенскі суддзя Ян Мінгайла, тэстамент якога займае некалькі вялікіх аркушаў, распарадзіўся перадаць на ўласнае пахаванне не толькі грошы, але персідскі дыван і срэбны кубак. Гэтых сродкаў магло хапіць на пабудову асобнай каплічкі [14].

«Паўтараемае» ў тэстаментах і іншых эга-дакументах дапамагае разуменню культуралагічнага кантэксту штодзённасці. У гэтых крыніцах часам утрымліваецца інфармацыя, якая датычыць вобраза жыцця

абываценляў у мінулым і іх разумення каштоўнасцей. Незвычайным прыкладам з'яўляецца духоўнае завяшчанне берасцейскага райцы Гурына Федаровіча і яго жонкі. У гэтым завяшчанні заўважаны дзве акалічнасці. Першая датычыць перадачы нябожчыкам на імя зяця і дачкі крамніцы з заўвагай "въ которой я не торгую" [12, с. 243]. Такое ўдакладненне можа сведчыць пра адмаўленне ад гандлёвай дзейнасці, што вызначала маёмасны стан нябожчыка, ці пра пэўныя адносіны набожнага хрысціяніна, райцы, да гандлю ўвогуле. Другая асаблівасць тэстаменту ў тым, што Гурын Федаровіч завяшчаў шматлікія асобнікі царкоўных і свецкіх кніг. На "шпіталь Рускі" райца ахвяраваў напрастольнае Евангелле, на сваё пахаванне – Астрожскі трэбнік, розным цэрквам і асобам было перададзена Евангелле Вучыцельнае, Псалтыр "друку Скоринина", Маргарыт (зборнік Слоў Іаана Златавуста), кніга "Пчала" (павучальныя расказы і афарызмы) і "вси польскіе книжки", некалькі малітоўнікаў, Апостал "друку Скоринина", Часоўнік і Трэбнік. Побач з гэтым пералічэннем размеркаванне сенажацей, грошай і іншай маёмасці выглядала другасным. Якую каштоўнасць бачыў нябожчык у кнігах: яны перадаваліся як духоўны скарб ці ў першую чаргу на ўвазе меўся іх кошт? Завяшчаючы другі Трэбнік, Гурын даручыў свайму зяцю вырашыць, "до якое церкви отдать". Пра грашовы эквівалент нічога не гаворыцца нават у вызначэнні платы за пахаванне, хоць у многіх тэстаментах таго часу было звычайным вызначаць продажны кошт завешчанай рэчы. Заканчваецца тэстамент подпісам "пісьма рускага": "Многогрѣшный Гурин Федоровичъ и я Соломея Гуриновая" [12, с. 243].

Для аплаты пахавання нябожчык мог вызначыць рэчы, якія меркавалася прадаць (вінакурны кацёл, частка зямлі), ці рэчы, якія самі ў сабе мелі сімвалічны змест (срэбны пояс, кніга). Гэта магло сведчыць пра існаванне пэўнай іерархіі рэчаў у сістэме каштоўнасцей абываценляў ранненавачаснай эпохі, умоўна незалежнай ад грашовага эквіваленту.

***Каляндарная традыцыя.*** Вялікую ролю ў штодзённым жыцці абываценляў ВКЛ адыгрывала існаванне двух календароў, іх выкарыстанне ў побыце і грамадскай практыцы. Уведзены ў часы кіравання Стэфана Баторыя, грыгарыянскі стыль усведамляўся многімі як складнік традыцыі заходняга хрысціянства. Найбольшы ўздым пратэстанцкага супраціву рэформе летазлічэння адбыўся падчас беспарадкаў у Рызе 1584 − 1589 гадах. Рэч Паспалітая прыняла новы каляндар адначасова з магутнымі каталіцкімі краінамі Еўропы.

Практыка ўказання на рэлігійныя святы ў справаводстве ВКЛ была распаўсюджанай. У складанні судовых пастаноў гэта залежыла ад таго, на які перыяд года прыпадалі рокі ці рочкі (сесіі суда). Патокавыя запісы пачыналіся са згадкі пра праваслаўнае, каталіцкае ці агульнае для абедзвюх традыцый свята. Сутнасць і разуменне падобнай практыкі змянілася з прыняццем грыгарыянскага календара. Напрыклад, калі да 1582 года свята Трох Каралёў і Хрышчэнне Госпада вернікі абедзвюх традыцый святкавалі ў адзін дзень, то пазней фармулёўка "о трехъ кроляхъ святъ римском прыпалых" ва ўступе да дакумента пэўным чынам парушала ўмовы *замацаванага законам раўнапраўя* рэлігій [15, с. 3]. Кастрычніцкія рочкі спалучаліся з некалі агульным для католікаў і праваслаўных днём св. Міхаіла, майскія – "о Светой Троицы, святъ Римскомъ, припалых" і да т.п. [15, с. 48]. З 1582 года згадка пра "рымскае свята" падкрэслівала новую каляндарную традыцыю, што магло закранаць пачуцці вернікаў грэцкай царквы. Яшчэ напярэдадні Брэсцкай уніі праваслаўны віленскі святар айцец Дзямянцян Добрынскі скардзіўся на тых, хто "за распространеньем слуху въ народе христіянскомъ о отщепенствѣ митрополита и владыкъ закону греческого подъ благословенство папежа Римского и подъ календарь, отъ него новозмышленный поддалися" [16, с. 20].

Паводле класіфікацыі вядучага прадстаўніка гістарычнай сацыялогіі Норберта Эліяса, "святочнае" не з'яўляецца часткай штодзённасці, аднак справаводцы ранненавачаснай эпохі, прыгадваючы рэлігійнае свята ва ўступе (invocatio), гэтым не падкрэслівалі выключныя абставіны падзей. Аналіз судовых запісаў розных перыядаў упэўнівае, што згадванне свята не залежыла ад таго, справы якіх фігурантаў – духоўных ці свецкіх – разглядаліся. Магчымасць сустрэць справы на роках "iako wyszey", гэта значыць з пропускам стандартных выразаў, характарызуюць спасылку на свята ў invocatio выключна як справаводчую форму, не залежную ад псіхалагічных, ментальных і іншых кантэкстаў [11, с. 81].

Іншы выпадак сувязі з рэлігійнымі святамі датычыць удакладнення часу разглядаемых падзей, дзе акрамя "рымскай" прыгадвалася "руская" традыцыя. Калі полацкія шаўцы ў 1640 годзе падалі скаргу на крамнікаў за тое, што тыя гандлююць абуткам, парушаючы правы цэха, суд у сваім рашэнні вызначыў дзве даты: "ку Тѣлу Божому, святу хвалебному католицкому Римскому" і "до Радуницы Руское" [17, с. 311]. У поліканфесійных рэаліях ВКЛ такое ўдакладненне выглядае зразумелым.

На сумежжы заходняга і ўсходняга хрысціянства згадка каляндарнай традыцыі магла сведчыць пра пэўныя канфесійныя сімпатыі асобы ці групы. Многія дакументы першай паловы XVII стагоддзя ўзгадваюць "рускую традыцыю", калі фігурантамі справы ці ўдзельнікамі падзеі выступалі вернікі грэцкай традыцыі. У пратэсце віленскага Свята-Духава брацтва супраць мітрапаліта Іпація Пацея адзначаўся час "въ року теперь идучомъ тысеча шесть сотъ первымъ, Іюля двадцатого дня, водлугъ старого календаря, на день свята светого пророка Ильи…" [16, с. 41]. Нягледзячы на прыняцце грыгарыянскага стылю ў афіцыйны дыскурс дзяржавы, "рускія" святы не зніклі з дакументальнага тэксту першай паловы XVII ста-

годдзя. У 1649 годзе ў пастанове гродзенскага земскага суда згадваўся тэрмін “въ день светое Тройцы, в день светого Петра и Павла апостоловъ и въ день Нароженя наисветшое Панны, водлугъ старого календара” [11, с. 82].

**Сімвалы дысцыплінацыі.** У вывучэнні канфесійнай трансфармацыі цікавымі з’яўляюцца прадметы, якія набывалі асаблівы сэнс у працэсах сацыяльнай дысцыплінацыі. Побытавай рэччу была свечка, якая выкарыстоўвалася штодзённа ранненавачаснымі абывацелямі. Воск, з якога рабіліся свечкі, быў досыць каштоўным матэрыялам. За распаўсюджванне цэхавых таямніц статут віленскага цэха збройнікаў прадугледжаў кару ў 1 камень воска. Праз 60 год у цэху бляхароў за няякасную працу рамеснік караўся чвэрцю “kamienia wosku na ołtarz” [18, с. 21, 35 ]. Для гарбароў, шаўцоў, кушняроў воск не быў галоўным матэрыялам вытворчасці, аднак з’яўляўся вельмі запатрабаваным у штодзённым жыцці цэха. Воск мог быць адначасова мерай кары, заахвочвання і абавязку (перад царквой, дзяржавай, грамадствам).

У іншым разуменні свечка – неабходны атрыбут рэлігійнага культу. Падчас яна сведчыла пра пэўную падпарадкаванасць чалавека ці групы агульнапрынятым нормам паводзін. Свечка звязвала чалавечую супольнасць з сацыяльнымі абавязкамі, з’яўлялася сімвалічным падцвярджэннем іх выканання. У гэтым сэнсе васкавая свечка – адзін з атрыбутаў працэсу дысцыплінацыі ранненавачаснага грамадства.

У канцы 30-х гадоў XVII стагоддзя разгарнулася вострая барацьба за юрысдыкцыю паміж брэсцкімі ўніятамі і луцкім праваслаўным епіскапам Пузынай. Як сведчаць дакументы, многія мяшчане пераходзілі ў прыход царквы св. Сімяона пад паслушэнства неўніяцкага пастыра. У адказ уніяцкія святары на чале з пратапопам Рагазніцкім склалі цэлы шэраг скаргаў на рамесныя цэхі. Парадак падпарадкавання дыяцэзіям быў не такім важкім аргументам у справе з мяшчанамі, таму ўніяты настойвалі на абавязках, якія ўскладваліся на рамесныя цэхі прывілеямі караля, − несці павіннасці на карысць кафедральнай царквы св. Мікалая, як “спрадвеку прадзеды і бацькі іх рабілі”. Напрыклад, ад кушняроў патрабавалася ўдзельнічаць у працэсіях у Вялікую пятніцу і на Вялікдзень з брацкімі свечкамі і даваць свечы для аднаго з ліхтароў у храме [12, с. 323]. У адказ рамеснікі спасылаліся на рэлігійныя свабоды, гарантаваныя каралеўскімі прывілеямі, у тым ліку падчас элекцыі Уладзіслава IV, і адмаўляліся выконваць павіннасці на карысць уніяцкага храма. Пры гэтым брацтва кушняроў абавязвалася даваць па дзве свечкі і “po półkamieniu” воска царкве св. Мікалая. Сваё рашэнне рамеснікі тлумачылі тым, што сярод іх былі і браты-ўніяты. Такім чынам падкрэслівалася прыхільнасць брацтваў традыцыі канфесійнай талерантнасці [12, с. 339]. Брэсцкія рамеснікі не прынялі ролю дысцыплінуючага сімвала, якую свечцы надаваў уніяцкі клір. Абавязак жа выконваць павіннасці на карысць “свайго” прыхода акцэнтавана ўспрымаўся як рэлігійнае дзеянне. У далейшым пад ціскамі ўніятаў і каталіцкай супольнасці кароль у сваім прывілеі брэсцкім кушнярам удакладніў, што вернікі грэцкай рэлігіі нясуць павіннасці на карысць царквы св. Мікалая, “a nie gdze indzeiy” [12, с. 356].

Ранненавачасная дзяржава падпарадкоўвала грамадства праз абавязак, які адначасова з’яўляўся часткай царкоўнай абраднасці. У прывілеях і статутах рамесным цэхам ВКЛ абавязак ставіць свечку ў вызначаны па волі караля каталіцкі і грэка-ўніяцкі храм выступае як свецкая форма дысцыплінацыі. Падобнае месца ў сістэме каштоўнасцей абывацеляў Новага часу займалі алтары буйных гарадскіх і вясковых храмаў. Падпарадкаванне грамадства праз дзяржаўныя і царкоўныя інструменты адбывалася побач з існаваннем традыцыі рэлігійных свабод, замацаванай у галоўным заканадаўчым акце краіны − Статуце ВКЛ 1588 года, і як сведчаць крыніцы, усведамляемай на ўзроўні штодзённага суіснавання людзей.

**Заключэнне.** Гісторыя штодзённасці з’яўляецца неад’емнай часткай даследавання канфесійных працэсаў у грамадстве ВКЛ Новага часу. Спецыфіка крыніц, іх захаванасць, інфармацыйная разнастайнасць абумовілі дамінаванне культуралагічнага падыходу ў вывучэнні штодзённасці першай паловы XVII стагоддзя. Канфесійная свядомасць у многім вызначала адносіны абывацеляў да грамадскага абавязку і царкоўных рытуалаў. Спалучэнне набожнасці чалавека з яго надзённымі практыкамі і перажываннямі зафіксавана ў тэкстах завяшчанняў, судовых пастановах, правілах калектыўнага суіснавання. Трансфармацыя рэлігійнага светапогляду і канфесійнай свядомасці абывацеляў першай паловы XVII стагоддзя адбывалася пад уплывам працэсаў падпарадкавання індывідуума і грамадства “агульнаму дабру” і вярхоўнай уладзе. У сувязі з гэтым некаторыя прадметы і рэчы набывалі значэнне сімвалаў дысцыплінацыі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Ходзін, С. Гістарычная навука ў XXI ст.: праблемы для асэнсавання / С. Ходзін // Працы гістарычнага факультэта: навук. зб.; рэдкал.: У. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2006. – Вып. 1. – С. 3 – 8.
2. Пушкарева, Н. Предмет и методы изучения истории повседневности / Н. Пушкарева // Материалы Тамбовского центра гендерных исследований [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http //www.tambovdem.ru/thesises.php?id=gender1.pushkareva. − Дата доступа: 22.09.2011.

3. Дубин, Б. Быт, бытовщина, обыденность: идея и история повседневности в России / Б. Дубин // Демоскоп. Электронная версия бюл. «Население и общество» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://demoscope.ru/weekly/knigi/konfer/konfer_020.html. − Дата доступа: 27.02.2012.
4. Дэ Серто, М. Разновидности письма, разновидности истории / М. Де Серто; пер. Б. Дубина [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.ruthenia.ru/logos/number/2001_4/02.htm#_ftn6. – Дата доступа: 20.09.2011.
5. Ходзін, С. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў XXI ст.: парадоксы развіцця / С. Ходзін // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: материалы междунар. науч. конф., посв. 70-летию ист. фак. БГУ, Минск, 15 − 16 апр. 2004 г.; редкол.: В. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2004. – С. 42 – 44.
6. Вамбольдт, Н. Повседневность в истории / Н. Вамбольдт, М. Шубина // Электронный научный журнал «Вестник Омского государственного педагогического университета». – Выпуск 2006 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.omsk.edu. − Дата доступа: 01.04.2011.
7. Ким, С. Историческая наука Германии на перекрестках «новой гуманитарности» / С. Ким // Вестн. Томского государственного университета. – 2003. − № 276. – С. 5 – 12.
8. Schilling, H. Konfessjonalizacja. Kościoł i państwo w Europie doby przednowoczesnej. – Poznań: Wyd-wo Poznańskie, 2010. – 640 s.
9. Білоус, Н. Тестаменти киян середини XVI – першоі половіні XVII століття / Н. Білоус. – Київ: Видавничий Дім «Простір», 2011 – 200 с.
10. Гродзенскі магістрат. Актавая кніга пратаколаў гарадскога самакіравання. 1638 – 1810 гг. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 1761. – Воп. 1. – Спр. 1.
11. Акты Виленской археографической комиссии (АВАК). Т. I. Акты Гродненского земского суда. – Вильна: Тип. А.К. Киркора, 1865. – 377 с.
12. АВАК. Т. VI. Акты Брестского гродского суда. Акты Брестского подкоморского суда. Акты Брестской магдебургии. Акты Кобринской магдебургии. Акты Каменецкой магдебургии. – Вильно: Тип. Губернского правления, 1872. – 593 с.
13. АВАК. Т. XXXIII. Акты, относящиеся к истории Западно-русской церкви. – Вильно: «Русский почин», 1908. – 568 с.
14. Lietuvos mokslu akademijos biblioteka (LMAB). F. 20. − ТА-637. Завещание Я. Мингайлы. 1655. – А. 1.
15. АВАК. Т. II. Акты Брестского земского суда. – Вильно: Тип. Губернского правления, 1867. – 361 с.
16. АВАК. Т. VIII. Акты Виленского гродского суда. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1875. – 652 с.
17. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-западной Руси. Т. I. – Вильно: Тип. Губернского правления, 1867. – 410 с.
18. АВАК. Т. X. Акты Виленского магистрата и магдебургии. – Вильно: Тип. А. Сыркина, 1879. – 592 с.


*Паступіў 04.06.2012*

## CONFESSIONAL TRANSFORMATION OF THE SOCIETY IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE LIGHT OF DAILY LIFE IN THE FIRST HALF OF THE 17th CENTURY

***M. PIATRAUSKAS***

*The author viewed the possibilities of the study of the GDL confessional history through the prism of the 17th century daily life. It is showed that confessional feelings were largely dependent from the New Age people's attitude towards the civic duty, religious rituals, material values. In the spotlight of the author there are the documents of the mass record-keeping of the first part of the 17th century, where the connection between the piety of the people and their daily routine and experiences are disclosed. The author claimed that some things and objects could gain the role of the submission of people to the supreme authority. Also in the confessional daily life characteristics the researcher viewed the process of "servants' society" formation.*

УДК 2-9(476)(XVI – XVII)

# КАНФЕСІЙНАЯ ПАЛІТЫКА ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У АПОШНЯЙ ТРЭЦІ XVII СТАГОДДЗЯ (1667 – 1701 ГАДЫ)

*А.Ю. БАРТАШЭВІЧ*
*(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы)*

*Аўтарам ацэньваюцца вынікі вайны 1654 – 1667 гадоў і іх уплыў на дзяржаўную палітыку Рэчы Паспалітай у адносінах асноўных хрысціянскіх канфесій: праваслаўе, каталіцтва, уніяцтва, пратэстантызма, палажэнне іўдзеяў. Робіцца вынік, што каталіцкая вера і прыхільнасць да каталіцтва становіцца палітычным прыярытэтам, у той час як праваслаўе, абмежаванае ў правах, паступова страчвае свой уплыў. Разглядаецца шырокае распаўсюджванне ўніяцтва, якое ў нейкай ступені сумела захаваць культурныя традыцыі ўсходняй царквы. У 1660 – 1680 гадах пратэстантызм губляе свой моцны палітычны і культурны патэнцыял. У гэты перыяд у беларускіх гарадах расце колькасць нехрысціянскага насельніцтва – іўдзеяў, якія ўсё часцей сутыкаюцца з праяўленнямі нецалерантнасці ў поліканфесійным мяшчанскім грамадстве.*

**Уводзіны.** Канфесійная палітыка вышэйшых колаў Рэчы Паспалітай, як і мясцовай адміністрацыі ў другой палове XVII стагоддзя звычайна не разглядалася ў сувязі з наступствамі вайны 1654 – 1667 гадоў. У айчынай гістарыяграфіі (збольшага) пануе перакананне, што праявы неталерантнасці, спрыянне каталіцызму, «апалячванне» сацыяльных і палітычных эліт Вялікага княства Літоўскага значна пашырыліся ў 70 – 90-я гады XVII стагоддзя і былі толькі лагічным вынікам і працягам палітыкі першай паловы гэтага стагоддзя. Аднак падрабязны разгляд крыніц дазваляе пераканацца, што трынаццацігадовы ваенны канфлікт прынёс не толькі дэмаграфічныя і эканамічныя страты, але і значна паўплываў на накірункі і прыярытэты дзяржаўнай палітыкі ў канфесійным пытанні на беларускіх землях, стварыў новыя ўмовы для рэалізацыі гэтай палітыкі.

Такім чынам, мэтай навуковага даследавання з'яўляецца аналіз накірункаў канфесійнай палітыкі на беларускіх землях і іх значэнне ў канфесійнай трансфармацыі беларускага грамадства ў 70 – 90-я гады XVII стагоддзя. Задачы даследавання: 1) ацэнка наступстваў вайны 1654 – 1667 гадоў на фарміраванне накірункаў канфесійнай палітыкі дзяржавы на беларускіх землях; 2) ахарактарызаваць намаганні дзяржаўных колаў Рэчы Паспалітай па распаўсюджванню ўніяцкай і каталіцкай канфесій на беларускіх землях; 3) паказаць, як паступова выцяснялася з грамадскага і культурнага ўжытку праваслаўная канфесія; 4) вывучэнне прычын заняпаду «літоўскага» пратэстантызму ў 70 – 90-я гады XVII стагоддзя, вырашэнне дзяржавай «дысідэнцкага» пытання; 5) даследаваць становішча нехрысціянскага насельніцтва ў поліканфесійным хрысціянскім асяроддзі Беларусі; 6) прааналізаваць непаслядоўную пазіцыю дзяржаўнай улады па захаванні традыцыі талерантнасці і прадухілення грамадскіх канфліктаў на канфесійнай глебе ў гэты перыяд.

**Вайна 1654 – 1667 гадоў і фарміраванне новай мадэлі канфесійнай палітыкі ў дзяржаве.** Чарговым этапам барацьбы паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай за палітычную гегемонію ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне стала вайна (1654 – 1667), якая праходзіла пераважна на беларускіх землях, што з'яўляліся «яблыкам раздору» ў гэтай вайне. Канфлікт праходзіў з пераменным поспехам для абодвух бакоў, аднак меў драматычныя наступствы для культуры, дэмаграфіі, гаспадаркі менавіта зямель ВКЛ. Беларускія гарады, што паперамена займаліся то маскоўскім войскам, то адваёўваліся літвінска-польскімі сіламі зведалі ўвесь цяжар ваеннага часу: рабаўніцтва, пастоі, пажары, знішчэнне і вывад у палон жыхароў.

Падзеі «крывавага патопу» надзвычай абвастрылі і без таго складаную рэлігійную сітуацыю ў грамадстве ВКЛ [1, с. 356]. Маскоўская ваенная кампанія, якая пачыналася пад лозунгам абароны праваслаўя на «спрадвечна рускіх» землях першапачаткова прывяла да калабарацыі часткі насельніцтва ўсходняй Беларусі – значная колькасць мяшчан і некаторая частка праваслаўнай шляхты прысягнула на вернасць маскоўскаму цару. Гэта не магло застацца незаўважным для цэнтральнай улады Рэчы Паспалітай, вышэйшага кола дзяржаўных дзеячоў. Асабліва цярпелі ад непрыяцельскіх войскаў уніяты і каталікі. Казакі і царскае войска мелі на мэце поўнае знішчэнне уніі – уніяцкія святары пераследаваліся, частка ўніятаў была перахрышчана ў праваслаўе [2, с. 19]. Касцёлы і будынкі каталіцкіх кляштараў перадаваліся праваслаўным, як і іншая рухомая і нерухомая маёмасць. Пратэстанты, што мелі складаныя адносіны з урадам Рэчы Паспалітай да вайны, адкрыта падтрымалі Швецыю – ворага Польшчы. Прашведская накіраванасць пратэстанцкай «партыі» ў ВКЛ яскрава ўвасобілася ў акце Кейданскай уніі (1655 г.), якая абвяшчала рэальны палітычны саюз ВКЛ і Шведскага каралеўства.

У драматычнай сітуацыі апынуліся яўрэі. Як нехрысціяне, яны заўсёды трымаліся асобна ў шматканфесійным хрысціянскім грамадстве ВКЛ, хоць іх правы і маёмасць ахоўваліся шматлікімі прывілеямі як мясцовага, так і дзяржаўнага характару. Дэфакта, і ў мірны час мелі месца праявы гвалту і канфлікты паміж яўрэямі і хрысціянамі ў беларускіх гарадах, вайна ж пакінула яўрэяў, фактычна, па-за законам. Расійскае войска і ўкраінскае казацтва рабавала і нішчыла безабароннае яўрэйскае насельніцтва, прымушала яўрэяў пакідаць месцы сталага жыхарства. Разам з тым ёсць факты непасрэднага ўдзелу яўрэяў у абароне беларускіх гарадоў, як гэта здарылася ў Віцебску [3, с. 173].

Падобная сітуацыя падчас вайны, фактычна, раскалола грамадства на прыхільнікаў і праціўнікаў каралеўскай улады Рэчы Паспалітай, дзяржаўнага ладу, прычым раскол праходзіў па канфесійнай прыкмеце. Не дзіўна, што пасля вайны ўзрасла дзяржаўна-палітычная важнасць канфесійнай праблемы [1, с. 356]. Пасля вайны рэзка ўзрасла канфесійная нецярпімасць. Калі ў першай палове XVII стагоддзя на соймах часта ўздымалася праблема захавання за праваслаўнай царквой яе правоў, то пасля вайны супраць «схізматыкаў» усё часцей з’яўляюцца дыскрымінацыйныя артыкулы ў прынятых соймавых канстытуцыях. Між тым з-за вайны праваслаўная царква фактычна пацярпела найбольш. Дэмаграфічныя страты, што панёс беларускі горад, эканамічны заняпад і запусценне таксама былі прычынай таму. Такія асяродкі праваслаўя, як Полацк, Віцебск, Магілёў, Вільня і іншыя, стаялі дашчэнту разбураныя і разрабаваныя. Разам са знішчэннем і ўводам у палон праваслаўных мяшчан занепадалі і брацтвы – арганізацыі праваслаўных на Беларусі, якія займаліся эканамічнымі, адміністрацыйнымі, культурнымі пытаннямі дзейнасці царквы. Праваслаўная шляхта, колькасць якой пасля вайны значна скарацілася, хутка прымала рымскі абрад, а праваслаўная царква ўсё болей губляла моцных апекуноў і абаронцаў на публічнай і палітычнай арэне. Складаным быў і матэрыяльны стан праваслаўнай царквы. З-за безупынных войн значная частка праваслаўных сакральных аб’ектаў была знішчана ці закінута. Святары, з-за недахопу святынь часта пакідалі свае парафіі, перастала функцыянаваць каля трэці ўсіх парафій на «рускіх» абшарах Рэчы Паспалітай [4, с. 216].

**Паступовы заняпад праваслаўя. Распаўсюджванне і поспех уніяцкай канфесіі.** Нягледзячы на трохкротную колькасную перавагу праваслаўных парафій над уніяцкімі, іх становішча ў многіх рэгіёнах Рэчы Паспалітай было вельмі складаным [4, с. 216]. На абшарах, дзе дамінавалі ўніяты, меў месца працэс пераймання (заняцця) праваслаўных святынь. Тым не менш нельга сцвярджаць, што становішча праваслаўнай канфесіі на Беларусі ў апошняй трэці XVII стагоддзя было катастрафічным, а традыцыі талерантнасці і верацярпімасці ў ВКЛ заняпалі. Шэраг дакументаў гэтага часу сведчыць, што дзяржава працягвала адыгрываць ролю «арбітра» ў рэгуляванні складаных міжканфесійных і міжэтнічных адносін у грамадстве ВКЛ. Яшчэ падчас вайны і пасля яе, калі працягвала захоўвацца напружанасць каля межаў дзяржавы, выдаюцца прывілеі і ўніверсалы па ахове маёмасці і будынкаў праваслаўнай царквы і святароў ад ваенных пастояў, рабаўніцтваў, пабораў (Універсал Яна Казіміра, 1668 г.) [5, с. 64]. Віленскі ваявода Міхал Казімір Пац выдае Універсал аб вызваленні ад вайсковых павіннасцей і пастояў праваслаўнага духавенства (1673 г.) [5, с. 78]. Новы кароль Ян III пацвярджае прывілеі праваслаўных і ўніяцкіх святароў (Брэсцкай і Уладзімірскай епархіі) ад вайсковых павіннасцей і свецкіх судоў [5, с. 81].

Спрабуючы вырашыць набалелыя пытанні ўзаемаадносін праваслаўных і ўніяцкіх цэркваў, кароль запрасіў абодва бакі на з’езд у Любліне (1679 г.). У спецыяльным Універсале Яна III адзначалася, «што ў народзе існуе нязгода, якая адзінства абывацеляў дзяржавы разрывае» [5, с. 84]. Аднак падобную ініцыятыву караля частка гісторыкаў схільна разглядаць як чарговую спробу па «навяртанню схізматыкаў» у дзяржаве [6, с. 29]. Каралеўская ўлада спрабавала выступаць вярхоўным суддзёй і пры вырашэнні эканамічных пытанняў, падзеле «сфер уплыву» паміж рознымі канфесіямі. Напрыклад, у 1682 годзе кароль спецыяльным лістом папярэджвае брэсцкіх езуітаў, якія забралі частку земляў праваслаўнага манастыра, аб недапушчальнасці гвалту і неабходнасці законнага і справядлівага вырашэння такіх справаў [5, с. 104]. Тым не менш маюцца дакументы, якія дакладна праясняюць пазіцыю каралеўскай улады, шляхецкіх саноўнікаў па падобных пытаннях. У 1676 годзе на сейме быў прыняты закон, накіраваны, па сутнасці, супраць праваслаўных брацтваў, паколькі забараняў паездкі духоўных і свецкіх асоб за мяжу (без асабістага дазволу караля), абмяжоўваў кантакты праваслаўных іерархаў з канстанцінопальскім патрыярхам, перадаваў справы і маёмасць брацтваў мясцовай уладзе [4, с. 212].

У Кобрыне мясцовыя ўніяты масава пачалі пераходзіць у праваслаўе, наведваць праваслаўны манастыр, заклалі на новым месцы праваслаўныя могілкі, прычым такія дзеянні мяшчан знайшлі падтрымку ў кобрынскіх бурмістраў і ўраднікаў [5, с. 112]. У лісце караля Яна III віленскаму кашталяну і адміністратару Кобрынскай эканоміі Язэпу Служке (1689 г.) праваслаўныя названы «схізматыкамі», а іх дзеянні «паганскімі». Кароль патрабаваў ад урадніка рашучых дзеянняў і недапушчэння падобных інцыдэнтаў [5, с. 112].

Увогуле, калі ўзнікала спрэчная сітуацыя паміж уніятамі і праваслаўнымі, судовыя інстанцыі, кароль часцей вырашалі справу на карысць уніяцкай царквы, хоць гэта і абстаўлялася складанай юрыдычнай працэдурай і ў духу вырашэння справы «па справядлівасці». Напрыклад, у спрэчцы аб прыналежнасці Заблудаўскай царквы ўніятам ці праваслаўным, уніяцкім бокам былі прадстаўленыя сумнеўныя аргументы ў сваю карысць, тым не менш справу яны выйгралі [7, с. 89].

Праваслаўная царква Рэчы Паспалітай у 70 – 80-я гады XVII стагоддзя ўсё болей трапляе пад кантроль Масквы, усходняя дзяржава бярэ на сябе ролю «заступніка» праваслаўных Рэчы Паспалітай. Апагеем падобнай сітуацыі сталі падзеі 1685 – 1686 гадоў, калі збеглы ў Маскву луцкі біскуп Гедэон Святаполк Чацьвярцінскі быў асвячоны маскоўскім патрыярхам на Кіеўскую мітраполію пасля прысягі на вернасць цару. Падпарадкаванне Кіеўскай мітраполіі Маскоўскаму патрыярхату толькі пагоршыла прававое становішча «грэцкай веры» ў Рэчы Паспалітай, паколькі праваслаўе ўсё болей пачынае разглядацца дзяржаўнымі саноўнікамі і шляхтай як «сфера ўплыву» суседняй, традыцыйна варожай дзяржавы.

Сярод тагачасных дакументаў нярэдка сустракаюцца фундушовыя запісы шляхты, прадстаўнікоў палітычнай эліты на праваслаўныя і ўніяцкія храмы. Некаторыя фундушы, прывілеі цэрквам асобна маглі пацвярджацца каралём. Фундуш на Дакудаўскую праваслаўную царкву аформіў князь Карл Радзівіл – тагачасны падканцлер ВКЛ (1696 г.) [8, с. 86]. Фундушовы запіс на праваслаўную царкву ў Радванічах быў зроблены віленскім кашталянам, польным гетманам ВКЛ – Восіпам Балтазарам Служкай [5, с. 118]. Каралеўская камісія прызначыла фундуш Прылуцкай царкве (1698 г.), паколькі і сам прыход, і святар былі ў вялікай галечы [5, с. 119]. Аднак у інструкцыі шляхты брэсцкага ваяводства на сейм у Варшаву (1676 г.) ёсць патрабаванне «дызуніцкую царкву ў Лепешах неаднаўляць, забраць фундуш яе, бо ад яе шкода і людзям простым, і шляхце» [9, с. 182].

Такім чынам, у тых абставінах – пры прававым ціску на «дызунітаў» з боку дзяржавы і мясцовых уладальнікаў і падтрымцы уніі – склаліся спрыяльныя ўмовы для хуткага і паспяховага распаўсюджвання ўніяцтва. За апошнія дзесяцігоддзі XVII стагоддзя ўнія дасягнула большых поспехаў, чым за ўвесь ранейшы час пасля 1596 года [1, с. 356]. Уніяцкая царква карысталася некаторай падтрымкай сярод магнатэрыі і каталіцкай шляхты. Таксама ўніяты мелі магчымасць заявіць аб сабе на палітычным форуме [4, с. 217]. Шляхта-каталікі, уладальнікі маёнткаў, з’яўляючыся патронамі царквы ў сваіх добрах, ужывалі ціск на праваслаўнае духавенства, прымушаючы іх да змены веравызнання. Існуе таксама думка, што ўплывы польска-лацінскай культуры на «рускую» шляхту прыводзілі да згубы апошняй сувязі з асновамі праваслаўнай традыцыі, што спрыяла распаўсюджванню ўніяцтва [4, с. 217].

Відавочным з’яўлялася імкненне кіруючых колаў у Рэчы Паспалітай да большага распаўсюджвання уніі за кошт праваслаўных, пры гэтым пазбягаючы палітычных дзеянняў, відавочна дыскрымінуючых апошніх. Паказальная сітуацыя склалася вакол віленскага магістрата. У 1663 годзе праваслаўны ігумен скардзіўся на прыцясненні праваслаўных у віленскім магістраце – на месцы, што належалі «рускай» лавіцы, пачалі актыўна запрашаць унітаў і пратэстантаў [10, с. 126]. У 1668 годзе кароль Ян Казімір дасылае ўпамінальны ліст віленскаму магістрату, дзе нагадвае змест дзяржаўнай палітыкі ў канфесійным пытанні: «жадаем больш выкаранення схізмы, а не змяншэння рэлігіі грэцкай, якая ў адзінстве святым з касцёлам рымскім знаходзіцца… памнажэння яе і распаўсюджвання Божай хвалы надалей» [10, с. 131]. Прычынай жа з’яўлення гэтага дакумента паслужыла скарга ўніяцкага мітрапаліта Календы на перашкоды ўніятам, што нібыта чыніў віленскі магістрат. У тым жа 1668 годзе Календа ізноў падае скаргу на віленскі магістрат, па прычыне абкладання апошнім рознымі падаткамі жыхароў уніяцкіх юрысдык у горадзе. Мітрапаліт нагадвае, што па каралеўскаму прывілею – царкоўныя добры ўніятаў незалежныя ад паўнамоцтваў віленскага магістрата [10, с. 133]. Сітуацыя паўтараецца напрыканцы стагоддзя (1697), калі пратэстацыю супраць віленскага магістрата накіроўваюць віленскія базыльяне [10, с. 143]. Апошніх абурыла сітуацыя, што ў некаторых гарадскіх цэхах старшынямі былі абраны праваслаўныя мяшчане. Базыльяне спасылаюцца на тое, што ў віленскі магістрат не дапускаюцца «дызуніты» і «дысідэнты», гэтае ж правіла, на іх думку, павінна распаўсюджвацца і на цэхавых старшынь [10, с. 144]. У дакуменце ўніяты падкрэсліваюць што Рэч Паспалітая – каталіцкая дзяржава, у якой усё робіцца дзеля славы рымскай рэлігіі, і дзе яна з’яўляецца галоўнай. Прычым астатнія цэрквы і «секты», адзначаюцца ў дакуменце, павінны ў правах памяншацца [10, с. 144]. «Людзьмі каталіцкімі» ў пратэстацыі называюцца мяшчане як рымскага, так і «грэцкага» набажэнства. Відавочна, што гаворка ідзе пра ўніятаў [10, с. 145]. У наступным, 1698 годзе ў скарзе пракуратара віленскага Свята-Троіцкага манастыра на віленскі магістрат ізноў адзначаецца, што віленскі магістрат нядбайна адносіцца да абавязкаў па распаўсюджванні уніі, ігнаруе каралеўскія прывілеі, на старшынства ў цэхах дазваляе выбіраць «дызунітаў». Разам з тым у дакуменце адзначаецца, што праваслаўных ужо амаль не засталося ў горадзе [10, с. 149].

З другой паловы XVII стагоддзя назіраецца тэндэнцыя паступовага збліжэння і атаясамлення праваслаўнай і ўніяцкай канфесій у грамадскай і дзяржаўна-палітычнай свядомасці, асабліва гэта заўважна па дакументах другой паловы 80-х і ў 90-я гады XVII стагоддзя. Прынамсі, у дакументах гэтага перыяду ўсё часцей гаворка ідзе пра цэрквы «ўсходняга абраду», «грэцкай веры» – дастаткова складана вызначыць, дзе гаворка ідзе пра цэрквы менавіта праваслаўныя, а дзе – грэка-каталіцкія. Можна ўпэўнена сказаць, што менавіта другая палова XVII стагоддзя пасля «патопу» стала часам найбольшага поспеху уніі. Аднак гэта было дасягнута не толькі і не столькі дзякуючы дзяржаўнай апецы, колькі ў выніку ўсё ж аб’ектыўных прычын: у «пракаталіцкай» дзяржаве царква, што ў большай ступені захоўвала ўсходнюю

абраднасць, карысталася ў набажэнстве «рускай» мовай – знаходзіла ўсё больш прыхільнікаў сярод простых сялян і мяшчанства. Да таго ж уніяцтва не цуралася заходніх каштоўнасцей, адукаванасці, пры ўніяцкіх кляштарах дзейнічалі школы і калегіумы – гэта больш адпавядала тэндэнцыям грамадскага і культурнага развіцця Рэчы Паспалітай, знаходзіла больш прыхільнікаў сярод, напрыклад, заможнага і адукаванага мяшчанства, чым кансерватыўная пазіцыя праваслаўнай царквы. Можна меркаваць, што ўніяцтва пачало ўспрымацца як пэўны «свой» варыянт праваслаўя, адрозны ад праваслаўя, напрыклад, суседняй Маскоўскай дзяржавы.

**Вырашэнне «дысідэнцкага» пытання. Поспех контррэфармацыі.** Апошняя трэць XVII стагоддзя стала часам заняпаду «літоўскага» пратэстантызму. Частка прадстаўнікоў эліты Княства ў свой час падтрымала Рэфармацыю з мэтай, пераважна, аслабіць уплыў каталіцкага Польскага каралеўства ў пасляʼлюблінскі перыяд на Княства. Гэта прывяло да значнага распаўсюджвання евангелічнага вучэння сярод прадстаўнікоў магнацкіх родаў – палітычных і дзяржаўных дзеячоў ужо ў пачатку – сярэдзіне XVII стагоддзя [11, с. 69]. Пратэстанты ў ВКЛ (асабліва іх радыкальны лагер – арыяне) цярпелі пераслед ад каталіцкай рэакцыі ўрада Рэчы Паспалітай і да вайны 1654 – 1667 гадоў. Аднак у паваенны час іх становішча значна пагоршылася. Прычынай таму стала адкрытая антыўрадавая пазіцыя, якую заняла пратэстанцкая «партыя» ў ВКЛ падчас вайны, калі пайшла на хаўрус з ворагам Кароны – Швецыяй – і заключыла з ёй палітычны саюз (1655). Ад вайны моцна пацярпелі евангелісцкія асяродкі – маскоўскія і казацкія войскі знішчалі зборы, вывозілі друкарні. Каталіцкая шляхта ў асобных выпадках рабавала маёнткі пратэстантаў, разбурала лютэранскія зборы [11, с. 272]. Да пагаршэння становішча пратэстантызму на Беларусі спрычынілася і дзяржаўная падтрымка каталіцкай канфесіі, якая ўсё больш становіцца маркерам лаяльнасці да ўрада і прыналежнасці да «народу шляхецкага» ў Рэчы Паспалітай. Ужо ў 1658 годзе пастанова сойма абавязвала «літоўскіх» і польскіх арыян прыняць каталіцызм або пакінуць краіну, арыяне пазбаўляліся ўсіх дзяржаўных пасад [12, с. 272]. Закон 1668 года адзначаў, што рэлігійныя свабоды не пашыраюцца на «арыянскую секту» [11, с. 270]. Па заканчэнні ваенных дзеянняў на Беларусі каталіцкія ўлады пачалі выцясняць кальвіністаў і лютэран з палітычнага жыцця. На соймах 1661 – 1662 гадоў пратэстанцкая «партыя» на чале з Багуславам Радзівілам спрабавала дамагчыся пацвярджэння рэлігійных свабод у дзяржаве, аднак сустрэла байкот з боку шматлікай каталіцкай шляхты [11, с. 271]. Важным этапам у згортванні правоў пратэстантаў з’яўляліся пастановы сойма 1668 года, якія, у прыватнасці, забараняў збірацца ў Вільні Сінодам Ядноты Літоўскай, пераход з каталіцызму ў пратэстантызм. Пасля 1673 года некатолікі ўжо не маглі атрымаць шляхецкую годнасць [11, с. 272]. Інструкцыя шляхты брэсцкага ваяводства на сойм (1676) змяшчае патрабаванне пацвярджэння законаў супраць арыянаў, у той жа час дакумент згадвае пра фундушы берасцейскім аўгусцінцам і брыгіткам, патрабуе вызваленне берасцейскіх бернардзінцаў ад вайсковых пастояў і павіннасцей [9, с. 162].

Статуты гродзенскіх, віленскіх цэхаў утрымліваюць дыскрымінацыйныя артыкулы для некатолікоў, напрыклад, калі нехта з братоў цэха не наведвае касцёльныя імшы, павінен плаціць грашовы штраф, ці плаціць падатак воскам на карысць касцёла [13, с. 32]. У каралеўскім прывілеі віленскаму цэху пераплётчыкаў (1676) знаходзім цікавыя звесткі: «паведамлялі нам… што ерэтыкі і дысідэнты, альбо розных іншых сект, да месца нашага Віленскага дасылаюць кнігі ерэтыцкія, па крамах іх прадаюць… Хочам знішчыць такія непарадкі… Таму даем прывілей такі, каб ні адзін жыд ці гандляр, ані які дысідэнт не асмеліўся кнігамі гандляваць…». Далей дакумент агаворвае парадак выбрання старшынь цэху, каб яны былі «ў веры святой, каталіцкай рымскай, людзі добрыя, а не якія дысідэнты» [13, с. 83]. У статуце віленскіх краўцоў адзначаецца, што на імшы ў касцёле Св. Духа павінны прысутнічаць усе браты цэху – «рэлігіі рымскай, рускай, нямецкай» [13, с. 106]. Зацятая справа распачалася паміж братамі цэху па вырабу пазументаў (1668): каталіцкая частка цэху скардзілася на братоў-дысідэнтаў, што апошнія не наведваюць набажэнствы ў каталіцкім касцёле, не плацяць грошай на алтар і іншых таварышаў падбіваюць не хадзіць на каталіцкую імшу [13, с. 360]. Да справы далучаюцца бернардынцы, якія выказваюць пратэст супраць вышэйзгаданых пратэстантаў: майстры-дысідэнты не бываюць на квартальнай імшы, абавязкаў сваіх касцёльных не выконваюць [13, с. 373]. Справа дайшла да караля, які пастанавіў выбраць старэйшын, каб тыя сачылі за выкананнем касцёльных абавязкаў [13, с. 382]. У выніку заключанага пагаднення паміж пратэстанцкай і каталіцкай часткамі цэху (1670), дысідэнтаў абавязалі наведваць каталіцкую службу (квартальную, нядзельную) і выплаціць неабходны штраф [13, с. 387].

Сітуацыя, у якой апынуліся пратэстанты, нагадвала становішча праваслаўных. У 70-я гады XVII стагоддзя яны, фактычна, апынуліся без заступнікаў з боку ўплывовых асоб і дзяржаўных дзеячоў – пратэстантамі ў ВКЛ заставаліся дробная шляхта, мяшчане, жамойцкія сяляне [11, с. 272]. Цікавым эпізодам рэлігійнага жыцця ў 60 – 80-я гады XVII стагоддзя на беларускіх землях з’яўляецца аб’яднанне і супраца праваслаўнай і пратэстанцкай канфесіі на ніве супрацьстаяння каталіцкай рэакцыі, барацьбы за палітычныя правы некаталіцкай шляхты і г.д. Напрыклад, у маёнтках пратэстанцкай шляхты і магнатаў правы, прывілеі праваслаўнай царквы захоўваліся і пацвярджаліся. У спрэчцы паміж праваслаў-

нымі і ўніятамі за правы на Заблудаўскую царкву (1668) канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл (вядомы пратэстанцкі дзеяч) прадстаўляў праваслаўны бок, між тым уніятаў прадстаўляў Гаўрыла Календа – полацкі ўніяцкі архіепіскап [14, с. 225]. У Слуцку праваслаўныя карысталіся асаблівай апекай уладальнікаў мястэчка – біржанскай (евангелічнай) лініі Радзівілаў. Дзейнічала знакамітае слуцкае праваслаўнае брацтва пры Спаскім манастыры – адно з найбольш магутных і заможных у ВКЛ, у Слуцку меў сваю рэзідэнцыю праваслаўны архімандрыт – наместнік Кіеўскага мітрапаліта [15, с. 34].

Без моцных абаронцаў становішча пратэстанцкіх абшчын было досыць небяспечным, былі выпадкі гвалту з боку каталіцкіх фанатыкаў. У 1675 годзе гараджане разбурылі адбудаваны кальвіністкі збор у Навагрудку. Мясцовыя кальвіністы спрабавалі прыцягнуць да суду навагрудскіх езуітаў, але не змаглі нічога даказаць. Езуіты ж (у змове з бурмістрам і райцамі) выкарысталі сітуацыю, каб назаўсёды выгнаць кальвінісцкую абшчыну з горада, а маёмасць адабраць. Кульмінацыяй сталі падзеі 1682 года, калі студэнты-езуіты і віленскія мяшчане ўчынілі знішчэнне Віленскага рэфармацыйнага кафедральнага збору [11, с. 273]. Збор быў разрабаваны, учынены здзек над целамі нябожчыкаў, разбураны дамы пратэстанцкіх святароў. Гэтая акцыя была санкцыянавана дзяржаўнай уладай – яна была падтрыманая віленскім ваяводай, гетманам ВКЛ Міхалам Пацам. Сведка тых падзей, што пакінуў свае ўспаміны з апісаннем – мінскі шляхціч Ян Цадроўскі, з асуджэннем адзначае ў сваёй «Хроніцы»: «Але, відаць, пан Бог не затрымаўся аддаць належнае за такія страшэнныя здзекі аўтарам гэтай нечуванай злосці. Назаўтра пасля разбурэння сабора ягамосць пан Пац… засмуткаваў і амаль што раптоўна памёр» [15, с. 165]. У 1697 годзе натоўп каталіцкай шляхты разбурыў евангелічныя крыпты ў Краснагалішках і Гружах [11, с. 272].

Такім чынам, у Рэчы Паспалітай другой паловы XVII стагоддзя дзе «рымскае» веравызнанне стала аб’ектам асаблівай увагі і апекі з боку дзяржаўных структур, сацыяльнай і палітычнай эліты, якую гэтае веравызнанне ўсё больш аб’ядноўвала – пратэстантызм як палітычная, рэлігійная, культурная альтэрнатыва стаў непатрэбным. Палітыка контррэфармацыі, якую ўрад працягнуў у наступнае трыццаціgоддзе пасля «патопу», была паспяховай: калі ў 1654 годзе на тэрыторыі ВКЛ налічвалася каля сотні збораў, то ў 1696 годзе іх засталося толькі 46 [11, с. 273].

**Роля дзяржавы ў рэгуляванні адносінаў хрысціянаў з нехрысціянскім насельніцтвам у беларускіх гарадах.** Другая палова XVII стагоддзя – час, калі пачынаецца паступовае, але няўхільнае павелічэнне яўрэйскай прысутнасці ў беларускіх гарадах. Гэтая тэндэнцыя ўплывала на ўсе бакі развіцця беларускага горада – гаспадарчы, сацыяльны, культурны, пэўным чынам абвастраючы іх, паколькі парушала «традыцыйную» раўнавагу ў беларускім магдэбургскім горадзе. Канкурэнцыя ў гаспадарчай сферы вяла да напружвання адносінаў, пераводзіла яго ў этнаканфесійную плоскасць, да таго ж не страцілі сваю актуальнасць ранейшыя стэрэатыпы хрысціян пра яўрэяў. Агульная тэндэнцыя апошняй трэці XVII стагоддзя – паступовае згортванне рэлігійнай талерантнасці, выключэнне яе са сферы рэальнай жыццёвай практыкі – ускладняла і без таго няпростае жыццё іўдзеяў. Дакументы гэтага часу сведчаць пра самыя розныя канфлікты паміж яўрэямі і хрысціянамі розных канфесіі. Адна справа змяшчае звесткі аб збіцці двума брэсцкімі шляхцічамі яўрэяў (1665), справу вырашылі праз суд на карысць пацярпелых [3, с. 28]. У 1669 годзе вялася судовая справа паміж берасцейскімі святарамі і берасцейскім кагалам за царкоўную зямлю. Дакумент сведчыць, што святары збівалі яўрэяў, абраджалі. Зноўку справа была вырашана на карысць берасцейскага кагала, святароў пакаралі [3, с. 41]. Незвычайны дакумент датаваны 1670 годам – пратэстацыю ў суд на яўрэяў ВКЛ накіраваў віленскі дэкан, прэлат Кшыштаф Прэдслаўскі. Саноўнік абвінавачваў групы яўрэяў з розных гарадоў Княства (Брэст, Мыш, Рось, Высокае), што яны дамаўляюцца і крадуць касцёльныя і царкоўныя рэчы [3, с. 54].

У 1671 годзе выйшаў універсал Яна III аб ахове яўрэяў ад гвалту. Кароль звяртаецца да ўраднікаў, бурмістраў, каб яны не дазвалялі простым людзям лавіць і катаваць яўрэяў (па падазрэнні ў чараўніцтве). Згодна са звесткамі дакумента, падобны выпадак меў месца ў Наваградку – двух яўрэяк спалілі [3, с. 201]. Нягледзячы на падобныя інцыдэнты, вышэйшая ўлада ў дзяржаве прадстаўляла і гарантавала яўрэйскай абшчыне дастаткова шырокія правы і прывілеі. У 1669 годзе кароль Міхаіл пацвярджае прывілеі яўрэям у ВКЛ, нададзеныя ім ад «даўніх часоў» [3, с. 182]. У дакуменце ўказваюцца найбуйнейшыя супольнасці яўрэяў у Княстве – Брэст, Магілёў, Менск, Гродна, Пінск, Ворша, Наваградак. Яўрэі плацілі звычайны падатак, маглі свабодна займацца рамяством (па-за цэхам), наведваць свае набажэнствы і будаваць сінагогі [3, с. 182]. Цікава, што спецыяльна падкрэслівалася, што хрысціяне не могуць жыць на адной вуліцы разам з «жыдамі», нават калі маёмасць яўрэя перайшла хрысціяніну [3, с. 187]. Ян III пацвярджае гэты прывілей (1679) [3, с. 209]. У канстытуцыі Гродзенскага сейма (1678) ёсць пастановы накласці штрафы на студэнтаў, якія абразілі яўрэяў (трэба думаць, маюцца на ўвазе навучэнцы езуіцкага калегіума), і патрабаванні, каб зборшчыкі падаткаў не вымагалі лішняга ад яўрэяў [3, с. 226]. У 1685 годзе кароль выдае спецыяльны прывілей яўрэям з Воінава, які вызваляў іх ад значнай часткі падаткаў і павіннасцей, незаконна ўскладзеных на іх мясцовымі мяшчанамі [3. с. 240]. У гэты ж час выйшаў каралеўскі прывілей мяшчанству Менска (1681), які забараняў яўрэям пад пагрозай вялікага штрафу сяліцца па-за раней выз-

начанымі пляцамі побач з сінагогай [17, с. 131]. У 1687 годзе выступленне супраць яўрэяў адбылося ў Вільні. У ноч перад каталіцкім Вялікаднём пагромшчыкі панішчылі і парабавалі маёмасць мясцовых яўрэяў [17, с. 128]. Статуты цэхаў беларускіх гарадоў утрымлівалі асобныя артыкулы, якія тычыліся яўрэяў, пераважна накіраваныя на абарону ад эканамічнай канкурэнцыі з боку яўрэяў-партачоў [13, с. 54]. Шэраг артыкулаў тычыўся этнаканфесіных пытанняў: напрыклад, яўрэям забаранялася мець хрысціянскую чэлядзь; у сваю чаргу яўрэям забаранялася працаваць у хрысціян [13, с. 36]. Вельмі характэрнай з’яўляецца судовая справа паміж віленскімі раменнікамі-хрысціянамі з мясніцкага цэха і мяснікамі-яўрэямі (1667). Цэх скардзіўся на яўрэяў, што яны парушаюць правы і прывілеі хрысціян: набываюць жывёлу і самі яе рэжуць, наадчынялі безліч мясных лавак (ятак), дзе на заражэнне і згубу хрысціян прадаюць мяса нібыта хворых жывёл. Да таго ж яўрэі ў вялікі пост пры касцёлах і кляштарах публічна забіваюць быдла, чым зневажаюць каталіцкую веру [18, с. 408].

У грамадскім жыцці для яўрэяў існаваў набор абмежаванняў рэлігійнага і эканамічнага характару. Напрыклад, яўрэі павінны былі пэўным чынам весці сябе падчас хрысціянскіх святаў (каталіцкіх ці праваслаўных): не працаваць, падчас святочных хрысціянскіх працэсіі – сядзець у дамах зачыніўшы вокны; за «перацягванне» хрысціяніна ў іўдаізм яўрэя чакала смерць. Яўрэі не маглі займацца цэхавым рамяством: ствараць уласныя цэхі ці ўваходзіць у цэхі хрысціянскія. Яўрэй не мог займаць якую-небудзь дзяржаўную ці адміністратыўную пасаду.

Нягледзячы на падобныя абмежаванні, адносіны да яўрэяў з боку ўлады ў Рэчы Паспалітай былі досыць прыхільнымі і талерантнымі: гэта пацвярджалася як агульнадзяржаўнымі прывілеямі, так і спецыяльнымі каралеўскімі лістамі, накіраванымі на абарону маёмасці, жыцця і годнасці іўдзеяў, рэлігійных свабод [3, с. 273].

Такім чынам, тэндэнцыі канфесійнага развіцця на беларускіх землях Княства пасля «патопу» ў апошняй трэці XVII стагоддзя дазваляюць зрабіць наступныя **высновы:**

1) вайна 1654 – 1667 гадоў прывяла да расколу грамадства ВКЛ і рэзкага абвастрэння канфесійнага пытання: шляхта і мяшчане пэўнага хрысціянскага веравызнання ў межах адной дзяржавы маглі падтрымаць адзін з варагуючых бакоў. Відавочны «пракаталіцкі» характар каралеўскай улады ў ваенны і пасляваенны час зрабіў прыналежнасць да «рымскай» рэлігіі маркерам палітычнай лаяльнасці. Гэта ў сваю чаргу вяло да згортвання правоў іншых канфесій, ці нават іх ліквідацыю ў межах дзяржавы (арыянства);

2) пазіцыя праваслаўнай царквы і яе прыхільнікаў была моцна падарваная: ваенныя разбурэнні знішчылі матэрыяльную базу, прывялі да знішчэння масы вернікаў. Частка праваслаўных святароў, шляхты і мяшчан дыскрэдытавала царкву супрацоўніцтвам з маскоўскай уладай. У такіх абставінах каталіцкай дзяржаве, якая ўсё больш прадстаўляла «польскі народ шляхецкі», было прасцей праводзіць адпаведную культурную і канфесійную палітыку. Уніяцтва, такім чынам, становіцца «кампрамісным варыянтам» для ажыццяўлення гэтай палітыкі. Аднак распаўсюджванне ўніяцтва ў апошняй трэці стагоддзя было звязана не толькі з высілкамі дзяржаўнай улады: канфесія з усходняй абраднасцю і народнай мовай, заходняй культурнай арыентацыяй знаходзіла ўсё больш прыхільнікаў сярод шляхты, мяшчанства і сялян;

3) пратэстантызм як культурная і палітычная альтэрнатыва аказаўся незапатрабаваным каталіцкай дзяржавай: функцыянаванне і развіццё евангелічнай канфесіі на землях Княства ажыццяўлялася ва ўмовах шырокай рэлігійнай талерантнасці другой паловы XVI – першай паловы XVII стагоддзя, ва ўмовах яе згортвання ў 60 – 80-я гады XVII стагоддзя адбываўся заняпад пратэстантызму. Аб’яднанне ж пратэстантаў і праваслаўных у адзін лагер не мела перспектывы – яны прадстаўлялі розныя культурныя традыцыі, каштоўнасці. І нарэшце, апошняе – нягледзячы на папярэднія высновы аўтар не схільны разглядаць апошнюю трэць XVII стагоддзя як час «рэлігійнага фанатызму» і згортвання ўсіх рэлігійных правоў і вольнасцей. Традыцыі папярэдніх часоў захоўваліся, дзяржава спрабавала вырашаць найбольш вострыя сітуацыі паміж прадстаўнікамі розных канфесій, не дапускаючы іх перацякання ў канфлікт. Стаўленне да нехрысціянскіх канфесій, найперш іўдзеяў, было досыць талерантным. Выпадкі гвалту, рабункаў, пагромаў заўсёды асуджаліся і разглядаліся з усёй сур’ёзнасцю, ініцыятары канфліктаў цярпелі жорсткія пакаранні.

## ЛІТАРАТУРА


1. Сагановіч, Г.М. Царкоўная вунія 1596 г. і пытанне нацыянальнай тоеснасці беларусаў у XVIII ст. / Г.М. Сагановіч // Наш Радавод. – 1996. – Кн. 7. – С. 353 – 357.
2. Сагановіч, Г. Невядомая вайна 1654 – 1667 гг. / Г. Сагановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 164 с.
3. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. Губернского Правления, 1871. – Т. 5: Акты Брестского и Городненского гродских судов. – 496 с.
4. Mironovich, A. Kosciół prawosławny w dziejach dawnej Rzeczypospolitej / A. Mironowich. – Białystok: Wyd-wo univ. w Białymstoku, 2001. – 352 s.

5. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: типография Губернского правления, 1870. – Т. 3: Акты Брестского гродского суда. – 440 с.
6. Титов, Ф.И. Русская православная церковь в Польско-Литовском государстве в XVII – XVIII вв. (1654 – 1795 гг.): опыт церковно-исторического исследования / Ф.И. Титов. – Киев: Тип. С.В. Кульженко, 1905. – Т. 1. – 394 с.
7. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. А.К. Киркора, 1865. – Т. 1: Акты Гродненского земского суда. – 414 с.
8. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. Губернского Правления, 1867. – Т. 2: Акты Брестского земского суда. – 381 с.
9. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. Губернского Правления, 1870. – Т. 4: Акты Брестского гродского суда. – 687 с.
10. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. А.Г. Сыркина, 1875. – Т. 8: Акты Виленского гродского суда. – 765 с.
11. Катлярчук, А. У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швэцыя ў часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст. / А. Катлярчук. – Мінск: ARCHE, 2008, 2009. – 306 с.
12. Volumina Legum. Tom IV. Prava, konstytucye i przivileie krolestwa Polskiego, Wielkiego Xiestwa Litewskiego y wszystkich prowincyi nalezacych na walnych sejmiech koronnyh. Ab anne 1641 ad annum 1668. – Petersburg: nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1859. – 519 s.
13. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. А.Г. Сыркина, 1879. – Т. 10: Акты Виленского магистрата и магдебургии. – 686 с.
14. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. А.Г. Сыркина, 1888. – Т. 15: Декреты Главного Литовского Трибунала. – 592 с.
15. Degiel, R. Protestanci i prawosławni: Patronat wyznaniowy Radziwiłłów birżańskih nad cerkwią prawosławną w księstwie słuckim w XVII w. / R. Degiel. – Warszawa: Neriton, 2000. – 153 s.
16. Коршунаў, А.Ф. Успаміны Яна Цадроўскага / А.Ф. Коршунаў // Беларус. літ. – 1977. – Вып. 5. – С. 154 – 167
17. Марзалюк, І.А. Этнічны і канфесійны свет беларускага горада XVI – XVIII стст. / І.А. Марзалюк. – Магілёў: МДУ, 2007. – 162 с.
18. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. «Русский почин», 1901. – Т. 28: Акты о евреях. – 521 с.

*Пастуміў 24.05.2012*

## THE CONFESSIONAL POLICY OF RECH POSPOLITAJA GOVERNMENTAL AUTHORITIES ON THE LANDS OF BELARUS IN THE LAST THIRD OF THE XVII CENTURY (1667 – 1701)

***A. BARTASHEVICH***

*The 1654 – 1667 war loss is evaluated, and its influence on the state politics of Rech Pospolitaja towards the basic christian confessions: the Orthodox, the Catholic, the members of the Uniat Church, and the Protestant, contrasted to the policy towards jews, is analysed. The conclusion is made that Catholics were perceived as more politically reliable, while the rights of the members of the Orthodox Church were restricted, causing them to gradually lose their influence. The profession and practice of Uniat Church was spreading widely, which helped to retain the cultural values of the Eastern-rite Catholicism. In 1660 – 1680 Protestantism loses its political and cultural potential. At this time the number of non-Christian people (jews) increased in Belorussian towns. The attitude to them in policonfessional petty-bourgeois surrounding was non-tolerant.*

**УДК 334.735(476-15)(091) “1920/1939”**

# СПЕЦЫФІКА РЭАЛІЗАЦЫІ ПОЛЬСКАГА КААПЕРАТЫЎНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1920 – 1939 ГАДЫ)

***А.Л. РАДЗЮК***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Даследуюцца асноўныя этапы фарміравання і развіцця нарматыўна-прававой базы дзейнасці кааператываў у міжваеннай Польшчы, асаблівасці рэалізацыі і распаўсюджвання польскага кааператыўнага права на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1920 – 1939 гг.). Аўтар прыходзіць да высновы, што нават ва ўмовах дзеяння дэмакратычнага кааператыўнага права (да 1934 г.) беларускія кааператыўныя арганізацыі мелі на шляху сваёй дзейнасці дадатковыя цяжкасці прававога характару. Гэта адбывалася з-за таго, што кааператыўныя нарматыўныя палажэнні праецыраваліся на беларускія кааператывы праз мясцовую адміністрацыю, якая ў сваю чаргу разглядала іх як палітычна непажаданыя арганізацыі і стварала разнастайныя перашкоды іх развіццю.*

Міжваенная гісторыя Заходняй Беларусі па-ранейшаму выклікае трывалы навуковы інтарэс. Нягледзячы на дастаткова багатую гістарыяграфію, многія пытанні патрабуюць грунтоўнага перагляду ці ўвогуле знаходзяцца па-за ўвагай даследчыкаў. Так, на сучасным этапе ў беларускай гістарычнай навуцы няма спецыяльных даследаванняў, прысвечаных праблеме дзейнасці беларускіх кааператываў. Абсалютная большасць прац закранае яе ўскосна і фрагментарна. Між тым у галіне кааперацыі беларусы дасягнулі некаторых поспехаў, а самі кааператывы адыгрывалі важную ролю ў жыцці насельніцтва той мясцовасці, дзе яны функцыянавалі.

Любое даследаванне кааператыўнага руху не магчыма без аналізу прававых умоў яго існавання. У гэтым плане заходнебеларуская кааперацыя не з’яўляецца выключэннем. Першыя спробы даследавання польскага кааператыўнага заканадаўства (у рамках якога дзейнічалі і беларускія кааператывы) былі зроблены яшчэ ў 1920-я гады [1; 2]. Пачынаючы з 1960-х гадоў выходзіць цэлы шэраг прац польскіх гісторыкаў, у якіх разглядалася кааператыўнае права міжваеннай Польшчы і асноўныя этапы яго фарміравання [3 – 5]. Украінскія навукоўцы таксама надавалі пэўную ўвагу аналізу польскіх кааператыўных законаў у рамках вывучэння ўкраінскага кааператыўнага руху [6; 7]. Улічваючы тое, што беларускія і ўкраінскія кааператывы знаходзіліся ў падобных умовах існавання і часта сутыкаліся з аднолькавымі цяжкасцямі, звесткі ўкраінскіх гісторыкаў маюць значную карысць і для айчыннай гістарыяграфіі. Вядомая польская даследчыца К. Гамулка разгледзела некаторыя асаблівасці палітыкі польскага ўрада ў сферы кааперацыі на этнічных беларускіх землях [8; 9]. Аднак на сённяшні дзень асобнага даследавання, прысвечанага рэалізацыі польскага кааператыўнага заканадаўства ў Заходняй Беларусі, не існуе.

Мэтай дадзенай работы з’яўляецца аналіз асноўных этапаў фарміравання і развіцця нарматыўна-прававой базы дзейнасці беларускіх кааператываў, а таксама паказ спецыфікі рэалізацыі польскага кааператыўнага права на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

**Асноўная частка.** Пасля Рыжскай мірнай дамовы Заходняя Беларусь апынулася ў складзе польскай дзяржавы. Станаўленне беларускай кааперацыі тут пачалося фактычна з нуля. Да вайны ўвесь кааператыўны рух на тэрыторыі Беларусі развіваўся ў межах гаспадарчай сістэмы Расійскай імперыі, падпарадкоўваўся яе заканадаўству і меў агульнарасійскі характар. Далучэнне Заходняй Беларусі да Польшчы, кааператыўныя прынцыпы якой кардынальна адрозніваліся ад расійскіх, патрабавала ліквідацыі ранейшых структур і стварэння новых, ужо на нарматыўна-прававой базе польскага заканадаўства.

Няўстойлівае геапалітычнае становішча заходнебеларускіх зямель 1919 – 1920 гадоў наклала моцны адбітак на кааперацыю. Многія кааператывы не паспявалі рэагаваць на частыя змены ўлад. Паказальным у гэтым плане з’яўляецца даклад інструктара Віленскага саюза кааператываў (ВСК) аб стане кааператываў у Дзісенскім павеце напрыканцы 1919 года. На аснове прадстаўленых ім матэрыялаў можна вылучыць 5 груп мясцовых гаспадарчых таварыстваў паводле іх прававога становішча: 1) кааператывы, зарэгістраваныя губернатарам да 1914 года; 2) кааператывы, зарэгістраваныя акружнымі судамі часовага ўрада; 3) кааператывы, зарэгістраваныя саветамі народнай гаспадаркі пры бальшавіцкай уладзе; 4) кааператывы, якія падалі дакументы на рэгістрацыю ў польскія ўрадавыя ўстановы; 5) кааператывы, якія не мелі зарэгістраванага статута [10, л. 1 адв.]. Падобная сітуацыі назіралася і ў іншых заходнебеларускіх рэгіёнах.

Пасля захопу Віленшчыны войскамі польскага генерала Л. Жалігоўскага ў кастрычніку 1920 года на карце Усходняй Еўропы афіцыйна з’явілася новая дзяржава пад назвай “Сярэдняя Літва” з цэнтрам у Вільні, якая ўключала ў сябе Ашмянскі, Віленскі, Троцкі і Свянцянскі паветы. Самастойнага значэння гэта ўтварэнне не мела, і фактычна яго “незалежнасць” служыла толькі шырмаю для прыкрыцця польскай улады над спрэчнымі з Літвой тэрыторыямі [11, с. 111]. Для беларускага кааператыўнага руху гэтыя геапалітычныя змены азначалі чарговы пераход да новых умоў існавання.

Узнікненне Сярэдняй Літвы не прывяло да канчатковага вырашэння юрыдычных супярэчнасцей у кааператыўным руху. З пачатку 1921 года на тэрыторыі Віленшчыны паралельна функцыянавалі 2 заканадаўчыя акты: 1) распараджэнне № 255 польскага генеральнага камісара ўсходніх зямель аб таварыствах і саюзах; 2) польскі закон аб кааператывах ад 29 кастрычніка 1920 года.

Першы заканадаўчы акт распаўсюджваўся выключна на тэрыторыю Сярэдняй Літвы, дзе ў той час функцыянавала большасць беларускіх кааператываў. Характарызуючы яго, вядомы тагачасны кааператар С. Чыжэўскі пісаў, што ён у асноўным паўтараў палажэнні старога царскага закону* [13, с. 1]. Другі закон, нягледзячы на ўсе высілкі мясцовай польскай адміністрацыі, так і не быў канчаткова распаўсюджаны на беларускія кааператывы Віленшчыны да канца існавання Сярэдняй Літвы.

Да гэтага неабходна дадаць, што доўгі час не былі вырашаны праблемы з наяўнасцю розных форм статутаў спажывецкіх кааператываў. Так, на руках інструктараў ВСК знаходзіліся тры групы статутаў: 1) стары расійскі, які быў перакладзены на беларускую мову (найбольш папулярны на этнічнай беларускай тэрыторыі Віленшчыны ў 1919 – 1921 гг.); 2) "Ustawa Spółdzielczego Stowarzyszenia Spożywców" (найбольш папулярная сярод гарадскіх, у сваёй большасці не беларускіх кааператываў); 3) "Ustawa stowarzyszenia spożywców" (найменш папулярная) [10, л. 2 адв.].

Адным з цэнтральных пытанняў, разгледжаных на ўрадавай нарадзе дэпартаментаў Сярэдняй Літвы 15 лістапада 1921 года, была менавіта праблема рэгламентацыі дзейнасці кааператываў. Выступаючы там інструктар па справах кааперацыі, сярод іншага, адзначыў нізкі ўзровень арганізацыі ў вясковых кааператывах. Яшчэ раней (у сакавіку 1921 г.) улады разаслалі анкету для кааператываў, мэтай якой было высвятленне арганізацыйнага і прававога становішча гаспадарчых арганізацый. Інструктар адзначыў, што вялікая частка кааператываў так і не прыслала вынікаў апытання [14, л. 51 адв.]. Але нават на аснове аналізу дадзеных, якія дайшлі да цэнтра, можна зрабіць выснову аб захаванні цэлага шэрага прававых прабелаў, прыкмет не валодання заканадаўчай базай і супярэчнасцей у дзейнасці вясковых спажывецкіх таварыстваў, перадусім беларускіх. Да ўваходжання Сярэдняй Літвы ў склад Польшчы гэтая праблема так і не была канчаткова вырашана. Ужо на гэтай нарадзе была падкрэслена неабходнасць як мага хутчэйшага распаўсюджвання на тэрыторыю Сярэдняй Літвы польскага кааператыўнага закона. У дакладзе кіраўніка аддзела таварыстваў дэпартамента Унутраных спраў Ю. Ракоўскага сярод іншага гаварылася: "Што датычыцца кантролю над кааператыўнымі арганізацыямі, належыць распаўсюдзіць на тэрыторыю Сярэдняй Літвы закон аб кааператывах ад 29 кастрычніка 1920 года, у якім супрацоўніцтва ўрада з грамадствам зафіксавана ў прававых нормах" [14, л. 50.]. Але шырокае распаўсюджванне польскага закона на Віленшчыну адбылося толькі ў другой палове 1922 года.

На астатняй тэрыторыі Заходняй Беларусі закон ад 29 кастрычніка 1920 года набыў юрыдычную моц з 1 студзеня 1921 года. Яго распрацоўка пачалася яшчэ ў 1918 годзе. Пасля доўгіх спрэчак, правядзення разнастайных міністэрскіх нарадаў і канферэнцый закон быў прыняты. Дадзены заканадаўчы акт меў ліберальны і дэмакратычны характар. У ім падавалася вызначэнне кааператываў і фармуляваліся агульныя прынцыпы кааперацыі. Працэдура заснавання і рэгістрацыі кааператыва ў параўнанні, напрыклад, з заканадаўствам Расійскай імперыі была нескладанай. Для гэтага трэба было падаць у акружны суд статут кааператыва, дзе агаворваліся яго асноўныя арганізацыйныя прынцыпы і гаспадарчыя мэты. Пасля разгляду статута судом і дзяржаўнай кааператыўнай радай кааператыў на працягу 2 месяцаў рэгістраваўся і мог працаваць на легітымных пачатках. Закон дэталізаваў умовы членства ў кааператывах, рэгламентаваў правядзенне рэвізій і дзейнасць рэвізійных саюзаў. Таксама былі вызначаны органы кааператываў і акрэслены іх функцыі [3, s. 25 – 26; 15].

Асобная роля належала згаданай вышэй Кааператыўнай радзе. Яна была створана 14 снежня 1920 года пастановай Міністэрстваў фінансаў і юстыцыі Польшчы і выконвала функцыю своеасаблівага злучніка паміж урадам і кааперацыяй [5, s. 30]. Для беларускага кааператыўнага руху роля гэтай інстытуцыі была надзвычай высокай. Калі ў саюзных кааператывах канчатковыя гадавыя рэвізіі праводзіліся адпаведным рэвізійным саюзам, то ў незалежных кааператывах (большасць беларускіх гаспадарчых арганізацый належалі менавіта да гэтай групы) гэта функцыя адводзілася радзе. Акрамя таго незалежныя ("дзікія") кааператывы павінны былі: 1) штогод прысылаць справаздачы агульных сходаў і пасяджэнняў нагляднай рады; 2) плаціць грошы за правядзенне канчатковай рэвізіі (раз у два гады); 3) кожны год абвяшчаць свой баланс у прэсе; 4) плаціць грошы за апрацоўку балансаў [16, л. 16].

У гістарычнай літаратуры звяртаецца ўвага на шэраг хібаў кааператыўнага закона. Як загана, падкрэсліваецца, напрыклад, тое, што закон не патрабаваў дазволу адміністрацыі для заснавання кааператыва (толькі акруговага суда). З цягам часу на практыцы выявіліся яшчэ некалькі дробных памылак, якія былі ў асноўным выпраўленыя папраўкай 1923 года. Аднак большасць кааператараў ацэньвалі закон (але не палітыку дзяржавы ў сферы кааперацыі) пазітыўна [3, s. 31].

Характэрна, што кансерватыўныя колы дзеячаў падкрэслівалі як хібы закона празмерны грамадскі радыкалізм і дэмакратызм [3, s. 31]. Менавіта яны ініцыявалі атакі на закон у прэсе. Асноўныя іх патра-

---

* Маецца на ўвазе "нормальный устав потребительских обществ" ад 1897 года. Паводле яго замацоўваўся канцэсійны (дазваляючы) парадак адкрыцця кааператыва, што павышала ролю мясцовай адміністрацыі ў кіраванні кааператыўным рухам. У сваю чаргу гэта вяло да парушэння асноўных прынцыпаў кааперацыі (аўтаномнасці і самакіравання) [12, с. 1].

баванні можна звесці да наступных пунктаў: 1) павышэнне ролі дзяржавы ў кіраўніцтве; 2) ліквідацыя кааператыўнай рады; 3) няроўнасць галасоў для сяброў усіх кааператываў; 4) павышэнне ролі акруговых судоў у адносінах да кааперацыі. На базе гэтых прэтэнзій у 1925 годзе быў падрыхтаваны альтэрнатыўны праект закона аб кааперацыі [4, s. 56]. У рэшце рэшт на пачатку 1930-х гадоў нападкі з боку санацыйнага рэжыму і буйнога прыватнага капіталу прывялі да г. зв. навелізацыі кааператыўнага права.

Яшчэ адной важнай юрыдычнай задачай было стварэнне класіфікацыі кааператываў. У 1924 годзе Кааператыўная рада выпрацавала адпаведную схему (з нязначнымі папраўкамі захоўвалася да 1939 г.), якая потым пачала выкарыстоўвацца ў справаводстве. Паводле яе ўсе кааператывы на тэрыторыі Польшчы дзяліліся на 6 груп і 18 тыпаў:

Група I. Кааператывы спажыўцоў. Тыпы: 1) спажывецкія таварыствы; 2) будаўнічыя кааператывы; 3) кааператывы ўзаемнай дапамогі.

Група II. Ашчадна-пазыковыя кааператывы (крэдытныя). Тыпы: 4) кааператыўныя банкі і касы; 5) сялянскія ашчадна-пазыковыя кааператывы; 6) працоўныя і ўрадавыя ашчадна-пазыковыя кааператывы; 7) іншыя ашчадна-пазыковыя кааператывы.

Група III. Кааператывы сялян. Тыпы: 8) агульныя кааператывы закупу і збыту; 9) спецыяльныя кааператывы закупу і збыту; 10) малочныя кааператывы; 11) іншыя перапрацоўчыя кааператывы; 11) дапаможныя кааператывы.

Група IV. Кааператывы рамеснікаў. Тыпы: 12) рамесніцкія кааператывы.

Група V. Кааператывы працаўнікоў. Тыпы: 13) вытворчыя кааператывы; 14) кааператывы працы.

Група VI. Іншыя кааператывы. Тыпы 15) прамысловыя кааператывы; 16) гандлёвыя кааператывы; 17) розныя кааператывы (спартовыя, артыстычныя і інш.) [3, s. 24].

Дадзеная класіфікацыя выкарыстоўвалася ў статыстыцы кааператываў, а таксама пры аднясенні таго ці іншага кааператыва да рэвізійных саюзаў розных формаў дзейнасці.

Што датычыцца рэалізацыі кааператыўнага права на тэрыторыі Заходняй Беларусі, то тут яно мела свае спецыфічныя рысы. Мясцовая адміністрацыя імкнулася павысіць свой уплыў на кааперацыю, хаця паводле закона 1920 года гэты ўплыў фактычна нівеляваўся. Не маючы значных юрыдычных рычагоў ціску на кааперацыю, чыноўнікі кантралявалі кааператыўны рух з дапамогай сістэмы крэдыту. Яны падтрымлівалі "пажаданыя" і стрымлівалі развіццё "непажаданых" кааператываў нацыянальных меншасцяў, ці кааператываў, якія стваралі канкурэнцыю дзяржаўным арганізацыям. У 1925 годзе Палітычны камітэт Рады міністраў прыняў рашэнне аб выдзяленні крэдытаў толькі польскім ці этнічна мяшаным кааператывам, і гэта палітыка набыла афіцыйны характар [9, s. 94].

Напрыканцы 1920-х – пачатку 1930-х гадоў у сувязі з эканамічным крызісам праграма ўрадавай падтрымкі кааперацыі перажыла некаторыя змены, а памеры дзяржаўнай дапамогі значна скараціліся. Паводле справаздачы кааператыўнага інспектара Палескага ваяводства, акцэнт рабіўся на падтрымку толькі вытворчых кааператываў (малачарняў, алеярняў, кааператываў, звязаных з народнымі промысламі – ткацтвам, бортніцтвам і г.д.) і сялянскіх кааператываў закупу і збыту. Функцыю крэдытных кааператываў мусілі выконваць гмінныя касы. Урад аказваў кааператывам матэрыяльную падтрымку толькі ў тых выпадках, калі ў пэўнай мясцовасці ў іх была вострая неабходнасць [17, л. 43 адв.]. Падобныя палажэнні былі змешчаны і ў запісцы Міністэрства замежных спраў Польшчы, прысвечанай гаспадарчаму становішчу "крэсаў" у гады крызісу. Акрамя гэтага там падкрэслівалася неабходнасць недапушчэння стварэння цалкам беларускіх кааператываў, а толькі з удзелам прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці [18, л. 23 – 24].

У 1934 годзе быў прыняты новы кааператыўны закон, згодна з якім уся тэрыторыя тагачаснай Польшчы была падзелена на акругі, дзе маглі дзейнічаць толькі буйныя рэвізійныя саюзы [19]. Для беларускіх кааператываў дадзенае палажэнне пакідала толькі два варыянты магчымай дзейнасці: 1) у межах польскіх рэвізійных саюзаў, што фактычна азначала інкарпарацыю ў польскую кааператыўную сістэму; 2) заставацца "дзікімі", г. зн. не ўваходзіць у рэвізійныя саюзы і плаціць вялізныя падаткі. Таксама закон прадугледжваў павышэнне ролі мясцовай адміністрацыі пры рэгістрацыі кааператыва, якая з вялікай неахвотай дазваляла заснаваць беларускі кааператыў [19; 20, л. 3].

Пазней былі абмежаваны паўнамоцтвы Кааператыўнай рады. Яе новая роля і стаўленне да "дзікай" кааперацыі былі акрэслены на III канферэнцыі рэвізораў Кааператыўнай рады 2 – 3 верасня 1935 года. Адзін з кіраўнікоў рады Т. Клапкоўскі паміж іншага адзначыў: "Рада больш не жадае быць сурагатам рэвізійнага саюза для «дзікіх» кааператываў, таму ўся ўвага Бюро *(кіраўніцтва рады – А. Р.)* будзе скіравана на тое, каб весці развітыя кааператывы да ўступлення ў рэвізійныя саюзы, а неразвітыя кааператывы і псеўдакааператывы ліквідаваць" [21, л. 5].

Ад гэтага часу ў беларускія кааператывы, якія ў сваёй большасці не належалі да польскіх рэвізійных саюзаў, прыходзяць лісты з Міністэрства фінансаў з патрабаваннем у трохгадовы тэрмін уступіць у рэвізійны саюз пад пагрозай вывядзення з рэестра і дэлегалізацыі [22, л. 8].

Такім чынам, у міжваеннае дваццацігоддзе заканадаўчая база для дзейнасці беларускіх кааператываў у Польшчы неаднаразова змянялася. Напачатку 1920-х гадоў на тэрыторыі Заходняй Беларусі не было ўніфікаванага кааператыўнага права. Асноўная маса беларускіх арганізацый дзейнічала на тэрыторыі Сярэдняй Літвы, дзе не было выкрышталізаванага заканадаўства. Польскі закон аб кааператывах ад

29 кастрычніка 1920 года распаўсюдзіўся на гэтыя землі толькі ў 1922 – 1923 гады. Гэты заканадаўчы акт у цэлым насіў дэмакратычны і ліберальны характар. Аднак ён распаўсюджваўся на беларусаў праз мясцовую адміністрацыю, якая навешвала на ўсе беларускія, у тым ліку і гаспадарчыя, арганізацыі ярлыкі "нядобранадзейнасці" і "антыпольскасці", што безумоўна не спрыяла паспяховаму развіццю кааператыўнага руху. Абноўлены пры санацыйным рэжыме закон аб кааператывах быў пазбаўлены ранейшых прынцыпаў дэмакратычнасці і адкрытасці, узмацняў кантроль дзяржавы над кааператыўнымі таварыствамі. Галоўным вынікам заканадаўчых змен для беларусаў стала немагчымасць існавання без прыналежнасці да якога-небудзь рэвізійнага саюза. А так як уласнага саюза ў беларускіх кааператараў не было, гэта азначала паступовую інкарпарацыю ў польскую кааператыўную сістэму.

ЛІТАРАТУРА

1. Wejdlich, K. Ruch spółdzielczy w Polsce w latach 1914 – 1926 / K. Wejdlich. – Kraków-Poznań: Wyd-wo SIN w Krakowie, 1927. – 316 s.
2. Dąbrowski, F. Spółdzielczość w Polsce / F. Dąbrowski // Kalendarz Spółdzielczy na rok 1927. – Warszawa: Druk T. Dobrzańskiego, 1927. – S. 112 – 116.
3. Rusiński, W. Zarys historii polskiego ruchu spółdzielczego (część II 1918 – 1939) / W. Rusiński. – Warszawa: Zakład wyd-w CZSR, 1980. – 355 s.
4. Kędziorek, F. Spółdzielczość w zaryse / F. Kędziorek. – Warszawa: Wyd. Spółdzielcze, 1988. – 157 s.
5. Chyra-Rolicz, Z. Z tradycji polskiej spółdzielczości II Rzeczypospolitej: idee, fakty, dokonania / Z. Chyra-Rolicz. – Warszawa: Polski Dom Wydawniczy "Ławica", 1992. – 102 s.
6. Moklak J. The Ukrainian Cooperative Movement in the Second Polish Republic. A Contribution to the History of Economic Nationalism and National Minorites / J. Moklak // Cooperatives in ethnic conflicts; edited by Torsten Lorenz. – Berlin: BWL, 2006. – S. 307 – 342.
7. Вісина, Т.М. Інкорпорація українських кооперативів Волині в систему польських ревізійних союзів. / Т.М. Вісина // Науковий вісник ВДУ ім. Лесі Українки. Історичні науки. – Луцьк: ред.-вид. відділ "Вежа" ВДУ, 2001. – № 11. – С. 54 – 60.
8. Gomółka, K. Białorusini w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka. – Gdańsk: Politechnika Gdańska, 1992. – 179 s.
9. Gomółka, K. Białoruskie instytucje życia gospodarczego w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1997. – Nr. 8. – S. 90 – 98.
10. Бібліятэка літоўскай акадэміі навук (аддзел рукапісаў і старадрукаў). – Фонд 21. – Адз. зах. 74.
11. Пашкевіч, А. Выбары ў Віленскі сойм 1922 г. і адносіны да іх беларускай грамадскасці / А. Пашкевіч // Беларускі гістарычны агляд. – 2005. – Т. 12. – Сшыткі 1 – 2 (22 – 23). – С. 111 – 132.
12. Липич О.А. Нормативно-правовое регулирование потребительской кооперации в России в 1917 – 1920-х годах // Вестн. Читинского гос. ун-та. – 2009. – № 2 (53-9). – С. 79 – 82.
13. Чыжэўскі. Руйнаваньне каапэрацыі / Чыжэўскі // Беларускі Звон. – 4 ліпня 1922. – С. 1 – 2.
14. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў у Вільне. – Фонд 23. – Воп.1. – Адз. зах. 77.
15. Dziennik Ustaw Rzeczypospospolitej Polskiej. – 111. – Poz. 733. – Ustawa z dnia 29 paździermika 1920 r. O spółdzielniach
16. Архіў новых актаў у Варшаве (АНА). – Фонд 213. Кааператыўная рада (КР). – Адз. зах. 18384.
17. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 46.
18. АНА. – Ф.9. Міністэрства ўнутраных спраў (дадатак). – Адз. зах. 1073.
19. Dziennik Ustaw Rzeczypospospolitej Polskiej. – № 38. – Poz. 342. – Ustawa z dnia 13 marca 1934 r. w sprawie zmiany ustawy o spółdzielniach. – S. 635 – 641.
20. Клімовіч, А. Да гісторыі беларускай коопэрацыі / А. Клімовіч // АР НАНБ. – Фонд 5 "Клімовіч Адольф Юстынавіч". – Воп. 1. – Спр. 7.
21. АНА. – Фонд. 213. – КР. – Адз. зах. 74.
22. АНА. – Фонд. 213. – КР. – Адз. зах. 21782.

*Паступіў 15.06.2012*

## THE SPECIFICITY OF REALISATION OF POLISH COOPERATIVE LEGISLATION ON TERRITORY OF WESTERN BELARUS (1920 – 1939)

***A. RADZIUK***

*The main stages of formation and development of normative-legal base of cooperative activity in Poland during the interwar period are explored. The peculiarities of realisation and spreading of Polish cooperative law on territory of Western Belarus are considered. The author made a conclusion, that the Belarusian cooperative organisations (till 1934) experienced supplementary difficulties of law nature in their activities even under the influence of the democratic cooperative legislation. The cooperative standards are projected on the Belarusian cooperatives by the local authorities that in their turn considered them as political disliked organisations and created different obstacles on their development way.*

**УДК 94(467)**

# ТОРГОВЛЯ В БЕЛАРУСИ В УСЛОВИЯХ НАЦИСТСКОЙ ОККУПАЦИИ

***канд. ист. наук, доц. Е.А. ГРЕБЕНЬ***
***(Белорусский государственный аграрный технический университет, Минск)***

*Рассматривается важный аспект повседневной жизни населения Беларуси в условиях нацистской оккупации – организация торговли. На основе значительного количества архивных источников детально реконструированы порядок организации торговли, цены на продукты питания и промышленные товары в различных регионах Беларуси в разные периоды оккупации, показана степень втянутости населения в торговые операции, реконструирована система наказаний за нарушения правил торговли, показан провал попыток оккупационных властей пресечь спекуляцию и обменные операции. Автор констатирует, что элементом оккупационной повседневности стало наличие прослойки городского населения, занимавшейся операциями на черном рынке. В условиях тотального дефицита продуктов питания, промтоваров для некоторых горожан вовлечение в этот процесс явилось одной из стратегий выживания.*

**Введение.** В условиях колоссального дефицита продуктов питания и промышленных товаров немецкие оккупационные власти взяли торговлю под жесткий контроль. Распределяемые по карточкам продукты питания совершенно не удовлетворяли потребности гражданского населения, а промтовары по карточкам не выдавались, поэтому уже осенью 1941 года была разрешена торговля на рынках, открывались магазины и предприятия общественного питания. На протяжении всего периода оккупации немецкая и коллаборационная администрация издавала множество нормативных документов, регламентировавших порядок торговли, в первую очередь цены, категории товаров, разрешенных к продаже, дни работы рынков.

**Основная часть.** В различных территориально-административных единицах в разные периоды оккупации были изданы нормативные акты, регулировавшие порядок торговли: время работы, место размещения рынков, количество рабочих дней, цены и др. В Могилеве первый базар состоялся 16.08.1941 и в начальный период оккупации проводился еженедельно по средам и субботам. В постановлении бургомистра Могилева содержался запрет на обменную торговлю под угрозой штрафа в 100 руб. или ареста до 1 месяца, запрет на продажу продуктов христианским населением в районе гетто (штраф до 50 руб.) за исключением тех граждан, которые проживали в этом районе. Последняя норма должна была пресечь торговлю с евреями [1, л. 9, 25]. В дальнейшем установилась практика, по которой крестьяне могли продавать свои товары в среду, пятницу и воскресенье, в остальные дни разрешалась торговля для жителей города. Торгующие постоянно должны были получать специальный патент, однако, помимо профессиональных торговцев, на рынке часто продавали свои товары горожане (одежду, предметы обихода), чтобы на вырученные средства купить продукты питания. Такие граждане были обязаны платить разовый базарный сбор. За право торговли на Быховском рынке взимался базарный сбор от 5 руб. с торгующего с рук до 30 руб. за торговлю с телеги. Арендная плата за базарные ларьки и лавки составляла 75 – 100 руб. в месяц [2, л. 30 – 31]. Комендант рынка был обязан следить за тем, чтобы никто не превышал официальные цены, однако воспрепятствовать спекуляции и строжайше воспрещенной меновой торговле было невозможно, угрозы штрафа и лишения права торговли не действовали. Помимо основного Быховского рынка, существовали дополнительные места торговли в районе вокзала и на Офицерской улице, торговля на которых начиналась с 5.00 [3, л. 8]. Штат Быховского рынка в Могилеве летом 1943 года составлял: комендант, помощник коменданта, 5 дворников, 2 сторожа, ответственный за весы, 2 сборщика, 2 весовщика, 2 уборщицы, 4 кассира, возчик; Луполовского рынка: комендант, помощник коменданта, весовщик, 2 дворника [4, л. 102].

На территории Барановичского округа торговля была регламентирована в ноябре 1941 года. В Барановичах торговыми днями являлись понедельник и четверг. Для торговли отводилась территория между Слуцкой, Виленской, Аптечной и Сосновой улицами, продажа товаров в других местах, а также продажа с возов запрещалась. Торговцам разрешалось продавать товары, а покупателям платить только ту цену, которая была установлена гебитскомиссаром на конкретный товар. В случае нарушения данного правила наказанию подлежали как продавец, так и покупатель. Категорически запрещалась обменная торговля. Торговцам предписывалось все товары на полках, и в витринах магазинов, и на рынках снабжать табличками с указанием цены в марках и рублях, а также единиц измерения (килограммы, литры). Цены на ряд товаров (мясо и колбасы, хлебобулочные изделия, зерновые и бобовые, кофе, чай, сахар, мармелад, масло, яйца, сыр, картофель) должны были быть оформлены отдельным списком, вывешенным на видном месте. Это же касалось и предприятий бытового обслуживания. Рестораны, столовые,

буфеты должны были размещать цены на еду и напитки на столах, указывая там же повышение цены в результате налогов и обслуживания клиента. Ценники требовалось оформлять на немецком и белорусском языках. В декабре 1941 года торговцам было приказано доставить в отдел мер и весов гири, весы, метры и другие измерительные приборы, использовавшиеся в торговле, для их верификации [5, л. 1, 2 об.].

На основании приказа ортскоменданта Гомеля от 18.02.1942 разрешалась свободная торговля на рынках Гомеля и районов. Торговля продуктами питания разрешалась ежедневно, промышленными товарами – в дни базаров по средам, пятницам и воскресеньям еженедельно. Ежедневный базарный сбор с человека устанавливался в 5 руб., уплатившему базарный сбор выдавалась соответствующая квитанция. Главы местной администрации были обязаны следить за порядком на рынках, не допуская меновой торговли и спекуляции валютой, пресекать отказы принимать валюту по установленному курсу 1 марка = 10 руб. [6, л. 27].

В Койданово с разрешения Минского гебитскомиссара 5.07.1942 был открыт еженедельный рынок. Торговля осуществлялась еженедельно по четвергам с 8.00 до 15.00. К продаже разрешались птица, яйца, овощи, рыба, промышленные товары, художественные изделия. Торговля поросятами разрешалась в изолированном от остальной части рынка месте под надзором ветеринарного врача. Торговый сбор составлял 1,5 марки с воза и 0,5 марки с торгового места за столом. Волостным бургомистрам предлагалось оповестить местных жителей об открытии рынка. Традиционно к торговле допускались граждане, имевшие свидетельства о сдаче государственных поставок [7, л. 109].

Новогрудский гебитскомиссар 10.07.1943 издал распоряжение относительно порядка торговли на рынках в районных центрах округа. Вводился запрет на продажу лошадей, домашнего скота, мяса и мясных изделий. Копченое сало и масло можно было продавать только в магазины Центрального торгового общества. Лишки других сельскохозяйственных продуктов разрешалось продавать только после уплаты всех налогов. К продаже разрешались овощи, фрукты, рыба, предметы домашнего обихода. Во время продажи необходимо было иметь при себе товарную карту, карту сдачи яиц и молочную карту, которые предъявлялись контролирующим лицам. За нарушение порядка торговли грозил штраф до 1000 марок (!) или тюремное заключение до 6 месяцев и конфискация товаров. Также вводился контроль над ценами. Например, килограмм раннего картофеля до 15 августа стоил 0,1 марки, до 30 августа – 0,8 марок, после 30 августа – 0,4 марки [8, л. 29].

На основании распоряжения Осиповичской полевой комендатуры от 31.10.1943 был разработан проект положения о рынках в городах, местечках и других населенных пунктах Осиповичского района. Главам местной администрации давалась возможность организовывать рынки по согласованию с ортскомендатурой, за исключением тех населенных пунктов, где ортскомендатура отсутствовала. Рекомендовалось, по возможности, организовывать рынки в центре населенного пункта на огороженной территории. Базарные дни устанавливались в зависимости от количества и покупательной способности населения конкретного населенного пункта и прилегающей сельской округи. В крупных городах рекомендовалось базарные дни установить по воскресеньям, средам и пятницам, в районных центрах – по воскресеньям и средам, в остальных населенных пунктах только по воскресным дням. Торговля крестьянами сельскохозяйственными продуктами могла осуществляться свободно, без специального разрешения, за исключением случаев невыполнения крестьянами военного сбора. Торговля промышленными товарами и продукцией из непереработанного сельскохозяйственного сырья разрешалась при наличии патента или разрешения от местных органов власти. Под угрозой конфискации товара запрещалась торговля промышленными товарами вразнос, торговля военным снаряжением.

Торговля должна была производиться по установленным местными органами власти ценам, повышение которых допускалось не более чем на 20 % от средней рыночной цены в зависимости от качества товара. При продаже по завышенным ценам следовала конфискация товаров, а в случае систематических нарушений данного правила накладывался штраф.

